Нацыянальны інстытут адукацыі

## Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

# Беларуская мова

# Навучальныя і кантрольныя пераказы

## 5–9 класы

Аверсэв

Нацыянальны інстытут адукацыі

Кантрольна-вымяральныя матэрыялы

# Беларуская мова

# Навучальныя і кантрольныя пераказы

# 5–9 класы

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне

Мінск • «Аверсэв» • 2016

УДК 373.3.016:811
ББК 74.268.1Беи
Б43

*Серыя заснавана ў 2012 годзе*

**А ў т а р ы:**
Г. М. Валочка, Л. С. Васюковіч, В. У. Зелянко, І. М. Саматыя,
С. С. Міхнёнак, С. М. Якуба

**Беларуская мова** : навучальныя і кантрольныя пераказы :
Б43 5—9 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — 2-е выд. — Мінск : Аверсэв, 2016. — 219 с. — (Кантрольна-вымяральныя матэрыялы).

ISBN 978-985-19-2115-3.

Зборнік змяшчае тэксты ўсіх відаў навучальных і кантрольных пераказаў, якія прадугледжаны для напісання ў 5—9 класах устаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання. У пачатку дапаможніка пададзены падрабязны метадычны каментарый па правядзенні навучальных і кантрольных пераказаў.

**УДК 373.3.016:811**
**ББК 74.268.1Беи**

**ISBN 978-985-19-2115-3**

© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2012
© Афармленне. ТДА «Аверсэв», 2012

# Прадмова

## Пераказ як сродак фарміравання ў вучняў навыкаў звязнага маўлення

Пераказ — традыцыйны, правераны на практыцы від працы па развіцці звязнага маўлення. У розныя часы да пераказу ставіліся па-рознаму: ад поўнага яго адмаўлення як малаэфектыўнага, механічнага віду працы да прызнання яго ролі ў больш паспяховым развіцці звязнага маўлення. Ролю пераказаў у развіцці звязнага маўлення вучняў добра разумелі аўтары першых беларускіх праграм, падручнікаў, вучэбных і метадычных дапаможнікаў. Так, аўтар першай «Методыкі роднае мовы» К. Міцкевіч пісаў у адносінах да вуснага пераказу, што ён «павінен лічыцца важным практыкаваннем на лекцыях аб'яснялЬнага чытання» [1, с. 415] з прычыны лепшага засваення зместу твора, выпрацоўкі ўмення складна гаварыць і навыку вуснага маўлення, а таксама з'яўляецца вельмі добрай падрыхтоўкай да разнастайных пісьмовых практыкаванняў. «Трэба пагадзіцца з тым палажэннем, — зазначаў і акадэмік І. Замоцін, — што няма даных, каб зусім адмовіцца ад пераказаў ці іншых відаў пераймальных работ, бо лексіка і фразеалогія, з якімі дзеці з'яўляюцца ў школу, маюць вялікую патрэбу ў папаўненні і развіцці шляхам уласна пераймання дзелавой і літаратурнай мовы чытанага матэрыялу» [2, с. 53].

У сучаснай метадычнай навуцы лічыцца, што пераказ найлепш адпавядае сучасным патрабаванням да навучання мове, бо дапамагае вучням авалодаць маўленчай дзейнасцю на роднай мове, садзейнічае выпрацоўцы ўменняў слухаць, чытаць, гаварыць і пісаць. У працэсе працы над тэкстам-арыгіналам школьнікі вучацца «аналізаваць, сінтэзаваць, выдзяляць галоўнае, канцэнтраваць увагу на адных з'явах і абстрагавацца ад іншых» [3, с. 10]. Тэкст-арыгінал дазваляе паказаць вучням логіку пабудовы тэксту, магчымасці і спосабы аб'яднання

моўных сродкаў у адзінае цэлае. Спасцігаючы традыцыі і магчымасці спалучэнняў слоў у сказы, сказаў у тэкст на аснове ўзорных твораў, вучні могуць засвоіць гатовы матэрыял, пераняць вопыт майстроў слова, каб карыстацца ім пры стварэнні ўласных вусных і пісьмовых выказванняў. А паглыблены комплексны лінгвістычны аналіз тэксту, які праводзіцца перад напісаннем пераказу, спрыяе павышэнню чытацкай культуры, выхаванню мастацкага густу. Акрамя таго, пераказ (вусны і пісьмовы) на ўроках мовы дапамагае вучням авалодваць агульнаадукацыйным уменнем, якое патрэбна ім на ўсіх уроках, а таксама ў жыцці: пераказ зместу параграфа, прачытанай кнігі, праслуханага паведамлення, прагледжанага кінафільма, спектакля і г. д. (пераказ у шырокім значэнні).

З пазіцый псіхалогіі пераказ (вусны і пісьмовы) уяўляе сабой два ўзаемазвязаныя маўленча-мысліцельныя працэсы: успрыманне выказвання і яго ўзнаўленне. Гэтыя працэсы цесна звязаны з фарміраваннем уменняў у розных відах маўленчай дзейнасці: з аднаго боку — уменне ўспрымаць тэкст на слых (аўдзіраванне) або зрокава (чытанне), з другога боку — уменне ствараць уласны тэкст на аснове прапанаванага вусна (гаварэнне) або пісьмова (пісьмо).

Спецыяльныя псіхолага-педагагічныя даследаванні паказалі найбольшую эфектыўнасць якраз такога комплекснага навучання ўсім відам маўленчай дзейнасці. У гэтым сэнсе пераказ уяўляецца ідэальным відам працы, бо «дазваляе арганізаваць навучанне звязнаму маўленню па тыпе дзейнасці» [4].

Успрыманне выказвання на слых залежыць ад таго, наколькі ў вучняў развіты доўгатэрміновая і аператыўная памяць, мысленне, механізм верагоднаснага прагназавання (М. І. Жынкін). Аператыўная, або кароткачасовая, памяць захоўвае інфармацыю ў словах, гэта значыць так, як яна была ўспрынята. Аднак гэта інфармацыя ўтрымліваецца ў памяці на працягу некалькіх секунд, а пры паступленні новай інфармацыі «сціраецца». Доўгатэрміновая памяць захоўвае інфармацыю доўгі час, але ў перапрацаваным выглядзе (наглядныя вобразы, схемы, «сэнсавыя згусткі» і г. д.).

Успрымаючы тэкст для пераказу, вучань асобныя часткі запамінае даслоўна (актывізуецца аператыўная памяць), а асноўны змест тэксту — у наглядных вобразах і схемах, «сэнсавых згустках», якія пры ўзнаўленні зместу (стварэнні ўласнага тэксту на аснове прапанаванага) неабходна перадаць з дапамогай слоў, словазлучэнняў, сказаў.

«Працэс пераходу ад думкі да маўлення ўяўляе сабой надзвычай складаны працэс падзелу думкі і яе ўзнаўлення ў словах», — пісаў Л. С. Выгоцкі, параўноўваючы думку з навіслым воблакам, якое праліваецца дажджом слоў [5]. Вучням даводзіцца трымаць у памяці ўвесь змест тэксту-арыгінала, адначасова ствараць і афармляць уласнае выказванне, імкнучыся захаваць і аўтарскі тэкст, і логіка-кампазіцыйнае размяшчэнне частак у ім, і выкарыстаную аўтарам сістэму моўных сродкаў, пры гэтым вырашаючы арфаграфічныя і пунктуацыйныя задачы.

Прымаючы пад увагу складанасць працэсу пераказу, неабходнасць павышэння эфектыўнасці падрыхтоўчай працы, забеспячэння мэтанакіраванасці навучальнай дзейнасці, гатоўнасці вучняў да такога віду працы, у беларускай методыцы неаднаразова падкрэслівалася мэтазгоднасць зрокавага ўспрымання тэксту пры навучанні пераказам (В. У. Протчанка, М. Г. Яленскі, Я. М. Лаўрэль і інш.). Пры гэтым В. У. Протчанка, абгрунтоўваючы ў сувязі з гэтым наяўнасць тэкстаў для навучальных пераказаў у падручніках, адзначаў, што «тэкст у падручніку настаўнік выкарыстоўвае як наглядны дапаможнік, які дазваляе заглыбляцца на змесце і форме аўтарскага выказвання, засяроджвацца на тых моўных і кампазіцыйных сродках, якія ён выкарыстоўвае для выражэння сваіх думак» [6, с. 106].

Магчымасць успрымаць тэкст не толькі на слых, але і зрокава — неабходная ўмова для комплекснага аналізу тэксту. Настаўнік мае магчымасць засяродзіцца на асаблівасцях мовы тэксту, спыніць увагу вучняў на асобных словах, словазлучэннях, выразах, якія на слых яны могуць і не ўспрыняць, але якія маюць істотнае значэнне для перадачы аўтарскай думкі. Іншымі словамі, ствараецца магчымасць для абагульняльных пытанняў як праблемнага аналізу твора, перавага якіх неадна-

разова сцвярджалася ў метадычнай літаратуры (М. А. Плёнкін, І. Д. Марозава і інш.).

З успрыманнем выказвання (адлюстраваннем у свядомасці вучня пэўнага зместу) цесна звязана разуменне (спасціжэнне розумам) закладзенай у тэксце інфармацыі, як і ўменне ўзнаўляць змест пачутага ці прачытанага прама залежыць ад умення яго зразумець. Тэкст пераказу з’яўляецца ў пэўнай ступені паказчыкам якасці разумення, бо свой тэкст вучань стварае на аснове прапанаванага ў адпаведнасці з тэмай, асноўнай думкай, тыпам, стылем і жанрам тэксту-арыгінала.

Разуменне тэксту з’яўляецца складаным аналітыка-сінтэтычным працэсам, у выніку якога вучань спазнае перададзеную ў тэксце і зафіксаваную з дапамогай мовы аб’ектыўную рэальнасць. Як вядома, разуменне можа быць як апасродкаваным, так і непасрэдным (прамым). Пры прамым разуменні прадмет маўлення знаёмы чалавеку, разуменне ў такім выпадку дасягаецца простым выкарыстаннем уласных ведаў, жыццёвага вопыту. Калі ж прадмет разумення новы, то «працэс яго асэнсавання не абмяжоўваецца пазнаваннем і яго можна зразумець толькі апасродкавана, калі на аснове наяўных ведаў з дапамогай спецыяльных прыёмаў чалавек прыходзіць да новых ведаў» [7, с. 76]. Поспех разумення зместу, такім чынам, залежыць, па-першае, ад ведаў, вопыту, назапашанага вучнямі, а па-другое, ад таго, наколькі яны валодаюць прыёмамі аналітычнай працы з тэкстам. У гэтай сувязі ў навучанні пераказам узрастае роля авалодвання вучнямі такімі прыёмамі. Пад прыёмамі будзем разумець пэўныя дзеянні, аперацыі (настаўніка і вучняў), якія накіраваны на вырашэнне дыдактычных задач пры падрыхтоўцы да напісання пераказу.

У «Тлумачальным слоўніку беларускай мовы» (Мінск, 1978) падкрэсліваецца актыўны характар працэсу разумення: *зразумець* — засвоіць сэнс, змест чаго-небудзь; асэнсаваць (т. 2, с. 512). А. А. Лявонцьеў апісвае эксперымент, у час правядзення якога ўдзельнікі ўспрымалі адзін і той самы тэкст, але пры розных умовах: без інструкцыі, у форме дыктоўкі, з устаноўкай запомніць, вызначыць асноўную ідэю, выказаць меркаванне.

Вынікі эксперымента паказалі найбольшую эфектыўнасць разумення ў трох апошніх выпадках, гэта значыць, калі мелася канкрэтная ўстаноўка на запамінанне або асэнсаванне. Гэта дало падставы для вываду, што глыбіня разумення маўленчай інфармацыі прама прапарцыянальная ступені ўсвядомленай рэцыпіентам неабходнасці адказу на яе [8]. У сувязі з гэтым асаблівае значэнне набывае стварэнне спецыяльнай устаноўкі ў час слухання ці чытання тэксту, якая б настройвала вучня на актыўнае ўспрыманне інфармацыі. Устаноўка на ўспрыманне тэксту стымулюе дзейнасць слухача, дапамагае ўсвядоміць яе канчатковую мэту. У гэтай ролі перад чытаннем (слуханнем) тэксту выступае ўстаноўка на напісанне падрабязнага (выбарачнага або сціслага) пераказу, гэта значыць устаноўка на першаснае (агульнае) успрыманне тэксту, што звязана з усведамленнем загалоўка (яго адпаведнасць тэме ці асноўнай думцы), мэтанакіраванасці і адрасата, тыпу, стылю і жанру тэксту.

Такім чынам, пераказ у практыцы навучання беларускай мове з'яўляецца тым відам навучальнай творчай працы, якая звязана з развіццём звязнага маўлення, з фарміраваннем камунікатыўных уменняў вучняў.

Зразумела, што магчымасці гэтага віду працы могуць найлепшым чынам рэалізавацца пры ўмове выкарыстання на ўроку беларускай мовы розных відаў навучальных пераказаў, што звязана з вырашэннем канкрэтных дыдактычных задач.

Віды пераказаў выдзяляюцца на самых розных падставах. «Школьная практыка, — пісаў А. В. Цекучоў, — ведае вялікую колькасць відаў пераказаў, якія адрозніваюцца па змесце, мэце, аб'ёме, па адсутнасці або наяўнасці плана і ўмоў яго складання, па ступені ўскладненасці пераказаў дадатковымі заданнямі і г. д.» [9, с. 325].

Найбольш вычарпальнай (паказана шматмернасць характарыстыкі і класіфікацыі пераказаў) лічыцца класіфікацыя Т. А. Ладыжанскай, якая з улікам узнаўляльнай дзейнасці, што ляжыць у аснове перадачы зыходнага тэксту, прапаноўвае класіфікаваць пераказы: 1) па адносінах да аб'ёму

зыходнага тэксту: падрабязныя і сціслыя; 2) па адносінах да зместу: поўныя, выбарачныя, з дадатковымі заданнямі; 3) па ўскладненасці моўным заданнем: з лексічным, граматычным, стылістычным і іншымі заданнямі; 4) па ўспрыманні зыходнага тэксту: пераказ прачытанага (успрынятага зрокава), пачутага (успрынятага на слых), успрынятага на слых і зрокава; 5) па ступені знаёмства з зыходным тэкстам: пераказ незнаёмага тэксту і знаёмага, вядомага вучням [10, с. 222—224]. У метадычных выданнях сустракаюцца і іншыя асновы для выдзялення відаў пераказу: у залежнасці ад тэматыкі тэксту-арыгінала (пра свет, прыроду, сяброўства, спорт, Радзіму і г. д.), ад яго жанрава-кампазіцыйных асаблівасцей (пераказ-апісанне, пераказ нарыса, нататкі і г. д.) і інш.

Пры разнароднасці і шматлікасці класіфікацый метадычна мэтазгодна для практыкі навучання беларускай мове выдзеліць найбольш значныя з падстаў, тыя, што дазволілі б убачыць спецыфіку і патэнцыяльныя магчымасці пераказаў у сістэме развіцця звязнага маўлення вучняў.

Зыходзячы са сказанага і з практыкі навучання ўяўляецца мэтазгодным выдзеліць наступныя падставы для класіфікацыі пераказаў: 1) мэта правядзення; 2) спосаб успрымання тэксту-арыгінала; 3) характар узнаўлення матэрыялу.

Паводле мэты правядзення пераказы падзяляюцца на:

1) *навучальныя*, непасрэдна перад напісаннем якіх праводзіцца падрыхтоўчая праца, мэта якой — правесці комплексны аналіз тэксту-арыгінала, садзейнічаць выпрацоўцы ў вучняў камунікатыўных уменняў і навыкаў, звязаных з успрыманнем чужога і стварэннем уласнага выказвання;

2) *кантрольныя*, перад напісаннем якіх падрыхтоўчая праца не праводзіцца, падрыхтоўчай для іх лічыцца ўся сістэма працы на працягу пэўнага прамежку часу (паміж дзвюма кантрольнымі).

Паводле спосабу ўспрымання тэксту-арыгінала выдзяляюцца:

1) пераказ прачытанага тэксту, успрынятага зрокава (вучні чытаюць тэкст самастойна);

2) пераказ пачутага, успрынятага на слых (тэкст чытае настаўнік або падрыхтаваны вучань, ці даецца аўдыязапіс);

3) зрокава-слыхавы пераказ, успрыняты на слых і зрокава.

Паводле характару ўзнаўлення матэрыялу адрозніваюцца:

1) *падрабязны* пераказ, задачай якога з'яўляецца перадача зместу цалкам з усімі падрабязнасцямі, з захаваннем яго жанрава-стылістычных і моўных асаблівасцей;

2) *сціслы* пераказ, задача якога — перадаць галоўнае ў змесце тэксту-арыгінала, апусціўшы дэталі, падрабязнасці; тып і стыль пры гэтым звычайна захоўваюцца;

3) *выбарачны* пераказ, які мае сваёй мэтай перадаць не ўвесь тэкст, а толькі пэўную яго частку, што мае адносіны да пэўнай тэмы (асноўнай ці пабочнай). Пры выбарачным пераказе стыль выказвання звычайна захоўваецца, а тып, кампазіцыя, асноўная думка, як правіла, змяняюцца.

Акрамя гэтага, паводле жанрава-стылістычных асаблівасцей тэксту адрозніваюцца: 1) пераказ тэкстаў мастацкага стылю; 2) пераказ тэкстаў навуковага стылю; 3) пераказ тэкстаў публіцыстычнага стылю; 4) пераказ тэкстаў гутарковага стылю; 5) пераказ тэкстаў афіцыйнага стылю.

Паводле жанрава-кампазіцыйных асаблівасцей выдзяляюцца: 1) пераказ тэксту-апавядання; 2) пераказ тэксту-апісання; 3) пераказ тэксту-разважання; 4) пераказ тэкстаў з розным тыпавым значэннем.

Кожны з відаў пераказу можа быць ускладнены дадатковымі заданнямі: моўным (лексічным, граматычным, стылістычным і г. д.), творчым (прадугледжвае творчую перапрацоўку, дапаўненне тэксту-арыгінала), маўленчым (звязаны з маўленчымі паняццямі), калі гэта не перашкаджае задачам развіцця звязнага маўлення вучняў.

Кожны з пераказаў выконвае сваю ролю ў фарміраванні камунікатыўных уменняў, мае сваю методыку правядзення і адрозніваецца характарам аналізу матэрыялу.

У сістэме працы па развіцці звязнага маўлення выкарыстоўваюцца розныя віды пераказаў. Праца над імі пачынаецца ўжо ў пачатковай школе, паступова ўдасканальваецца

і ўскладняецца на наступных этапах навучання. Пры гэтым на першапачатковым этапе (5 клас) пераказы займаюць асноўнае месца сярод усіх пісьмовых творчых прац, а к канцу II ступені навучання іх удзельная вага змяншаецца на карысць розных відаў сачыненняў. Змяняецца і характар працы: ад падрабязнага пераказу па простым, затым складаным плане, сціслага, выбарачнага пераказу да напісання тэзісаў, рэферата, канспекта, якія патрабуюць складанай аналітыка-сінтэтычнай дзейнасці.

На кожным этапе навучання вырашаюцца свае задачы, што прадугледжвае выкарыстанне розных відаў пераказаў. Так, на пачатковым этапе (1—4 класы) фарміруюцца ўменні вызначаць тэму і асноўную думку нескладаных тэкстаў, выдзяляць асноўнае ў змесце, сэнсавыя часткі, складаць план, пісаць падрабязныя пераказы. На гэтым этапе вучні таксама вучацца вусна пераказваць тэкст сцісла і выбарачна.

У 5 класе настаўнік абапіраецца на камунікатыўныя ўменні, сфарміраваныя ў пачатковай школе, і працуе над фарміраваннем новых з улікам перспектывы развіцця звязнага маўлення ў наступных класах. Так, у 5—9 класах навучанне пераказу наладжваецца на аснове практычнага засваення вучнямі сістэмы маўленчых паняццяў (тэкст, яго прыметы, тэма і асноўная думка, спосаб і сродкі сувязі сказаў у тэксце, план просты і складаны, стыль, тып і жанр маўлення, патрабаванні да падрабязнага, сціслага і выбарачнага пераказаў), якія і складаюць тэарэтычную аснову працы над пераказам. Працуючы над пераказам, вучні праходзяць складаны шлях: ад падрабязнага ўзнаўлення невялікіх па аб'ёме і нескладаных па змесце і кампазіцыі тэкстаў па простым, а затым складаным плане да сціслага і выбарачнага пераказу тэкстаў, а таксама падрабязнага пераказу тэкстаў, значных па аб'ёме і дастаткова складаных у кампазіцыйных і моўных адносінах. Кожнае з уменняў выконвае сваю ролю ў развіцці звязнага маўлення вучняў і разам з іншымі накіравана на авалодванне вучнямі ўсім комплексам камунікатыўных уменняў і навыкаў.

Праца над пераказам звязана з фарміраваннем як агульных, так і спецыфічных камунікатыўных уменняў. Першыя з іх

носяць комплексны характар і маюць адносіны да любога віду пераказу. Такія ўменні звязаны са зместам, лагічнай пабудовай і моўным афармленнем выказвання, а таксама ўдасканаленнем напісанага:

- уменні, звязаныя з разуменнем зместу (слухаць і ўспрымаць тэкст, асэнсоўваючы тэму і асноўную думку, тып, стыль і жанр маўлення, логіку і паслядоўнасць выкладу, узаемаабумоўленасць тэм і падтэм, асаблівасці аўтарскага выкладу);
- логіка-кампазіцыйныя ўменні (складаць план, вызначаць спосаб і сродкі сувязі сказаў і частак у тэксце і г. д.);
- моўныя ўменні (адбіраць моўныя сродкі ў залежнасці ад тыпу, стылю і жанру, задач маўлення);
- уменне правіць тэкст, удасканальваць напісанае.

Іншыя ўменні носяць спецыфічны характар і звязаны з канкрэтным відам пераказу. Так, пры падрабязным пераказе неабходны ўменні раскрываць тэму і асноўную думку тэксту пэўнага стылю, тыпу і жанру; паслядоўна выкладаць падзеі, не парушаючы часавых, прасторавых, прычынна-выніковых сувязей; перадаваць логіку і кампазіцыю тэксту-арыгінала; выкарыстоўваць моўныя сродкі ў адпаведнасці з камунікатыўнай задачай.

Пры сціслым пераказе неабходны ўменні выдзяляць галоўную (істотную) і другарадную інфармацыю (галоўнае і дэталі); пры сцісканні тэксту захоўваць асноўную думку; карыстацца рознымі спосабамі скарачэння тэксту (выключэнне ці абагульненне); захоўваць моўныя сродкі, неабходныя для перадачы стылю выказвання; самастойна падбіраць сродкі абагульненай перадачы зместу.

Пры выбарачным пераказе патрэбны ўменні выбіраць з тэксту (тэкстаў) матэрыял на прапанаваную тэму; вызначаць асноўную думку новага выказвання ў выпадку яе несупадзення з асноўнай думкай тэксту-арыгінала; сістэматызаваць адабраны матэрыял у адпаведнасці з асноўнай думкай новага выказвання; знаходзіць неабходныя моўныя сродкі для сувязі адабранага матэрыялу; ствараць выказванне іншага тыпу ў параўнанні з тэкстам-арыгіналам.

Традыцыйная методыка прапануе наступны парадак працы ў сувязі з правядзеннем пераказаў: аб'яўленне тэмы і мэты заняткаў, уступная гутарка пра зыходны тэкст і яго аўтара; чытанне зыходнага тэксту, гутарка пра яго змест, складанне плана пераказу, чытанне зыходнага тэксту па частках і моўны аналіз, работа па правапісе, выніковае чытанне зыходнага тэксту, напісанне пераказу, яго праверка настаўнікам і аналіз.

В. У. Протчанка прапаноўваў засяродзіцца на «самім вучні, яго здольнасці выконваць прагматычны аналіз тэксту — лексіка-семантычны, структурна-кампазіцыйны, мадальна-часавы, маральна-этычны і, нарэшце, дыдактыка-накіраваны: лексічны, арфаграфічны, пунктуацыйны і інш.» [6, с. 108]. На думку вучонага, праца над вусным і пісьмовым пераказамі заўсёды пачынаецца з чытання і шматаспектнага аналізу тэксту, які ўключае ў сябе асэнсаванне загалоўка і выказванні вучняў, звязаныя з тэмай тэксту; высвятляюцца адрасат тэксту, яго стыль, мэтанакіраванасць і галоўная думка; выконваюцца падрыхтоўчыя практыкаванні; тэкст слухаецца другі раз, выпісваюцца ключавыя словы, на аснове якіх ствараюцца сказы на тэму, заяўленую ў аўтарскім тэксце; затым калектыўна складаецца план, згодна з якім вучні карэкціруюць падрыхтаваныя сказы, размяшчаючы іх у лагічна-храналагічнай паслядоўнасці (згодна з пунктамі плана) і правільна, у адпаведнасці з нормамі літаратурнай мовы, далучаючы адзін да аднаго.

Найбольшую эфектыўнасць паказвае такое навучанне пераказу, калі праца над ім праводзіцца па наступнай схеме:

- чытанне тэксту пераказу (абавязковае зрокавае ўспрыманне);
- комплексны аналіз тэксту, які складаецца са зместавага, стылістычнага, тыпалагічна-кампазіцыйнага аналізу і аналізу функцыянавання моўных сродкаў;
- стварэнне ўласнага вуснага тэксту;
- ацэнка (самаацэнка і ўзаемаацэнка) выступленняў;
- пісьмовы запіс тэксту;
- удасканаленне напісанага.

У адрозненне ад традыцыйнай прапанаваная методыка навучання пераказу мае некаторыя прынцыповыя адрозненні. Перш за ўсё гэта неабходнасць зрокавага ўспрымання тэксту, што дае магчымасць для абагульняльных праблемных пытанняў па змесце твора, дазваляе засяродзіцца на тых зместавых, структурных і моўных асаблівасцях, якія маюць істотнае значэнне для перадачы аўтарскай задумы. Як сведчаць псіхалагічныя даследаванні, гукавая памяць у большасці людзей развіта горш за зрокавую, а прапускная здольнасць зрокавага аналізатара большая за слыхавы ў 6,5 раза. У сувязі з гэтым некаторыя даследчыкі раяць адмовіцца ад выкарыстання пераказу ў якасці кантрольнай работы і разглядаць методыку працы над ім як над практыкаваннем, накіраваным на навучанне стварэнню тэксту [11].

На наступным этапе традыцыйны моўны аналіз тэксту заменены комплексным аналізам, які прадугледжвае разгляд тэксту па асноўных напрамках (змест, кампазіцыя і моўнае афармленне) **на аснове маўленчых паняццяў**. Поўны комплексны аналіз тэксту ўключае: асэнсаванне загалоўка і яго суадноснасці з тэмай і асноўнай думкай (або вызначэнне тэмы і асноўнай думкі тэксту, падбор загалоўка, які б перадаваў тэму ці асноўную думку), вызначэнне стылю і тыпу маўлення (вядучы тып, спалучэнне розных тыпаў), колькасці тэм, падтэм і мікратэм, спосабу і сродкаў сувязі сказаў у тэксце, аналіз выяўленчых моўных сродкаў, якія выкарыстаны аўтарам для вырашэння камунікатыўнай задачы.

Новым з'яўляецца этап самаацэнкі і ўзаемаацэнкі вусных і пісьмовых выказванняў, у працэсе якога развіваецца навуковае маўленне вучняў, засвойваюцца патрабаванні да выказванняў, вучні прывыкаюць самакрытычна ставіцца да ўласнага маўлення, вучацца культуры маўленчых паводзін.

# Методыка правядзення розных відаў пераказаў

**Падрабязны пераказ** патрабуе ад вучняў узнаўлення тэксту-арыгінала ў той самай кампазіцыйнай форме з захаваннем асаблівасцей яго зместу. Задача падрабязнага пераказу заключаецца ў тым, каб найбольш дакладна і поўна перадаць змест і жанрава-стылістычныя асаблівасці тэксту-арыгінала. Вучні спраўляюцца з гэтай задачай у тым выпадку, калі яны зразумелі яго тэму і асноўную думку, паслядоўнасць падзей і фактаў, колькасць тэм і падтэм, з дапамогай якіх разгортваецца змест, асэнсавалі тыпалагічную схему тэксту і яго жанрава-стылістычную прыналежнасць, моўныя сродкі, характэрныя для гэтага стылю маўлення.

Разгледзім методыку навучання падрабязнаму пераказу на аснове прапанаванай вышэй метадычнай схемы.

Для падрабязнага пераказу ў 5 класе можна прапанаваць наступны тэкст.

## ЗІМОВАЯ РАНІЦА

*Выйшаў я раніцай з хаты на ганак і аж знерухомеў. Пад ботамі парыпвае свежы, пушысты снег. Ён белымі ахапкамі ляжыць на стрэхах, на яблынях і грушах. Аснежаныя белыя кусты нібы чародкі лебядзіныя. Чуваць, як шчоўкае мароз па сухіх жэрдках плота. Баяцца зварухнуцца дрэвы, хаця б ні пушыначкі, ні сняжыначкі не атрэсці са сваіх галін. Ім жа цяплей, ухутаўшыся ў белы пух.*

*Нібы яркімі чырвонымі вугалькамі, асыпана белая яблыня. Гэта так на ёй чырванеюць, іскрацца грудкі снегіроў.*

*Прыгажосць такая навокал!* (Паводле А. Бялевіча). (81 слова)

Прапанаваны для падрабязнага пераказу тэкст з'яўляецца мастацкім апісаннем стану прыроды (карціна зімовай раніцы). Перадаючы нам сваё захапленне ад убачанага, аўтар стварае вобразную і эмацыянальную карціну. Змест і моўныя сродкі тэксту падпарадкаваны асноўнай задачы — апісаць з дапамогай моўных сродкаў зімовую раніцу.

Праца над зместам тэксту звязана з вызначэннем яго тэмы і асноўнай думкі. (*Якая тэма тэксту? Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? У якім сказе яна сфармулявана? Ці праводзіцца гэта думка праз увесь тэкст? Дакажыце гэта.*) У першым сказе вызначаецца тэма тэксту (зімовая раніца). У гэтым жа сказе акрэсліваецца і асноўная думка, перададзеная праз аўтарскія пачуцці. Сфармулявана ж гэтая думка ў апошнім сказе, што падкрэслівае эмацыянальнасць тэксту: *Прыгажосць такая навокал!* Асноўная думка прасочваецца ва ўсім тэксце, бо кожны сказ-апісанне пэўнага прадмета ці з'явы падкрэслівае прыгажосць і незвычайнасць зімовай раніцы.

Тыпалагічна-кампазіцыйны аналіз тэксту дазваляе выявіць, што для раскрыцця тэмы аўтар выкарыстаў пяць падтэм (сэнсавых частак), якія выдзяляюцца ў тэксце без цяжкасцей. Першы сказ з'яўляецца ўводным, у ім перадаецца агульнае ўражанне ад прадмета апісання. Усе падтэмы раскрываюць змест першага сказа і звязаны з ім паралельнай сувяззю, гэта значыць кожны наступны сказ раскрывае, дапаўняе змест першага. У межах падтэм сувязь паміж сказамі паслядоўная: *снег — ён*, *дрэвы — ім*, *яблыня — (на) ёй*. Апошні сказ тэксту, канцоўка, выконвае вялікую сэнсавую нагрузку. У ім перададзена ацэнка ўбачанага і сфармулявана асноўная думка.

Будову тэксту можна перадаць з дапамогай плана і кампазіцыйнай схемы, якая дазваляе вучням не прапусціць сэнсавыя часткі тэксту, захаваць іх паслядоўнасць.

| Прыкладны план тэксту | Схема пабудовы |
| --- | --- |
| Уводная частка<br>*Выйшаў на ганак і знерухомеў.* | Агульнае ўражанне ад прадмета апісання. |
| *Свежы, пушысты снег.*<br>*Белыя кусты нібы чародкі лебядзіныя.*<br>*Мароз шчоўкае.*<br>*Дрэвы баяцца зварухнуцца.*<br>*Яблыня асыпана, нібы чырвонымі вугалькамі.* | Апісанне прымет прадмета ці з'явы:<br>а) снег;<br>б) кусты;<br>в) мароз;<br>г) дрэвы;<br>д) яблыня. |
| *Прыгажосць такая навокал!* | Ацэнка прадмета апісання. |

Параўнанне плана і кампазіцыйнай схемы паказвае, што схема перадае толькі агульную будову тэксту (агульнае ўражанне ад прадмета — пералік характэрных прымет — ацэнка прадмета апісання), але дазваляе не прапусціць істотных у сэнсавых адносінах частак. План уяўляе сабой своеасаблівы тэкст, у якім прасочваюцца пэўная тэма і асноўная думка.

Аналіз моўных сродкаў многія метадысты раяць наладжваць на аснове выдзялення апорных (ключавых) слоў і выразаў. Лічым, што такая праца дапамагае перадаць, а ў далейшым і ўзнавіць логіку і структуру тэксту-арыгінала. Удакладнім, што выбар такіх лексіка-граматычных структур залежыць ад тыпу маўлення. Так, для апавядальнага тэксту характэрны такія моўныя сродкі, што перадаюць паслядоўнасць, развіццё дзеяння ў пэўны прамежак часу, а ў разважаннях — словы, з дапамогай якіх пералічваюцца доказы. У апісанні, якое звычайна з'яўляецца статычным, асноўную сэнсавую нагрузку выконваюць словы са значэннем якасці, ацэнкі. Кожнае з апісанняў прадметаў ці з'яў (*снег*, *мароз*, *дрэва*, *яблыня*) падаецца згодна з законамі адпаведнага тыпу маўлення (апісання): называецца прадмет і даецца яго прымета. Пры выпісванні з тэксту словазлучэнняў з якаснымі прыметнікамі, з дапамогай якіх перадаецца якасць прадмета ці даецца яму ацэнка, звяртаецца

ўвага на захаванне жанрава-стылістычных асаблівасцей тэксту. Прыналежнасць тэксту да мастацкага стылю абумовіла выбар моўных сродкаў. Асноўную сэнсавую нагрузку ў тэксце выконваюць якасныя прыметнікі: *свежы*, *пушысты снег*; *белыя ахапкі*; *аснежаныя белыя кусты*; *белы пух*; *яркімі чырвонымі вугалькамі*; *белая яблыня*.

На наступным этапе адбываецца вусны пераказ тэксту, гэта дазваляе прааналізаваць вартасці і недахопы вучнёўскіх варыянтаў, вучыць аб'ядноўваць, сістэматызаваць матэрыял, адабраны ў працэсе працы над тэкстам, ужываць аўтарскія моўныя сродкі пры стварэнні ўласнага выказвання.

Пры абмеркаванні вусных варыянтаў звяртаецца ўвага на арганізацыю тэксту, размяшчэнне і ўзаемасувязь частак, на неабходнасць выкарыстання моўных сродкаў тэксту-арыгінала. На этапе ацэнкі (самаацэнкі і ўзаемаацэнкі) выступленняў выпрацоўваецца ўменне крытычна ацаніць уласнае ці чужое выказванне, вучні асвойваюць культуру маўленчых паводзін.

Пасля напісання пісьмовага варыянта пераказу вучні рэдагуюць (паляпшаюць) напісанае, звяртаючы ўвагу на змест, кампазіцыю і моўнае афармленне выказвання.

**Сціслы пераказ.** Падрыхтоўка да сціслага пераказу, як і да падрабязнага, прадугледжвае асэнсаванне зместу, структуры і моўных асаблівасцей тэксту. Таму пры першапачатковым успрыманні агульная ўстаноўка застаецца той самай: вызначыць тэму і асноўную думку, тып, стыль і жанр маўлення, адрасата і мэтанакіраванасць тэксту.

Працуючы над сціслым пераказам, школьнікі вучацца сціскаць тэкст рознымі спосабамі. Як вядома, ёсць два спосабы сціскання тэксту — выключэнне, калі другарадная інфармацыя апускаецца, і абагульненне, калі змест некалькіх сказаў (абзацаў) перадаецца абагульнена, сцісла з дапамогай аднаго-двух сказаў. Пры гэтым неабходнымі ўменнямі з'яўляюцца ўменні звязваць паміж сабой часткі пераказу (пасля выключэння другараднай інфармацыі) і падбіраць адпаведныя моўныя сродкі для перадачы абагульненай інфармацыі.

Для сціслага пераказу ў 6 класе можна выкарыстаць наступны тэкст.

## ЁСЦЬ РОЗНІЦА

*Аднойчы адзін наш сябра шпацыраваў на закаце сонца па мексіканскім пляжы. Неўзабаве ўдалечыні ён заўважыў яшчэ аднаго чалавека. Калі падышоў бліжэй, то ўбачыў, што гэта адзін з тутэйшых жыхароў, які ўвесь час нахіляўся да пяску, нешта падымаў, кідаў у ваду і зноў рабіў гэтыя нескладаныя рухі.*

*Чалавек збіраў марскія зоркі, якія апынуліся на беразе, і адна за адной кідаў назад у акіян. Наш сябра быў моцна здзіўлены. Ён падышоў да таго мужчыны і сказаў: «Добры вечар, дружа. Цікава, што ты тут робіш?» — «Я кідаю марскіх зорак назад у ваду. Цяпер вельмі нізкі адліў, і хвалі выкінулі ўсіх гэтых марскіх зорак на пляж. Калі я не закіну іх назад у мора, яны загінуць». — «Так, я разумею, — адказаў сябра, — але на гэтым пляжы ляжаць тысячы такіх марскіх зорак. Ты не зможаш гэтулькі сабраць. І хіба ты не разумееш, што такое здараецца на сотнях пляжаў на гэтым узбярэжжы? Мабыць, няма ніякай розніцы, ці робіш ты гэта, ці не?»*

*Мясцовы жыхар усміхнуўся, нахіліўся па чарговую марскую зорку. Кінуў яе ў ваду і адказаў: «Для гэтай зоркі ёсць розніца»* (Марк Хансэн). (176 слоў)

Падрыхтоўчая праца над сціслым пераказам пачынаецца з чытання і комплекснага аналізу тэксту-арыгінала. Высвятляецца, што тэкст належыць да мастацкага стылю, тып маўлення — апавяданне, у якім ёсць разважанне, яно дапамагае выказаць асноўную думку. Тэму тэксту перадае загаловак (*Ёсць розніца*), а асноўная думка выказана апошнім сказам.

З мэтай сціскання тэксту неабходна выдзеліць галоўную інфармацыю, гэта значыць адабраць тыя дзеянні, апісанні, якія перадаюць развіццё сюжэта ў апавяданні. Шляхам калектыўнага аналізу ўстанаўліваецца, што для раскрыцця тэмы аўтар выкарыстаў чатыры часткі (падтэмы).

У першай частцы гаворыцца пра тое, як аднойчы адзін наш сябра шпацыраваў на закаце сонца па мексіканскім пляжы і ўбачыў тутэйшага жыхара, які ішоў па пляжы і ўвесь час нешта кідаў у ваду. Гэтай частцы можна даць назву «На пляжы ў час адліву».

У другой частцы паведамляецца пра тое, што чалавек збіраў марскіх зорак, якія апынуліся на беразе, і кідаў назад у акіян. Гэтай частцы можна даць наступную назву: «Ратаванне марскіх зорак».

У наступнай частцы прыводзіцца дыялог нашага сябра з тутэйшым жыхаром, у які ўваходзяць восем сказаў. Сутнасць гэтай часткі перадаецца з дапамогай загалоўка «Дарэмная праца» («Няма ніякай розніцы, робіш ты гэта ці не»).

Апошняя, заключная частка, у якой перададзена асноўная думка тэксту, мае назву «Для гэтай зоркі ёсць розніца».

На наступным этапе складаецца план сціслага пераказу, побач з пунктамі плана запісваюцца словы і выразы, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку ў кожнай частцы.

Змест першай і другой частак патрабуе аб'яднання, астатнія часткі застаюцца без змен, але інфармацыя перадаецца сцісла. (Як думкі, выражаныя ў дзвюх апошніх частках тэксту, можна перадаць сцісла?)

| **Прыкладны план** | **Словы і выразы, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку** |
|---|---|
| Назад у акіян | Наш сябра шпацыраваў па пляжы; убачыў мясцовага жыхара; кідаў марскіх зорак у ваду |
| «Няма ніякай розніцы, робіш ты гэта ці не» | Наш сябра здзівіўся; на гэтым пляжы тысячы марскіх зорак; такіх пляжаў сотні; няма ніякай розніцы |
| «Для гэтай зоркі ёсць розніца» | Кінуў чарговую зорку ў акіян; ёсць розніца |

У метадычнай літаратуры неаднаразова падкрэслівалася, што пры скарачэнні мастацкага тэксту твор непазбежна збядняецца, знікаюць эмацыянальнасць, выразнасць. Каб сціслы пераказ неператварыўся ў сухое пералічэнне фактаў, пры комплексным аналізе тэксту неабходна звяртаць увагу вучняў на тое, што пры сціслым пераказе захоўваюцца стыль выказвання, яго лагічная аснова. А гэта азначае, што неабходна не проста коратка пераказаць змест, а выкласці яго сцісла ў мастацкім стылі, захаваўшы істотныя для перадачы асноўнай думкі мастацкія сродкі, тыя ключавыя словы і выразы, якія дапамагаюць аўтару рэалізаваць камунікатыўную задачу. Пры гэтым многія дэталі (апісальныя элементы, падрабязныя характарыстыкі дзеянняў герояў, падрабязныя дэталі знешнасці і інш.) аказваюцца «лішнімі» толькі «пры ўстаноўцы на сціслае ўзнаўленне выкладу. Для падрабязнага пераказу тэксту гэтыя дэталі вельмі істотныя, бо садзейнічаюць стварэнню яго выразнасці» [12, с. 7].

Пры аналізе моўных сродкаў неабходна акцэнтаваць увагу на ролі ўказальных займеннікаў у тэксце: займеннікі *гэтыя* (рухі), *таго* (мужчыны), *гэтых* (марскіх зорак), на *гэтым* (пляжы), на *гэтым* (узбярэжжы), для *гэтай* (зоркі) указваюць на прадмет, *гэтулькі* — на колькасць прадметаў. Пры гэтым указальныя займеннікі адыгрываюць важную ролю ў сінтаксічнай структуры тэксту — з'яўляюцца сродкамі сувязі сказаў. Выкарыстанне ўказальных займеннікаў у сціслым пераказе, папершае, дапамагае захаваць істотныя для перадачы асноўнай думкі мастацкія сродкі, па-другое, звязаць часткі сціслага пераказу паміж сабою. Істотным з'яўляецца і захаванне лексічнага паўтору (*розніцы — розніца*), з дапамогай якога апошні сказ, у якім выражана асноўная думка, звязваецца з папярэдняй часткай (*няма ніякай розніцы — для гэтай зоркі ёсць розніца*).

**Выбарачны пераказ** — гэта вусны ці пісьмовы пераказ зместу зыходнага тэксту, заснаваны на папярэднім адборы матэрыялу на зададзеную тэму і стварэнні на гэтай аснове новага выказвання. Мэта выбарачнага пераказу — перадаць не ўвесь тэкст, а толькі яго частку, што мае адносіны да пэўнай тэмы

(асноўнай ці пабочнай). Пры выбарачным пераказе стыль выказвання звычайна захоўваецца, а тып, кампазіцыя, асноўная думка, як правіла, змяняюцца.

У метадычнай навуцы звяртаецца ўвага на неабходнасць фарміравання ў вучняў у працэсе працы над выбарачным пераказам умення выдзяляць матэрыял, які мае адносіны да пэўнай тэмы. Адзначаецца таксама, што складанасць такога выбару залежыць ад яго месца ў тэксце: лягчэй выбіраць патрэбны матэрыял, калі ён знаходзіцца ў адным месцы, значна цяжэй гэта зрабіць, калі матэрыял «рассыпаны», калі яго патрэбна выбіраць у розных месцах тэксту [13]. Не менш істотным з'яўляецца ўменне сістэматызаваць выбраны матэрыял, падпарадкоўваючы яго асноўнай думцы, якая можа і не супадаць з асноўнай думкай тэксту-арыгінала.

Працуючы над выбарачным пераказам, вучні авалодваюць уменнем выбіраць з тэксту матэрыял на патрэбную тэму, сістэматызаваць яго ў адпаведнасці з асноўнай думкай новага выказвання, выкарыстоўваць маўленчыя сродкі тэксту-арыгінала ў адпаведнасці з новай камунікатыўнай задачай, самастойна афармляючы адабраны матэрыял у звязнае выказванне.

Для выбарачнага пераказу ў 7 класе выкарыстоўваецца тэкст «Жураўка ідзе ў атаку» [14, с. 78].

Фармулюецца задача пераказу — выбарачна пераказаць тэкст, адабраўшы неабходную інфармацыю на тэму «Нечаканы адпор», захаваўшы стыль выкладу, яго логіку і кампазіцыю, а таксама паслядоўнасць падзей, аўтарскія адносіны да іх, выкарыстаныя для вырашэння камунікатыўнай задачы моўныя сродкі.

У выніку калектыўнага комплекснага аналізу тэксту высвятляецца, што тэма тэксту — сутычка жураўля з варонамі, асноўная думка — трэба ўмець пастаяць за сябе (або «І адзін у полі воін» ці «Смеламу ды ўмеламу нічога не страшна»). Стыль тэксту — мастацкі (аўтар з дапамогай вобразных моўных сродкаў малюе карціну сутычкі жураўля з варонамі, якую назіралі рыбакі), тып маўлення — апавяданне, у ім выразна

прасочваюцца ўступ (паведамляецца пра рыбакоў, прапанову аднаго паглядзець на жураўля), пачатак дзеяння (журавель прыляцеў і пачаў ласавацца гарохам), развіццё дзеяння з кульмінацыйным момантам (наляцелі вароны, пачалі дзяўбці, шчыпаць за крылы, журавель уцякае, але нечакана дае варонам адпор), заканчэнне дзеяння (вароны разляцеліся, а журавель спакойна накіраваўся да лесу).

Абавязкова выяўляюцца аўтарскія адносіны да апісанага. Пісьменнік карыстаецца мастацкімі сродкамі мовы, каб уздзейнічаць на пачуцці чытача. Ён прама не выказвае сваіх адносін да падзей, яны праяўляюцца праз адносіны галоўнага героя, у якога ажно закалацілася сэрца. (Чаму герой так перажывае за жураўля?) Аўтарская пазіцыя, аўтарскія адносіны (спачатку суперажыванне, потым радасці ад таго, што жураўка справіўся, змог пастаяць за сябе сам) варта параўнаць з адносінамі вучняў. Высвятляецца, якія эмоцыі выклікаюць падзеі ў іх, ці адпавядаюць яны аўтарскай задуме, а калі не, то чаму.

На наступным этапе адбываецца асэнсаванне тэмы выбарачнага пераказу «Нечаканы адпор» і адбор з тэксту матэрыялу, неабходнага для раскрыцця гэтай тэмы.

Калектыўна вызначаецца, што тэкст кампазіцыйна дзеліцца на наступныя часткі: 1. Рыба не бралася (Рыбалка не заладзілася). 2. Прапанова паглядзець на жураўля. 3. На абед у гарох. 4. Вароны нападаюць. 5. Журавель кінуўся ўцякаць. 6. Пастаяў за сябе. 7. Спакойна накіраваўся да лесу.

Асэнсоўваецца тэма выбарачнага пераказу і вызначаюцца яе межы. (Які матэрыял увойдзе ў межы тэмы «Нечаканы адпор»?) Адзначаецца, што патрэбна апусціць усю інфармацыю пра людзей і іх назіранні за сутычкай (два першыя пункты, а таксама сказы, звязаныя з перажываннем героя і жаданнем дапамагчы жураўлю).

Матэрыял для выбарачнага пераказу выразна падзяляецца на тры часткі: пачатак дзеяння (журавель прылятае на поле з гарохам), развіццё дзеяння з кульмінацыйным момантам (наляцелі вароны, журавель уцякае), заканчэнне дзеяння (вароны разляцеліся, а журавель падаўся да лесу).

Складаецца схема тэксту і прыкладны план выбарачнага пераказу.

| **Прыкладны план тэксту** | **Схема пабудовы** |
|---|---|
| На абед у гарох | Пачатак дзеяння |
| Вароны нападаюць<br>Пастаяў за сябе | Развіццё дзеяння<br>Кульмінацыйны момант |
| Спакойна накіраваўся да лесу | Заканчэнне дзеяння |

Затым з тэксту адбіраецца неабходны для раскрыцця тэмы матэрыял і робяцца неабходныя выпіскі. Уменне адбіраць матэрыял на прапанаваную тэму звязана з уменнем учытвацца ў тэкст, знаходзіць там неабходны для працы матэрыял, добра ўсведамляючы межы тэмы. У прапанаваным тэксце неабходны матэрыял знаходзіцца ў адным месцы (пункты плана 3, 4, 5 і 6), але ён уключае звесткі пра адносіны галоўнага героя да падзей, якія не ўваходзяць у вызначаную тэму. (*Я ўсміхнуўся і чакаю, што будзе далей... У мяне ад крыўды ажно закалацілася сэрца. Здавалася, каб мог ператварыцца ў птаха, не раздумваючы, кінуўся б на дапамогу жураўлю. Але толькі крыкнуў услед: «Жураўка, родненькі, трымайся!» І раптам здарылася такое, што вельмі ўзрадавала.*)

Асноўную сэнсавую нагрузку ў тэксце-апавяданні выконваюць дзеясловы, якія перадаюць дзеянне ў развіцці. Дзеясловы, якія даюць характарыстыку дзеянням жураўля: *апусціўся, пакруціў* галавою, *пастаяў* і *рушыў*; *курлыкнуў, выбраў* і, *ухапіўшы* за самы верх, *схіліў, прыціснуў* і *пачаў патрашыць*; *падскочыў, узмахнуў* крыламі і *кінуўся ўцякаць*; *спыніўся і*, раптоўна *крутануўшыся, кінуўся* ў атаку, *стукнуў*, *дагнаў*, *накіраваўся*.

Дзеясловы, выкарыстаныя для апісання дзеянняў варон: *наляцелі,* хрыпла *закаркаўшы*; *спікіраваўшы, ударыла*; *не адставалі, ляцелі, дзяўблі, шчыпалі*; каменем *паляцела*; *усчалі* гвалт *і разляцеліся*.

Высвятляецца, ці здольны вучні вызначыць тую сэнсавую і выяўленчую ролю, што выконваюць дзеясловы ў словазлучэннях, сказах. Калектыўна асэнсоўваюцца выразы, адшукваюцца словы, раўназначныя па сэнсе: *набліжалася, расла і ператварылася ў птушку* — паступовае пазнаванне прадмета; *апусціўся, пакруціў галавою, пастаяў і рушыў* — намер выканаць пэўнае дзеянне і яго ажыццяўленне; *прыціснуў і пачаў патрашыць* — пачатак дзеяння; *ласавацца* — есці што-небудзь смачнае, любімае; *падскочыў, узмахнуў крыламі і кінуўся ўцякаць* — хуткае развіццё падзей; *не адставалі, ляцелі следам, дзяўблі, шчыпалі* — нарастанне дзеяння; *усчалі гвалт і разляцеліся*, а (жуке) *накіраваўся да лесу* — заканчэнне дзеяння. Асобна звяртаецца ўвага на сэнсава-граматычную і стылістычную ролю дзеепрыслоўяў у тэксце: *выбраў і, ухапіўшы за верх, схіліў долу*; *наляцелі, хрыпла закаркаўшы*; *спікіраваўшы, ударыла*; *спыніўся і, раптоўна крутануўшыся, кінуўся ў атаку*; *дагнаўшы, стукнуў* — асноўныя дзеянні перадаюцца дзеясловамі, дадатковыя — дзеепрыслоўямі, што дазваляе выдзеліць асноўныя дзеянні з шэрагу некалькіх і выявіць сэнсавыя адносіны паміж імі, надае выказванням лаканічнасць і выразнасць (дадатковыя дзеянні дапаўняюць, паясняюць асноўнае, вобразна характарызуюць яго, здымаюць аднастайнасць пры пераліку дзеянняў).

Такі аналіз дапамагае вучням асэнсаваць камунікатыўную, лагічна-сэнсавую ролю дзеясловаў і дзеяслоўных спалучэнняў у тэксце-апавяданні.

Адабраны згодна з заяўленай тэмай выбарачнага пераказу матэрыял патрабуе далейшай сістэматызацыі і афармлення ў звязнае выказванне.

Пасля прагляду адабранага матэрыялу вызначаецца, што асноўная думка выбарачнага пераказу супадае з асноўнай думкай усяго тэксту («Пастаяў за сябе» або «І адзін у полі воін»). Адпаведна захоўваецца стыль (мастацкі) і тып маўлення (апавяданне).

Пры абмеркаванні вусных варыянтаў звяртаецца ўвага на арганізацыю тэксту, размяшчэнне і ўзаемасувязь частак, на не-

абходнасць выкарыстання моўных сродкаў тэксту-арыгінала, выключэнне матэрыялу, які не ўваходзіць у межы вызначанай тэмы, а таксама на сродкі сувязі частак выбарачнага пераказу. Так, адзначаецца, як пачынаецца дзеянне: *У чыстым блакіце неба паказалася цёмная кропка, якая расла з кожнай хвілінай і праз нейкі час ператварылася ў вялікую птушку. Гэта быў шэры жураўель...* (апускаецца інфармацыя пра людзей). Тое самае робіцца і далей:

*Вароны не адставалі, ляцелі ўслед, дзяўблі, шчыпалі за крылы.*

*Ды раптам здарылася (сталася) нечаканае. Жураўель спыніўся і, раптоўна крутануўшыся, кінуўся ў атаку.*

Нагадваецца, каб вучні ўмела і ўдала выкарыстоўвалі дзеепрыслоўі і дзеепрыслоўныя звароты, што дазволіць дыферэнцаваць дзеянні, якімі насычаны тэкст, пазбегнуць аднастайнасці ў іх пераліку.

**Пераказ тэксту з дадатковым заданнем** можа ставіць перад вучнямі задачы як творчага характару (увесці ў тэкст апісанне прыроды, прадмета, знешнасці чалавека і г. д.; дапісаць тэкст па пачатку; дапоўніць некаторымі падрабязнасцямі; напісаць заключэнне і г. д.), так і лінгвістычнага (пераказаць тэкст з захаваннем пэўных моўных адзінак, са зменай часу, асобы ці ладу дзеяслова і г. д.).

Пераказ з дадатковым заданнем можна прапанаваць на матэрыяле наступнага тэксту.

## ДУХОЎНАЯ ЭНЕРГІЯ

*Нашы далёкія родзічы ведалі тое, што цяпер паспяхова даказвае навука. Духоўная энергія папярэдніх пакаленняў не знікае — яна жывіць род і ўвесь народ, дазваляе яму выстаяць у самыя цяжкія часіны. Але дабратворны ўплыў гэтай энергіі адчувае не кожны, а толькі той, хто захаваў з продкамі «канал сувязі» — памяць пра іх і іхнія дзеі.*

*У крывічоў існаваў няпісаны закон: калі юнак не ведаў сваіх продкаў да пятага калена, ён не меў права звацца мужчынам.*

*Такому чалавеку не давяралі, яго маглі наогул выгнаць з паселішча, бо лічылася, што бяспамятны лёгка робіцца здраднікам.*

*Ці шмат хто з нас, сённяшніх, распавядзе пра свой род няхай не да пятага, а хоць бы да трэцяга калена?*

*Дык мо паспрабуйма адрадзіць гэты звычай у нашых сем'ях? Кім былі нашы дзяды, прадзеды? Якая памяць засталася ад іх?* (У. Арлоў). (130 слоў)

Тэкст належыць да публіцыстычнага стылю. Пра гэта сведчыць выбар аўтарам сацыяльна значымай тэмы (паняцце роду, радаводу), а таксама ўстаноўка на эмацыянальнае ўздзеянне на чытача, зварот-заклік да яго. Змест, кампазіцыя тэксту, выбар моўных сродкаў падпарадкаваны галоўнай задачы, якая канкрэтызуецца ў асноўнай думцы: трэба ведаць свой радавод, каб не страціць духоўнай сувязі з папярэднімі пакаленнямі.

Для раскрыцця асноўнай думкі аўтар выкарыстоўвае чатыры падтэмы (часткі).

У першай частцы сфармулявана думка: нашы далёкія родзічы ведалі тое, што цяпер паспяхова даказвае навука. Духоўная энергія папярэдніх пакаленняў не знікае, яна жывіць род і ўвесь народ. Гэтай частцы даецца загаловак «Духоўная энергія папярэдніх пакаленняў».

Наступная частка пачынаецца са злучніка *але*, які мае супраціўнае значэнне: *Але дабратворны ўплыў гэтай сувязі адчувае не кожны, а толькі той, хто захаваў з продкамі «канал сувязі» — памяць пра іх і іхнія дзеі.* Частка можа мець наступную назву: «“Канал сувязі” з продкамі».

У трэцяй частцы, якая мае назву «Няпісаны закон», аўтар прыводзіць звесткі пра няпісаны закон, што існаваў у крывічоў.

У чацвёртай частцы аўтар звяртаецца да ўяўнага чытача з пытаннем «Ці шмат хто з нас, сённяшніх, распавядзе пра свой род няхай не да пятага, а хоць бы да трэцяга калена?», а потым з заклікам «Дык мо паспрабуйма адрадзіць гэты звычай у нашых сем'ях?»

Пры аналізе моўных сродкаў асаблівая ўвага звяртаецца на апошнюю частку, у якой аўтар не аддзяляе сябе ад чытача,

звяртаючыся да кожнага з пытаннем (А хто з нас, сённяшніх..?) і заклікам, выказаным у форме пажадання (Дык мо паспрабуйма адрадзіць...), форма *паспрабуйма* падкрэслівае абагульненасць, зборнасць.

У цэлым тэкст аналізуецца так, як і пры падрабязным пераказе, але ўскладняецца дадатковым заданнем: даць адказ на пытанне, зададзенае аўтарам (Ці шмат хто з нас, сённяшніх, распавядзе пра свой род няхай не да пятага, а хоць бы да трэцяга калена?).

Дадатковае заданне ўяўляе сабой дапаўненне пераказу тэксту-арыгінала, што патрабуе развітага пачуцця стылю і ўмення пранікнуць у падтэкст, знайсці апору ў тых словах, словазлучэннях, сказах тэксту, у якіх перадаецца асноўная думка.

Такая праца звязана з фарміраваннем у вучняў комплексу ўменняў: самастойна вызначаць прадмет і задачу выказвання; адбіраць для яе вырашэння неабходныя моўныя сродкі; ствараць выказванне ў адпаведнасці з канкрэтным камунікатыўным заданнем самастойна выбранага тыпу і стылю маўлення.

На наступным этапе адбываецца вусны пераказ тэксту з абмеркаваннем варыянтаў задання (элементарны адказ на пытанне; невялікае разважанне паводле праблемы, закранутай аўтарам тэксту-арыгінала; некалькі тэзісаў, якія пацвярджаюць або абвяргаюць пазіцыю аўтара; разгорнутае разважанне з аргументацыяй сваёй пазіцыі і г. д.). Пры аналізе пераказаў з дадатковым (творчым) заданнем пад увагу павінна прымацца не столькі колькасная (мала ці многа ска́заў напісаў вучань), колькі якасная ацэнка тэкстаў, створаных вучнямі: звязнасць, цэласнасць, завершанасць, наяўнасць і сфармуляванасць асноўнай думкі.

Такім чынам, кожны з пераказаў выконвае сваю ролю ў развіцці звязнага маўлення вучняў, фарміраванні ў іх камунікатыўных уменняў, мае сваю методыку правядзення і адрозніваецца характарам аналізу матэрыялу.

## Цытаваная літаратура

1. *Міцкевіч, К.* Методыка роднай мовы / К. Міцкевіч, В. Тэпін. — Мінск : Бел. дзярж. выд-ва, 1930. — 223 с. (Гл. таксама: Колас, Я. Збор твораў у 14-ці тамах / Я. Колас. — Мінск : Маст. літ., 1976. — Т. 12. — 528 с.)

2. *Замоцін, І.* Метадычныя пытанні выкладання мовы і літаратуры ў II—III канцэнтрах : матэрыялы для завочнай перапрацоўкі / І. Замоцін. — Мінск : Выд-ва Бел. акадэміі навук, 1934. — 91 с.

3. *Морозова, Н. П.* Учимся писать сочинения : кн. для учащихся 10 кл. сред. шк. / Н. П. Морозова. — М. : Просвещение, 1987. — 128 с.

4. *Капинос, В. И.* Развитие речи на основе понятий лингвистики текста. IV класс : учеб. пособие / В. И. Капинос, Н. Н. Сергеева, Ф. А. Новожилова. — Таллин : РИУУ ЭССР, 1985. — 73 с.

5. *Выготский, Л. С.* Мышление и речь / Л. С. Выготский. — 5-е изд., испр. — М. : Лабиринт, 1999. — 350 с.

6. *Протчанка, В. У.* Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2001. — 212 с.

7. *Дридзе, Т. М.* Язык и социальная психология : учеб. пособие для вузов по спец. «Журналистика» / Т. М. Дридзе ; под ред. А. А. Леонтьева. — М. : Высш. шк., 1980. — 224 с.

8. *Леонтьев, А. А.* Восприятие текста как психологический процесс / А. А. Леонтьев // Психолингвистическая и лингвистическая природа текста и особенности его восприятия. — Киев, 1979. — С. 137—145.

9. *Текучев, А. В.* Методика русского языка в средней школе / А. В. Текучев. — 3-е изд., перераб. — М. : Просвещение, 1980. — 414 с.

10. Методика развития речи на уроках русского языка : кн. для учителя / под ред. Т. А. Ладыженской. — 2-е изд., испр. и доп. — М. : Просвещение, 1991. — 240 с.

11. *Бабушис, Е. Е.* Обучение письменной речи как творческой деятельности в форме описания, повествования и аргументации (на старшем этапе в школах с углубленным изучением англ. языка) : дис. ... канд. пед. наук : 13.00.02 / Е. Е. Бабушис. — Тамбов, 2000. — 180 с.

12. *Мурина, Л. А.* Методика проведения обучающих изложений: сжатое изложение, выборочное изложение / Л. А. Мурина // Русский язык и литература. — 2003. — № 4. — С. 3—11.

13. *Морозова, И. Д.* Виды изложений и методика их проведения : пособие для учителя / И. Д. Морозова. — М. : Просвещение, 1984. — 127 с.

14. *Валочка, Г. М.* Беларуская мова : вучэб. дапам. для 7-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, С. А. Язерская. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2009. — 256 с.

# 5 КЛАС

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

### Вусны і пісьмовы падрабязны пераказ тэкстаў па плане

ПАМЯЦІ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Беларускаму паэту шмат часу давялося правесці за межамі Радзімы. Нават памёр ён у далёкай ад Беларусі Ялце. Мы шчыра ганарымся, што пэўны час наш славуты зямляк пражыў на Маладзечаншчыне.

У 1994 годзе ў вёсцы Ракуцёўшчына быў адкрыты музей паэта. Супрацоўнікі музея праводзяць цікавыя лекцыі, заняткі, сустрэчы. Экскурсаводы расказваюць, што ў Ракуцёўшчыне Багдановіч правёў летнія канікулы. Менавіта тут быў напісаны знакаміты верш «Вераніка».

Кожны год на базе музея праходзіць свята паэзіі і песні «Ракуцёўскае лета». Яно прысвечана памяці Максіма Багдановіча. У гэты дзень са сцэны ля Максімавай крынічкі гучаць песні і вершы (Паводле А. Лавора). (94 словы)

1. Чаму тэкст мае тры абзацы? Знайдзіце ў кожным абзацы сказ, які перадае асноўны змест сэнсава-граматычнай часткі. З іх дапамогай складзіце просты план тэксту. Колькі пунктаў будзе мець план? Чаму?

2. Адкажыце на наступныя пытанні:

- З чаго складаецца прыведзены тэкст? (Са сказаў, якія звязаны паміж сабой *лексічна*, *граматычна*, *сэнсава*.)
- Раскажыце, як *лексічна* звязаны сказы ў тэксце. (Напрыклад, у першым абзацы сказы звязаны з дапамогай сінонімаў, займеннікаў, паўтарэння блізкіх паводле значэння слоў і словазлучэнняў: *беларускі*

*паэт — ён — славуты зямляк;* у другім абзацы: *супрацоўнікі музея — экскурсаводы; у Ракуцёўшчыне — тут.*)

• Як *граматычна* звязаны сказы ў тэксце? (Прамы і адваротны парадак слоў у сказах: *мы ганарымся, славуты зямляк пражыў, супрацоўнікі праводзяць, экскурсаводы расказваюць; памёр ён, быў адкрыты музей, быў напісаны верш, праходзіць свята*; спакойная, апавядальная інтанацыя; пераважнае ўжыванне дзеясловаў у прошлым і цяперашнім часах.)

• Як *сэнсава* звязаны сказы ў тэксце? (Сказы ў тэксце звязаны *агульнай тэмай* (памяць пра Максіма Багдановіча), *агульнай думкай* (беларусы ганарацца славутым паэтам), тэкст мае *завершаны характар* (тэма поўна, лагічна раскрыта).)

Па дарозе ў Нясвіж растуць, абняўшыся, два дрэвы — дуб і сасна. Кажуць, што было гэта яшчэ за князем Радзівілам.

У князя была прыгожая дачка, і пакахала яна пастуха. І пастух яе таксама пакахаў. Але пажаніцца яны не маглі. Князь пра шлюб з простым селянінам і слухаць не хацеў.

І вось закаханыя вырашылі ўцячы з за́мка. Даведаўся пра гэта князь, разгневаўся, кіламетраў праз шэсць дагнаў іх са сваёй світай. Не пашкадаваў уладар ні дачкі, ні пастуха.

На тым месцы выраслі дуб і сасна, якія і цяпер растуць, навекі абняўшыся (Паводле А. Гурскага). (88 слоў)

1. Вызначце і запішыце тэму тэксту.

2. Выберыце загаловак да тэксту, растлумачце свой выбар: *Дуб і сасна*; *Па дарозе ў Нясвіж; За князем Радзівілам*; *Прыгожая дачка*; *Дрэва кахання*; *Навекі разам.*

3. Растлумачце, чаму тэкст падзелены на чатыры абзацы (сэнсава-структурныя часткі). Прачытайце тэкст па абзацах. Падбярыце загаловак да кожнага абзаца, каб ён адпавядаў зместу часткі.

4. Прачытайце і перакажыце наступную інфармацыю:

Тэкст можна падзяліць на часткі (мікратэмы, падтэмы). Кожная мікратэма звязана з агульнай тэмай і асноўнай думкай.

У тэксце звычайна кожная мікратэма выдзяляецца ў асобны абзац. Як правіла, у абзацы першы сказ заключае ў сабе асноўную інфармацыю.

5. Перачытайце тэкст і складзіце план да яго. Карыстайцеся памяткай.

### Як скласці план тэксту

1) Прачытайце тэкст, высветліце з дапамогай тлумачальнага слоўніка значэнне незразумелых слоў, выразаў.

2) Вызначце тэму, асноўную думку тэксту.

3) Падзяліце тэкст на абзацы (сэнсава-структурныя часткі), дайце назвы кожнай з іх.

4) На аснове падрыхтаванага плана вусна перакажыце тэкст. Прасачыце пры гэтым, ці ўсе істотныя моманты тэксту знайшлі адлюстраванне ў плане, ці звязаны пункты плана паміж сабой па змесце, па маўленчым афармленні, ці перадаюць пункты плана тэму і асноўную думку тэксту.

## НАЦЫЯНАЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА БЕЛАРУСІ

Нацыянальная бібліятэка заснавана ў 1922 годзе. Раней яна называлася Дзяржаўнай бібліятэкай імя Леніна. Супрацоўнікі старанна збіралі рэдкія кнігі, набывалі літаратуру. У Вялікую Айчынную вайну фашысты знішчылі або вывезлі шмат каштоўных рукапісаў і старадрукаў. Дагэтуль не ўдалося цалкам сабраць калекцыю твораў беларускага першадрукара Францыска Скарыны. Новы будынак бібліятэкі адчыніў дзверы для чытачоў у 2006 годзе. Ён размешчаны ва ўсходняй частцы сталіцы, каля станцыі метро «Усход». Перад фасадам узвышаецца скульптура Францыска Скарыны. Архітэктары М. Вінаградаў і В. Крамарэнка спраектавалі бібліятэку як шматграннік-дыямент, што сімвалізуе каштоўнасць ведаў. З аглядавай пляцоўкі будынка наведвальнікі могуць палюбавацца цудоўнай панарамай горада (Паводле Л. Рублеўскай). (97 слоў)

1. З якім значэннем ужываецца слова *Нацыянальная* (бібліятэка) у загалоўку тэксту? (*Нацыянальны.* 1) Які мае адносіны да нацыі, нацыянальнасці, звязаны з іх грамадскім жыццём. *Нацыянальнае пытанне.* 2) Які ўласцівы дадзенай нацыі, выражае яе характар. *Нацыянальны тэатр.* 3) Які належыць дадзенай краіне; дзяржаўны. *Нацыянальны гімн.*)

2. Упэўніцеся, што вы ведаеце значэнне ўжытых у тэксце слоў. (*Ру́капіс.* Помнік пісьменнасці, які адносіцца пераважна да часу ўзнікнення кнігадрукавання. *Кале́кцыя.* Сістэматызаваны набор аднародных прадметаў. *Фаса́д.* Пярэдняя частка будынка, што выходзіць на вуліцу. *Скульпту́ра.* 1) Майстэрства стварэння аб'ёмных мастацкіх твораў шляхам разьбы, высякання, лепкі або адліўкі, коўкі, чаканкі. 2) Твор такога мастацтва, а таксама сукупнасць такіх твораў. *Архітэ́ктар.* Спецыяліст па праектаванні і пабудове будынкаў, дойлід. *Дыяме́нт.* Алмаз (спецыяльна агранены, апрацаваны), брыльянт. *Панара́ма.* Від мясцовасці з вышыні.)

3. Ці з'яўляецца прыведзеная інфармацыя тэкстам? Прывядзіце для доказу *прыметы тэксту*:

а) кожны тэкст мае *тэму* — тое, пра што (пра каго) расказваецца, гаворыцца;

б) тэкст аб'ядноўваецца *асноўнай думкай*. Асноўная думка тэксту — тое, што хацеў выказаць аўтар; тое, да чаго ён заклікае, чаму вучыць;

в) да кожнага тэксту можна падабраць *загаловак*. Загаловак (назва) адпавядае тэме або перадае асноўную думку;

г) тэкст мае *пачатак*, *асноўную частку* і *заключэнне*;

д) у тэксце сказы *звязаны* паслядоўнай або паралельнай сувяззю.

4. Падзяліце тэкст на абзацы. Колькі абзацаў у вас атрымалася і чаму?

5. Дайце загаловак кожнаму абзацу. Запішыце план тэксту, на яго аснове вусна перакажыце тэкст.

6. Выпішыце словы і словазлучэнні, што пішуцца з вялікай літары. Растлумачце іх правапіс.

## КАСЦЁЛ СВЯТЫХ СЫМОНА І АЛЕНЫ

Касцёл Святых Сымона і Алены ў Мінску — помнік архітэктуры пачатку дваццатага стагоддзя. Храм быў пабудаваны ў 1905—1910 гадах паводле праекта архітэктара Т. Пайздэрскага.

Фундатарамі і ініцыятарамі будаўніцтва касцёла былі Эдвард Вайніловіч і яго жонка Алімпія. Яны ахвяравалі сродкі і ўзвялі храм у памяць пра сваіх памерлых дзяцей. Святыню пабудавалі з чырвонай цэглы, таму яна атрымала другую назву — Чырвоны касцёл.

У 1990 годзе храм вернуты католікам. Сёння там ідуць службы. Пры касцёле дзейнічаюць бібліятэка імя Адама Міцкевіча, тэатр моладзі «Анёл», тэатр аднаго акцёра «Зніч» (Паводле Л. Рублеўскай). (89 слоў)

1. Упэўніцеся, што вы ведаеце значэнне ўжытых у тэксце слоў. (*Касцёл.* Назва каталіцкага храма. *Храм.* Збудаванне, прызначанае для правядзення набажэнства (царкоўнай службы) і рэлігійных абрадаў, царква. *Фунда́тар.* Той, хто засноўвае што-небудзь ці дае фінансавыя сродкі на заснаванне. *Ахвярава́ць.* Прыносіць у дар, бязвыплатна рабіць уклады, даваць пэўныя сумы грошай. *Святы́ня.* 1) Тое, што з'яўляецца асабліва дарагім, што ахоўваецца і шануецца. 2) Прадмет або месца рэлігійнага пакланення. *Зні́чка.* Зорка, якая па́дае.)

2. Адкажыце на пытанні да тэксту:

- Калі быў пабудаваны касцёл Святых Сымона і Алены?
- Хто з'яўляецца аўтарам праекта, паводле якога ўзведзены храм?
- Хто выступаў фундатарам і ініцыятарам будаўніцтва касцёла?
- Чаму святыню называюць яшчэ Чырвоным касцёлам?
- У якім годзе храм вярнулі католікам?
- Чым жыве храм сёння?

3. Рыхтуючыся да вуснага (пісьмовага) пераказу, пазнаёмцеся з *простым планам* тэксту:

1) Касцёл Святых Сымона і Алены — помнік архітэктуры XX стагоддзя.
2) Фундатары будаўніцтва храма.
3) Жыццё храма сёння.

4. План тэксту можа быць складаным. Як вядома, адно са значэнняў слова *складаны* — той, які складаецца з некалькіх частак, разнастайны па саставе частак і сувязей паміж імі. *Складаны план* адрозніваецца ад простага тым, што яго асобныя пункты, якія выступаюць назвамі значных частак тэксту, уключаюць *падпункты* — назвы больш дробных частак. Рыхтуючы складаны план, мы вучымся абагульняць матэрыял, групаваць, аб'ядноўваць яго, сістэматызаваць. Пазнаёмцеся са складаным планам тэксту, прааналізуйце яго:

I. 1905—1910 — гады будаўніцтва касцёла Святых Сымона і Алены.

II. З гісторыі ўзвядзення храма.
1) Фундатары будаўніцтва.
2) Памяць пра дзяцей.
3) Другая назва касцёла.
III. Святыня ў нашы дні.

5. Запішыце ў сшытках наступныя словы і словазлучэнні: *праект архітэктара Т. Пайздэрскага, Эдвард Вайніловіч і яго жонка Алімпія, Чырвоны касцёл, бібліятэка імя Адама Міцкевіча, тэатр моладзі «Анёл», тэатр аднаго акцёра «Зніч».* Растлумачце іх правапіс.

## ДЗЯРЖАЎНЫ СЦЯГ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь — сімвал суверэнітэту нашай краіны. Сцяг уяўляе сабой прамавугольнае палотнішча, якое складаюць дзве каляровыя гарызантальныя паласы.

Сцяг Рэспублікі Беларусь мае тры колеры — чырвоны, зялёны і белы. Паласа чырвонага колеру — сімвал сонца, крыніцы энергіі. Паласа зялёнага колеру — знак веры ў невычэрпную сілу прыроды. Каля дрэўка размешчаны беларускі нацыянальны арнамент — чырвоныя геаметрычныя элементы на белым полі.

Белы колер гаворыць пра чысціню, мудрасць і веру. Ромбападобныя элементы — старадаўнія сімвалы ўрадлівасці, дбайна засеянага поля, пачатку і росквіту новага жыцця.

Сцяг Рэспублікі Беларусь, як і герб, сімвалізуе дзяржаўную волю народа, яго свабоду і суверэнітэт краіны (Паводле У. Ліпскага). (97 слоў)

1. Прачытайце ўважліва 1—2 разы тэкст.

2. Якая мэта гэтага тэксту? (Дакладна, вычарпальна, непрыблізна, у адпаведнасці з вызначанымі патрабаваннямі *апісаць, перадаць інфармацыю* пра сцяг Рэспублікі Беларусь як сімвал беларускай дзяржавы.)

Пра што нам расказвае беларускі сцяг? Ці згодны вы, што трэба разумець «мову беларускага сцяга», каб асэнсавана шанаваць сцяг, ганарыцца ім, сваім народам і яго гісторыяй? Чаму на вялікія святы вывешваюцца дзяржаўныя сцягі? Ці згодны вы, што сцяг дзяржавы аб'ядноўвае беларусаў, азначае наша адзінства і агульную волю?

3. Які гэта тэкст паводле будовы? (Гэты тэкст — апісанне, у якім дакладна названы, прыведзены элементы Дзяржаўнага сцяга, іх прыметы.)

4. З дапамогай слоўнікаў перакажыце наступныя сказы па-беларуску:

Красный цвет с древнейших времен служит знаком солнца. Символизирует кровные узы, братство, борьбу за правое дело.

Зеленый цвет — это цвет природы, нашей кормилицы, нашей первоматери.

Белый цвет — это цвет свободы. Это цвет нравственной чистоты и мудрости.

На Государственном флаге Республики Беларусь запечатлена часть наиболее древнего орнамента.

Белорусский флаг рассказывает историю белорусского народа.

Флаг объединяет белорусов, означает наше единство и общую волю.

Нынешние герб и флаг Республики Беларусь приняты в результате всенародного голосования 14 мая 1995 года.

5. Выпішыце словы і словазлучэнні, якія пішуцца з вялікай літары. Растлумачце іх правапіс.

6. Падрыхтуйце пісьмовы пераказ тэксту з дапамогай плана ў форме пытальных сказаў:

1) Якія істотныя звесткі адлюстроўвае Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь?
2) Што ўяўляе сабой Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь па форме?
3) Якія тры колеры мае дзяржаўны сімвал?
4) Што сімвалізуе чырвоны колер сцяга?
5) Сімвалам чаго з'яўляецца зялёны колер?
6) Пра што расказвае нам белы колер?
7) Сімвалам чаго выступае Дзяржаўны сцяг Рэспублікі Беларусь?

7. З мэтай падрабязнага і дакладнага апісання Дзяржаўнага сцяга запішыце (запомніце, паўтарыце) лексічнае значэнне наступных слоў. (*Суверэнітэ́т* (краіны). По́ўная незалежнасць дзяржавы ў знешняй і ўнутранай палітыцы. *Сі́мвал.* Прадмет або яго малюнак, а таксама графічны знак, якія перадаюць, выражаюць пэўную ідэю, з'яву.

*Крыні́ца* (энергіі). Тое, што дае пачатак чаму-небудзь. *Крыніца святла. Крыніца дабра. Арна́мент* (беларускі, нацыянальны). Жывапісны (вобразны, яркі, выразны) узор з рытмічна размешчаных геаметрычных, раслінных і жывёльных элементаў.)

8. Выберыце і растлумачце, якія назвы нашай Радзімы найбольш мэтазгодныя для перадачы зместу менавіта гэтага тэксту: *Рэспубліка Беларусь, Беларусь, дзяржава, краіна, Радзіма, родная старонка, Айчына, Бацькаўшчына, беларуская зямля.*

## ПРА БАБУ ЯГУ

Раней на Беларусі дзяцей пужалі злоснай старой з касцяной нагой. Рабілася гэта, каб дзеці не хадзілі па чужых агародах і садах, не бегалі па нівах, дзе каласуе збожжа. Казалі, што неслухаў Баба Яга таўчэ ў жалезнай ступе, грызе жалезнымі зубамі.

Аднак у чарадзейных казках Баба Яга можа быць і добрай памочніцай. Без яе казачны герой не здабудзе жывой вады, маладзільных яблыкаў, не атрымае магутнага каня. Гэтыя рэчы робяць героя непераможным. Яны дапамагаюць яму вярнуць нявесту, перамагчы ворагаў.

Казкі пра Бабу Ягу прыносяць нам задавальненне, перадаюць веды пра дабро і зло, надаюць веры ў справядлівасць (Паводле І. Клімковіч). (97 слоў)

1. Ці любіце вы чытаць чарадзейныя казкі? Якія ведаеце казкі пра Бабу Ягу? Якой вы ўяўляеце Бабу Ягу — добрай жанчынай ці злоснай вядзьмаркай? Чаму? Дзеля чаго малых палохалі Бабай Ягой?

2. Упэўніцеся, што вы ведаеце лексічнае значэнне слоў. (*Каласава́ць.* Выпускаць колас у працэсе росту (пра збожжавыя расліны). *Магу́тны.* Вельмі вялікі, значны (па сіле, велічыні). *Сту́па.* Драўляная або металічная пасудзіна, у якой таўкуць што-небудзь.)

3. Запішыце ў два слупкі словы і выразы, што «малююць» вобраз Бабы Ягі — *вядзьмаркі* і *добрай памочніцы: пачварная, чарадзейная, злосная, раскудлачаная, варожая, гаспадыня лесу, уладальніца лясной жывёлы,валадарка, ведзьма, «нос у паталок урос», «носам у печы варочае», жахлівае аблічча, памочніца героя, магічная сіла, звышнатуральная сіла, чарадзейства, чараўніцтва, злая чараўніца, лясная вядзьмарка, займацца вядзьмарствам — заклінаннямі, якімі*

*можна ўздзейнічаць на сілы прыроды, на людзей, вылечваць іх або наклікаць хваробы.*

4. Растлумачце, чаму тэкст падзелены на тры часткі (абзацы). Запішыце першыя сказы, якімі пачынаецца кожны абзац. Размяркуйце словы і словазлучэнні, што адносяцца да першай, другой і трэцяй частак тэксту: *пужалі злоснай старой, не хадзілі па чужых агародах, нівах, таўчэ ў жалезнай ступе, можа быць і добрай памочніцай, здабудзе жывую ваду, адшукае маладзільныя яблыкі, атрымае магутнага каня, робяць героя непераможным, прыносяць задавальненне, перадаюць веды пра дабро і зло.*

5. Прачытайце прапанаваны план да тэксту. Ці перадае ён, на вашу думку, змест, логіку, паслядоўнасць тэксту?

1) Запалохванне дзяцей Бабай Ягой.
2) Неадназначнасць вобраза Бабы Ягі ў беларускіх казках.
3) Прызначэнне чарадзейных казак.

6. Перабудуйце і запішыце план, які будзе складацца з пытальных сказаў. На аснове аднаго з планаў вусна перакажыце тэкст. Які план вы выбралі і чаму?

7. Прачытайце прапанаваны *цытатны план*, які складаецца з даслоўных вытрымак, выказванняў з тэксту. У чым вы бачыце яго перавагі?

1) «Раней пужалі злоснай старой».
2) «Баба Яга можа быць і добрай памочніцай».
3) «Казкі перадаюць веды пра дабро і зло».

8. Якая назва, акрамя прапанаванай, дакладна перадае змест тэксту? Абгрунтуйце свой выбар: «Казкі пра Бабу Ягу», «Чарадзейныя казкі», «Добрая памочніца і вядзьмарка», «Асалода ад казак», «Казкі майго маленства», «Казкі пра дабро і зло». Прапануйце свой варыянт загалоўка да тэксту, абгрунтуйце яго.

9. Выберыце да выдзеленых слоў сінонімы, якія можна выкарыстаць пры пераказе тэксту:

*Баба* (Яга) — бабуля, бабка, жанчына;
*злосная* (старая) — злая, нядобразычлівая, зламысная, варожая;
*ніва* — поле, ворыва;
*грызці* — кусаць, скубсці;
*чараўніцтва* — чарадзейства, вядзьмарства, чары;
*казка* — выдумка, прыдумка, быліна;
*магутны* — моцны, дужы, вялікі, тоўсты;
*непераможны* — гераічны, мужны, адважны, смелы.

10. Падрыхтуйце *падрабязны* пераказ тэксту, які поўна, з усімі дэталямі перадае змест, захоўвае яго стылістычныя, лексічныя асаблівасці, змяшчае большасць слоў, словазлучэнняў, выкарыстаных аўтарам.

## Падрабязны пераказ тэкстаў з простай мовай (з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў)

### ЗАЕЧАЕ САЛА

*Украінская народная казка*

Сабраўся пан у дарогу. Узяў з сабой фурмана. Едуць яны, а на дарозе — ні хаты, ні чалавека. Сумна стала пану. Тут заяц прабег. Пан і завёў размову: «Бачыш, Грыцко, зайца? Ці добры ён?» — «Добры, канечне!» — гаворыць фурман. Пан пярэчыць: «Ці гэта заяц? Вось у мяне зайцы! Я іх з-за мяжы завёз. Усе вялікія, як бараны. А колькі я з іх сала атрымаў! З кожнага паўпуда».

Грыцко слухаў-слухаў ды крыкнуў коням: «Гэй, мілыя, хутчэй на мост, што пад брахунамі ламаецца!» Спалохаўся пан: «Грыцко, той заяц не тлусты быў. Так сабе, заяц як заяц».

Так Грыцко адвучыў пана хлусіць (Паводле М. Прохар). (102 словы)

1. Прачытайце тэкст па ролях (словы аўтара, пана, Грыцко).

Чаму казка называецца «Заечае сала», а не «Пан і фурман». Як вы думаеце, каму сімпатызуе аўтар гэтай казкі, чаму?

2. Пазнаёмцеся са значэннем наступных слоў: *Фурма́н (фурмана́).* Чалавек, які кіруе коньмі ў запрэжанай павозцы. *Пуд.* Мера вагі, роўная 16,38 кілаграма. *Браху́н.* Ілгун, манюка. *Хлусі́ць.* Гаварыць няпраўду.

Выберыце значэнне, з якім ужыта слова *мяжа* ў выразе *з-за мяжы завезці*: 1) вузкая палоска неўзаранай зямлі паміж палеткамі, участкамі, уладаннямі; 2) пагранічная лінія паміж сумежнымі дзяржавамі; граніца; 3) *перан.* парадак паводзін, форм абыходжання, рубеж чаго-небудзь дазволенага.

3. Прачытайце цытатны план да тэксту казкі. Ці перадае план змест казкі, логіку развіцця падзей?

1) «Сабраўся пан у дарогу».

2) «Зайцы... вялікія, як бараны».

3) «Так сабе, заяц як заяц».

4) «Спалохаўся пан».

4. Выпішыце ў розныя слупкі словы, якія можна выкарыстаць, характарызуючы *пана* і *фурмана*: *вясёлы, жыццярадасны, хвалько, выхваляцца, пахваляцца, разважлівы, няспешны, нетаропкі, негаваркі, кемлівы, разумны, мудры, кемны, ганарысты, фанабэрысты, самаўпэўнены, палахлівы, нешматслоўны, важнічаць, фанабэрыцца.*

Якія рысы характару высмейваюцца ў казцы?

Знайдзіце падабенства і адрозненне ў афармленні наступных сказаў. Сказ з простай мовай запішыце:

а) Грыцко ўсміхнуўся і адказаў: «А мост, пане, як тое заечае сала, растапіўся і знік».

б) Грыцко адказаў пану, што мост, як заечае сала, растапіўся і знік.

Знайдзіце ў тэксце казкі сказы са звароткамі. Растлумачце знакі прыпынку ў іх.

Знайдзіце ў тэксце сказы з параўнаннямі. Як параўнанні дапамагаюць аўтару захаваць «дух», характар народнай казкі?

Выпішыце з тэксту словы, якія вы раней не ведалі або хацелі б ужыць пры пераказе.

Выпішыце з тэксту казкі *апорныя* (ключавыя, асноўныя, найбольш значныя, сэнсава важныя) *словы* і *словазлучэнні*, якія суадносяцца з кожным пунктам плана.

5. Прачытайце памятку. З яе дапамогай падрыхтуйцеся да падрабязнага пераказу тэксту казкі. Афармляйце ў пісьмовым пераказе рэплікі пана і фурмана як сказы з простай мовай.

### Як падрыхтавацца да падрабязнага пераказу тэксту

1) Уважліва прачытайце тэкст. Высветліце значэнне незразумелых слоў і выразаў.

2) Адкажыце на пытанні да тэксту, звязаныя з разуменнем яго зместу.

3) Сфармулюйце тэму і асноўную думку тэксту. Пры пераказе старайцеся, каб змест быў падпарадкаваны тэме і асноўнай думцы.

4) Вызначце, да якога тыпу маўлення адносіцца тэкст, каб пераказ адпавядаў схеме тэксту.

5) Падзяліце тэкст на структурна-зместавыя часткі, складзіце план.

6) Вызначце стыль тэксту. Выпішыце або пастарайцеся запомніць моўныя асаблівасці тэксту (апорныя словы і словазлучэнні) і па магчымасці выкарыстайце іх пры пераказе.

7) Прачытайце тэкст паўторна. Напішыце чарнавы варыянт пераказу тэксту. Праверце яго і запішыце пераказ.

## РЭКІ ЯК ЛЮДЗІ

«Наша рэчка ў вёсцы памерла», — не раз казаў бацька. «Як гэта — памерла?» — перапытваў сын.

Бацька расказвае: «Рэчка не сама памерла. Яе забілі людзі. Спачатку на яе берагі прыйшлі трактары, сталі карчаваць дрэвы і кусты. Потым экскаватар пачаў рыць канавы, каб асушыць балота. Не стала ў рэчцы ні рыбы, ні гарлачыкаў. Рачулка ператварылася ў канаву. Яна змялела і зарасла травой».

«Я папрашу ў рэчкі прабачэння», — з сумам прамовіў сын. «Добра», — пагадзіўся бацька (Паводле А. Кавалеўскага). (74 словы)

1. Растлумачце значэнне наступных выразаў: *рэкі як людзі, рэчка памерла, рэчку забілі.*

2. Выпішыце апорныя словы і словазлучэнні, якія дапамогуць пераказаць тэкст:

Рака — рэчка — рачулка — канава.

(Трактары) прыйшлі, сталі карчаваць, рыць (канавы), асушаць (балота).

(Рэчка) стала мялець, зарастаць травой, ператварылася ў канаву, памерла, (яе) забілі, папрасіць прабачэння (у рэчкі).

3. Выберыце з прапанаваных загаловак да тэксту. Растлумачце свой выбар.

*Беражыце прыроду. Не забівайце рэчку. Віна перад рэчкай. Невясёлае апавяданне. Як забівалі рэчку. Ці прабáчыць рэчка людзям?*

4. Знайдзіце сказы з простай мовай. Пры іх чытанні выкарыстоўвайце адпаведную інтанацыю. Якія словы дапамагаюць зразумець, каму належыць простая мова? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

5. Апошнія сказы аформіце па-рознаму. Адзін — як сказ з простай мовай пасля слоў аўтара, другі — як сказ з простай мовай перад словамі аўтара. Растлумачце розніцу ў пунктуацыйным афармленні сказаў.

## МЫ — БЕЛАРУСЫ

Адшукаць нашу малую радзіму лёгка. Трэба толькі выйсці на вуліцу. Усё навокал — гэта твая радзіма. Гэта невялікае месца на планеце Зямля, да якога мы прывязаны каранямі.

У класе вісіць карта Беларусі. У гэтай краіне жыве слаўны народ — беларусы. Твая малая радзіма — часцінка Беларусі. «Я — беларус?» — спытаешся ты. Настаўніца адкажа: «Так, беларус. Беларусь — твая краіна. Тут нарадзіліся твае мама і тата, твае дзядулі і бабулі. Гэта яны будавалі дамы і палацы, вырошчвалі хлеб, абаранялі зямлю ад ворагаў».

У Беларусі жыве шмат іншых народаў. Галоўнае, каб усім было тут утульна, гасцінна. Галоўнае — любіць зямлю. Яна нам як маці (Паводле А. Бензерука). (98 слоў)

1. Сфармулюйце і запішыце асноўную думку тэксту.

2. Знайдзіце і выпішыце складаныя сказы, ужытыя ў тэксце. Растлумачце знакі прыпынку ў іх.

3. Знайдзіце сказы з аднароднымі членамі. Растлумачце знакі прыпынку ў іх.

4. З дапамогай цытатнага плана і апорных слоў падрыхтуйце падрабязны пераказ тэксту:

1) «Усё навокал — гэта твая радзіма». (Адшукаць, прывязаны каранямі.)

2) «Я — беларус?» — спытаешся ты. (Слаўны народ, малая радзіма, часцінка Беларусі.)

3) «Беларусь — твая краіна». (Твае мама і тата, твае дзядулі і бабулі, будавалі, вырошчвалі, абаранялі.)

4) «Галоўнае — любіць зямлю». (Шмат іншых народаў, утульна, гасцінна, стала нам як маці.)

## СУЧАСНАЯ КАЗКА ПРА БЯССТРАШНАЕ КАЦЯНЯ

На каўбасным заводзе працавалі добрыя эльфы. Выраблялі яны самую смачную каўбасу. Панадзіўся працiўны пацук выкалупваць з каўбасы мяса ды смачныя прыправы. Шмат чаго рабілі эльфы, каб пазбавіцца ад крадуна! Аднак усё было дарэмным. Нахабны шкоднік выядаў з каўбасы прысмакі. Эльфы толькі горка плакалі.

Аднойчы да іх прыбілася маленькае кацяня. «Не плачце, эльфы! Я пазбаўлю вас ад пачвары», — паабяцаў каток.

Прыйшло кацяня да пацука і адважна выгукнула: «Выходзь, пацук, будзем з табой біцца!». Зубастая істота зарагатала так моцна, што лопнула са смеху.

З таго часу коцік быў любімым госцем у эльфаў (Паводле Е. Ахроменкі). (95 слоў)

1. Прасачыце, якія словы выкарыстоўвае аўтар для характарыстыкі кацяняці і пацука.

*Кацяня* — бясстрашнае, маленькае, каток, коцік, любімы госць, адважна выгукнула.

*Пацук* — працiўны, вялізны, злосны, крадун, нахабны шкоднік, агідная пачвара, зубастая істота.

2. Зачытайце клічныя сказы. Якая іх роля ў тэксце? Якія пачуцці перадаюцца з іх дапамогай?

3. Выпішыце сказы са звароткамі. Растлумачце знакі прыпынку ў іх.

4. Знайдзіце складаныя сказы ў тэксце. Растлумачце знакі прыпынку ў іх.

## Падрабязны пераказ мастацкага тэксту

### ГЕША

Пакалечылася Геша яшчэ малой.

Аднойчы Гешына маці павяла дзяцей на луг. Гусяняты скублі траўку, маці грэлася ў пяску. Раптам, нібы камень з неба, упаў на малых коршак. Маці ад страху страціла голас. Калі апамяталася, коршак з гусянём узляцеў высока. Аднак гусяня было цяжкое. Малое вырвалася з кіпцюроў і ўпала ў бульбоўнік. Там яго і знайшлі.

Імя гусяняці далі дзеці. Як гуску дасталі з кошыка, усе абступілі яе, пачалі частаваць. Гуска толькі дзякавала: «Ге! Ге!». Так з'явілася ў Гешы імя.

Гаспадыня часта казала гусцы:

— Ах ты, мая разумніца, ах ты, мая залатая!

Геша радавалася:

— Ге! Ге! І ты залатая! (Паводле А. Васілевіч). (99 слоў)

1. Да якога стылю належыць тэкст? Як вы гэта вызначылі?

2. Прачытайце тэкст. Чыё меркаванне, на вашу думку, найбольш правільнае? Чаму? Паразважайце.

– Пры пераказе зыходны тэкст павінен перадавацца амаль даслоўна, слова ў слова, — кажа Васіль.

Марына пярэчыць:

– Пры пераказе тэкст трэба перадаваць выключна сваімі словамі.

– А вось і няпраўда, — падключаецца да размовы Ганна. — Пераказ не павінен пераўтварацца ў пісьмо па памяці. Аднак трэба захоўваць змест зыходнага тэксту, захоўваць словы, выразы, якія перадаюць асаблівасці мовы пісьменніка.

3. Дакажыце, што гэты тэкст *апавядальны*, што ў ім *пералічваюцца* падзеі, дзеянні, якія адбываюцца *паслядоўна*.

4. Ці можна ўявіць схему гэтага тэксту як ступенькі лесвіцы, па якой мы паступова падымаемся да мэты? Колькі ступенек нама-

люем у гэтай лесвіцы? Прыдумайце сваю назву для кожнай ступенькі.

| | |
|---|---|
| | 2. Як далі імя Гешы? («Імя ёй далі дзеці з нашага двара».) |
| 1. Як пакалечылася гусяня? («Пакалечылася Геша яшчэ малой».) | |

Якія прыпынкі можна зрабіць на кожнай ступеньцы?

5. Упэўніцеся, што вы правільна разумееце значэнне выкарыстаных пісьменніцай слоў. (*Пакале́чыцца.* Знявечыцца, фізічна пашкодзіцца. *Ко́ршак.* Драпежная птушка з кароткай кручкаватай дзюбай і доўгімі вострымі кіпцюрамі. *Апа́мятацца.* Апрытомнець, прыйсці да памяці.)

Запішыце словазлучэнні з тэксту з гэтымі словамі.

6. Перакажыце апавяданне з дапамогай наступных дзеясловаў. Падбярыце да іх сінонімы.

*Павяла* (сваіх дзяцей); *скублі* (траўку); *грэлася* (у пяску); *упаў* (коршак); (ад страху) *страціла* (голас); *узляцеў* (высока); *вырвалася* (з кіпцюроў); *упала* (у бульбоўнік); *знайшлі* і *адратавалі*; *дасталі* (з кошыка); *абступілі*; (пачалі) *частаваць*; (толькі) *дзякавала*.

7. Перапішыце дыялог гаспадыні і гускі, выбіраючы патрэбныя сінонімы да ўжытых у тэксце слоў.

*Казаць* — гаварыць, гаманіць, гутарыць, размаўляць, весці размову.

*Разумніца* — разумная, мудрая.

*Залаты* — добры, дасканалы, слаўны, выдатны, бездакорны, цудоўны, ідэальны, пашукаць трэба.

*Радавацца* — весяліцца, цешыцца.

Ці ўсе сінонімы ўзаемазамяняльныя ў дыялогу? Які варыянт дыялогу лепшы — аўтарскі ці ваш? Чаму?

## СВЯТА НАСТАЎНІЦЫ

Перад выхадам у школу Юля спахапілася, што заўтра Дзень настаўніка. Позна было шукаць кветкі. І бабуля зрэзала астры, якія дацвіталі ў вазонах на балконе. Букет атрымаўся небагаты, сіратлівы. Гэта адчувала і дзяўчынка.

Вінавата падышла яна да настаўніцкага стала, паклала кветкі. Села за парту, ніяк не магла супакоіцца. Вельмі яна любіла сваю настаўніцу. Хацелася зрабіць ёй нешта асабліва прыемнае.

Юля адкрыла партфелік. Там ляжала адна-адзіная цукерка «Залаты пеўнік». Дзяўчынка ўзрадавалася шчаслівай нечаканасці. Яна дастала цукерку і паклала побач з астрамі.

Настаўніца ўвайшла ў клас. Амаль не зірнула на стол, але так радасна ўсміхнулася. Мабыць, убачыла шчыры падарунак (Паводле В. Віткі). (98 слоў)

1. Сфармулюйце тэму і асноўную думку тэксту. Які загаловак можна падабраць да тэксту?

2. Вызначце стыль тэксту. Якія словы, выразы адпавядаюць гэтаму стылю? Пра што расказваюць вам наступныя эпітэты: *небагаты, сіратлівы* (букет), *шчаслівая* (нечаканасць), *шчыры* (падарунак)?

3. Вызначце тып маўлення.

4. Напішыце чарнавы варыянт пераказу.

5. Прааналізуйце чарнавік, адказаўшы на пытанні:

- Ці ўдалы план пераказу?
- Ці адпавядаюць пункты плана структурна-кампазіцыйнай схеме апавядання?
- Наколькі поўна раскрыта тэма пераказу?
- У якой ступені ўдалося перадаць асноўную думку тэксту?
- Якія моўныя недакладнасці, арфаграфічныя і пунктуацыйныя памылкі вы заўважылі ў чарнавым варыянце пераказу?

## ВЕРНІСАЖ ДЛЯ МАМЫ

Мы з сястрой спрачаліся. Вырашалі, які падарунак зрабіць маме. Сястра сказала:

— Я вышыю маме сурвэтку.

— Ты ў мінулым годзе ёй вышывала.

— Я ў мінулым годзе вышывала зайчыка.

— А ў дзіцячым садку ты падарыла ёй таксама зайчыка.

— Не, тады я вышывала маме вішанькі. Калі не верыш — паглядзі. Усе нашы падарункі ляжаць у маміным стале.

Сястра разлажыла папку з вернісажам для мамы.

Там былі малюнкі і пісьмо маме, калі яна ляжала ў бальніцы. Літары друкаваныя, няроўныя, нязграбныя: «Мамачка, мы без цябе сумуем».

Незразумела, чаму мама не парвала гэтыя каракулі і не выкінула іх (Паводле А. Васілевіч). (99 слоў)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Адкажыце на пытанне, сфармуляванае ў апошнім сказе тэксту.

2. Чаму тэкст мае такі загаловак? Ці можна гэты тэкст назваць *«Спрэчка перад святам»*, *«Маміна багацце»*? Прапануйце свой загаловак да тэксту.

3. Упэўніцеся, што вы ведаеце лексічнае значэнне слоў. *Вернiса́ж.* Прагляд мастацкай выстаўкі; дзень яе адкрыцця. *Нязгра́бны.* Несуразмерны, непрапарцыянальны, нясkладны, нястройны. *Сурвэ́тка.* Невялікі кавалак тканіны або паперы, якім карыстаюцца ў час яды, у цырульні і г. д.

4. Выпішыце апорныя сказы з кожнай сэнсава-структурнай часткі тэксту, якія выкарыстаеце пры пераказе.

5. Выпішыце сказ з простай мовай, растлумачце знакі прыпынку ў ім.

6. Складзіце план тэксту ў форме пытальных сказаў.

## БУСЕЛ І ЖЭНЬКА

Буслоў мы ўбачылі ранкам. Яны ўзляталі да шэрых воблакаў. У паднябессі буслы гуртаваліся ў чародкі.

Непадалёку мы заўважылі адзінокага бусла. Ён узмахваў крылом, спрабуючы ўзляцець. Другое крыло бяссільна вісела.

Упэўніўшыся, што ўзляцець не ўдасца, птушка знерухомела. У яе клёкаце чулася роспач. Здавалася, што яна плача.

– Трэба яго злавіць, — сказаў Жэнька, — бо іначай замерзне.

Не чакаючы майго адказу, Жэнька падаўся на поплаў. Раптам я ўбачыў, як Жэнька паслізнуўся і ўпаў. Бусел, які да гэтага

стаяў нерухома, хутка пайшоў насустрач. Здавалася, што ён спяшаецца на дапамогу чалавеку.

Назад чалавек і бусел ішлі разам (Паводле У. Аляхновіча). (95 слоў)

1. Вызначце асноўную думку тэксту.

2. У аснове апавядання — няшчасце з буслам, але апавяданне не выклікае суму, трывогі. Чаму?

3. Растлумачце ўжыванне сінонімаў у тэксце: буслоў мы *ўбачылі, заўважылі* адзінокага бусла; чалавек і бусел *ішлі* разам, Жэнька *падаўся* на поплаў.

4. Якім часткам у будове тэксту адпавядаюць наступныя сказы?

- Буслоў мы ўбачылі ранкам.
- Непадалёку мы заўважылі адзінокага бусла.
- Раптам я ўбачыў, як Жэнька паслізнуўся і ўпаў.
- Назад чалавек і бусел ішлі разам.

5. Складзіце план і перакажыце з яго дапамогай тэкст.

## Падрабязны пераказ апавядальнага тэксту

### ДЗІЦЯЧЫЯ ГАДЫ ФРАНЦІШКА СКАРЫНЫ

Францішак Скарына нарадзіўся пяцьсот гадоў таму ў старажытным Полацку. Полацк быў буйным і багатым горадам. Там было шмат майстроў і купцоў. Бацька Францішка таксама быў купцом. Яго звалі Лука.

Дом Лукі Скарыны стаяў недалёка ад Сафійскага сабора. Побач рэчка Палата злівалася з Дзвіною.

У горадзе было шмат манастыроў і цэркваў, пры якіх існавалі школы. Там Францішак навучыўся чытаць і пісаць. У школе Францішак даведаўся пра слаўнае мінулае сваёй Радзімы. Настаўнікі былі вельмі задаволены здольным вучнем.

Францішак разумеў, што магутнасць роднай зямлі залежыць ад асветы жыхароў. Чым больш будзе людзей адукава-

ных, тым мацнейшай і багацейшай стане дзяржава (Паводле У. Арлова). (93 слова)

1. У якім горадзе нарадзіўся Францішак Скарына? Якім тады быў горад Полацк? Як звалі бацьку Францішка? Кім ён быў? Дзе стаяў дом, у якім прайшло дзяцінства хлопчыка? Дзе навучыўся Францішак чытаць і пісаць? У чым бачыў Францішак магутнасць сваёй радзімы?

2. Прааналізуйце план тэксту. Якія пункты плана вам хочацца сфармуляваць па-іншаму?

1) У старажытным Полацку.
2) Дом Лукі Скарыны.
3) Здольны вучань.
4) Адукаваныя людзі — моц дзяржавы.

3. Якім пунктам плана адпавядаюць апорныя сказы з тэксту?

- Францішак Скарына нарадзіўся ў старажытным Полацку.
- Дом Лукі Скарыны стаяў недалёка ад Сафійскага сабора.
- У школе Францішак даведаўся пра слаўнае мінулае сваёй Радзімы.
- Магутнасць роднай зямлі залежыць ад асветы ў дзяржаве.

4. Выпішыце *апорныя* словы і словазлучэнні з кожнай часткі тэксту. Напрыклад:

а) пяцьсот гадоў таму, старажытны Полацк, буйны і багаты горад, купец Лука Скарына;
б) Сафійскі сабор;
в) манастыры, цэрквы, мінулае Беларусі, здольны вучань;
г) магутнасць зямлі, асвета жыхароў, багатая дзяржава.

5. З дапамогай апорных слоў і словазлучэнняў перакажыце кожную частку тэксту.

## ГАНАРЛІВАЯ ЕЛАЧКА

Расла ў лесе елачка. Стаяла асобна, бо занадта ганарлівая была. Дрэвы зайздросцілі ёй. Асабліва восенню ды зімой, калі ападала лістота.

Аднойчы пад Новы год чалавек завітаў у лес з сякерай. На месцы елачкі застаўся толькі пянёк, які зацерушыў снег. Сама

елачка перасялілася ў гарадскую кватэру, дзе стаяла прыгожая, з рознакаляровымі шарамі.

Доўжылася свята толькі два тыдні. Затым з елачкі знялі ўпрыгожванні, вынеслі з кватэры. Ніхто не ведае, як склаўся яе лёс далей.

А дрэўцы ў лесе растуць як раслі. З вясны да восені шумяць лістотай. Часам згадваюць сваю ганарлівую сяброўку. Праўда, ужо без зайздрасці (Паводле А. Зэкава). (96 слоў)

1. Чаму гэты тэкст аўтар назваў менавіта так? Знайдзіце ў тэксце словы, якія дапамагаюць зразумець, што аўтар усё ж спачувае елачцы, нягледзячы на яе ганарлівы характар. (Елачка, згадваюць сяброўку, застаўся толькі пянёк.)

2. Чаму гэты тэкст *апавядальны*? (Ён расказвае, паведамляе, *апавядае* пра выпадак з жыцця лясной ганарлівкі.)

3. Прачытайце план да тэксту.

1) Жыццё елачкі ў лесе.
2) Чалавек з сякерай завітаў у лес.
3) Нядоўгае свята.
4) Лёс елачкі.
5) Згадкі пра ганарлівую сяброўку.
6) Шчасце не ў прыгажосці.

Які пункт плана адпавядае *ўступу* — той частцы тэксту, у якой аўтар тлумачыць, дзе, з кім, калі адбываюцца падзеі, апісаныя ў апавяданні?

Які пункт плана суадносіцца з *завязкай* у апавяданні — тым момантам, з якога пачынаецца развіццё падзей?

Якая назва з плана адпавядае той частцы тэксту, што перадае *развіццё дзеяння* ў апавяданні?

Які пункт плана раскрывае *кульмінацыю* — момант найвышэйшага напружання ў развіцці падзей?

Які пункт плана суадносіцца з часткай тэксту, што перадае *развязку* — вынік развіцця падзей, заключны момант у апавяданні?

Які пункт плана адпавядае *заключэнню*, што ўтрымлівае вывад аўтара з нагоды апісаных падзей?

4. Паразважайце, з якой мэтай аўтар ужывае словы з памяншальна-ласкальным значэннем.

5. Перакажыце змест тэксту з дапамогай наступнай схемы, якая перадае *кампазіцыю* (будову, структуру тэксту, суадносіны, размеркаванне асобных частак).




## ВОЖЫК І РУЧАЁК

Знайшоў вожык пень, зрабіў у ім гняздо і заснуў.

Доўга спаў вожык. Аднойчы пачуў, што нехта трывожыць яго. Высунуўся з гнязда, а там ручаёк весела гамоніць. «Прачнуўся сам і іншых будзіш», — папракнуў звярок. І зноў заснуў.

Раніцаю вочкі расплюшчыў і зморшчыўся. Вылез з гнязда, а ручаёк да самага пня падступіўся.

— Ну, пачакай, назола! — зазлаваўся вожык. — Я цябе зямлёю засыплю!

Падбег да ручайка. Той падхапіў вожыка і панёс. Плыве звярок, а навокал вясна. Пралескі яснымі вочкамі ўсміхаюцца. У сінім небе жаваранкі спяваюць.

Выбраўся вожык на беражок і сказаў:

— Дзякуй, ручаёк! Каб не ты, я вясну праспаў бы (Паводле Я. Галубовіча). (101 слова)

1. Выпішыце сказ, які перадае асноўную думку тэксту. Пракаменціруйце знакі прыпынку ў ім.

2. Чаму апавяданне называецца «Вожык і ручаёк», а не, напрыклад, «Вожык», «Ручаёк»? Прапануйце свой загаловак да тэксту.

3. Упэўніцеся, што вы ведаеце значэнне слоў, ужытых у тэксце. Падбярыце сінонімы да іх. *Гамані́ць.* 1) Весці гаворку, размаўляць з кім-небудзь. Гаварыць, расказваць. 2) Поўніцца, запаўняць шумам,

гоманам, галасамі. *Назо́ла.* Разм. Той, хто вельмі дакучае, прыстае, турбуе каго-небудзь.

4. Як аўтару тэксту ўдаецца надзяліць персанажаў казкі чалавечымі рысамі? З дапамогай якой часціны мовы аўтар адухаўляе герояў апавядання? Дакажыце, што аўтар сімпатызуе героям апавядання.

5. У тэксце ўжываюцца словы *папракнуў, зморшчыўся, зазлаваў*, якія перадаюць негатыўныя, адмоўныя адчуванні вожыка. Аднак у канцы апавядання вожык дзякуе ручайку. Чаму? Дзеясловы якога часу ўжыты ў тэксце? Чаму?

6. Выберыце прыметнікі, якія вы выкарыстаеце пры пераказе ў апісанні характару вожыка і ручайка: *марудны, гаманкі, хуткі, гаманлівы, энергічны, дзейны, актыўны, санлівы, настойлівы, сонны, вялы, бяздзейны, пасіўны, удзячны.*

7. Запішыце адзін сказ з аднароднымі членамі. Пабудуйце яго схему.

8. Складзіце план. Суаднясіце яго пункты з кампазіцыйнай схемай апавядальнага тэксту.

## ЖАВАРАНАК

Каршун лунаў над полем. Каго ён высочвае? Я прыкмеціў, як ад зямлі ўзнімаецца жаўрук. Срэбны званочак падымаў сваю песню ўсё вышэй.

Каршун застыў на месцы. Я насцярожыўся. Няўжо жаваранак не бачыць, што ён ляціць у кіпцюры ворагу?

Драпежнік кінуўся ўніз. Каршун, як маланка, рассякаў паветра. Толькі цяпер я пабачыў, як кідаецца шэры камячок. Я аж уздрыгнуў, калі ён, як куля, хуценька шмыгнуў мне пад плашч. Я міжволі замахнуўся на драпежніка пугай. Ах, як каршун неахвотна ўздымаўся ўгару!

Як толькі я зварухнуўся, шэрая птушачка выпырхнула з-пад майго сховішча. Я стаяў радасны ад птушынага даверу (Паводле І. Грамовіча). (94 словы)

1. Выпішыце сказ, які перадае асноўную думку тэксту. Прапануйце загаловак, які б адлюстроўваў яе.

2. Як вы лічыце, якую асноўную задачу ставіў перад сабой пісьменнік: паведаміць пра выпадак, пра смеласць жаваранка або перадаць чытачу пачуцці, выкліканыя птушыным даверам?

3. Ад якой асобы вядзецца апавяданне? Што гэта дае пісьменніку для абмалёўкі ўбачанай сітуацыі?

4. Чаму пісьменнік выкарыстоўвае розныя назвы жаваранка ў апавяданні: *жаваранак*, *жаўрук*, *срэбны званочак*, *шэры камячок*, *шэрая птушка*? Як праз ланцужок назваў аўтар выяўляе свае адносіны да каршуна: *каршун*, *вораг*, *драпежнік*? Як вы разумееце выраз *птушыны давер*? Чаму гэты давер такі дарагі для аўтара?

5. Якія словы і выразы выкарыстоўвае пісьменнік для апісання паслядоўнасці дзеянняў жаўрука і каршуна? Чаму большасць выкарыстаных у тэксце дзеясловаў ужыта ў прошлым часе? Якія параўнанні выкарыстоўвае пісьменнік для характарыстыкі дзеянняў жаўрука і каршуна? Як параўнанні дапамагаюць перадаць імгненнасць, раптоўнасць, энергічнасць падзей, апісаных у тэксце?

6. Як звязаны сказы і часткі тэксту?

7. Складзіце цытатны план апавядальнага тэксту.

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

## ДЗЯРЖАЎНЫ ГЕРБ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь з'яўляецца сімвалам суверэнітэту краіны.

Герб уяўляе сабой зялёны контур рэспублікі ў залатых промнях сонца, што ўзыходзіць над зямным шарам. Зверху размешчана пяцівугольная чырвоная зорка — знак бяспекі, сям'і і высокіх імкненняў.

Герб знаходзіцца ў вянку залатых хлебных каласоў. Яны пераплятаюць ружовыя кветкі канюшыны і блакітныя кветкі лёну. Гэта сімвал працы і творчай сувязі з прыродай. Каласы спавіты чырвона-зялёнай стужкай. Унізе залатым колерам зроблены надпіс — Рэспубліка Беларусь.

Герб Рэспублікі Беларусь, як і сцяг, сімвалізуе дзяржаўную волю народа, яго свабоду і незалежнасць краіны (Паводле У. Ліпскага). (88 слоў)

## З ГІСТОРЫІ «БЯРОЗКІ»

«Бярозка» — літаратурна-мастацкі часопіс для дзяцей. Гэта выданне прызначана для тых, хто хоча ведаць гісторыю і сучаснасць роднай зямлі.

Першы нумар пасляваеннай «Бярозкі» выйшаў у 1945 годзе. Асноўная тэма першых нумароў часопіса — услаўленне Вялікай Перамогі. Друкаваліся творы пра герояў вайны, іх подзвігі. Матэрыялы былі прысвечаны аднаўленню Беларусі, будаўніцтву дамоў, заводаў і фабрык.

Аўтарамі тагачаснай «Бярозкі» былі Янка Купала, Якуб Колас, Янка Маўр. Друкаваліся ўспаміны пра Максіма Багдановіча, Цётку. Выходзілі пераклады твораў Льва Талстога, Максіма Горкага.

Шмат артыкулаў было прысвечана беларускай прыродзе, навінкам тэхнікі, гісторыі населеных пунктаў. Кожны нумар «Бярозкі» радаваў чытачоў (Паводле А. Масла). (93 словы)

## БЕЛАРУСКА-РУСКІ СЛОЎНІК

Што рабіць, калі захочацца даведацца, як гучыць і пішацца слова на той ці іншай мове? Напрыклад, перакласці на рускую мову вам дапаможа беларуска-рускі слоўнік. У яго ёсць надзейны «брат» — руска-беларускі даведнік.

Слоўнікі змяшчаюць словы, розныя па гучанні (*бусел — аист*), словы, якія адрозніваюцца родам (*сабака* — мужчынскі род, *собака* — жаночы род), а таксама словы з розным націскам (*імя́ — и́мя*).

Уменне карыстацца перакладным слоўнікам спатрэбіцца пры напісанні пераказаў, сачыненняў, пры падрыхтоўцы вусных адказаў.

Пасябруйце са слоўнікамі. Ваша маўленне стане багатым і прыгожым (Паводле І. Буторынай). (81 слова)

## СВЯТЫ

У кожнага народа — свае святы. У беларусаў сярод вялікіх, значных — Новы год, Дзень жанчын, Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, Дабравешчанне, Купалле. Шмат прафесійных свят — Дзень настаўніка, шахцёра, медыка, геолага. У першую нядзелю верасня — Дзень беларускага пісьменства. Пасля ўборкі ўраджаю — свята «Дажынкі».

Кожны ведае сваё свята — дзень нараджэння. У гэты дзень хочацца ўвагі, падарункаў, пачастункаў. Аднак ці добра, што некаторыя з нас не помняць імянін сваіх бацькоў, бабуль і дзядуль?

Давайце пастараемся, каб усе святы былі радасныя, шчаслівыя. Каб мы былі ўдзячнымі бацькам, усім добрым людзям (Паводле У. Ліпскага). (85 слоў)

## ПАЛАСАТЫЯ ЗАЙЦЫ

Вечарамі мы з бабуляй чыталі кніжкі. Смяяліся, жартавалі. Раптам я спытаў у бабулі:

— Дзе нашы вязаныя пальчаткі?

— Навошта табе?

— Будзем рабіць зайцо́ў з пальчатак...

Часам выдаюцца вельмі сумныя дні. У такіх выпадках патрэбна маленькая радасць. Напрыклад, можна зрабіць зайца з вязанай пальчаткі. І ён абавязкова раскажа што-небудзь вясёлае.

Бабуля сумна сказала:

— У мяне толькі паласатыя пальчаткі.

— Значыць, у нас будуць паласатыя зайцы, — радасна прамовіў я.

Вячэру мы гатавалі на чацвярых: на мяне, бабулю і двух паласатых зайцоў. За сталом зайцы спявалі, чыталі вершы, расказвалі смешныя гісторыі (Паводле А. Мальчэўскай). (88 слоў)

## СЯБРЫ

Дзед Макар любіў свайго сабачку. Ён быў роднай душой, верным, адданым. Аднойчы сабачка паводзіў сябе дзіўна. Ён то кідаўся да дзеда, то адбягаў, нібы штосьці прасіў.

Дзед пайшоў за сабачкам. Стары асцярожна расхінуў парэчкавыя галінкі і ўбачыў вожыка. Спачатку дзед падумаў, што той нежывы. Аднак вожык заварушыўся. Дзед уважліва прыгледзеўся і зразумеў, што вожык паранены кавалачкам шкла.

Дзядуля зажывіў вожыкаву ранку гаючай маззю. Не гаўкаў на вожыка і сабака. Ён толькі віляў хвастом, даваў зразумець, што ён таксама гаспадар.

Пасля гэтага ў двары наступіў мір. Дзед з радасцю паглядаў, як сябры пілі малако з адной талеркі (Паводле К. Камейшы). (97 слоў)

## СІРОТЫ

Ёсць дзеці, якія называюць чужых людзей мамай і татам. Для іх дырэктар, выхавальнік, няня, педагог — родныя, сваякі, тыя, хто вядзе іх у самастойнае жыццё.

Такія дзеткі жывуць у дзетдоме, у школе-інтэрнаце, у спецшколе або ў сямейным дзіцячым доме. Назва ў іх адна — сіроты.

Сярод іх ёсць круглыя сіроты, паўсіроты, сацыяльныя сіроты. Апошнія — сіроты пры жывых бацьках, у якіх на догляд дзяцей няма часу і жадання.

Пра што мараць гэтыя дзеці? Вярнуцца ў свае сем'і, жыць у сваім доме. Хочуць простага шчасця, каб мама слала ім пасцель, расказвала казкі, чакала, любіла.

Дай бог, каб іх мары спраўдзіліся (Паводле У. Ліпскага). (97 слоў)

## КАМАРЫ І МЯДЗВЕДЗЬ

Улез мядзведзь у балота. Лёг і падушыў камароў дзвесце ці болей. Загулі камары, не даюць спакойна ляжаць. А самы галоўны пішчыць:

— Ты чаго, дзядзька, сюды прыцягнуўся? За што загубіў столькі камарыкаў?

Мядзведзь ляжыць, нібы не чуе. Тады камары наляцелі на яго цэлай хмарай. Вочы, нос, рот — усё скусалі. Свету белага не бачыць, бедны.

Падняўся мядзведзь з балота. Пачаў лапамі махаць, нагамі тупаць. Ды хіба можна адбіцца ад камарынай хмары? Вымушаны быў мядзведзь з балота бегчы.

Камары адсталі. Толькі самы галоўны камар ляцеў за мядзведзем ды пішчаў над вухам:

— Будзеш ведаць, дзядзька, як да нас чапляцца! (Паводле І. Масленік). (98 слоў)

# 6 КЛАС

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

### Падрабязны пераказ

#### ЖАЛУДЫ ДЛЯ ВАВЁРАЧКІ

Дагараюць жоўтым золатам бярозы і клёны. Агрубела, пакрылася белым павуціннем трава. Не спяваюць птушкі. Але малых грыбнікоў гэта не засмучае. Весела пераклікаюцца хлопчыкі ў родным лесе.

З поўнымі кошыкамі грыбоў вярталіся сябры дамоў. Каля лесу стаяла невялікая альтанка, і яны прыселі адпачыць.

І тут хлопчыкі ўбачылі вавёрачку. Яна скокнула на дуб, схавала ў дупло жолуд і зноў уніз па камлі спусцілася.

Дупло знаходзілася нізка ад зямлі. Яно было прасторнае, як кладовачка. Засунуў Алесь у яго руку і намацаў жменьку жалудоў. Зімой не толькі арэхі, але і жалуды вавёрачцы спатрэбяцца.

Сябры вырашылі дапамагчы лясной прыгажуні і пачалі збіраць жалуды.

Дома хлопчыкі не сказалі, чаму затрымаліся ў лесе. Моўчкі перабіралі грыбы. Кожны ўяўляў, як радуецца жалудам у дупле вавёрачка (Паводле Т. Хадкевіча). (120 слоў)

1. Чаму хлопчыкі затрымаліся ў лесе? З якім настроем яны вярталіся дадому? Праверце, ці вядома вам значэнне слоў. *Альта́нка.* Летняя паркавая або садовая пабудова для адпачынку. *Каме́ль.* Ніжняя патоўшчаная частка дрэва, якая прылягае да кораня.

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Загаловак тэксту падабраны ў адпаведнасці з тэмай ці асноўнай думкай?

3. Назавіце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку. Ці ёсць у тэксце апісанне? Пашырце апісанне дупла.

4. Вызначце колькасць частак у тэксце. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай?

Складзіце схему будовы тэксту. Суаднясіце яе з наступным планам:

1) Вясёлыя грыбнікі.
2) Па дарозе дадому.
3) Руплівая працаўніца.
4) Вавёрчына кладовачка.
5) Сяброўская дапамога.
6) Радасныя думкі.

5. У якой форме ўжыты дзеясловы ў першай частцы і ва ўсіх астатніх частках? Абгрунтуйце выбар аўтара.

Падбярыце сінонімы да слоў *грыбнікі*, *вавёрачка*, якія можна выкарыстаць у тэксце, каб пазбегнуць паўтарэння.

6. Абгрунтуйце напісанне слоў *альтанка*, *камель* у розных формах.

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры параўнаннях з ***як***.

## ДАРЫ ВЕРАСНЯ

Ходзіць Верасень па зямлі і дорыць свае багацці.

Зайшоў ён у сады цяністыя, атрос ігрушы залацістыя. Асыпаў з яблынь духмяныя антонаўкі, чырвоныя крамяныя малінаўкі. Выйшаў Верасень у поле, наставіў мяхоў бульбы. На лузе склаў у копы траву і падаўся ў лес.

Ідзе Верасень лесам, прыбірае дрэвы ў дарагія ўборы. Бярэзінку апрануў у золата, а асіну прыбраў у чырвань. На дубы навесіў медны ўбор. Не забыўся і пра каліну ды рабіну, прыхарашыў іх пацеркамі чырвонымі.

Азірнуўся Верасень. Які прыгожы асенні лес! Вось толькі трава сухая. Страсянуў Верасень з дрэў буйную расу. Упалі на зямлю драбнюткія званочкі. І зацвілі верасы.

Багаты месяц Верасень! Ён насыпаў поўныя засекі збожжа, апрануў у золата лясы і расквеціў верасы. Таму і завуць яго Верасень (Паводле К. Каліны). (120 слоў)

1. Чаму першы месяц восені называецца верасень? Якія падарункі зрабіў Верасень саду, полю, лугу і лесу? Назавіце назоўнікі-сінонімы, што выкарыстоўвае аўтар.

Запомніце значэнне слова *засе́к* — агароджанае ў свірне месца для ссыпання збожжа, мукі. У якім значэнні (прамым ці пераносным) яно ўжываецца ў тэксце?

Чым быў незадаволены Верасень, калі выходзіў з лесу? Чаму аўтар называе Верасень багатым?

2. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце? Які яна мае сэнс? Падзяліце тэкст на часткі і дайце ім загалоўкі. Складзіце план тэксту.

4. Пры дапамозе якіх дзеясловаў перадаюцца дзеянні Верасня? Запішыце словазлучэнні з прыметнікамі. З якой мэтай аўтар ужывае іх у тэксце? Ці захоўваецца ў сказах прамы парадак слоў?

5. Растлумачце значэнне і напісанне такіх слоў: *крамяныя, пацеркі.* Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

## ЛЯСНОЕ ДЗІВА

Мы з аднакласнікамі едзем па мясцовай шашы недалёка ад Ельска. Мільгаюць, бягуць назад стройныя сосны. І раптам наш гід просіць шафёра затармазіць.

Недалёка ад дарогі заўважаем дзіва прыроды. Тут расце незвычайная сасна. Думаецца, што яна адзіная такая на ўсю Беларусь. На вышыні двух метраў дрэва разгаліноўваецца на пяць ствалоў. Жаўтлявымі агністымі свечкамі цягнецца ўверх незвычайная сасна. Мясцовыя жыхары расказваюць, што аднойчы гарэў тутэйшы лес. Але агонь прыпыніўся перад гэтым загадкавым дрэвам і далей не пайшоў.

Калі захочаце ўбачыць лясное дзіва, то шукайце яго ў бары паміж вёскамі Кочышчы і Вішанькі на Ельшчыне (Паводле У. Ліпскага). (94 словы)

1. Што асаблівага заўважылі аднакласнікі на экскурсіі? Чым вызначалася дрэва? Дзе трэба шукаць незвычайную сасну?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Ці перадае назва тэксту яго асноўную думку?

Пераканайцеся, што вам вядома значэнне слова *гід* — чалавек, які суправаджае турыстаў і знаёміць іх са славутымі мясцінамі горада, краю.

3. Вызначце стыль тэксту, тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку. Знайдзіце ў тэксце апісанне.

4. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце? Вызначце часткі тэксту. Дайце ім загалоўкі і складзіце план.

5. З дапамогай якіх моўных сродкаў расказваецца пра сасну? Выпішыце з тэксту прыметнікі і дзеясловы, якія выкарыстоўваюцца пры апісанні дрэва.

З якой мэтай аўтар ужывае ў тэксце дзеясловы ў форме цяперашняга часу? Чаму пры апісанні сасны даецца адваротны парадак слоў?

6. Растлумачце напісанне слоў *гід, шафёр, мільгаюць, разгалінsocialоўваецца* і ўласных назоўнікаў.

## ВОРЧЫК

Пахом Тачыла працаваў лесніком на Палессі.

Калі пачалася вайна, у лесе з'явіліся партызаны. Яны не давалі спакою нямецкім акупантам ні днём, ні ноччу. Ляснік падтрымліваў іх і дапамагаў.

Аднойчы ў час паходу на партызан карнікі натрапілі на леснічоўку Пахома. Ворагі пачалі катаваць лесніка, але ён не выдаў сваіх таварышаў.

Ледзь прытомнага Пахома карнікі забралі з сабой у суседнюю вёску. Там яго кінулі ў свіран і замкнулі дзверы.

Раніцай фашысты не знайшлі Пахома. Толькі з-пад сцяны свірна была відаць вялікая нара. Ворагі падумалі, што ляснік выграб яму і ўцёк.

На самай жа справе яму выграб леснікоў сабака Ворчык. Ён бег па слядах карнікаў. Высачыў, куды немцы кінулі Пахома. Калі змерклася, падкраўся да свірна, падгробся пад сцяну і выратаваў свайго гаспадара (Паводле Б. Сачанкі). (120 слоў)

1. Кім працаваў Пахом? Што хацелі даведацца карнікі? Як сабака выратаваў свайго гаспадара?

Праверце, ці ведаеце вы значэнне наступных слоў. *Ка́рнік.* Той, хто карае, удзельнік карнага атрада. *Сві́ран.* Халодны будынак, прызначаны для захоўвання збожжа, мукі. *Катава́ць.* Моцна і балюча біць, жорстка мучыць.

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Як можна назваць тэкст, каб загаловак перадаваў асноўную думку?

3. Вызначце стыль тэксту, тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Складзіце схему будовы тэксту. Суаднясіце яе з наступным планам:

1) На пачатку вайны.
2) Не выдаў таварышаў.
3) У суседняй вёсцы.
4) Нечаканае здарэнне.
5) Верны сябар.

Назавіце ключавыя словы ў сэнсавых частках тэксту. Пабудуйце з імі сказы.

Вызначце сродкі сувязі сказаў у частках. Якімі сінонімамі замяняе аўтар назоўнікі *Пахом, карнікі*?

5. Якія словы, аднакаранёвыя да слова *ляснік*, ужываюцца ў тэксце?

6. Растлумачце правапіс наступных спалучэнняў слоў і словазлучэнняў: *на Палессі, ні днём, ні ноччу, не давалі спакою, ледзь прытомнага, з-пад сцяны свірна, леснікоў сабака, падгробся пад сцяну.*

Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаным сказе.

## ВУЧОНЫЯ ТАНЦОРЫ

Даўным-даўно каля Смаргоні князі Радзівілы заснавалі дзіўную акадэмію. Яна так і называлася — Смаргонская. У ёй вучылі не сялянскіх дзяцей, а мядзведзяў.

Марудная была тая навука. Лясных жыхароў на ўроках ставілі на вялізную гарачую печ. Яны вымушаны былі падымаць пярэднія лапы, а на задніх нібы падтанцоўвалі. У гэты час іграла дуда або біў бубен. Такая навука доўжылася месяцамі і нават гадамі.

Пасля гэтага мядзведзяў выводзілі на заробкі. Дрэсіроўшчык іграў мелодыю, а звер танцаваў. Такіх смаргонскіх «акадэмікаў» ахвотна прымалі не толькі ў гарадах і вёсках Беларусі, а нават у Францыі, Германіі, Венгрыі.

Вось чаму на гербе Смаргоні ёсць выява чорнага мядзведзя. Заднімі лапамі звер стаіць на чырвонай рашотцы. А ў пярэдніх

ён трымае герб Радзівілаў, ва ўладанні якіх была Смаргонь (Паводле У. Ліпскага). (120 слоў)

1. Як вы ацэньваеце старажытныя правілы дрэсіроўкі? Чаму аўтар называе мядзведзяў «акадэмікамі»? Што адлюстравана на гербе Смаргоні?

2. Назавіце тэму і асноўную думку тэксту. Які яшчэ загаловак можна да яго падабраць?

3. Вызначце стыль тэксту, тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Растлумачце, ці адпавядаюць пункты плана часткам тэксту.
1) Смаргонская акадэмія.
2) Марудная навука.
3) На людскую пацеху.
4) Сімвал Смаргоні.

5. У сэнсавых частках выдзеліце апорныя словы. Пабудуйце з імі сказы.

Назавіце дзеясловы, якія перадаюць пачатак дзеяння, яго развіццё і заканчэнне.

6. Растлумачце правапіс наступных слоў: *мядзведзяў, дрэсіроўшчык, заробкі, падтанцоўвалі, рашотцы.* Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку пры аднародных членах са злучнікам ***а***.

## Пераказ тэкстаў з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання

### БАРАВІКІ Ў ХУСЦІНКАХ

Вечарам мы са Стасікам падрыхтаваліся ісці ў грыбы. Прачынаемся, а на двары зіма. Але Стасік прапанаваў пайсці ў лес і хоць палюбавацца прыродай.

Зямля, дрэвы, кусты — усё было пакрыта бялюткім снегам. Асенні лес стаяў задуменны, маўклівы. І вось цуд! Баравік пад елачкай стаіць у белай хусцінцы са снегу. А побач яшчэ і яшчэ.

Цудаў у лесе было шмат. І ярка-чырвоныя ягады шыпшыны на белых кустах. І малінавыя завушнічкі брызгліны. І зялёныя венічкі чарнічніку. І лісіныя ды заечыя сляды на снезе.

Мы налюбаваліся аснежаным лесам і асеннія дарункі прынеслі дамоў. Чырвоным жарам гарэлі ў кошыках буйныя гронкі каліны, залаціліся яловыя шышкі. Асабліва радавалі вока крамяныя баравікі. Снег растаў, і яны ўжо ляжалі ў нашых кошыках без хусцінак (Паводле Р. Ігнаценкі). (119 слоў)

1. Што перашкодзіла сябрам ажыццявіць задуму? Што за цуд яны ўбачылі ў лесе? Якія лясныя дарункі хлопцы прынеслі дамоў?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Як бы вы назвалі тэкст?

3. Вызначце стыль тэксту. Які тып маўлення пераважае ў ім? Абгрунтуйце сваю думку.

4. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы?

Складзіце схему будовы тэксту. Суаднясіце яе з наступным планам:

1) Па грыбы.
2) Асенні лес у снезе.
3) Цуды ў лесе.
4) Лясныя дарункі.

Назавіце ключавыя словы ў сэнсавых частках тэксту. Вызначце сродкі сувязі сказаў у частках.

5. З дапамогай якіх моўных сродкаў перадаецца якасць прадметаў? Выпішыце з кожнай часткі тэксту словазлучэнні з прыметнікамі, пабудуйце некалькі сказаў.

6. Карыстаючыся тлумачальным слоўнікам, растлумачце значэнні слоў *брызглі́на, крамя́ны*. Абгрунтуйце напісанне наступных слоў і спалучэнняў: *на дварэ, ярка-чырвоныя, заечыя*. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

## ЖЫВЫ ПАДАРУНАК

Тата з мамай падарылі Машы марскую свінку. Усе разам прыдумалі ёй хатку — пусты акварыум. Маша прапанавала назваць свінку Рыжухай, бо шэрстка на ёй рыжая, як у ваверкі.

Рыжуха любіць спаць. Таму і тоўсценькая такая, гладкая. Вочкі маленькія, як бы сонныя. А як прачнецца, становіцца на заднія лапкі і піпікае, просіць есці.

І Маша пачынае карміць сваю любіміцу. Дае сырую бульбу, капуснае лісце. Рыжуха можа есці сыр, шкарлупкі ад яек. Асабліва падабаецца ёй зялёненькая траўка.

Маша выпускае Рыжуху пагуляць. Свінка разгоніцца, паслізнецца і сунецца бачком па слізкім паркеце.

З кожным днём Машы ўсё больш падабаецца Рыжуха. Дзяўчынка толькі не можа зразумець, чаму марская свінка не любіць вады, не любіць купацца і не ўмее плаваць. Чаму яе марской назвалі? (Паводле У. Ліпскага). (119 слоў)

1. Чаму марская свінка атрымала такое імя? Як паводзіць сябе жывёліна? Як Маша клапоціцца пра марскую свінку? Чаго не можа зразумець дзяўчынка?

2. Якая тэма тэксту? Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

3. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Знайдзіце ў тэксце апісанне. З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст?

4. Ці супадае колькасць абзацаў і частак у тэксце? Выпішыце з кожнай часткі ключавыя словы і выразы. Складзіце з імі сказы. Дайце часткам загалоўкі. Складзіце план тэксту.

5. З дапамогай якіх моўных сродкаў перадаецца апісанне марской свінкі? Выпішыце прыметнікі, якія характарызуюць марскую свінку. Складзіце з імі словазлучэнні. Якія дзеясловы перадаюць рухі звярка? Запішыце іх.

6. Растлумачце напісанне наступных слоў: *акварыум, капуснае, слізкім*. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі і ў канцы пытальнага сказа.

## ЦІ ПРЫЛЯЦІЦЬ АДМІРАЛ?

Такога прыгожага матылька Міхаська яшчэ не бачыў. Гэты прыгажун сеў на яблык і раскрыў свае крыльцы. Яны мелі акантоўку колеру страусавага пяра і дзве блакітныя плямы, якія нагадвалі вочы. На аксамітна-чорным фоне працягнулася чырвоная стужка.

Міхаську вельмі захацелася злавіць матылька. Імклівым рухам хлопчык накінуў на яго сачок.

— Што ты нарабіў, унучак! — ускрыкнуў дзядуля. — Гэта незвычайны матылёк. Яго называюць адмірал з-за яркай чырвонай стужкі на крыльцах. Гэта рэдкі від. Ён занесены ў Чырвоную кнігу.

Дзядуля павярнуўся і пайшоў.

Ноччу Міхаська не спаў. Перад вачыма стаяў адмірал. Хлопчыку захацелася мець чароўную палачку, каб ажывіць усіх матылькоў і адпусціць на волю. З вачэй пакаціліся слёзы.

— Не плач, Міхаська, — пагладзіў яго дзядуля. — Ты зразумеў галоўнае: нікога нельга забіваць на гэтым свеце! (Паводле А. Вашчанкі). (120 слоў)

1. Чаму тэкст называецца «Ці прыляціць адмірал?» Як выглядаў незвычайны матылёк? Паводле якіх прымет яго назвалі адмірал? Чаму дзядуля павярнуўся і пайшоў? Што зразумеў Міхаська?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Назва адпавядае тэме ці асноўнай думцы? Падбярыце загаловак, каб ён перадаваў тэму тэксту.

3. Дакажыце, што тэкст адносіцца да мастацкага стылю. Знайдзіце ў тэксце апісанне. Ці можна сказаць, што тэкст адносіцца да такога тыпу маўлення, як апісанне?

4. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? Назавіце часткі тэксту. Дайце ім загалоўкі. Складзіце план з пытальных сказаў. Суаднясіце яго з прапанаваным:

1) Якога матылька ўбачыў Міхаська?
2) Ці споўнілася жаданне хлопчыка?
3) Чаму дзядуля не зразумеў унука?
4) Як паводзіў сябе Міхаська ноччу?
5) Што зразумеў хлопчык?

5. З дапамогай якіх моўных сродкаў апісваецца матылёк? Запішыце словазлучэнні з прыметнікамі, якія дапамагаюць апісаць матылька.

Падбярыце словы, што аўтар выкарыстоўвае як сінонімы да слова *Міхаська*.

Назавіце ў кожнай частцы ключавыя дзеясловы, пры дапамозе якіх перадаюцца паводзіны хлопчыка і дзядулі.

6. Растлумачце напісанне формаў слоў у наступных словазлучэннях: *страусавага пяра, дзве блакітныя плямы, на аксамітна-чорным фоне, з-за стужкі на крыльцах, Чырвоную кнігу, стаяў перад вачыма.*

Запішыце і выкарыстайце ў пераказе сказ: *Ты зразумеў галоўнае: нікога нельга забіваць на гэтым свеце!* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай.

## ДЗЯРЖАЎНЫ ГЕРБ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Кожная дэталь герба нашай дзяржавы дае важныя звесткі пра Беларусь.

Зялёны контур тэрыторыі сімвалізуе імкненне беларусаў ахоўваць межы сваёй краіны.

Герб утвораны вянком з каласоў. З аднаго боку каласы пераплецены ружовымі кветкамі канюшыны, а з другога — блакітнымі кветкамі лёну.

Вянок з пучкоў жыта з'яўляецца знакам багатага ўраджаю. Канюшына сімвалізуе сувязь са светам свойскіх жывёл, для якіх яна найлепшы корм. Лён — цудоўны матэрыял для адзення. Ён выступае сімвалам працы і дастатку.

Зямны шар на гербе гаворыць, што Беларусь успрымае ўсе народы Зямлі раўнапраўнымі сябрамі і партнёрамі. Зямля ў сонечных промнях — гэта галоўны знак жыцця.

Пяціканцовая зорка сімвалізуе мужнасць і высокія памкненні.

Герб абвіты чырвона-зялёнай стужкай з надпісам «Рэспубліка Беларусь».

У гербе адлюстраваны асноўныя нацыянальныя духоўныя каштоўнасці беларусаў (Паводле Э. Скобелева). (120 слоў)

1. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст?

Назавіце асноўныя нацыянальныя духоўныя каштоўнасці беларусаў. (*Грамадзянскае адзінства, праца, імкненне да ўдасканалення сваёй асобы і ўсяго грамадства, міралюбства і адначасова гатоўнасць пастаяць за сваю свабоду і суверэннасць.*)

Што сімвалізуе Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь? (*Дзяржаўны герб Рэспублікі Беларусь сімвалізуе дзяржаўную волю народа і выкарыстоўваецца ўсімі дзяржаўнымі органамі краіны.*)

Дзе выкарыстоўваецца герб нашай краіны? (*Герб упрыгожвае ўрадавыя ўстановы, як бы афармляе іх паўнамоцтвы. Усе важнейшыя дакументы і пячаткі ўтрымліваюць выяву Дзяржаўнага герба.*)

Ці згодны вы, што Дзяржаўны герб і Дзяржаўны сцяг аб'ядноўваюць беларусаў, азначаюць наша адзінства?

2. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце і які яна мае сэнс? Карыстаючыся планам у форме пытальных сказаў, вызначце колькасць частак у тэксце. Раскажыце, якая сувязь паміж сказамі ў частках і паміж самімі часткамі.

1) Што паказвае кожная дэталь герба нашай краіны?

2) Што сімвалізуе зялёны контур тэрыторыі Рэспублікі Беларусь?

3) Сімвалам чаго з'яўляюцца вянок з каласоў, кветкі канюшыны і лёну?

4) Пра што гавораць зямны шар і сонечныя промні на гербе нашай краіны?

5) Сімвалам чаго з'яўляецца пяціканцовая зорка?

6) Што адлюстравана на Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь?

4. Нагадайце лексічнае значэнне наступных слоў. *Контур.* Абрыс, лінія, якая ачэрчвае што-небудзь. *Сі́мвал.* Умоўны знак, які перадае, выражае пэўную ідэю, з'яву. *Партнёр.* 1) Удзельнік якой-небудзь сумеснай дзейнасці; 2) Краіна — удзельнік якога-небудзь саюза, пагаднення. *Канюшы́на.* Кармавая травяністая расліна сямейства бабовых з шарападобнымі кветкамі.

Сказы якой будовы выкарыстоўвае аўтар у апісанні?

З кожнай часткі выпішыце апорныя словы. Складзіце з імі сказы. Якімі сінонімамі можна замяніць слова *сімвалізаваць*?

5. Выпішыце словы і спалучэнні слоў, што пішуцца з вялікай літары. Растлумачце іх правапіс. Абгрунтуйце пастаноўку працяжніка паміж дзейнікам і выказнікам у сказах.

## ХАТА БЕЛАРУСА

Васільку падабалася бавіць час у чыстай, прасторнай бабулінай хаце. Няўжо такія хаты былі і трыста гадоў таму? Адказаць на пытанне дапамагла бабуля.

Раней хата селяніна была зусім маленькая, з земляной падлогай. Цэнтральнае месца ў хаце займала вялікая печ. У ёй гатавалі ежу. На печы спалі, сушылі адзенне і збожжа.

У хаце было чатыры куты, але толькі адзін з іх лічыўся галоўным. Яго называлі чырвоным. У гэтым куце віселі абразы з прыгожымі саматканымі ручнікамі. Уздоўж сцен хаты стаялі шырокія лавы. На покуці ўзвышаўся вялікі драўляны стол. У другім куце стаяла скрыня са святочнай адзежай, вышыванымі абрусамі, ручнікамі і сціплымі жаночымі ўпрыгожаннямі.

Уражаны апавяданнем Васілёк хуценька ўзяў фарбы і намаляваў старажытную хату. Вось будзе нечаканы падарунак для мамы з татам! (Паводле А. Бензерука). (120 слоў)

1. Чаму Васілёк любіў бываць у бабулінай хаце? Якое пытанне яго зацікавіла? Што хлопчык даведаўся з апавядання бабулі?

Праверце, ці ведаеце вы значэнне наступных слоў. *Абра́з.* Малюнак Бога або святога ў выглядзе партрэта ў фарбах як прадмет рэлігійнага пакланення. *Кут.* Частка памяшкання, прастора паміж дзвюма сценамі. *По́куць.* Ганаровае месца за сталом пад абразамі. *Саматка́ны.* Вытканы ў хатніх умовах саматужным спосабам. *Скры́ня.* Вялікая скрынка з векам для захоўвання тканіны, адзежы, каштоўнасцей.

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Як бы вы назвалі тэкст?

3. Вызначце стыль тэксту. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Абгрунтуйце сваю думку.

4. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы?

Складзіце схему будовы тэксту. Суаднясіце яе з наступным планам:

1) У бабулінай хаце.
2) Хата старажытнага беларуса.
3) Нечаканы падарунак.

Назавіце ключавыя словы ў сэнсавых частках тэксту. Пабудуйце з імі сказы. Вызначце сродкі сувязі сказаў у частках.

5. Выпішыце з кожнай часткі тэксту словазлучэнні з прыметнікамі. З якой мэтай аўтар выкарыстоўвае іх у тэксце?

6. Абгрунтуйце напісанне наступных слоў і спалучэнняў: *трыста гадоў, селяніна, цэнтральнае месца, адзенне і збожжа, уздоўж сцен, на покуці*. Раскажыце пра пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, пытальных сказах.

Запішыце і выкарыстайце ў пераказе сказ: *У другім куце стаяла скрыня са святочнай адзежай, вышыванымі абрусамі, ручнікамі і сціплымі жаночымі ўпрыгожаннямі.* Растлумачце напісанне арфаграм у словах і пастаноўку знакаў прыпынку.

## НЕЧАКАНЫ ГОСЦЬ

Мяла мяцеліца. Алесь ішоў да дзядзькі Ігнася праз стары лес. Яны збіраліся папарыцца ў лазні.

Раптам сярод дрэў хлопец заўважыў звера з густой, мяккай рыжай поўсцю і цёмнымі плямкамі на спіне і нагах. Ён пазнаў яго па высокіх і дужых нагах, кароткім хвасце, вялікіх вострых вушах з кутасікамі. Гэта была рысь.

Алесь дайшоў хутка. Дзядзька ўжо чакаў, і яны накіраваліся ў лазню. Запалілі святло і аслупянелі. На шырокім палку ляжала рысь. Дзікая кошка падхапілася на высокія ногі, прыгнулася і скокнула. Моцны ўдар у грудзі паваліў Алеся. Калі хлопец ачухаўся, дзядзька сказаў: «Прабач, гэта я насіў у лазню ваду і забыўся зачыніць дзверы. Напэўна, і рысь захацела папарыцца».

Так адбылася сустрэча з нечаканым госцем (Паводле Я. Галубовіча). (115 слоў)

1. З якой мэтай Алесь накіроўваўся да дзядзькі ў вёску? Як выглядаў звер, якога ён убачыў у лесе? Што адбылося ў лазні? Чаму рысь прыйшла да чалавека?

Праверце, ці ведаеце вы значэнне наступных слоў. *Ла́зня.* Спецыяльнае памяшканне, дзе мыюцца і парацца. *Пало́к.* Узвышэнне ў выглядзе шырокай паліцы ў лазні, на якім парацца.

2. Якая назва, акрамя прапанаванай, дакладна перадае асноўную думку тэксту: «У лазні», «Рысь», «Незвычайнае здарэнне», «Выпадак у вёсцы», «Сустрэча з прыродай»?

3. Вызначце стыль тэксту. Які тып маўлення пераважае ў ім? Ці ёсць у тэксце апісанне? З якой мэтай аўтар выкарыстоўвае яго?

4. Колькі частак можна выдзеліць у тэксце? Назавіце ў іх апорныя сказы. Запішыце іх. Складзіце план.

5. Растлумачце значэнне наступных слоў: *аслупянець, ачухаўся.*

Запішыце прыметнікі, пры дапамозе якіх аўтар апісвае поўсць, плямкі, ногі, хвост, вушы рысі. Складзіце словазлучэнні. Растлумачце напісанне.

Назавіце дзеясловы, што дапамагаюць перадаць развіццё дзеяння ў апавяданні. У якой форме яны ўжыты?

Якімі сінонімамі можна замяніць слова *рысь* у тэксце?

Сказы якой будовы выкарыстоўвае аўтар у апісанні?

6. Запішыце наступныя словы і выразы: *мяцеліца, да дзядзькі Ігнася, папарыцца, у лазні, з мяккай поўсцю, забыўся зачыніць*. Абгрунтуйце напісанне.

Растлумачце пунктуацыйнае афармленне сказа з простай мовай.

## Падрабязны пераказ тэксту па складаным плане

### САЧЫНЕННЕ ВАВЁРКІ

Вавёрка Алёнка засумавала. Ёй трэба напісаць сачыненне «Мой родны кут». А пра што пісаць, не ведала.

Раптам яна пачула стук Жаўны Петрыка. Вавёрка вырашыла запытацца, пра што ён пісаў сачыненне. Пятрок разгарнуў сшытак і прачытаў наступнае: «Мой родны кут — краіна Беларусь. Ніхто з маіх суродзічаў не лётае далей таго месца, дзе гняздуецца сям'я. Але ўсе ведаюць, што жоўны жывуць па ўсёй Беларусі.

Усім жоўнам вядома такая прытча. Пчаляр не святкаваў у нядзелю, а выдзёўбваў борць для пчол. За гэта Бог пераўтварыў яго ў чорнага дзятла. З таго часу жоўны дзяўбуць дрэвы.

Жоўны абмінаюць чалавечае жыллё. Але мы рады, калі чалавек клапоціцца пра дрэвы і насельнікаў бароў, ахоўвае наш кут».

Пятрок замоўк. Цяпер Вавёрка ведала, пра што пісаць сачыненне (Паводле А. Карлюкевіча). (120 слоў)

1. Чаму Вавёрцы было складана напісаць сачыненне? Як вы думаеце, пра што яна напісала ў сваёй працы?

Пераканайцеся, што вы ведаеце значэнне слоў, ужытых у тэксце. *Пры́тча.* Апавяданне з павучальным зместам. *Борць.* Вулей у дупле або ў выдзеўбанай калодзе, дзе жывуць пчолы.

2. Вызначце асноўную думку тэксту. Які яшчэ загаловак можна да яго падабраць?

3. Вызначце стыль тэксту. Дакажыце, што тэкст адносіцца да такога тыпу маўлення, як апавяданне.

4. Пазнаёмцеся са складаным планам да тэксту. Ці адпавядае ён схеме тэксту?

I. Складанае заданне.
II. Сачыненне Жаўны.
1) Мой край.
2) Прытча пра чорнага дзятла.
3) Радасць птушак.
III. Упэўненасць Ваверкі.

Вызначце ў кожнай частцы апорныя словы і выразы.

5. Вызначце, якія займеннікі выкарыстоўвае аўтар у тэксце. Замест якіх слоў ужывае?

6. Запішыце ў сшытках наступныя словы і спалучэнні слоў: *ніхто з маіх суродзічаў, Жаўна Пятрок, Вавёрка Алёнка, абмінаюць жыллё, сям'я гняздуецца, выдзёўбваў борць.* Растлумачце іх правапіс.

Якія знакі прыпынку вы паставіце пры афармленні сачынення Жаўны?

Грэчаскае слова «сафія» ў перакладзе на беларускую мову азначае «мудрасць». Якраз пра мудрасць і людскую супольнасць дбаў полацкі князь Усяслаў Чарадзей, калі задумаў пабудаваць на беразе Дзвіны Сафійскі сабор.

Пяць гадоў будаваўся Сафійскі сабор. Муравалі яго з камянёў і трывалай цэглы. Быццам з самай зямлі паціху вырастаў дзівосны храм. І вось ён паўстаў ва ўсёй сваёй красе і велічы. Цудоўны, светлы сабор узвышаўся пасярод новага дзядзінца, які назвалі Вышнім замкам. Магутныя двухметровыя сцены з вузкімі вокнамі імкліва сягалі ў самае неба. На сямі купалах зіхацелі пазалочаныя крыжы. З радасцю і здзіўленнем глядзелі палачане на Сафійскі сабор. Пачуццё гонару за родны горад, за сваё княства перапаўняла іх сэрцы.

Мураваны сабор стаў галоўнай святыняй Полацкай дзяржавы (Паводле У. Ягоўдзіка). (114 слоў)

1. Пра што думаў Усяслаў Чарадзей, калі вырашыў пабудаваць Сафійскі сабор? Колькі часу будаваўся сабор і як ён выглядаў? Чаму аўтар называе сабор галоўнай святыняй Полацкай дзяржавы? Як у народзе называюць Сафійскі сабор?

Запомніце значэнне слоў, ужытых у тэксце. *Супо́льнасць.* Адзінства, непарыўнасць. *Дзядзі́нец.* Умацаваная цэнтральная частка старажытнага горада. *Мурава́ць.* Будаваць што-небудзь з каменю ці цэглы, змацоўваючы цэментам або глінай.

2. Падбярыце загаловак, каб ён адлюстроўваў асноўную думку тэксту.

3. Вызначце стыль тэксту. Абгрунтуйце сваю думку. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Ці ёсць у тэксце апісанне? З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст?

4. Колькі абзацаў у тэксце? У адпаведнасці з абзацамі вызначце колькасць частак. Назавіце апорныя словы і выразы ў частках. У якой з частак можна вызначыць падтэмы? Складзіце складаны план. Суаднясіце яго з прапанаваным:

I. Мара князя.
II. Сафійскі сабор.
1) Будаўніцтва сабора.
2) Ва ўсёй красе і велічы.
3) Пачуццё гонару.
III. Святыня Полацкай дзяржавы.

Вызначце ў кожнай частцы апорныя словы і выразы.

5. Якія дзеясловы ўжывае аўтар, каб перадаць працэс будаўніцтва Сафійскага сабора? Якія азначальныя займеннікі дапамагаюць перадаць прыгажосць храма? (*Ва ўсёй красе, з самай зямлі, у самае неба.*) Якія займеннікі выкарыстоўвае аўтар пры паслядоўнай сувязі сказаў у тэксце?

6. Назавіце словы, аднакаранёвыя са словам *Полацк*, што ўжываюцца ў тэксце. (*Полацкі, палачане.*) Абгрунтуйце напісанне роднасных слоў.

Запішыце ў сшытках наступныя словы і спалучэнні слоў: *грэчаскае слова «сафія», князь Усяслаў Чарадзей, Сафійскі сабор, на беразе Дзвіны, людскую супольнасць, Вышні замак, быццам з самай*

*зямлі, княства, двухметровыя сцены, з камянёў і трывалай цэглы.* Растлумачце іх правапіс.

Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

## КЛЁН

На ўсё жыццё запомніўся гэты клён. Калі вясною з'яўлялася зялёная траўка, мы ладзілі каля яго свае гульні. Летам залазілі на самую вяршаліну клёна і спявалі. Захапляліся клёнам восенню, якая шчодра аблівала яго пазалотай.

Памятаю і прыкрае. Вясною мне захацелася кляновага соку. Я ўзяў бацькаву сякеру, слоік і рушыў да клёна. Надсек дрэва, падставіў слоік і пайшоў.

Хутка вярнуўся бацька і ўбачыў паранены клён. Дасталося мне тады на арэхі.

Тата замазаў раны, але яны не зажывалі. Праз год зноў нехта надсек клён. Не шанцавала яму і пасля. Кожны раз я адчуваў сябе вінаватым, быццам зноў раніў дрэва.

А мінулай восенню яго паваліла бура. Я зразумеў, што зрабіў зарубкі не на кляновым, а на сваім целе. І яны пякуць несціханым болем (Паводле М. Пазнякова). (120 слоў)

1. Чым прывабліваў дзяцей клён у розныя поры года? Як вы разумееце выраз «*дасталося на арэхі*»? Чаму лірычны герой балюча перажывае страту дрэва? Вызначце па тлумачальным слоўніку значэнне слова *прыкры*, падбярыце аднакаранёвыя.

2. Што перадае загаловак тэксту: тэму ці асноўную думку? Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Прапануйце свой варыянт загалоўка да тэксту, каб ён адлюстроўваў асноўную думку.

3. Вызначце стыль і тып маўлення.

4. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце і які яна мае сэнс? На колькі сэнсавых частак можна падзяліць тэкст? У якой частцы можна вызначыць падтэмы?

Вызначце апорныя словы і словазлучэнні ў кожнай частцы.

Дайце часткам загалоўкі. Складзіце складаны план тэксту. Параўнайце яго з прапанаваным:

I. Любімае дрэва.

II. Прыкрыя ўспаміны.

1) Нясцерпнае жаданне.

2) Дасталося на арэхі.

3) Незагойныя раны.

III. Несціханы боль.

5. Ад імя якой асобы вядзецца апавяданне? Які займеннік пераважае ў тэксце? Складзіце з займеннікам ***я*** словазлучэнні ў родным, давальным і вінавальным склонах. Назавіце дзеясловы, што выкарыстоўвае аўтар у якасці сінонімаў да слова *ісці*, растлумачце напісанне.

6. Запішыце наступныя словы і словазлучэнні: *вяршаліну, кляновага соку, падставіў слоік, надсек дрэва, мінулай восенню, зарубкі, несціханым болем*. Растлумачце іх правапіс.

Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаным сказе.

7. Перакажыце тэкст па складаным плане.

## ВАЖКІ ПРОМЫСЕЛ

У Беларусі рыбалоўства здаўна было важкім промыслам. У некаторых мясцінах рыба складала аснову сялянскага жыцця.

Былі выпадкі, калі рыбалоўныя сеткі выцягвалі толькі коньмі. Сілы ў руках не хапала, каб выцягнуць увесь улоў. Часам сеткамі перагароджвалі суднаходныя рэкі. Столькі было рыбы. Вось і з'явілася загадка: «Скубу не пер'е, ем не мяса».

Аднак не ўся здабыча даставалася сялянам. Трэба было выплачваць аброк панам. Законы рэгулявалі самавольную лоўлю рыбы.

Чым лавілі рыбу нашы продкі? Па тонкім лёдзе глушылі яе драўлянымі дубінамі. Лавілі плеценымі з лазы лавушкамі. Найчасцей выкарыстоўвалі сеткі.

За стагоддзі беларусы навучыліся гатаваць з рыбы разнастайныя стравы. Асабліва багатым быў рыбны стол у палешукоў. З рыбай нястачы ніколі не было.

Няма ў Беларусі ні мора, ні акіяна. А краіна застаецца рыбным царствам (Паводле А. Карлюкевіча). (120 слоў)

1. Якое месца займала рыбалоўства ў жыцці нашых продкаў? Чаму часам рыбалоўныя сеткі выцягвалі толькі коньмі? Ці маглі беларусы лавіць столькі рыбы, колькі ім захочацца? Якія прылады

існавалі для лоўлі рыбы? Чаму асабліва багатым быў рыбны стол у палешукоў?

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце? Пра што расказваецца ў асноўнай частцы? Ці можна вылучыць у ёй падтэмы? Пастаўце пытанні да кожнай падтэмы і адкажыце на іх. Дапоўніце пункты складанага плана:

I. Важкі промысел.
II. Скубу не пер'е, ем не мяса.
1)
2)
3)
III. Рыбнае царства.

## Сціслы пераказ

### СУНІЦЫ

Гэтага дня Вася чакаў даўно. Сёння хлопчык з бацькамі паедзе ў суніцы.

Да лесу даехалі праз пятнаццаць мінут. Мясціна была надзвычай маляўнічая. Уздоўж невялікай рэчкі расцягнулася вёска. З аднаго боку зелянеў бярозавы гай, а з другога — рос рэдкі сасоннік.

Пайшлі ў лес. Хутка трапілася сунічная палянка. Вася адразу пачаў збіраць чырвоныя, як жар, ягады ў свой паўлітровы слоік.

Суніцы раслі палянкамі. Давялося пакружыць па лесе. Стаміўся хлопчык, прысеў на пянёк. Адпачыў і зноў за работу ўзяўся.

Апоўдні выбраліся з лесу. Васілёк вельмі радаваўся. Ён, як дарослы, будзе ісці па горадзе з поўным слоікам духмяных суніц. Сам назбіраў!

На лаўцы каля іх пад'езда сядзелі суседкі.

— Малайчына, Васілёк, — пахваліла бабка Дар'я і ўздыхнула: — А я ўжо даўно не каштавала суніц.

Вася ведаў, што бабка Дар'я жыве адна. Ён прыпыніўся, зірнуў на слоік з суніцамі і сказаў:

— Бабуля, вазьміце, калі ласка, ягады.

Жанчына разгубілася, а хлопчык падаў ёй слоік і хуценька шмыгнуў у пад'езд (Паводле М. Слівы). (152 словы)

1. Чаму Васілёк з нецярпеннем чакаў гэтага дня? Як ён паводзіў сябе ў лесе? Чаму хлопчык аддаў ягады бабулі?

2. Назавіце тэму і асноўную думку тэксту. У адпаведнасці з тэмай ці з асноўнай думкай падабраны загаловак да тэксту? Прапануйце свае варыянты загалоўка, які б адпавядаў асноўнай думцы тэксту.

3. Вызначце стыль і тып маўлення. Ці ёсць у тэксце апісанне? З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст?

4. Ці супадае колькасць абзацаў і частак у тэксце? Пабудуйце кампазіцыйную схему тэксту. Суаднясіце кампазіцыйную схему з наступным планам:

1) Васева мара.
2) Па дарозе ў лес.
3) На сунічных палянках.
4) Сам назбіраў!
5) Шчодры хлопчык.

Вызначце ў кожнай частцы апорныя словы і выразы. Якую інфармацыю можна скараціць у кожнай з частак? Якую з частак можна апусціць?

5. Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаецца пачатак дзеяння, яго развіццё і заканчэнне. Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння пры апавяданні пра галоўнага героя? Назавіце словы, што паказваюць на час дзеяння. Запомніце іх напісанне (*сёння, праз пятнаццаць мінут, апоўдні*). Якую ролю адыгрываюць у тэксце параўнанні?

6. Абгрунтуйце напісанне наступных слоў і словазлучэнняў: *паўлітровы слоік, бабка Дар'я, хуценька шмыгнуў, пад'езд.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры параўнаннях: *чырвоны, як жар; ён, як дарослы;* пры зваротках.

7. Сцісла перакажыце тэкст.

На Валожыншчыне вёску Сакаўшчына ведаюць і дарослыя, і дзеці. Каля яе на вадасховішчы аблюбавала сабе

куточак пара лебедзяў. Вялікія птушкі з беласнежным апярэннем ганарліва ўздымаюць свае чырванадзюбыя галовы на тонкіх доўгіх шыях. Круглы год жывуць белыя птахі на вадасховішчы і чаруюць сваёй прыгажосцю людзей. Асаблівую радасць лебедзі прыносяць дзецям. Даверлівыя птушкі смела падплываюць да самага берага і бяруць з рук дзятвы ласункі.

Адзін год стаяла суровая зіма. Бывалі дні, калі маразы дасягалі сарака градусаў. На вадасховішчы, дзе зімавала пара лебедзяў, не замерзла толькі адна палонка. Але з кожным днём яна станавілася ўсё меншай. Хутка ад яе засталося толькі адно «акенца». Птушкі ўжо не маглі плаваць і здабываць сабе корм. Ім пагражала немінуемая гібель.

Тады на дапамогу лебедзям прыйшлі школьнікі. Яны злавілі птушак і прынеслі іх у школу. Цэлую зіму даглядалі лебедзяў, а вясной зноў выпусцілі на волю. Многія думалі, што птушкі ніколі больш не застануцца зімаваць у Сакаўшчыне. Але лебедзі паверылі, што людзі заўсёды прыйдуць ім на дапамогу.

Не могуць чырванадзюбыя птахі пакінуць родны куточак, бо прыкіпелі да яго сэрцам (Паводле Я. Галубовіча). (170 слоў)

1. Чым адметная вёска Сакаўшчына? Як дапамаглі школьнікі лебедзям? Чаму птушкі кожны год застаюцца зімаваць на вадасховішчы?

Праверце, ці ведаеце вы значэнне слова *палонка*. *Палонка*. Незамерзлае месца на ледзяной паверхні ракі, возера.

Як вы разумееце наступныя выразы: *толькі адно «акенца»*, *прыкіпелі сэрцам*? Якімі сінанімічнымі канструкцыямі можна іх замяніць?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Падбярыце да тэксту загаловак, каб ён перадаваў асноўную думку.

3. Вызначце стыль і тып тэксту. Якую ролю адыгрывае ў тэксце апісанне?

4. Падзяліце тэкст на часткі. Якую частку можна лічыць уводнай? Ці мае тэкст канцоўку? Ці можна выдзеліць падтэмы ў другой частцы?

Размяркуйце прапанаваныя апорныя словазлучэнні і выразы па частках.

*Вёска Сакаўшчына, выпусцілі вясной, суровая зіма, прыйшлі на дапамогу, пара лебедзяў, толькі адна палонка, з рук дзятвы, школьнікі даглядалі, на вадасховішчы, круглы год, не могуць пакінуць.*

Якую інфармацыю пры перадачы зместу кожнай часткі можна апусціць?

Складзіце складаны план тэксту.

5. Вызначце, чаму ў першай і трэцяй частках аўтар ужывае дзеясловы ў цяперашнім часе. У форме якога часу ўжываюцца дзеясловы ў другой частцы?

Якія з сінонімаў выкарыстоўвае аўтар у тэксце да назоўніка *лебедзі*: *птушкі, чырванадзюбыя птахі, белакрылыя жыхары*?

Якімі займеннікамі замяняе аўтар назоўнікі *лебедзі, дзеці*? З якой мэтай?

6. Растлумачце напісанне арфаграм у наступных словах: *чырванадзюбыя, лебедзяў, на Валожыншчыне, на вадасховішчы, прыгажосцю, меншай, падплываюць, немінуемая*; напісанне ***не*** з дзеясловамі.

Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

7. Сцісла перакажыце тэкст.

## ПАРТРЭТ НА СЦЯНЕ

Сашка прыехаў у вёску да бабулі і дзядулі. Хлопчыка ўразіла, што ў хаце на сценах вісела многа фатаграфій.

Аднойчы Сашка скінуў на падлогу адзін з партрэтаў. Шкло разбілася. Хлопчык хуценька згроб усё пад канапу і пабег на вуліцу.

Калі Сашка вярнуўся дамоў, дзед выразаў шкло пад тую рамку, якую ўнук разам з партрэтам схаваў пад канапу.

— Раскажу табе, унучак, пра аднаго героя, — сказаў дзед. — У час Вялікай Айчыннай вайны я быў у партызанскім атрадзе. Падчас паветранага бою фашысты збілі наш самалёт. Я знайшоў лётчыка ў лесе і адвёў да партызан. Гэта быў лейтэнант Васіль Зыкаў, які пазней стаў начальнікам разведкі.

Аднаго разу ў вёсцы спыніўся карны атрад. Партызаны прынялі рашэнне знішчыць карнікаў. У ходзе аперацыі Зыкаў заўважыў, як некалькі фашыстаў кінуліся ў хату. Лейтэнант выхапіў гранату, але аўтаматная чарга скасіла яго.

Васіль Зыкаў быў узнагароджаны ордэнам. Яго ўзнагароду камандзір уручыў сястры героя. А сястра героя — твая бабуля.

— Мая бабуля?.. — здзівіўся хлопчык.

— А вось і герой, — паказаў дзед партрэт, які Сашка скінуў са сцяны.

Хлопчык вінавата апусціў вочы (Паводле М. Пазнякова). (170 слоў)

1. Што ўразіла хлопчыка ў вёсцы? Што ён зрабіў, калі разбіў партрэт? Чаму пасля апавядання дзеда Сашка апусціў галаву? Кім даводзіцца герой апавядання хлопчыку?

2. Сфармулюйце тэму і асноўную думку тэксту. Што адлюстроўвае загаловак: тэму ці асноўную думку? Які яшчэ загаловак да тэксту вы можаце падабраць?

3. Вызначце стыль і тып тэксту.

4. Колькі падтэм выкарыстоўвае аўтар для раскрыцця тэмы? Вызначце колькасць частак у тэксце і ключавыя словы ў іх. Як можна скараціць інфармацыю ў частках?

5. Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаюцца дзеянні Сашкі. Якія дзеясловы выкарыстоўвае дзядуля ў сваім апавяданні? Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння пры апавяданні пра хлопчыка, пра лётчыка?

6. Растлумачце значэнне і правапіс *слоў кана́па, ка́рнікі.* Абгрунтуйце напісанне наступных слоў, словазлучэнняў і спалучэнняў: *у час Вялікай Айчыннай вайны, падчас паветранага бою, лётчык, у партызанскім атрадзе, лейтэнант Васіль Зыкаў, карны атрад, аўтаматная чарга, ордэн, сястра героя.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

7. Сцісла перакажыце тэкст, замяняючы простую мову ўскоснай.

## Пераказ з дадатковым заданнем

Жыло ў Белавежскай пушчы маленькае зубраня. Было яно гарэзлівым, жвавым і цікаўным. А яшчэ вельмі любіла катацца на веласіпедзе. Прачнецца раніцай, паснедае і катаецца цэлы дзень.

Аднойчы зубраня папрасіла маці расказаць яму пра горад Мінск. Здзівілася маці такому жаданню, але пачала расказваць пра шырокія вуліцы, высокія дамы, пра фабрыкі і заводы, пра метро.

Ноччу зубраняці прысніўся дзіўны сон. У сне яно каталася на веласіпедзе па вуліцах Мінска, і ўсе радаваліся яму, усміхаліся. З таго часу зубраня марыла паехаць у далёкі Мінск.

Даведаліся ў сталіцы пра дзіўную мару белавежскага зубраняці і вырашылі яму дапамагчы. Прыдумалі на заводзе дзіцячы веласіпед і назвалі яго «Зубраня». З таго часу катаецца «Зубраня» не толькі па вуліцах сталіцы, але і па ўсёй Беларусі (Дзіма Рубашка). (117 слоў)

1. Пра што марыла зубраня? Ці збылася мара зубраняці? Якое «Зубраня» катаецца па ўсёй Беларусі?

2. Падбярыце загаловак у адпаведнасці з тэмай тэксту.

3. Вызначце стыль, жанр і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? Ці супадае колькасць абзацаў і частак у тэксце? У якім абзацы перадаецца кульмінацыйны момант развіцця дзеяння?

Выпішыце з кожнай часткі апорныя словы і выразы. Складзіце з імі сказы. Дайце часткам загалоўкі. Запішыце план тэксту.

5. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання?

6. Растлумачце напісанне ўласных назваў, канчаткаў назоўнікаў *зубраня, веласіпед, вуліцы* ў розных склонах. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі.

7. Пашырце тэкст апісаннем зубраняці.

## МАЛЮНАК

Пад шкляным купалам у садзе мастака вырасла дзівосная кветка.

«Гэта сапраўдны цуд!» — захапляліся ёю людзі.

Калі мастак выпраўляў вучняў маляваць кветку, то прасіў: «Намалюйце цуд».

Міналі гады. Людзі забыліся на дзівосную кветку. Толькі вучні мастака паслухмяна малявалі «цуд».

Аднойчы да майстра прыйшоў новы вучань. Мастак і яму загадаў намаляваць цуд. Вучань пайшоў у сад і намаляваў шкло, пад якім расла кветка.

— Што ты намаляваў?! — жахнуўся мастак.

— Цуд, — адказаў вучань.

Калі стары мастак памёр, ён пакінуў сваю майстэрню і сад якраз гэтаму вучню. А на развітанне сказаў:

— Цяпер усе малююць шкло, пад якім растуць кветкі. Ты першым пайшоў па такім рызыкоўным шляху. Абяцай, што не прагоніш вучня, калі ён замест шкла намалюе кветку. І дапаможаш перамагчы цябе (Паводле С. Кавалёва). (117 слоў)

1. Што было цудам для ўсіх людзей? Ці ўспрымалі людзі праз гады кветку як цуд? Чаму майстар працягваў вучням даваць заданне намаляваць кветку? Чаму мастак не прагнаў вучня, калі той намаляваў шкло? Што папрасіў майстар у свайго вучня перад смерцю?

2. Што перадае загаловак тэксту: тэму ці асноўную думку? Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Прапануйце свой варыянт загалоўка да тэксту, каб ён адлюстроўваў асноўную думку.

3. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку. Ці ёсць у тэксце разважанне?

4. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце і які яна мае сэнс?

Ці супадае ў тэксце колькасць частак і абзацаў? Якая сувязь паміж часткамі ў тэксце і сказамі ў частках?

Складзіце схему будовы тэксту. Параўнайце яе з планам:

1) Сапраўдны цуд.

2) Загад мастака.

3) Незвычайны малюнак.

4) Наказ майстра.

5) Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаецца дзеянне ў тэксце.

5. Абгрунтуйце правапіс наступных слоў, словазлучэнняў і спалучэнняў: *пад шкляным купалам, дзівосную кветку, пакінуў майстэрню, на развітанне, рызыкоўным шляху, замест шкла, дапаможаш перамагчы.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры простай мове.

6. Пашырце пераказ апісаннем дзівоснай кветкі.

## КРАСАВІК — МАСТАК

Ці ведаеце вы, чаму ў красавіку так хораша і столькі красак? Ды таму, што Красавік — мастак.

Узяў Красавік фарбы і пэндзаль. Спачатку памаляваў неба ў сіні-сіні колер, а на ім размясціў бялюткія аблокі. Затым перамаляваў палі. Дзе зялёнай, дзе жаўтаватай, дзе шэрай фарбай мазнуў. Лугі вымаляваў у ясна-зялёны колер. А па тых лугах пачаў пырскаць то блакітнай, то жоўтай, то белай, то ружовай фарбамі. Якіх толькі красачак не з'явілася на лузе!

Затым узяўся Красавік за дрэвы... (Паводле К. Каліны). (78 слоў)

1. Якое значэнне мае слова *краска* ў беларускай мове? З якой мэтай узяў Красавік пэндзаль? Якім колерам ён намаляваў неба? Як Красавік перамаляваў палі і лугі? Якія фарбы ён выкарыстаў, каб намаляваць краскі?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту.

3. Вызначце стыль і жанр тэксту. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Абгрунтуйце сваю думку.

4. Якая частка тэксту з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце? Падзяліце тэкст на дзве часткі. Назавіце ў іх апорныя словы і выразы. Складзіце з імі сказы. Як можна закончыць тэкст? Складзіце план, у якім было б тры часткі.

5. Якія дзеясловы, роднасныя слову *маляваць*, выкарыстоўвае аўтар тэксту? (*Памаляваць, вымаляваць, перамаляваць.*) Якімі сіно-

німамі можна замяніць слова Красавік, каб пазбегнуць паўтораў у тэксце?

6. Растлумачце правапіс наступных слоў: *спачатку, Красавік, пэндзаль, бялюткая, жаўтаватая, ясна-зялёная, пырскаць.*

7. Напішыце пераказ, дапісаўшы апошнюю частку.

## НА ЎСХОДЗЕ СОНЦА

Сонца толькі што паказалася з-за сасонніку. Вялікі пунсовы шар каціўся насустрач адзінокай ранішняй хмарцы. Яна хутка падала за далягляд і таяла там у полымі ўсходу. Полымя гэта хутка праглынула хмарку і паступова гасла, рассейвалася.

Заблішчала раса. Пад праменямі сонца маладая трава стала алюмініева-белай. Толькі ў адным месцы па ёй пралеглі ярка-зялёныя мокрыя сцежкі. Гэта былі сляды чалавека ці жывёлы.

Статак яшчэ толькі выганялі. Каровы прагна хапалі каля агароджы траву, незадаволена мычалі, залазілі ў пасевы. Пастухі крычалі, ляскалі пугамі.

Радасна віталі новы дзень птушкі. Звінелі ў вышыні жаваранкі. Мітусіліся каля шпакоўняў шпакі. Няспынна лёталі то высока ў небе, то над самай зямлёй імклівыя ластаўкі (Паводле І. Шамякіна). (106 слоў)

1. Якія пачуцці выклікае ў аўтара ўсход сонца? Як вы разумееце выразы *таяла ў полымі ўсходу, падала за далягляд, прагна хапалі траву*? Чаму трава стала алюмініева-белай?

2. Вызначце тэму тэксту. Які яшчэ загаловак можна падабраць да тэксту, каб ён адлюстроўваў яго тэму?

3. Пабудуйце кампазіцыйную схему тэксту. Дакажыце, што гэта тэкст-апісанне.

4. Падзяліце тэкст на чатыры часткі. Ці супадае колькасць частак і абзацаў у тэксце? Як звязаны сказы і часткі тэксту? Запішыце першыя сказы, якімі пачынаецца кожны абзац.

Вызначце, да якой з частак адносяцца наступныя словазлучэнні: *насустрач ранішняй хмарцы, пунсовы шар, хапалі каля агароджы,*

*праглынула хмарку, ляскалі пугамі, маладая трава, імклівыя ластаўкі, сляды чалавека ці жывёлы, звінелі ў вышыні, ярка-зялёныя мокрыя сцежкі, над самай зямлёй.*

Перакажыце змест кожнай часткі, выкарыстоўваючы апорныя сказы і ключавыя словы і выразы.

Складзіце план. Вусна перакажыце тэкст.

5. Апішыце ўсход сонца, які назіралі вы.

## ЯКОЕ БЫВАЕ НЕБА?

Аднойчы я падумала пра тое, якога колеру неба.

Яно бывае markdown рознае. Калі ў мяне цудоўны настрой, то яно вясёлкавае. Калі не вельмі добры, то неба бледнае. А бывае і зусім шэрае.

Але ж колер неба не залежыць ад мяне. Сонейка робіць яркімі ўсе колеры. Калі яно свеціць, траўка, дрэвы, кусты падаюцца зялянейшымі. А без сонейка яны не такія прыгожыя, цьмяныя. Свеціць сонейка — і неба блакітнае, знікае — і яно блякне.

У душы кожнага з нас таксама павінна свяціць сонейка. Тады прыемна глядзець нават на шэрае неба. Таму што яго прывабнасць не залежыць ад колеру (Паводле В. Сальва). (96 слоў)

1. Ці згодны вы з аўтарам, што колер неба мяняецца? Ад чаго ён можа залежаць?

2. Як вы думаеце, загаловак падабраны ў адпаведнасці з тэмай ці асноўнай думкай тэксту?

3. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? Ці супадае колькасць абзацаў і частак у тэксце?

Выпішыце з кожнай часткі апорныя словы і выразы. Складзіце з імі сказы. Дайце часткам загалоўкі. Складзіце план тэксту.

Складзіце схему будовы тэксту, параўнайце яе з планам.

5. Якія моўныя сродкі выкарыстоўваюцца ў тэксце для таго, каб зрабіць доказы пераканальнымі? Выпішыце словы, з дапамогай якіх пералічваюцца доказы.

6. Растлумачце напісанне наступных слоў: *залежыць, зеляней-шай, цьмяная, блякне*. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах.

7. Паразважайце, якім уяўляецца неба вам. Апішыце яго.

Калі ў вас няма незвычайных каменьчыкаў, можна зрабіць іх самім! Для гэтага трэба развесці ў вадзе акварэльныя ці гуашавыя фарбы. Каляровую ваду пажадана разліць па формачках для лёду. Добра будзе зрабіць пяцелькі з нітак і адным канцом апусціць у кожную ячэйку з каляровай вадой. Формачкі неабходна выставіць на мароз на двор або памясціць у халадзільнік. Праз некалькі гадзін у вас будзе многа рознакаляровых ледзяшоў. Можна развесіць іх на дрэвах ці кустах. Празрыстыя ледзяшы без нітачак пажадана рассыпаць проста на снег. Гэта вельмі прыгожа! Нібы яркія зорачкі падалі і ў галінках дрэва заблыталіся, прасыпаліся на зямлю.

Не варта бедаваць, калі нехта здыме вашы ледзяшы ці яны растануць. Трэба быць настойлівымі і намарозіць новых! Прыбраны зорным дажджом двор будзе радаваць людзей усю зіму (Паводле А. Масла). (121 слова)

1. З якой мэтай аўтар прапануе зрабіць зорныя каменьчыкі? Чаму ён іх так называе? Ці заўсёды трэба быць настойлівым у дасягненні сваёй мэты?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Падбярыце да яго загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

3. Вызначце стыль і тып тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Ці можна падзяліць тэкст на часткі? Якая частка ўводная? Ці ёсць у тэксце заключная частка? Пра што паведамляецца ў асноўнай частцы?

Назавіце апорныя словы і выразы, характэрныя для кожнай часткі.

Складзіце план тэксту, выкарыстоўваючы пытальныя сказы. Суаднясіце яго з прапанаваным:

1) Ці можна зрабіць незвычайныя каменьчыкі?
2) Як зрабіць зорныя каменьчыкі?
3) Чаму трэба быць настойлівым у дасягненні мэты?

5. Якія прыметнікі выкарыстоўвае аўтар для апісання зорных каменьчыкаў? Складзіце з імі словазлучэнні.

Замяніце дзеясловы ў неазначальнай форме дзеясловамі загаднага ладу ў форме другой асобы множнага ліку: *зрабіць, развесці, разліць, зрабіць, апусціць, выставіць, памясціць, развесіць, рассыпаць, быць, намарозіць.*

Якую ролю будуць выконваць запісаныя вамі дзеясловы ў тэксце? Растлумачце іх напісанне.

6. Растлумачце правапіс арфаграм у наступных словах, спалучэннях слоў і словазлучэннях: *незвычайных каменьчыкаў, рознакаляровых ледзяшоў, без нітачак, рассыпаць, здыме, растануць, зорным дажджом.*

Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў клічных сказах.

7. Перакажыце тэкст, ужываючы замест дзеясловаў у неазначальнай форме дзеясловы загаднага ладу другой асобы множнага ліку.

## ЗЯЗЮЛЬЧЫНЫ СЛЁЗКІ

— А чаму гэтыя кветкі называюцца зязюльчыны слёзкі? — запыталася Арынка ў бабулі.

— Некалі зязюля падкінула два яйкі ў чужое гняздзечка. І вось вылупілася трое сваіх маленькіх жаўтароцікаў і двое зязюльчыных. Гаспадары гняздзечка не ведалі, што наседжваюць чужыя яйкі. Насіліся як апантаныя і ўсё кармілі ненажэрных птушанят. А чужакі неўзабаве выпхнулі малых з гняздзечка і засталіся адны ў сваіх прыёмных бацькоў.

Неяк пралятала паўз той куст, дзе ўжо аперыліся яе дзеткі, зязюля. Але тыя не пазналі маці. Не яна ж іх выседжвала ды гадавала. Вось зязюля і пачала ліць слёзкі. І дзе слёзкі ўпалі — там кветачкі гэтыя з зямлі праклюнуліся.

Арынцы стала зразумела, чаму кветачкі маюць такую назву (Паводле М. Даніленкі). (108 слоў)

1. Пра што запыталася Арынка ў бабулі? Пра што ёй расказала бабуля? Каго аўтар называе чужакамі? Чаму заплакала зязюля?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Загаловак да тэксту падабраны ў адпаведнасці з асноўнай думкай ці тэмай?

3. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

4. Назавіце колькасць частак у тэксце. Якая частка адсутнічае ў ім? Вызначце ў кожнай частцы апорныя словы і выразы. Складзіце з імі сказы. Пабудуйце схему тэксту. Суаднясіце яе з планам:

1) Па дарозе ў лес.
2) Апавяданне бабулі.
3) Слёзкі зязюлі.

Якой часткі не хапае ў тэксце?

5. Растлумачце значэнне наступных словазлучэнняў і выразаў: *насіліся як апантаныя, кармілі ненажэрных птушанят, выпхнулі малых, дзеткі апeрыліся*. Абгрунтуйце іх выкарыстанне ў тэксце і напісанне.

З якой мэтай аўтар ужывае ў тэксце словы з памяншальна-ласкальным значэннем? Запішыце іх. Растлумачце правапіс.

Якія сродкі выкарыстоўвае аўтар для сувязі аднародных членаў у сказах? Запішыце прыклады з тэксту. Падбярыце, калі магчыма, сінонімы да іх.

Запішыце сказ *І дзе слёзкі ўпалі — там кветачкі гэтыя з зямлі праклюнуліся*. Паспрабуйце замяніць яго сказам іншай будовы.

6. Абгрунтуйце правілы афармлення дыялогу. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі і зваротkам.

7. Перакажыце тэкст, пашырыўшы яго ўводнай часткай.

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

## Пераказ тэксту з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання

### АБРУС

На свята мама засцілала стол абрусам. І адразу святлела ў хаце і на душы. Сярод розных прысмакаў сонцам ззяў на белым палатне залацісты бохан хлеба. А каляровыя ўзоры па краях абруса і ў марозны дзень пахлі летам.

Абрус — тканіна, якой засцілаюць стол. Звычайна абрус складаўся з двух кавалкаў ільнянога палатна. Пасярэдзіне яны былі злучаны ажурным швом. Краі абруса часам упрыгожваліся махрамі — распушанымі ніткамі або шнуркамі.

Абрусы звычайна ткалі на кроснах. Белае поле аздаблялася раслінным арнаментам, крыжыкамі, клетачкамі, шырокімі або вузкімі палоскамі. Цешылі вока з густам падабраныя колеры аздобы. Узор мог быць блакітнага, зялёнага, чырвонага, жоўтага, фіялетавага і іншага колеру.

Сучасныя абрусы вырабляюць з ільняных, баваўняных і шаўковых нітак. Заходзь у краму, выбірай любы і засцілай ім стол (Паводле М. Маляўкі). (118 слоў)

### БАБЁР

Бабры старанна рыхтуюцца да зімы. Адна бабрыная сям’я нарыхтоўвае да дваццаці кубаметраў драўніны. Калі замерзнуць рэчкі, гэтыя звяры кормяцца сваімі запасамі.

Бабёр — вельмі прыгожы звярок. У сваім каштоўным футры ён выглядае велічна, статна. Звярок нізкарослы, доўгі, мае гладкую поўсць цёмна-карычневага колеру. У яго магутны лапатападобны хвост.

Бабёр вядомы сваім умельствам валіць дрэвы. Зваленае дрэва ён разгрызае на кавалкі, каб іх зручней было занесці на дно вадаёма. Асноўнай прыладай працы гэтага лесаруба з’яўляюцца моцныя разцы. Яны заўсёды вострыя, як брытва.

У час адпачынку звярок старанна трэ свае верхнія разцы аб ніжнія і наадварот. Так ён вострыць зубы.

У пачатку дваццатага стагоддзя дзяржава вымушана была ўзяць баброў пад сваю ахову. Сёння іх папуляцыя ў Беларусі складае каля трыццаці тысяч (Паводле Я. Галубовіча). (118 слоў)

## МУЗЕЙ ВЕКАПОМНАЙ СЛАВЫ

У гэтым будынку жыве вайна. Аднак тут не гучаць выбухі. У будынку пануе цішыня. Гэта музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У ім шмат дакументаў, якія расказваюць пра дзейнасць падпольшчыкаў. Тут можна ўбачыць сумачку Алены Мазанік. У ёй жанчына пранесла магнітную міну ў дом гаўляйтара Кубэ.

Здзіўляюць партызанскія залы музея. У іх знаходзяцца макет зямлянкі, баявыя лістоўкі, рукапісныя часопісы. Адзін з экспанатаў — самаробны партызанскі сцяг. Яго сшылі з дзіцячай коўдрачкі. Затым перафарбавалі ў чырвоны колер і вышылі.

Прыцягваюць увагу ўзнагароды, зброя, асабістыя рэчы воінаў, палкаводцаў. Сярод рэліквій знаходзіцца прабіты куляй медаль «За адвагу».

Адна з мемарыяльных залаў — зала Герояў. На яе сценах высечаны імёны людзей, якія змагаліся за беларускую зямлю.

Беларусы ўдзячныя тым, хто захоўвае памяць пра Перамогу (Паводле М. Чарняўскага). (120 слоў)

## ВЫПАЎ СНЕГ

Раніцай Андрэй усхапіўся ад таго, што ў хаце было светла. Ён прынік да шыбы і ўсё зразумеў.

На двары ўчарашнія змрочныя будынкі, сад, платы стаялі аснежаныя, і ў хату ад іх лілося белае мяккае святло. Лёгкія пушынкі ляталі, кружыліся ў паветры і асядалі на дрэвы і кусты. Хлопчыка адразу пацягнула з хаты.

Яшчэ з парога на яго дыхнула зіма. Шчокі шчыпаў бадзёры марозік. На сэрцы ад гэтага рабілася светла і радасна.

Андрэй спяшаўся ў школу і глядзеў, як кружацца гэтыя белыя пушынкі. Сняжынкі былі плоскія і аб'ёмныя, тонкія і тоўстыя, шасцівугольныя і трохвугольныя, у форме шасцікрылых матылёў, зорак-прамянёў і разнастайных пласцін. Як прыгожа!

Выпаў снег. Значыць, наступіла зіма!.. (Паводле І. Грамовіча). (110 слоў)

### ЯКІ ХЛЕБ ЛЕПШЫ

*Руская народная мудрасць*

У невялікай вёсцы жылі два браты. Іх маці была добрая і клапатлівая жанчына. Мікіта быў шчыры і руплівы, як маці. Захар жа не любіў працаваць.

Аднойчы маці захварэла і доўга не ўставала з ложка.

Пайшлі сыны хлеб здабываць. Мікіта працаваў цэлы дзень. За заробленыя грошы змог купіць толькі невялічкую лусту хлеба. Прынёс яе і кажа: «Даруй, матуля».

Захар прыйшоў вясёлы і прынёс вялікі каравай. Ён быў з белай пшанічнай мукі, вельмі свежы і мяккі. Яго ўпрыгожвалі цудоўныя кветкі, разнастайныя ўзоры. Румяная скарыначка так і прасілася ў рот.

З'ела маці лусту хлеба і змагла па хаце прайсціся. А каравай ляжыць, сохне. Тады і Захар кажа: «Даруй, матуля!» А маці толькі прамовіла: «Заробленая луста лепшая за крадзены каравай». (119 слоў)

## Падрабязны пераказ апавядальнага тэксту

### АДКУЛЬ УЗЯЛАСЯ ВЯСЁЛКА

Бог вырашыў знішчыць усё зло на зямлі і толькі добраму чалавеку Ною падараваць жыццё. Бог прапанаваў яму пабудаваць трохпавярховую лодку, пасадзіць у яе сям'ю, па пары звяроў і птушак і перачакаць патоп.

Больш за сто гадоў Ной разам з сынамі будаваў каўчэг. За сем дзён да патопу Бог загадаў Ною ўвайсці ў лодку.

І хлынуў лівень, які працягваўся сорак дзён. Усё на зямлі загінула. Засталіся толькі тыя, хто схаваўся ў каўчэгу. Вада прыбывала яшчэ сто пяцьдзясят дзён. Затым пачала спадаць.

Бог паабяцаў больш не заліваць зямлю вадой. Нагадаць яму пра гэта павінна была вясёлка. «Я ўбачу сяміколерную дугу і загадаю дажджу перастаць», — пераконваў Бог. Так і адбываецца.

Так што вясёлка — гэта добры знак шчаслівага жыцця на зямлі (Паводле П. Мажэйкі). (120 слоў)

## ЗОРАЧКА

Далёка ў касмічнай прасторы жыла Зорачка. Ад старэйшых сясцёр яна ведала, што жыхары планеты Зямля захапляюцца зорным небам. А ёй вельмі хацелася парадаваць людзей.

Зорачка не шкадавала свайго святла і разгаралася ўсё ярчэй і ярчэй. Найпрыгажэйшым яе ззянне станавілася тады, калі з дому на планеце Зямля выходзіла дзяўчынка. Зорачка працягвала да яе свае промні, і яна радасна ўсміхалася.

Але аднойчы вечарам дзяўчынка не выйшла. Зорачка праз акно зазірнула ў пакой да маленькай сяброўкі і зразумела, што яна цяжка захварэла.

— Дзяўчынка, я падарую табе сваё жыццё, — прамовіла Зорачка і залатой слязінкай скацілася з неба.

А потым доўга на планеце Зямля выходзіла з дому дзяўчынка і махала рукой Зорачцы, якая для яе так і засталася жывой (Паводле А. Масла). (115 слоў)

## ВОЗЕРА СВІЦЯЗЬ

Пра Свіцязь жывуць розныя легенды. Адна з іх такая.

Некалі на гэтым узвышшы стаяў непакорны горад. Жыхары яго больш за жыццё любілі волю. Часта чужынцы вы-

прабоўвалі моц нашых прашчураў, але кожны раз вярталіся ні з чым. Адзін раз на горад напала вельмі ж ваяўнічая зграя ворагаў. Усе мужчыны сталі ваярамі і загінулі ў той няроўнай бойцы. Іх верныя жонкі і дзеці звярнуліся з малітвай да Бога, папрасілі ўратаваць іх ад навалы. Яны так плакалі, што на месцы паселішча ўтварылася возера Свіцязь. І паплылі па ім у памяць пра людзей чароўныя кветкі.

І цяпер на возеры растуць рэдкія вадзяныя краскі, якія занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі. Яны ёсць толькі на Свіцязі! (Паводле У. Ліпскага). (112 слоў)

## КЛАДКА

Без гэтай сажалкі не абысціся. Вясной на яе беразе бяруць крупінкі гразі ластаўкі. У гарачыя дні тут п'юць ваду каровы і коні. А каб вяскоўцам зачарпнуць вады, трэба пакласці кладку.

Я адшукаў пару цаглін і паклаў на беразе. Гэтак можна бліжэй да вады падступіцца. На наступны дзень мае цагліны нехта пасцягваў вышэй на траву. Хто гэта зрабіў?

Я сеў на лавачцы каля дома і стаў чакаць. Праз нейкі час убачыў суседскага хлопчыка. Паўлік нёс са свайго двара цагліны, дошку і накіроўваўся да сажалкі. Я пайшоў за ім. Бачу, хлопчык нешта майструе на беразе.

— Хачу кладку мацней пакласці, каб не спаўзала ў ваду, — патлумачыў Паўлік.

Я пахваліў хлопчыка. Кладка стала моцная, трывалая. Можна смела ступаць. Ужо не паслізнешся каля вады (Паводле М. Даніленкі). (120 слоў)

## НЕЧАКАНАЯ ЗНАХОДКА

Вераніка вярталася са школы праз стадыён. Раптам заўважыла ўтаптаную ў гразь паперку. Прыгледзелася і ўбачыла дзесяць тысяч рублёў. Дзяўчынка ўзрадавалася, падняла грошы. Яна ўжо марыла, на што іх можна патраціць.

Вечарам брат Алесь паведаміў, што на ўроку фізкультуры яго сябар Валерык згубіў дзесяць тысяч рублёў. Маці дала

яму іх на школьныя абеды, а ён згубіў. Таму шэсць урокаў прасядзеў галодны.

— Няхай не будзе разявакам! — асудзіла Вераніка.

Яна вырашыла не аддаваць грошы, але падумала пра галоднага Валерыка і засумнявалася. Ёй стала шкада хлопчыка.

Раніцай дзяўчынка ўзяла дзесяць тысяч, паклала іх у кішэньку ранца і пайшла ў школу. На перапынку ўбачыла Валерыка і працягнула яму грошы. Яны ўсміхнуліся адзін аднаму (Паводле Г. Скаржынскай). (110 слоў)

## ГАНАРЛІВАЯ КВЕТАЧКА

Завітала ў наш край вясна, і ўсё вакол пачало зелянець ды квітнець. Усюды вясна паспявае, усюды свае парадкі наводзіць.

Дайшла чарга да саду. Нарэшце і на галінках маладзенькай яблынькі кветачкі распусціліся. Адна з іх пачала выхваляцца, што яна самая прыгожая і разумная. Пакрыўдзіліся на яе сяброўкі.

Якраз у гэты час пчолкі ў сад прыляцелі, над кветачкамі закружыліся. Яны да сябе пчолак запрашаюць, духмяным нектарам частуюць. Толькі ганарлівая кветачка адвярнулася. Ні адну пчолку не пачаставала. Яшчэ і пасмяялася з сяброўак, што нектар свой аддалі.

Аднак яблынька за ганарлівасць кветачкі прадказала ёй нешчаслівы лёс. За нектар пчолкі апылілі іншыя кветачкі, і хутка яны ператворацца ў прыгожыя духмяныя яблычкі. А ганарлівая кветачка засохне, ападзе, і ніхто не ўспомніць яе добрым словам (Паводле Г. Аўласенкі). (120 слоў)

# 7 КЛАС

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

### Падрабязны пераказ

#### СОН-ТРАВА

Сон-трава расце там, дзе дастаткова сонца. Прырода добра паклапацілася пра гэтую кветку. Укрытая пухнатым «футрам», яна не баіцца начных маразоў. З надыходам цяпла кветка раскрываецца, а ярка-жоўтыя тычынкі прываблiваюць насякомых, якія збіраюць пылок.

Сон-трава — расліна, занесеная ў Чырвоную кнігу. Ірваць яе забаронена.

Атрутны сок сон-травы выклікае моцнае раздражненне скуры. Але гэта расліна вядома не толькі сваімі атрутнымі ўласцівасцямі. Калісьці даўно народныя лекары рабілі з яе адвар ад кашлю, сухотаў, выкарыстоўвалі сон-траву для лячэння хвароб скуры.

Адкуль у гэтай расліны такая цікавая назва? Легенда расказвае, што сон-травой кветку назваў невядомы паляўнічы. Аднойчы ён блукаў па лесе і ўбачыў мядзведзя. Звер выкопваў з зямлі карэньчыкі гэтай травы, з'ядаў іх і засынаў.

Існуе і іншая версія паходжання назвы. Калі ў лесе растае снег, на прагрэтых вясновым сонцам палянах з'яўляюцца пухнатыя кветкі сон-травы. Схіленыя долу, яны нібы спяць. З-за знешняга выгляду расліны людзі і далі ёй такое імя (Паводле П. Грынчанкі, А. Церашковай). (145 слоў)

1. Вызначце тэму тэксту. Ці перадае загаловак тэму тэксту? Чаму аўтары сцвярджаюць, што прырода добра паклапацілася пра сон-траву? З якой мэтай сон-трава выкарыстоўваецца ў народнай меды-

цыне? Адкажыце на пытанне, сфармуляванае ў чацвёртым абзацы тэксту.

2. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце? Знайдзіце ў тэксце апісанне. З якой мэтай яно ўключана ў тэкст?

3. Колькі падтэм выкарыстана для раскрыцця тэмы? Складзіце план тэксту так, каб яго пункты мелі форму пытанняў.

4. Якую ролю ў тэксце выконваюць якасныя прыметнікі? Якія словы дазваляюць пазбегнуць паўтарэння слова *сон-трава*?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *ярка-жоўты, Чырвоная кніга, карэньчыкі*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыметнікавымі зваротамі.

## ЛАСТАЎЧЫНЫ ДОМІКІ

На беразе Чорнага мора пачалі будаваць санаторый. Спачатку зрабілі невялікі драўляны домік, дзе жылі рабочыя. Вясной пад дахам гэтага доміка ластаўкі змайстравалі гнёзды. Птушкі шчабяталі кожную раніцу, і будаўнікам прыемна было чуць іх галасы.

Хутка санаторый быў пабудаваны. Дайшла чарга разбіраць драўляны домік. Людзі залезлі на дах і пачалі адрываць дошкі.

Ластаўкі з жаласным піскам кружыліся над домікам, шчабяталі, упрошвалі будаўнікоў не разбураць гнёздаў. Рабочыя шкадавалі птушак, аднак домік быў патрэбны на новай будоўлі. Вечарам яго перавезлі на іншае месца. А бяздомныя ластаўкі ўсю ноч прасядзелі на парэнчах[1] веранды. Людзі спачувалі птушынай бядзе, але дапамагчы нічым не маглі.

Раніцай будаўнікі прыйшлі рабіць цэментавыя сходы[2], каб можна было спускацца з санаторыя да мора. Ластаўкі кінуліся да скрынкі, у якой замешваўся бетон. Дзе ім у сухое надвор’е знайсці гразь? А тут пад бокам гатовы матэрыял на пабудову новых гнёздаў. Птушкі з-пад рук у рабочых хапалі замес. Цяпер ластаўкі пачалі ляпіць гнёзды пад застрэшкамі новага санаторыя. Тут ужо ніхто не разбурыць іхніх домікаў (Паводле А. Пальчэўскага). (163 словы)

---

[1] Парэ́нчы, -аў, *мн.* Агароджа, поручні па краях лесвіцы, балкона, моста.

[2] Схо́ды, -аў, *мн.* Ступенькі лесвіцы.

1. Вызначце тэму тэксту. Ці перадае яе загаловак? Чаму будаўнікі, якія спачувалі ластаўкам, не маглі ім дапамагчы?

2. Да якога стылю і тыпу маўлення адносіцца тэкст? Дакажыце гэта.

3. Якая частка тэксту з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць у тэксце канцоўка? Размясціце пункты плана тэксту ў правільнай паслядоўнасці:

1) Ластаўчына бяда.
2) Гнёзды пад дахам доміка.
3) Незвычайны будаўнічы матэрыял.
4) Завяршэнне будаўніцтва санаторыя.

Як звязаны сказы ў тэксце: паслядоўнай ці паралельнай сувяззю?

4. Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаюцца пачатак дзеяння, яго развіццё, заканчэнне. Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння наступных слоў: *будаваць, рабочыя, ластаўкі*?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *Чорнае мора, спачатку, бяздомныя, з-пад*. Знайдзіце ў тэксце сказы з аднароднымі членамі і складаныя сказы, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў іх.

Каля хаты каркалі дзве вароны, перад якімі ляжала хлебная скарынка. Маладая варона некалькі разоў патрабавальна каркнула і сцішылася ў чаканні, шырока раскрыўшы дзюбу. Гэта дачка-гультайка хацела, каб маці яе пакарміла хлебнай скарынкай. Але старая варона лічыла, што дачка і сама ўжо справіцца з такой работай. Маладая варона зноў закаркала, а старая ўзяла ў дзюбу хлебную скарынку і шпурнула яе далей ад сябе. Абедзве вароны кінуліся да спажывы. Старая варона знарок прыпазнілася, каб дачка схапіла скарынку. Але тая ўзняла такі гвалт каля хлеба! Аднак маці аказалася вельмі цярплівая. Зноў паляцела скарынка, зноў за ёй кінуліся птушкі.

Навучанне спыніла пярэстая кошка, якая раптам выскачыла з хаты. Маладая варона, не раздумваючы, узмахнула крыламі і праз хвіліну схавалася за дахам суседняй хаты. Старая ж, папераджальна каркнуўшы на ўвесь надворак, схапіла ў дзюбу хлеб і кінулася даганяць дачку (Паводле А. Бадака). (133 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Які з наступных загалоўкаў, на вашу думку, найбольш адпавядае тэксту: «Маладая

варона», «Старая варона», «Дзве вароны», «Маці і дачка», «Хлебная скарынка», «Варона-гультайка»? Дакажыце, што варона-маці «аказалася вельмі цярплівая» ў выхаванні дачкі.

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Выдзеліце часткі, якія адпавядаюць схеме тэксту, дайце ім загалоўкі. Ахарактарызуйце спосаб і сродкі сувязі сказаў у тэксце.

4. Выпішыце з тэксту дзеясловы, з дапамогай якіх перадаюцца пачатак дзеяння, яго развіццё і заканчэнне. Абапіраючыся на наступныя прыклады, растлумачце, якую ролю выконваюць у тэксце прыслоўі: *некалькі разоў каркнула — некалькі разоў патрабавальна каркнула; раскрыўшы дзюбу — шырока раскрыўшы дзюбу; старая варона прыпазнілася — старая варона знарок прыпазнілася; кошка выскачыла з хаты — кошка раптам выскачыла з хаты.*

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *дзве, абедзве, дачка-гультайка, прыпазнілася.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўямі і дзеепрыслоўнымі зваротамі.

## НОВАЯ СЯБРОЎКА

Антось і Алеся стаялі на балконе свайго новага дома і разглядалі двор. Раптам да іх падляцела некалькі птушак. Маленькая галубка і вялікі голуб з белай плямай на дзюбе селі на парэнчах[1] балкона.

Алеся заўважыла, што ў галубкі баліць ножка. Дзяўчынка вынесла хлебных крошак, жменьку круп і насыпала на падаконнік. Першы пераляцеў з парэнчаў голуб. Следам за ім нясмела прыкульгала і галубка. Але ўхапіць зерне яна ніяк не магла. Вялікі голуб прагна дзёўб крошкі, адганяючы іншых птушак.

Тады Алеся зноў вынесла крошак і працягнула іх на далоні галубцы. Асцярожнымі падскокамі птушка дабралася да дзяўчынкі, дзеўбанула крошку і адляцела ў другі канец балкона. Пасля зноў ухапіла крошку.

Голуб убачыў, што дзяўчынка корміць галубку. Пераляцеў на парэнчы. Злосна дакараючы галубку, ён сапхнуў яе ўніз, а сам падаўся да крошак. Тады Алеся схапіла венік і прагнала хцівага голуба.

---

[1] Парэ́нчы, -аў, *мн.* Агароджа, поручні па краях лесвіцы, балкона, моста.

Пакалечаную галубку дзеці кармілі аж да вясны. Яна смела садзілася каля Антосевай ці Алесінай рукі і дзяўбла крошкі, кідаючы лагодны позірк на дзяцей. Малым здавалася, што птушка дзякуе ім за пачастунак.

Так у новым доме ў Антося і Алесі з'явілася сяброўка (Паводле А. Пальчэўскага). (177 слоў)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Ці перадае назва тэксту яго тэму? Пра якія рысы характару Алесі і Антося сведчаць іх адносіны да пакалечанай галубкі?

2. Вызначце тып маўлення, стыль тэксту. Назавіце асаблівасці і прыметы гэтага стылю.

3. Складзіце схему будовы тэксту. Суаднясіце яе з наступным планам:

1) Крылатыя госці.
2) Алесін пачастунак.
3) Крошкі для галубкі.
4) Пакаранне за хціўасць.
5) Птушыная падзяка.

У якім абзацы перадаецца кульмінацыйны момант развіцця дзеяння?

4. Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння слоў *галубка, Алеся*? З дапамогай якіх дзеясловаў перадаюцца рухі птушак? Чаму, калі гаворка ідзе пра галубку, аўтар ужывае словы з суфіксамі ацэнкі: *маленькая, ножка*?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *падаконнік, падскокі, дзёўб — дзяўбла — дзеўбанула*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі.

## БУСЛЫ НАД КАЗАРМАЙ

Ваенны гарадок стаяў каля рэчкі. На яе беразе расла старая бяроза. На вяршыні дрэва буслы зрабілі сабе гняздо.

Увосень птушкі адляцелі ў вырай. Аднойчы моцны вецер паваліў бярозу з буслянкай. Людзі ўбачылі гэта, пашкадавалі птушак, якія засталіся без гнязда.

У выхадны дзень салдаты ўзялі жалезную трубу, укапалі ў зямлю, добра ўтрамбавалі. Зверху прымацавалі аўтама-

більную пакрышку. На яе ўскінулі кучку галля, што засталася ад гнязда.

Прыйшла вясна. Неяк раніцай пара буслоў нізка праляцела над казармамі. Людзі паднялі галовы і сачылі за птушкамі. Буслы падляцелі да таго месца, дзе расла бяроза. Не ўбачыўшы дрэва, яны трывожна заклекаталі і пачалі кружыцца. Усе падумалі, што буслы паляцяць адсюль.

Раптам птушкі сталі зніжацца, селі на кола. Потым буслы прынеслі галінак, падправілі гняздо. Праз некаторы час бусліха знесла яйкі, вывеліся бусляняты.

Не раз салдаты прыносілі для буслоў пачастунак: булку, рыбу, каўбасу. Бусліха злятала ўніз, брала ежу, карміла птушанят і клекатала, дзякавала салдатам.

Усё лета буслы лялі над ваенным гарадком. Але прыйшоў час зноў выпраўляцца ў вырай. Паляцелі туды два старыя і пяць маладых буслоў (Паводле В. Хомчанкі). (171 слова)

1. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Ці праводзіцца гэта думка праз увесь тэкст? Якія ўчынкі салдат сведчаць пра іх клапатлівыя адносіны да птушак? Растлумачце сэнс апошняга сказа тэксту.

2. Да якога тыпу і стылю маўлення належыць тэкст? Абгрунтуйце сваю думку.

3. З якіх кампазіцыйных частак складаецца тэкст? Якой кампазіцыйнай часткі тэксту можа адпавядаць пункт плана «Будаўніцтва новай буслянкі»? Складзіце план тэксту. Параўнайце схему будовы тэксту з яго планам.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання? Выпішыце з кожнага абзаца дзеясловы, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку ў тэксце.

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *ваенны, увосень, уніз, клекатала*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе з абагульняльным словам пры аднародных членах.

## ТАПОЛЯ

За лета таполя з маленькай галінкі ператвараецца ў трохметровае дрэва. Гэтую ўласцівасць таполі выкарыстоўваюць для спынення рухомых пяскоў, з-за якіх гіне ўрадлівая гле-

ба. Уваткнутыя ў пясок шматлікія галінкі хутка становяцца дрэвамі і сваім карэннем «звязваюць» пяскі, не даючы ім распаўзацца.

Таполя ўмее «хадзіць». Ад яе кораня вырастае новае дрэўца, корань цягнецца далей, а з яго зноў імкне парастак.

Лістота таполі — сапраўдны фільтр для гарадскога паветра, загазаванага транспартам. Толькі не кожны чалавек гэтыя дрэвы любіць. Калі яны цвітуць, нідзе не схавацца ад таполевага пуху. Але вінаваты ў гэтым тыя, хто азеляняе вуліцы. Таполя — дрэва двухдомнае. На адным дрэве растуць мужчынскія кветкі, на другім — жаночыя. Пух жа бывае толькі на таполях з жаночымі кветкамі. Вось і выхад з праблемы (Паводле Х. Гурыновіча). (118 слоў)

1. Якая тэма тэксту? Ці перадае яе загаловак? Якую ўласцівасць таполі выкарыстоўваюць для спынення рухомых пяскоў? Растлумачце сэнс сказа «Таполя — дрэва двухдомнае». Што трэба рабіць, каб падчас цвіцення таполяў у паветры было менш пуху?

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы. Ці супадаюць абзацы і часткі тэксту? Дайце часткам загалоўкі.

4. Якія словы, выразы ўжыў аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння слова *таполя*? Чаму словы *звязваюць, хадзіць* узяты ў двукоссе? Якія моўныя сродкі выкарыстоўваюцца ў тэксце для таго, каб зрабіць прыклады пераканальнымі?

5. Назавіце арфаграмы ў наступных словах: *трохметровае, карэннем, распаўзацца, гарадскога*. Растлумачце пастаноўку працяжнікаў у сказах. Пракаменціруйце знакі прыпынку ў апошніх сказах першага і другога абзацаў.

## РАБІНА

Калі б рабіна цвіла адначасова з яблынямі ды вішнямі, многія людзі яе і не прыкмецілі б. Зацвітае рабіна позняй вясной. У сціплых жаўтаватых кветках, сабраных у гронкі, няма раскошы майскага саду. Затое восенню на фоне густой зеляніны аранжавыя ягады вабяць вока.

Ягады рабіны жорсткія і гаркаватыя. Але з першымі маразамі яны мяняюць свой смак. Ці ведаеце вы, што пасціла і мармелад такія смачныя дзякуючы рабіне?

Для птушак рабінавыя гронкі — сапраўднае свята. Асабліва цэняць іх дразды-рабіннікі. Гэтыя пералётныя птушкі застаюцца ў лесе да таго часу, пакуль на дрэвах пагойдваюцца мёрзлыя гронкі.

Падвесьце восенню пад дах пучкі рабінавых ягад. Хай іх падсалодзіць мароз. А ўзімку пакладзіце ягады ў кармушку. Да іх з удзячнасцю будуць прылятаць птушкі.

А яшчэ з ягад рабіны дзяўчынкі могуць зрабіць сабе чырвоныя пацеркі або ўпрыгожванні для навагодняй ёлкі (Паводле Х. Гурыновіча). (131 слова)

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту? Калі гаркаватыя ягады рабіны мяняюць свой смак? Якія птушкі асабліва любяць ласавацца ягадамі рабіны? Што трэба зрабіць восенню, каб зімой пачаставаць птушак рабінавымі ягадамі?

2. Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце? Знайдзіце ў тэксце апісанне рабіны. З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст?

3. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць у тэксце канцоўка? Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы. Назавіце сродкі сувязі сказаў у тэксце.

4. Якімі мастацкімі сродкамі карыстаецца аўтар пры апісанні рабіны? З якой мэтай у тэксце ўжыты дзеясловы загаднага ладу, пытальны сказ?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *позняй, зеляніны, мармелад, дразды-рабіннікі, узімку, навагодняй*. Растлумачце пастаноўку працяжніка ў першым сказе трэцяга абзаца, знакі прыпынку ў складаных сказах. Знайдзіце ў тэксце сказ з дзеепрыметнікавым зваротам, абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку.

## ДЗЬМУХАВЕЦ

Дзьмухавец — расліна трывалая. Ён расце ўсюды: на лугах, палянах, узлесках, агародах, уздоўж дарог. Яго топчуць людзі і жывёлы, заглушаюць трава і дрэвы. А ён расце і расце,

распраўляючы лісты і жоўтыя кветкі. Але дзьмухаўцы бываюць не толькі жоўтыя. У гарах Каўказа сустракаюцца віды з пурпуровымі і ліловымі кветкамі.

Парашуцікі дзьмухаўца разносіць вецер. Калі б кожны з іх вырастаў у кветку, то праз некалькі гадоў для дзьмухаўца спатрэбілася б велізарная плошча. Яна павінна быць большай за паверхню нашай планеты ў пятнаццаць разоў. Але не ўсё насенне выжывае, большая частка зярнятак гіне.

Мала хто ведае, што дзьмухавец можна есці. Маладое лісце вымочваюць у салёнай вадзе і робяць з яго салату.

У народзе дзьмухавец лічыцца добрым сродкам для ачышчэння лёгкіх. Ён дапамагае таксама ад бяссонніцы, паніжае крывяны ціск.

У сонечнае надвор'е дзьмухавец падкажа час. Яго суквецці адкрываюцца а шостай гадзіне раніцы і закрываюцца а трэцяй дня (Паводле П. Грынчанкі, А. Церашковай). (144 словы)

1. Якая тэма тэксту? Ці перадае яе загаловак? Каму адрасуецца тэкст? Чаму аўтары тэксту сцвярджаюць, што дзьмухавец — расліна трывалая? У якіх выпадках дзьмухавец выкарыстоўваецца ў народнай медыцыне? Якім чынам дзьмухавец можа падказаць час?

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Колькі падтэм выкарысталі аўтары для раскрыцця тэмы? Размясціце пункты плана тэксту ў правільнай паслядоўнасці:

1) Насенне дзьмухаўца.
2) Лекавыя ўласцівасці дзьмухаўца.
3) Трывалая расліна.
4) Кветка-гадзіннік.
5) Салата з дзьмухаўца.

4. Якую сэнсавую ролю выконваюць у тэксце лічэбнікі? З якой мэтай у першым абзацы тэксту ўжываюцца аднародныя члены сказа?

5. Назавіце арфаграмы ў наступных словах: *дзьмухавец, велізарная, пятнаццаць, бяссонніцы, суквецці*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў першым і другім сказах тэксту. Знайдзіце ў тэксце сказ з дзеепрыслоўным зваротам, абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку.

## Сціслы пераказ

### БАРАВІК ПАД ПАРАСОНАМ

На ўскрайку лесу вырас вялікі мухамор. Грыбнікі праходзілі міма яго. Каму патрэбны ядавіты грыб?

Пайшоў Васіль у грыбы і ўбачыў той мухамор. Спыніўся, залюбаваўся прыгажосцю грыба. Які ён яркі! Баравікі, сыраежкі, рыжыкі — усе грыбы хаваюцца ў траве, імху, пад лісцем. А гэты мухамор адразу ў вочы кідаецца.

Над мухаморам схілілася сухая галінка сасны, і грыб упёраўся ў яе шапкай. Многія грыбнікі бачылі, што галінка перашкаджае расці мухамору. Але ніхто не дапамог грыбу, не зламаў той галінкі. Людзі не хацелі ратаваць грыб, які ў кошык не пакладзеш.

Васіль прысеў перад мухаморам і зламаў сухую галінку, у якую ўпіралася шапка грыба. Мухамор вызваліўся, хіснуўся, і пад шырокай чырвонай шапкай Васіль убачыў баравік. Гэты хітрун схаваўся пад мухаморам, быццам парасонам накрыўся.

Васіль усміхнуўся. А мухамор нібы падміргнуў яму сваімі белымі кропкамі і сказаў: «Ты дапамог мне, а я табе за гэта баравік падарыў!» (Паводле В. Хомчанкі). (143 словы)

1. Што перадае загаловак тэксту: тэму ці асноўную думку? Чаму людзі не хацелі ратаваць мухамор? Як мухамор «аддзячыў» Васілю? Чаму аўтар тэксту называе баравік хітруном?

2. Дакажыце, што тэкст адпавядае тыповай схеме апавядання. Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Назавіце асаблівасці і прыметы гэтага стылю.

3. Складзіце схему будовы тэксту. Суаднясіце яе з наступным планам:

1) Ядавіты грыб.
2) Мухамор-прыгажун.
3) Перашкода.
4) Баравік-хітрун.
5) Падзяка мухамора.

Ахарактарызуйце сродкі сувязі сказаў у чацвёртым абзацы тэксту.

4. Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаюцца пачатак дзеяння, яго развіццё, заканчэнне. Растлумачце сэнс фразеалагізма *кідацца ў вочы*. Якую сэнсава-стылістычную ролю выконваюць у тэксце пытальны і клічныя сказы?

5. Назавіце арфаграмы ў наступных словах: (*на*) *ускрайку, сыраежкі, хіснуўся*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе з абагульняльным словам пры аднародных членах, у сказе з простай мовай.

6. Сцісла перакажыце тэкст, перадаўшы змест кожнага абзаца адным-двума сказамі.

## СМЕЛАЯ ВАРОНА

Адна варона аблюбавала двор з вялікай чарадой курэй. Але карыта з кормам стаяла на парозе куратніка, чубаткі[1] не адыходзілі ад яго. Побач тупаў грозны певень. Спынілася варона воддаль, глытае сліну, але баіцца наблізіцца да хлеўчыка.

Гаспадыня вынесла з хаты цёплую ежу ў шырокай місе, паставіла каля дзвярэй хлеўчыка. Некалькі курэй пабегла да місы. Варона таксама паціху наблізілася да яе, дзеўбанула два разы і адскочыла. Злосна зіркае на пеўня, з зайздрасцю пазірае на курэй, якія клююць ежу бесперастанку. Не выцерпела, зноў стала падкрадацца да місы. Дзюбай схапіла яе за край і пацягнула далей ад карыта і ад пеўня.

Куры разгублена пазіралі на варону. А яна амаль на метр адцягнула кармушку і не выпускае з дзюбы. Нарэшце спынілася, перавяла дух і ўзялася за снеданне. Зірне на пеўня, на курэй, дзеўбане некалькі разоў і падыме галаву ўверх. Каркае, кліча іншых варон, якія сядзяць на хляве, са страхам пазіраючы на пеўня. А ён здзіўлена глядзіць на нахабную варону.

Вось каля місы ўжо тры вароны тупаюць, ядуць з апетытам. Хваляць сяброўку за смеласць, кемлівасць і гасціннасць (Паводле В. Гурскага). (173 словы)

---

[1] Чуба́тка, -і, *ДМ* -тцы; *Р мн.* -так; *ж.* Птушка з чубам на галаве (звычайна пра курыцу).

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту? Чаму, характарызуючы варону, аўтар ужывае словы *смелая* і *нахабная*? Растлумачце, чаму іншыя вароны хвалілі сяброўку за смеласць, кемлівасць і гасціннасць.

2. Дакажыце, што тэкст адпавядае тыповай схеме апавядання. Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Назавіце асаблівасці і прыметы гэтага стылю.

3. З якіх кампазіцыйных частак складаецца тэкст? Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы. Ці супадаюць абзацы і часткі? Ахарактарызуйце сродкі сувязі сказаў у тэксце.

4. Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаюцца пачатак дзеяння, яго развіццё і заканчэнне. Знайдзіце ў тэксце фразеалагізм, які мае значэнне ‘зрабіць кароткі перапынак, перадышку ў чым-небудзь’. Якія прыслоўі выкарыстоўвае аўтар, каб выразна апісаць стан вароны, курэй, пеўня?

5. Растлумачце правапіс наступных прыслоўяў: *воддаль*, *паціху*, *бесперастанку*, *уверх*. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Знайдзіце ў тэксце сказ з дзеепрыслоўным зваротам, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

6. Вызначце галоўнае і другараднае ў тэксце. Сцісла перадайце змест тэксту, захаваўшы істотныя моўныя сродкі.

## НА КЛАДЦЫ[1]

За вёскай працякаў ручай, які ўпадаў у Нёман. Праз гэты ручай дзеці паклалі шэсць доўгіх жэрдак, каб можна было перабрацца на другі бераг.

Аблюбавалі кладку звяры. Лісіца доўга тупала каля ручая, не хацела мачыць ногі. Прынюхвалася да жэрдак, прыглядалася. І нарэшце асмелілася, павольна пайшла па кладцы. Пасля вярнулася, пасядзела на беразе ды стала бегаць туды-сюды.

А лось толькі касавурыўся[2] на кладку. Да самага снегу ён пераходзіў ручай у неглыбокім месцы. Але зімой да мокрых

[1] Кла́дка, -і, *ДМ* -дцы; *Р мн.* -дак; *ж.* Дошка або бервяно, пакладзеныя з берага на бераг для пераходу.

[2] Касаву́рыцца, -ву́руся, -ву́рышся, -ву́рыцца; незак., на каго-што. Разм. Непрыхільна адносіцца да каго-, чаго-небудзь.

ног пачаў прыліпаць снег, замярзаць. Даводзілася адбіваць лёд. Доўга нылі пасля ногі, напаміналі ласю, што небяспечна лезці ў халодную ваду.

Аднойчы ласіная сям'я рашыла перайсці на другі бераг ручая. Лось першы падышоў да вады і спыніўся. Пастаяў крыху і падаўся да кладкі, асцярожна ступіў на жэрдкі. Непадалёку бегла ліса, спынілася, паглядзела на ляснога рагача. Чакала, што вось-вось кладка пераломіцца. Але лось шчасліва перабраўся на другі бераг. Тады на кладку ступіла ласіха. За ёй пайшло і ласяня, падахвочанае бацькамі.

Так дзіцячая кладка стала служыць не толькі людзям, але і звярам (Паводле В. Гурскага). (165 слоў)

1. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? У якім сказе яна сфармулявана? Чаму лісіца адразу аблюбавала кладку, а лось баяўся ступіць на жэрдкі? Што прымусіла лася перайсці ручай па кладцы? У якой паслядоўнасці ласіная сям'я перабіралася па кладцы на другі бераг ручая?

2. Да якога тыпу і стылю маўлення належыць тэкст? Абгрунтуйце сваю думку.

3. Устанавіце адпаведнасць паміж кампазіцыйнымі часткамі тэксту і пунктамі плана:

| | |
|---|---|
| а) Пачатак дзеяння | 1) Кладка з жэрдак. |
| б) Развіццё дзеяння | 2) Лісіца на кладцы. |
| в) Заканчэнне дзеяння | 3) Зімовыя непрыемнасці. |
| | 4) Пераход ласінай сям'і праз ручай. |
| | 5) Кладка на службе ў звяроў. |

Знайдзіце ў тэксце прыклады сказаў, звязаных паміж сабой пры дапамозе займеннікаў, злучнікаў, аднатыпных граматычных формаў дзеясловаў.

4. Якія дзеясловы выкарыстоўвае аўтар, каб дакладна апісаць рухі звяроў? Знайдзіце сярод гэтых дзеясловаў сінонімы. З дапамогай слоў якіх часцін мовы перадаецца стан звяроў? Які выраз ужывае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння слова *лось*?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: (*на*) *кладцы*, *туды-сюды*, *небяспечна*, *перайсці*, *падышоў*, *непадалёку*, *вось-вось*. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі,

складаных сказах. Знайдзіце ў тэксце сказ з дзеепрыметнікавым зваротам, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

6. Сціcла перакажыце тэкст, перадаўшы змест кожнага абзаца адным-двума сказамі.

## Выбарачны пераказ

### ЧАЙКА ДАПАМАГЛА

Карабель плыў да ўзбярэжжа Камчаткі. Было ціха, цёпла, сонечна. Свабодныя ад вахты матросы былі на палубе.

З правага борта крыкнулі:

— Дэльфін!

Матросы перабеглі туды і ўбачылі, як падскочыла ўгору буйная рыбіна. Гэта быў ласось. Ён павольна плаваў на паверхні, крута мяняючы кірункі.

Паглядзеўшы ў бінокль, мічман[1] сказаў, што рыба просіць дапамогі. Да ласося прысмакталася мінога[2], моцна ўгрызлася ў яго цела. І ласось, пакутуючы ад болю, усплыў на паверхню, шукаючы ратунку.

Але хто яму мог дапамагчы? Хутка загадка была адгадана.

Аднекуль з'явілася чайка, знізілася, крыкнула і, зрабіўшы круг, села на ваду. Ласось бокам падплыў да птушкі і спыніўся. Тонкая чорная мінога адчула небяспеку, пачала выгінацца і біць па целе ласося. Але ж адпусціць здабычу і не думала.

Чайка ўхапілася дзюбай за хвост міногі і пацягнула. Тая не адрывалася. Птушка сярдзіта крыкнула і ўчапілася другі раз. Ласось тузаўся ўбок, дапамагаючы чайцы. Вось чайка і ласось адначасова на ўсю сілу рванулiся ў розныя бакі, і мінога засталася ў дзюбе чайкі.

---

[1] Мі́чман, -а, *м.* Воінскае званне старшынскага саставу ў Ваенна-Марскім Флоце, а таксама асоба, якая мае гэта званне.

[2] Міно́га, -і, *ж.* Водная пазваночная жывёліна са змеепадобным целам.

Ласось, вызвалены ад драпежніцы, закружыў па вадзе, потым падскочыў і, бліснуўшы белым жыватом, пайшоў у глыбіню (Паводле В. Хомчанкі). (175 слоў)

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту? Як мічман здагадаўся, што ласось просіць дапамогі? Якім чынам чайка дапамагла ласосю вызваліцца ад міногі?

2. Дакажыце, што тэкст адпавядае тыповай схеме апавядання. Вызначце стыль маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. З якіх кампазіцыйных частак складаецца тэкст? Ці супадаюць абзацы і часткі? Складзіце план тэксту.

4. З дапамогай слоў якой часціны мовы дасягаецца дынамізм апавядання? Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі жывёл і дзеясловамі, якія характарызуюць іх дзеянні:

| | |
|---|---|
| 1) ласось | а) прысмактацца |
| 2) мінога | б) угрызціся |
| 3) чайка | в) пакутаваць |
| | г) крыкнуць |
| | д) выгінацца |
| | е) ухапіцца |
| | ж) пацягнуць |
| | з) тузацца |
| | і) падскочыць |

*Адказы*: 1 — в, з, і; 2 — а, б, д; 3 — г, е, ж.

Знайдзіце ў тэксце сінонімы да дзеяслова *ўчапіцца*. Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння слоў *ласось, чайка, мінога*?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *узбярэжжа, угору, небяспеку, убок*. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі.

6. Перакажыце эпізод, у якім паведамляецца пра тое, як чайка дапамагла ласосю. Выкарыстайце ў тэксце пераказу дзеепрыслоўныя звароты.

## ЛАНДЫШ

У пачатку вясны ў цяністых лясных мясцінах з'яўляюцца з-пад зямлі лісты, туга скручаныя адзін вакол другога. Рас-

соўваючы каменьчыкі і апалае лісце, яны прабіваюць глебу, каб даць дарогу сцяблінe са званочкамі. Кветкі распускаюцца па чарзе. Спачатку раскрываецца ніжняя кветка, потым другая, трэцяя. І вось ужо паміж двух вялікіх лістоў вісяць духмяныя белыя званочкі.

Увосень на месцы кветак красуюцца бліскучыя чырвоныя ягады. Аднак ягады гэтыя атрутныя. Хоць уся расліна і прывабная, але горкая на смак. Таму мала хто з жывёл пакваліцца на яе.

Людзям ландыш падабаецца за далікатны, але моцны пах. Непаўторны водар кветкам надае эфірны[1] алей. Яго выкарыстоўваюць у парфумерыі. З лістоў ландыша робяць лекі ад хвароб сэрца.

У розных народаў з ландышам звязана мноства легенд і казак. Украінскае паданне сцвярджае, што кветка вырасла са слёз дзяўчыны, якая чакала казака з паходу. У некаторых еўрапейскіх легендах расказваецца, што ў званочках ландышаў жывуць лясныя эльфы, хаваюцца сонечныя зайчыкі.

Трэба памятаць, што ландышы ўзяты пад ахову. Таму збіраць іх забаронена (Паводле П. Грынчанкі, А. Церашковай). (158 слоў)

1. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Каму ён адрасуецца? У якой паслядоўнасці распускаюцца кветкі ландыша? Што надае ім прыемны водар? З якой мэтай ландыш выкарыстоўваецца ў медыцыне? Чаму збіраць ландышы забаронена?

2. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Абгрунтуйце сваю думку.

3. Колькі падтэм выкарысталі аўтары для раскрыцця тэмы? Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы. Складзіце план тэксту. Вызначце спосабы сувязі сказаў у першым і чацвёртым абзацах тэксту.

4. Словы якіх часцін мовы выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку ў тэксце? Якімі мастацкімі сродкамі карыстаюцца аўтары пры апісанні ландыша? Чаму, апісваючы працэс з'яўлення кветак лан-

[1] Эфі́рны, -ая, -ае. Тут: які ўтрымлівае эфір — арганічнае злучэнне кіслот са спіртамі.

дыша, аўтары ўжываюць дзеясловы цяперашняга часу? Растлумачце лексічнае значэнне слова *эльф*.

5. Растлумачце правапіс ужытых у тэксце прыслоўяў і спалучэнняў слоў, блізкіх да прыслоўяў. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыметнікавым, дзеепрыслоўным зваротамі, аднароднымі членамі.

6. На аснове прыведзенага тэксту складзіце тэкст-апісанне ландыша. Выкарыстайце прыслоўі і спалучэнні слоў, блізкія да прыслоўяў.

## САЛІГОРСКІЯ АГНІ

Незлічоныя скарбы схаваны пад зямлёй, на якой пабудаваны горад Салігорск. Здабыць іх могуць умелыя і вопытныя рукі, сучасныя машыны.

У Салігорску можна пачуць цікавую легенду. Шмат слёз пралілі нашы продкі. Слязамі арасілі зямлю. Глыбока ў нетры зацяклі яны. І ўтварылася там з людскіх слёз салёнае мора. А потым ператварылася яно ў соль зямлі. І назвалі яе сільвінітам.

Каб спусціцца ў шахту, трэба надзець рабочы касцюм, каску з ліхтарыкам. Вялізны ліфт едзе пад зямлю. У шахце «падлога» і «сцены» быццам высланы дыванамі. Чырвоныя, белыя, бардовыя, бэзавыя фарбы ўплецены ў шэрую пароду. Гэта каляровая сцяна салёная на смак. Дыхаецца тут лёгка. Падземныя машыны ездзяць па шырокай і роўнай вуліцы, якая называецца штрэкам.

Шахцёры працуюць там, дзе «столь» трымаюць металічныя «далоні». Тут магутныя камбайны ўгрызаюцца ў зямныя нетры. Шахцёры — стваральнікі салігорскай славы. Твары ў іх валявыя, мужныя. Беларускай калійнай солі так многа, што працы хопіць не аднаму пакаленню шахцёраў.

Калійныя ўгнаенні робяць урадлівымі сельскія нівы, дапамагаюць хлебаробам збіраць багаты ўраджай не толькі ў нашай рэспубліцы, але і за яе межамі. Вось як далёка свецяць агні нашага Салігорска! (Паводле У. Ліпскага). (176 слоў)

1. Вызначце асноўную думку тэксту. Пацвердзіце яе адпаведнымі словамі з тэксту. Ці праводзіцца гэта думка праз увесь тэкст? Раскажыце легенду пра паходжанне сільвініту. Як выглядае шахта? З якой мэтай выкарыстоўваецца калійная соль?

2. Вызначце стыль маўлення. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце? Знайдзіце ў тэксце апісанне. З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст?

3. Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць у тэксце канцоўка? Які яна мае сэнс? Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы. Складзіце план тэксту так, каб яго пункты мелі форму пытанняў.

4. Выпішыце з часткі тэксту, у якой апісваецца шахта, якасныя прыметнікі, што выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку. Знайдзіце ў гэтай частцы тэксту дзеясловы, ужытыя ў пераносным значэнні. Чаму словы *падлога*, *сцены*, *столь*, *далоні* ўзяты ў двукоссе? Карыстаючыся прыведзенай у тэксце інфармацыяй, растлумачце лексічнае значэнне слова *штрэк*.

5. Назавіце арфаграмы ў наступных словах: *незлічоныя*, *легенду*, *людскіх*, *высланы*, *лёгка*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, складаных сказах, пастаноўку працяжніка ў трэцім сказе чацвёртага абзаца.

6. Перакажыце частку тэксту, у якой паведамляецца пра тое, як выглядае шахта.

## УРОК ГЕАГРАФІІ

Геаграфію ў нас выкладаў Антон Антонавіч Струк. Яго незвычайнасць праявілася з першага ўрока.

Географ хутка ўвайшоў у клас, шпурнуў на стол партфель і арліным позіркам акінуў вучняў. Настаўнік загадаў дзяжурным прынесці карту.

Пачалося нешта чароўнае. Антон Антонавіч не паварочваўся тварам да карты, стаяў да яе спінай. Але яго ўказка дакладна апускалася на горныя хрыбты, плыла па рэчышчах ад вытокаў да вусцяў, адзначаючы ўсе звіліны.

Географ гаварыў:

— Мы ідзём па Сахары. Вады трэба ўзяць на пяць сутак, каб дайсці да бліжэйшага аазіса[1]. На галаве ў нас пробкавыя шле-

[1] Аа́зіс, -а, *м.* Месца ў гарачай пустыні, дзе ёсць вада і расліннасць.

мы, іначай мы загінем ад сонечнага ўдару. Тэмпература — пяцьдзясят шэсць па Цэльсію. Пад нагамі гарачы пясок. Пакладзіце туды яйка, і яно праз паўгадзіны спячэцца без агню. На сотні кіламетраў вакол нас шэрая пустыня. Расліннасці амаль няма, толькі зрэдку ля падножжа бархана[1] ўбачыш калючыя кусцікі. Прабяжыць яшчарка, можна наткнуцца на маленькую змейку. Яе ўкус смяротэльны.

Некалі тут былі гарады і людныя паселішчы. А мільёны гадоў назад Сахара была дном акіяна.

Мы ідзём па Сахары за Антонам Антонавічам. Нам здаецца, што скура ў кожнага пачарнела. Мы загартаваліся і лягчэй пераносім страшэнную спёку. Захопленыя падарожжам, мы адкрываем невядомае і не баімся цяжкасцей (Паводле І. Навуменкі). (187 слоў)

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку тэксту? З якога літаратурнага твора ўзяты гэты фрагмент? (*З апавядання Івана Навуменкі «Жуль Верн».*) У чым праяўлялася «незвычайнасць» настаўніка геаграфіі? Якім чынам Антон Антонавіч выклікаў у сваіх вучняў цікавасць да вывучэння геаграфіі?

2. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Знайдзіце ў тэксце апісанне. З якой мэтай аўтар уводзіць яго ў тэкст? Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Назавіце прыметы, характэрныя для гэтага стылю.

3. З якіх кампазіцыйных частак складаецца тэкст? Якой кампазіцыйнай частцы тэксту можа адпавядаць пункт плана «Небяспечнае падарожжа»? Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў аўтар падкрэслівае «незвычайнасць» паводзін настаўніка? Чаму замест словазлучэнняў *паклаў партфель, паглядзеў на вучняў, папрасіў дзяжурных* аўтар выкарыстоўвае выразы *шпурнуў партфель, арліным позіркам акінуў вучняў, загадаў дзяжурным*? З якой мэтай пры апісанні пустыні Сахары выкарыстоўваюцца лічэбнікі? Якія словы ўжывае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння імя *Антон Антонавіч*?

5. Растлумачце правапіс канчаткаў наступных назоўнікаў: (*з*) *урока*, (*па*) *Сахары*, (*ад*) *удару*, (*без*) *агню*. Абгрунтуйце пастаноў-

[1] Барха́н, -а, *м*. Наносны пясчаны ўзгорак у стэпах, пустынях.

ку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыметнікавым, дзеепрыслоўным зваротамі, складаных сказах, сказах з простай мовай.

6. Перакажыце частку тэксту, дзе расказваецца пра Сахару, ад імя вучня, які выступае перад класам з паведамленнем на тэму «Пустыня Сахара».

## ПОЛЬСКІ ГРЫБ

Чаму грыб называюць польскім? У часы Рэчы Паспалітай, калі ў адну дзяржаву аб'ядналіся Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае, на нашых землях падчас сумесных баляў падавалі да стала стравы з гэтага грыба. Беларусы хацелі зрабіць прыемнае палякам і паказаць, што добра ведаюць схільнасці суседзяў. Да таго часу ў беларускай кухні польскі грыб не карыстаўся вялікай павагай. А вось палякі яго высока цанілі з даўніх часоў. Таму гэты грыб у Беларусі і стаў называцца польскім. А ў Польшчы яго называюць панскім грыбам.

Польскі грыб сваёй паставай нагадвае заможнага вяльможу. Шапачка ў яго цёмна-каштанавая, колеру горкага шакаладу. У сырое надвор'е яна бліскучая, а ў сухое матавая. Ножка цыліндрычная, пад шапкай жоўценькая, у сярэдняй частцы светла-рудая.

Малады польскі грыбок — копія дарослага грыба ў мініяцюры. Шапачка яго адразу раскрыта, не прыціснута да ножкі. Маленькі грыбок трэба браць вельмі акуратна, таму што яго ножка слаба злучана з шапачкай.

Польскія грыбы могуць даваць ураджаі да позняй восені. Звычайна яны растуць у сасняках. Але можна сустрэць іх і ў зялёным моху ельніку, і па суседстве з дубам (Паводле Я. Шапаравай). (172 словы)

1. Што перадае загаловак тэксту: тэму ці асноўную думку? Растлумачце паходжанне назвы «польскі грыб». Чаму аўтар тэксту сцвярджае, што польскі грыб нагадвае заможнага вяльможу? Дзе растуць польскія грыбы?

2. Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Якія тыпы маўлення спалучаны ў тэксце? Абгрунтуйце сваю думку.

3. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? У якіх абзацах тэксту прыводзіцца апісанне польскага грыба? Складзіце схему будовы апісання польскага грыба.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаюцца выразнасць і дакладнасць апісання польскага грыба? Выпішыце з той часткі тэксту, дзе апісваецца польскі грыб, якасныя прыметнікі, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку. З якой мэтай у апісанні ўжыты назоўнікі і прыметнікі з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі?

5. Растлумачце правапіс ужытых у тэксце ўласных назваў, складаных прыметнікаў. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, працяжніка ў першым сказе трэцяга абзаца.

6. Напішыце выбарачны пераказ-апісанне польскага грыба.

## Пераказ з дадатковым заданнем

### ЯК ШУКАЛІ НАФТУ

Вакол нашай вёскі былі непраходныя балоты. Дарослыя палохалі дзяцей, што там жывуць ведзьмакі, рагатыя чэрці. Мы баяліся нячысцікаў, але ж вельмі хацелася паглядзець на іх. Таму хадзілі ў лес, сабраўшыся гуртам.

Аднойчы, далекавата зайшоўшы ад дому, мы сталі сведкамі страшнага выбуху. Спачатку ўбачылі за полем чужых людзей. Яны прыехалі на дзіўнай машыне. Падняўшы ўгору нейкую стралу, пачалі свідраваць зямлю. Мы былі перакананы, што гэта шпіёны. Вырашылі высачыць іх. Ляжым, перашэптваемся. Раптам як бабахне! Аж зямля пад намі скаланулася. Мы падумалі, што наступіў канец свету. Падхапіўшыся, панесліся ў вёску.

Выбух той нарабіў перапалоху ва ўсіх хатах. Людзі яшчэ памяталі вайну, і выбух нагадаў ваеннае ліхалецце. Але гэта быў мірны выбух. Пазней усе жыхары Рэчыцкага раёна даведаліся, што ў нашай мясцовасці геолагі знайшлі нафту (Паводле У. Ліпскага). (125 слоў)

1. Вызначце асноўную думку тэксту. Ці перадае яе загаловак? Чаму дзеці вырашылі, што высачылі шпіёнаў? Чаму выбух «нарабіў перапалоху ва ўсіх хатах»? Растлумачце значэнне выразу *мірны выбух*.

2. Вызначце стыль маўлення. Дакажыце, што тэкст адпавядае тыповай схеме апавядання.

3. Выдзеліце часткі, якія адпавядаюць схеме тэксту, дайце ім загалоўкі. Ці супадаюць абзацы і часткі? Ахарактарызуйце сродкі сувязі сказаў у першым абзацы тэксту.

4. Назавіце дзеясловы, з дапамогай якіх перадаюцца пачатак дзеяння, яго развіццё і заканчэнне. Якімі моўнымі сродкамі карыстаецца аўтар, каб перадаць узрушаны стан дзяцей?

5. Назавіце арфаграмы ў наступных словах: *ведзьмакі*, *спачатку*, *шпіёны*, *ваеннае*, *ліхалецце*, *Рэчыцкага*, *раёна*, *геолагі*. Растлумачце правапіс канчаткаў наступных назоўнікаў: (*ад*) *дому*, *выбуху*, *свету*, *перапалоху*, *раёна*. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі.

6. Перакажыце тэкст ад трэцяй асобы.

## ЧАЛАВЕК-ЛЕГЕНДА

Зіна Тусналобава была на вайне санінструктарам. Абавязак санінструктара — знаходзіцца на перадавой. Параненага салдата неабходна перавязаць, выцягнуць з-пад агню.

Сто дваццаць трох салдат і камандзіраў выратавала Зіна. Сто дваццаць чацвёртым мог стаць камандзір роты. Але, смяртэльна паранены, ён памёр на руках санінструктара. У тым баі была цяжка паранена ў ногі і Зіна.

Страціла дзяўчына прытомнасць і праляжала ў снезе амаль двое сутак. Знайшлі яе нашы разведчыкі, прынеслі ў медсанбат. Выратавалі дактары жыццё Зіне Тусналобавай, але не змаглі выратаваць прастрэленыя ногі і адмарожаныя рукі.

Чалавечая дабрыня дапамагла Зіне застацца ў страі. Дзяўчына была яшчэ ў шпіталі, а танкісты, ідучы ў бой, пісалі на танках: «За Зіну Тусналобаву!» На баявых самалётах пісалі:

«За дзяўчыну з Полацка!» Быццам сама Зіна ваявала супраць фашыстаў.

А потым вярнуўся з фронту яе каханы. Згулялі вяселле. У шчаслівай сям'і нарадзіліся сын і дачка. Жанчына зноў навучылася пісаць, гатаваць смачныя абеды.

Людзі выбралі яе дэпутатам. Зінаіда Міхайлаўна часта выступала перад вучнямі, воінамі, маладымі рабочымі. Вучыла самаахвярна любіць сваю Радзіму (Паводле У. Ліпскага). (161 слова)

1. Якая тэма тэксту? Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Растлумачце сэнс загалоўка. У чым заключаюцца абавязкі санінструктара на вайне? Чаму аўтар сцвярджае, што «чалавечая дабрыня дапамагла Зіне застацца ў страі»?

2. Да якога стылю і тыпу маўлення належыць тэкст? Абгрунтуйце сваю думку.

3. З якіх кампазіцыйных частак складаецца тэкст? Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Размясціце пункты плана тэксту ў правільнай паслядоўнасці:

1) Цяжкае раненне.
2) Шчаслівая сям'я.
3) Абавязкі санінструктара.
4) Зінаіда Міхайлаўна — дэпутат.
5) «За дзяўчыну з Полацка!»

Складзіце схему будовы тэксту, параўнайце яе з планам.

4. Якую сэнсава-стылістычную ролю выконваюць у тэксце лічэбнікі? Знайдзіце ў тэксце ваенную лексіку. З якой мэтай яна ўжываецца? Якія словы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння імя *Зіна*?

5. Назавіце арфаграмы ў наступных словах: *санінструктар*, *сто дваццаць трох*, *разведчыкі*, *медсанбат*, *дэпутатам*, *самаахвярна*, *Радзіму*. Растлумачце правапіс канчаткаў наступных назоўнікаў: (*у*) *баі*, (*у*) *снезе*, (*у*) *страі*, (*у*) *шпіталі*, (*з*) *фронту*. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў другім сказе першага абзаца, трэцім сказе другога абзаца, сказах з простай мовай.

6. Дапішыце заключную частку тэксту, выказаўшы ўласныя меркаванні пра тое, што такое мужнасць і адвага.

## НА КАНЬКАХ

Я вырашыў навучыцца катацца на коньках не горш за Эму.

У першы дзень трэніровак у мяне балелі і спіна, і ногі. Некалькі разоў я выцяўся аб лёд каленкамі і бокам. Ішоў дадому і думаў, што я самы нешчаслівы на свеце чалавек. Павячэраўшы, адразу ўпаў на ложак і заснуў. Мне сніліся рэчка, сіні лёд. Я падаў, стагнаў ад болю, але не прачынаўся.

Назаўтра ісці на рэчку мне не хацелася. Але перад вачыма стаяла Эма. І вось пасля ўрокаў я апрануў лыжны касцюм, узяў чаравікі з канькамі і падаўся на рэчку. Ішоў без жадання, хацеў нават вярнуцца, але перадумаў.

Пачалося тое самае. То праеду, то павалюся. Змарыўся так, што пот ліўся па твары. Калі было цяжка, я садзіўся адпачываць. Тады ўяўляў сабе той дзень, калі праеду перад Эмай на каньках. Якой разгубленай яна будзе! Гэтыя думкі надавалі мне сілы. І я зноў пачынаў катацца.

Рукі і ногі мае ад няспынных трэніровак наліваліся сілай. Я адчуваў, што мае рухі сталі больш дакладнымі. Аднойчы я выпісаў канькамі на лёдзе імя Эмы. Добра было б прамчацца ўдваіх па лёдзе навыперадкі! (Паводле М. Лупсякова). (177 слоў)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. У якім сказе сфармулявана асноўная думка тэксту? З якога літаратурнага твора ўзяты гэты фрагмент? (*З апавядання М. Лупсякова «Мэры Кэт».*) Як звалі галоўнага героя апавядання? (*Антон Бубноў.*) Чаму ў канцы першага дня трэніровак ён лічыў сябе самым нешчаслівым на свеце чалавекам? Якія думкі надавалі герою апавядання сілы? Як удасканальвалася майстэрства Антона ад трэніроўкі да трэніроўкі?

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Назавіце структурныя часткі тэксту, складзіце яго план. Укажыце апорныя словы, якія аб'ядноўваюць тэкст у адно цэлае (звязваюць тэкст лагічна і граматычна).

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў перадаецца стан галоўнага героя? Выпішыце з тэксту дзеясловы, якія абазначаюць

рух, знайдзіце сярод іх сінонімы. Якую ролю выконваюць у тэксце клічныя сказы?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *дадому, назаўтра, няспынных, адчуваў, удваіх, навыперадкі.* Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, складаных сказах.

6. Перакажыце тэкст ад трэцяй асобы.

Пры паходзе ў грыбы прытрымлівайцеся элементарных правіл.

Бярыце з сабой востры нож. Нельга проста выцягваць грыб з зямлі. Збіраць грыбы трэба так, каб не пашкодзіць грыбніцы. Можна зрэзаць шапку і пакінуць ножку.

Збірайце грыбы ў кошык. Не выкарыстоўвайце поліэтыленавыя пакеты, пластыкавую тару, ацынкаваныя вёдры. Гэта дазволіць пазбегнуць утварэння таксічных[1] прадуктаў распаду грыбоў і пераходу цяжкіх металаў у сабраныя грыбы.

Ніколі не збірайце грыбы, якія выклікаюць у вас сумненне ці падазрэнне. Не зразайце грыбы з прыкметамі плесені на шапцы або ножцы.

Нельга збіраць грыбы каля звалак, аўтамабільных дарог і чыгунак, на былых выпрабавальных палігонах[2]. У грыбніцу могуць пранікнуць таксічныя рэчывы, якія трапляюць у зямлю.

Перад прыгатаваннем стравы з грыбоў іх трэба абавязкова праварыць і зліць ваду.

Выконваючы гэтыя правілы, вы пазбегнеце непрыемнасцей, а збор грыбоў пакіне толькі добрыя ўспаміны (Паводле Я. Шапаравай). (128 слоў)

1. Каму адрасаваны тэкст? З якой мэтай ён напісаны? Дайце загаловак тэксту, каб перадаць яго тэму.

2. Да якога стылю маўлення належыць тэкст? Дакажыце гэта.

---

[1] Таксі́чны, -ая, -ае. Які ўтрымлівае таксіны — ядавітыя бялковыя рэчывы, што ўтвараюцца мікраарганізмамі, а таксама некаторымі жывёламі і раслінамі.

[2] Палігó́н, -а, *м.* Участак для вучэбнай, пераважна артылерыйскай стральбы, а таксама для выпрабавання рознай зброі.

3. Якая частка тэксту з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць у тэксце канцоўка? Абгрунтуйце падзел тэксту на абзацы.

4. Знайдзіце ў тэксце словы абмежаванага ўжытку, вызначце іх сэнсава-стылістычную ролю. З якой мэтай аўтарам выкарыстаны пабуджальныя сказы? Чаму ў тэксце паўтараюцца словы *трэба*, *нельга*, часціца *не*?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *элементарны*, *поліэтыленавы*, *пластыкавы*. Абгрунтуйце пастаноўку знакаў прыпынку ў апошнім сказе.

6. Перакажыце тэкст, пазбягаючы ўжывання дзеясловаў загаднага ладу. Напрыклад: *Пры паходзе ў грыбы прытрымлівайцеся элементарных правіл. — Пры паходзе ў грыбы варта прытрымлівацца элементарных правіл.*

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

## БЯРОЗА

Ёсць асаблівы майскі дзень, калі распускаецца бярозавая лістота. У гэты дзень у паветры пяшчотна пахне зелянінай.

Бяроза — адно з самых прыгожых дрэў. Яна адзіная ў свеце мае белую кару. Пакладзі на яе далонь у спякотны дзень. Адчуваеш прыемны халадок? Дрэва магло б лёгка атрымаць сонечныя апёкі, калі б не гэта кара. Белы колер бяроза набыла праз бетулін[1], які ўтрымліваецца ў кары. Назвалі яго так таму, што бяроза на латыні завецца бетула.

Вясной бяроза калыша на галінках аксамітныя[2] завушніцы. Летам яны выспяваюць і рассыпаюцца на лятучае насенне з крылцамі. Вецер разносіць яго вельмі далёка.

У народзе бярозу паважаюць. Яе драўніну выкарыстоўваюць у будаўніцтве, з бярозы вырабляюць фанеру і мэблю, здабываюць метылавы спірт і воцат. На бярозавай кары расце грыб чага, з якога робяць каштоўныя лекі. А кісла-салодкі бярозавік выдатна наталяе смагу (Паводле Х. Гурыновіча). (131 слова)

## ВАЛОШКА

У свеце існуе больш за пяцьсот відаў валошак самых розных колераў: блакітныя, сінія, ружовыя, жоўтыя, белыя, ліловыя. Але для беларусаў самай вядомай і звыклай з'яўляецца валошка сіняя. Яна лічыцца нашай нацыянальнай кветкай, адным з сімвалаў Беларусі. Ёй прысвячалі вершы Максім Багдановіч, Янка Купала, Якуб Колас і многія іншыя беларускія паэты. Узор валошкі вышываюць на ручніках, абрусах, хустках.

---

[1] Бетулі́н, -у, *м.* Белае смалістае рэчыва, якое запаўняе поласці клетак коркавай тканкі на ствалах бярозы і надае ёй белую афарбоўку.

[2] Аксамі́тны, -ая, -ае. Тут: падобны да аксаміту — тоўстай шаўковай тканіны, з аднаго боку пакрытай кароткім мяккім ворсам.

Гэтая кветка лічыцца пустазеллем у хлебным полі. Аднак ніхто не назаве яе шкоднай ці непатрэбнай. Блакітныя зорачкі валошак цудоўна аздабляюць летні пейзаж. Здаўна з пялёсткаў валошкі рабілі сінюю фарбу. А яшчэ валошка — вядомая лекавая расліна. Яна дапамагае вылечыцца ад прастуды, хвароб скуры, вачэй, печані, нырак, нерваў.

Людзі так палюбілі гэтую сціплую кветку, што сталі спецыяльна вырошчваць яе. Кветкаводы вывелі некалькі відаў валошак, якія нагадваюць сінюю жытнёвую валошку. Цяпер палянкі з гэтых кветак можна ўбачыць на газонах і клумбах (Паводле П. Грынчанкі, А. Церашковай). (136 слоў)

## ПА ДАРОЗЕ СА ШКОЛЫ

Цёплым вясновым днём хлопчыкі-аднакласнікі вярталіся са школы ў сваю вёску. Перагаворваючыся, жартуючы, яны непрыкметна падышлі да ручая. Сябры заўважылі, што ручай разліўся, вясенняя паводка сарвала кладку[1].

Да хлопчыкаў падышла бабуля, бездапаможна развяла рукамі. Яна паскардзілася, што сабралася ў госці да ўнучкі, але не змагла перайсці ручай.

Вова прапанаваў аднакласнікам зрабіць новую кладку. Тоўстае бервяно ляжала каля ручая. Хлопчыкі ледзь паднялі яго і перакінулі на другі бераг.

Рыгорка зірнуў на бабулю і сказаў:

— Яшчэ парэнчы[2] трэба зрабіць.

Па абодвух баках бервяна хлопчыкі ўбілі ў зямлю калкі і звязалі іх лазою. Атрымаліся парэнчы.

Алесь запрасіў бабулю перайсці ручай. Хлопчык першы пабег па кладцы. Бабуля ўбачыла, што кладка надзейная. Жанчына асцярожна ступіла на бервяно, узялася рукамі за парэнчы і, перайшоўшы на другі бераг, падзякавала хлопчыкам.

---

[1] Кла́дка, -і, *ДМ* -дцы; *Р мн.* -дак; *ж.* Дошка або бервяно, пакладзеныя з берага на бераг для пераходу.

[2] Парэ́нчы, -аў, *мн.* Агароджа, поручні па краях лесвіцы, балкона, моста.

Весела перагаворваючыся, аднакласнікі пабеглі ў вёску (Паводле А. Якімовіча). (132 словы)

## «СЛАВЯНСКІ БАЗАР У ВІЦЕБСКУ»

Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» пачаў сваю гісторыю 18 ліпеня 1992 года. Яго стваральнікамі былі тры дзяржавы: Беларусь, Расія і Украіна. У самым пачатку фестываль быў сціплай «сустрэчай сяброў» з трох славянскіх народаў. Яго арганізатары імкнуліся пазнаёміць віцебскага гледача з песеннай творчасцю славянскіх краін. Але цікавасць да гэтага культурнага мерапрыемства была надзвычай вялікай, і фестываль стаў штогадовым.

У 1993 годзе на флагштоку[1] «Славянскага базару» ўпершыню з'явіліся сцягі Славакіі, Кыргызстана, Літвы, Турцыі, Балгарыі, Югаславіі. З 1995 года «Славянскі базар» стаў называцца Міжнародным фестывалем мастацтваў. За два дзесяцігоддзі ў ім прынялі ўдзел прадстаўнікі амаль сямідзесяці краін.

Сама назва фестывалю надзвычай красамоўная. Яна сведчыць пра адметнасць культуры славянскіх народаў, нагадвае пра шчырую і добразычлівую атмасферу нашых старадаўніх кірмашоў.

Дзякуючы фестывалю «Славянскі базар у Віцебску» Беларусь сёння з'яўляецца важным культурным цэнтрам славянскага свету (Паводле інтэрнэт-рэсурсаў). (135 слоў)

## ЦЕРАМ-РУКАВІЦА

Аднойчы ўвесну Федзя капаў на агародзе градкі і згубіў рукавіцу. Шукаў, але не знайшоў, тады і другую выкінуў.

Мінула тыдні два, і хлопчык зноў прыйшоў на агарод. Убачыў на плоце сваю згубленую рукавіцу. Толькі цяпер Федзя ўспомніў, што ён сам яе туды павесіў.

---

[1] Флагшто́к, -а, *м.* Шост для пад'ёму флага.

Хлопчык працягнуў руку да рукавіцы. Раптам адтуль вылецела птушка. «Што яна там рабіла?» — падумаў Федзя. Зазірнуў ён у рукавіцу і ўбачыў гняздзечка і чатыры маленькія яечкі.

Федзя здзівіўся. Ён ніколі не бачыў і не чуў, каб птушкі вілі гнёзды ў рукавіцах. Зусім побач скакалі два вераб'і. Гэта яны і занялі церам-рукавіцу.

Праз некалькі тыдняў у вераб'ёў вывеліся неспакойныя птушаняткі. Калі хлопчык падыходзіў да іх, яны раскрывалі дзюбы, пішчалі, выцягвалі шыйкі.

Федзя пачаў дапамагаць дарослым вераб'ям карміць птушанят. Хлопчык лавіў мошак, падыходзіў да рукавіцы і клікаў вераб'янят. Самаму крыклівaму птушаняці Федзя кідаў у дзюбу мошку (Паводле В. Хомчанкі). (138 слоў)

## КОНІКІ

Гаспадарамі амаль любога лугу з'яўляюцца прамакрылыя насякомыя: конікі, кабылкі, цвыркуны і іншыя казяўкі.

У Беларусі сустракаюцца зялёны і пявучы конікі. Гэтыя насякомыя могуць дасягаць шасці сантыметраў. Але само цела ў іх звычайна каля трох сантыметраў, вусікі даўжэйшыя за палову цела.

Для перамяшчэння конікі выкарыстоўваюць як свае вялікія крылы, так і доўгія заднія ногі. Пры гэтым скачуць яны даволі далёка і хутка. Калі ты схопіш коніка за нагу, то ў тваіх пальцах можа застацца толькі гэта ножка. А сам конік схаваецца ў траве. Адкідванне нагі дапамагае яму ратавацца. Аднак далей коніку будзе жыць ужо цяжэй. Таму не трэба лавіць гэтых насякомых.

Спажываюць конікі не толькі раслінную, але і жывёльную ежу. Зялёны конік есць нават лічынак каларадскага жука, які з'яўляецца шкоднікам бульбы.

Лічынкі конікаў вельмі падобныя да сваіх бацькоў. Толькі яны меншыя па памерах і не маюць добра развітых крылаў (Паводле Л. Чумакова). (139 слоў)

## ЧАРАІТ

У 1973 годзе ў Якуціі, у глухой сібірскай тайзе, на абрывістым беразе сцюдзёнай ракі Чары, было знойдзена радовішча[1]. Па назве ракі невядомаму мінералу далі імя чараіт. Пасля праведзенай маскоўскімі спецыялістамі экспертызы было ўстаноўлена, што чараіт — гэта злучэнне солей натрыю, калію і кальцыю.

Чараіт мае шаўкавісты бляск, фіялетавую афарбоўку ад бледных да цёмных тонаў. Лабараторныя даследаванні паказалі, што гэты камень валодае каштоўнымі ўласцівасцямі. Ён вельмі прыгожы, досыць цвёрды і трывалы, лёгка паддаецца апрацоўцы, таму мае ювелірнае значэнне.

У бэзавым камені Якуціі сапраўды ёсць нешта чароўнае, вядзьмарскае, зменлівае. Нібы ў мінерале ўюцца, пераліваюцца сінявата-фіялетавыя струмені халоднай Чары.

Першым вырабам з чараіту быў галоўны прыз IX Маскоўскага кінафестывалю, зроблены ў выглядзе зямнога шара. Потым з’явілася шмат упрыгожванняў: брошкі, кулоны, пярсцёнкі, устаўкі ў завушніцы, бранзалеты.

Гэтаму каменю наканавана доўгае жыццё. Спецыялісты прадказваюць новаму мінералу такую ж вядомасць, як малахіту, лазурыту і іншым самацветам (Паводле У. Бардона). (140 слоў)

## КІНАФЕСТЫВАЛЬ «ЛІСТАПАД»

Штогод у лістападзе праводзіцца Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад». У найбуйнейшым кінафоруме Беларусі прымаюць удзел Расія, Украіна, Аўстрыя, Эстонія, Польшча, Францыя, Германія, Грузія, Тайланд, Манголія, Турцыя, Італія, Бразілія і іншыя краіны.

Першы кінафестываль «Лістапад» адбыўся ў Мінску ў 1994 годзе. На ім былі паказаны карціны, якія ілюстравалі

[1] Радо́вішча, -а, *н.* Месцанараджэнне карысных выкапняў.

культуру той ці іншай краіны. За тыдзень у кінатэатрах «Кастрычнік» і «Цэнтральны» фестывальныя фільмы паглядзелі больш за дваццаць тысяч чалавек. Ацэньвалі конкурсныя работы журы кінематаграфістаў, журналістаў і гледачоў. У 1996 годзе было прынята рашэнне зрабіць галоўнай узнагародай кінафестывалю прыз глядацкіх сімпатый. З 2010 года пераможцу зноў вызначае прафесійнае журы.

Перад урачыстай цырымоніяй адкрыцця кінафестывалю па чырвонай дывановай дарожцы праходзяць яго ўдзельнікі і госці: беларускія і замежныя дзеячы кінамастацтва, члены журы, стваральнікі фільмаў.

На фестывалі дэманструюцца работы, адзначаныя на прэстыжных кінафестывалях, а таксама кінастужкі маладых аўтараў. Конкурсныя фільмы размеркаваны па трох секцыях: ігравое, дакументальнае і дзіцячае кіно. У рамках кінафестывалю «Лістапад» праводзіцца Міжнародны фестываль дзіцячага і юнацкага кіно «Лістападзік» (Паводле інтэрнэт-рэсурсаў). (156 слоў)

## ДЗЕДАЎ ЧАМАДАН

Многа цацак і кніжак ёсць у Сяргейкі. Але хлопчыка больш за ўсё цікавіць дзедаў жоўты чамадан. Чамадан гэты стары, ручка абтрапаная, абматаная вяровачкай. Ляжаць там вельмі цікавыя рэчы: слясарныя ключы, адвёрткі, напільнікі, нож, малаток, шурупы, цвікі, гайкі, вінцікі, краны.

Сяргейкаў дзед Павел Васільевіч працуе слесарам-водаправодчыкам. Яшчэ яго называюць санітарным тэхнікам. А ў чамадане ляжаць яго інструменты.

Праца дзеда вельмі патрэбна людзям. Вось у кватэры зламаўся кран, засвістала вада. Тады бягуць да дзеда, просяць дапамагчы. Павел Васільевіч хапае жоўты чамадан і спяшаецца на выручку.

Дзед кажа, што струменьчык вады таўшчынёй з саломінку за суткі вялікую бочку напоўніць. А гэту чыстую ваду здалёк па трубах у горад гоняць.

Паўла Васільевіча ўсе ведаюць і паважаюць у доме. Ідзе дзед па двары, а людзі з ім вітаюцца, пра здароўе распытваюць.

Часам і Сяргейка ходзіць з дзедам Паўлам на выклікі. Чамадан тады нясе не дзед, а ўнук. Знаёмым Павел Васільевіч кажа, што ідзе на працу з памочнікам. Хлопчыку вельмі прыемна гэта чуць. Няхай ведаюць, што і Сяргейка хоча рабіць людзям дабро (Паводле В. Хомчанкі). (168 слоў)

## ВОЖЫК

Вожыкі жывуць ва ўсіх мясцінах Беларусі. Іх можна сустрэць у садзе, парку, непадалёку ад хлява для свойскай жывёлы. Гэта адзін з самых адважных звяркоў. Ён не спяшаецца ўцякаць, калі сустрэне каго-небудзь на сцяжынцы. Натапырыць свае вострыя калючкі і сярдзіта пыхкае. Калі ж крыўдзіцель нападзе, звярок умомант згорнецца ў клубок. Няшмат знойдзецца ахвотнікаў пагуляць з такім калючым мячыкам.

Вожык — смелы паляўнічы. Ён знішчае шкодных жукоў, слімакоў, бурыць мышыныя і кратовыя гнёзды. Ніколі не абміне гадзюку. Змяя ўмела бароніцца, але вожыка надзейна засцерагаюць вострыя калючкі.

Вожыкі нараджаюцца з іголкамі. Аднак напачатку яны мяккія і белыя. Замест іх праз два-тры тыдні вырастаюць цёмныя і калючыя. Вожычыха старанна даглядае сваіх дзяцей, водзіць іх за сабою амаль цэлае лета.

Малако для вожыка — самы смачны ласунак. Спадачкам сырадою[1] звярка лёгка прыручыць. Але малако шкодзіць вожыкаваму здароўю, калі наліваюць яго шмат.

Найлепш звяроў і птушак зусім не прыручаць і не рабіць ім ніякай крыўды. Тады яны заўсёды будуць жыць з намі ў блізкім суседстве і добрай згодзе (Паводле У. Ягоўдзіка). (161 слова)

---

[1] Сырадо́й, -ю, *м.* Толькі што надоенае малако.

## ПТУШЫНЫЯ ГНЁЗДЫ

Вясною птушкі вяртаюцца з выраю на радзіму і пачынаюць віць новыя гнёзды.

Буслы робяць гнёзды на дрэвах, нават на воданапорных вежах. Майструюць буслянкі адразу на шмат гадоў, а вясною толькі рамантуюць іх.

Чорныя кучкі галля ў вершалінах дрэў — гэта грачыныя гнёзды. Калі на дрэвах зазелянее лісце, іх будзе цяжка заўважыць.

Вясковыя і гарадскія ластаўкі лепяць гнёзды пад дахамі, каб туды не дабраліся каты. Робяць жытло з камячкоў зямлі, сцяблінак, валаскоў, нітачак. Змочваюць слінаю, перамешваюць і прыклейваюць да сцен. Унутры высцілаюць сухімі травінкамі, пер'ем.

Берагавыя ластаўкі майструюць гнёзды ў глыбокіх норках. Кормяцца яны пераважна мошкамі, ловячы іх на ляту ў паветры. Над цёплаю рачною вадою шмат мошак. Таму для сваіх птушыных калоній і абіраюць берагавыя ластаўкі абрывістыя пясчаныя берагі.

Сінічкі ў вырай не адлятаюць. Селяцца яны не толькі ў лясах і зарасніках уздоўж рэк і ручаёў, але і ў парках, садах. Гнёзды робяць у дуплах дрэў, у шчылінах будынкаў, нават у вулічных ліхтарах. Майструюць жытло з сухіх галінак, травінак, імху. Унутры высцілаюць валаскамі, поўсцю, раслінным пухам (Паводле А. Жука). (167 слоў)

## РАМОНАК

Рамонак — надзвычай пашыраная расліна ў нашых краях. Ён сустракаецца паўсюдна: у гарадах, вёсках, на лугах, узлесках, палянах, уздоўж дарог, у агародах.

У свеце існуе мноства розных відаў рамонкаў: нямецкі, каўказскі, рымскі, персідскі, амерыканскі...

Яшчэ два стагоддзі таму ў нашых краях пра рамонак нічога не ведалі. Яго паказвалі ў Пецярбургскім батанічным садзе. А ўжо праз сорак гадоў рамонак стаў для нас звычайнай раслінай. Яго насенне прыехала ў Еўропу з Амерыкі на караблі

разам з амерыканскім зернем. Тут рассеялася, узышло, дало новае насенне.

Рамонак — кветка не толькі прыгожая, але і карысная. Настой з яе дадаюць у крэмы, шампуні, мыла. Калі валасы вымыць рамонкавым адварам, яны набудуць цудоўнае залацістае адценне. Рамонак дапамагае лячыць прастуду, паляпшае страваванне[1]. Вясковыя гаспадыні ведаюць, што засушаныя расліны можна раскласці ў падвале, на кухні, на гарышчы[2], каб зваліся мышы.

У дзяўчат рамонак стаў кветкай для варажбы. У яго пытаюцца: «Кахае ці не кахае?» На Купалле плятуць вянкі з рамонкаў, пускаюць іх па вадзе. Калі вянкі дзяўчыны і хлопца сустрэнуцца, то тыя назаўсёды пакахаюць адзін аднаго (Паводле П. Грынчанкі, А. Церашковай). (167 слоў)

---

[1] Страва́ванне, -я, *н.* Перапраўліванне і засваенне стравы арганізмам.

[2] Гары́шча, -а, *н.* Памяшканне, прастора паміж столлю і дахам у будынку.

# 8 КЛАС

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

### Пераказ зместу кінафільмаў, урыўкаў з мастацкіх твораў, радыё- і тэлеперадач з выкарыстаннем двухсастаўных сказаў

Андрэй Курэйчык адсвяткаваў сваю першую круглую дату ўжо як вядомы і вельмі паспяховы аўтар: напісаныя ім 25 п'ес пастаўлены ў тэатрах дзевяці краін, сярод якіх Расія, Украіна, Польшча, Аўстрыя, Вялікабрытанія і ЗША. Што ўжо казаць пра фільмы паводле яго сцэнарыяў, якія здабылі народную любоў?.. І Курэйчыку яшчэ толькі трыццаць!

У яго сапраўды можна шмат чаму павучыцца, асабліва сучасным маладым людзям.

1. **Не баяцца спрабаваць**. Як некалі студэнт юрфака напісаў сваю першую п'есу — «Споведзь Пілата», якую паставіў з сябрамі ў тэатры БДУ.

2. **Быць дзёрзкім, стукацца ў любыя дзверы**, калі ёсць што сказаць і прапанаваць: а раптам адчыняць. Вось як пачатковец са стосам першых п'ес сам прапаноўваў іх у тэатры. І нечакана для ўсіх звярнуў на сябе ўвагу Алега Табакова. П'еса «П'емонцкі звер» была пастаўлена ў маскоўскім мастацкім тэатры імя Чэхава і была прызнаная «лепшай сучаснай п'есай РФ» за 2002 год. Неўзабаве і беларускія тэатры сталі ўчытвацца ў яго п'есы.

3. **Не забываць, хто ты і адкуль**. Вось як у тым жа далёкім Лос-Анджэлесе Курэйчык дапісваў сваю п'есу «Пане Каханку» пра падзеі беларускай гісторыі. «Яна пра тое, як у свой час беларусы праспалі сваю дзяржаўнасць у васямнаццатым

стагоддзі, што потым з гэтага атрымалася і як гэта адгукаецца ў дваццаць першым стагоддзі», — кажа аўтар. Спектакль паводле гэтай п'есы ставіць галоўны рэжысёр Нацыянальнага тэатра імя Горкага Сяргей Кавальчык. Ён на юбілей Курэйчыку падараваў сімвалічны карабель... беларускага тэатра, які рухаецца наперад дзякуючы драматургіі. Сапраўды так. Таму матайце на вус, маладыя ды амбіцыйныя аўтары (З газеты «Звязда»). (239 слоў)

1. Дакажыце, што перад вамі тэкст:

- вызначыўшы тэму, якая аб'ядноўвае ўсе сказы; сфармуляваўшы асноўную думку тэксту;
- паказаўшы цэласнасць гэтага тэксту (ці ёсць у ім разважанні, якія не адносяцца да тэмы);
- растлумачыўшы, што тэкст мае завершаны характар (першы і апошні сказ быццам пераклікаюцца па сэнсе, звернуты да чытача), што наступная паслядоўнасць сказаў можа быць названа тэкстам. Ці падводзіць апошні сказ своеасаблівы вынік сказанаму?
- праілюстраваўшы і сэнсавую, і структурную звязанасць сказаў, заканамернасць іх аб'яднання ў абзацы, змест якіх падпарадкаваны паслядоўнаму разгортванню тэмы.

2. Выпішыце з тэксту ўласныя назоўнікі, растлумачце іх напісанне.

3. Перакажыце тэкст, падабраўшы да яго свой загаловак ці так, каб тэкст адпавядаў загалоўкам (на выбар): «Жыццёвае крэда Андрэя Курэйчыка» або «У яго можна павучыцца».

Які нядаўна прагледжаны фільм (прачытаны мастацкі твор, радыё- ці тэлеперадача) прымусіў вас задумацца пра нешта? Раскажыце пра гэта. У якасці пацвярджэння вашых думак, меркаванняў выкарыстайце коратка (сцісла) перададзены змест прагледжанага кінафільма (урыўкаў з мастацкіх твораў, радыё- і тэлеперадач).

Паглядзіце фільм па тэлебачанні (выбар залежыць ад вас). Калі пачняце глядзець, калі ласка, запісвайце (канспектыўна) усё, што вам падабаецца, як завуць герояў, як развіваецца сюжэт. Праз дватры дні пасля прагляду перакажыце сюжэт стужкі аднакласнікам, сябрам. Пераказваючы, пазначайце час: колькі прайшло хвілін. Падрыхтуйце тры варыянты пераказу: падрабязны; сціслы; звышсціслы. Вечарам падвядзіце вынікі: калі вас больш уважліва слухалі? З чаго вы пачыналі свой аповед (выступленне): з самага пачатку фільма

ці з найбольш эфектнага эпізоду, з ацэнкі кінастужкі ў цэлым? Ці стараліся быць нейтральнымі? Прааналізуйце, да якіх вывадаў вы прыйшлі. Абавязкова запішыце як мага больш падрабязна ўвесь ход выканання задання. Паспрабуйце стварыць жартаўлівую інструкцыю «Як лепш пераказваць фільм».

Чаму жартаўлівую? Ды таму, што такім чынам вы самі да сябе паставіцеся крыху іранічна, а самаіронія заўсёды цэніцца слухачамі. Больш удала праходзяць выступленні тых, хто да аўдыторыі ставіцца сур'ёзна, уважліва, а да сябе — іранічна.

Праз дзень пасля таго, як выканаеце гэтае заданне, калі ласка, паглядзіце яшчэ адзін фільм па тэлебачанні (можна па відэа, у кінатэатры) і нічога ў час прагляду не запісвайце. А праз два-тры дні перакажыце фільм аднакласнікам. Хутчэй за ўсё вы самі ўбачыце розніцу паміж першым выкананнем задання і другім. Больш лёгка пераказваць, калі складзены канспект.

## ПАЭТКУ З БЕЛАРУСІ АДЗНАЧЫЛІ Ў АМЕРЫЦЫ

Літаратурная стыпендыя Фонду Ленана за 2009 год прысуджаецца за незвычайныя літаратурныя якасці і вялікі патэнцыял. І гэта пры тым, што першая кніжка Вальжыны Морт выйшла, здаецца, зусім нядаўна — гадоў пяць таму. Але сама назва сведчыла, што дзяўчына напоўнена вобразамі: «Я тоненькая, як твае вейкі». І словамі круціць, як хоча: пакінула частку свайго прозвішча Мартынава і атрымала загадкавы псеўданім. Прыгожы і зручны, што даволі важна, калі цябе перакладаюць на іншыя мовы. А вершы Морт перакладаюць з беларускай не толькі на англійскую, але і на шведскую і нямецкую. І як не зразумець сэнсу таго, пра што яна гаворыць, калі гэта ідзе ад чалавека да чалавека, паміж якімі ўсе межы штучныя, таму што не распаўсюджваюцца на свет эмоцый? Ды і назва зборніка, які быў выдадзены ў Амерыцы ў перакладзе, — «Фабрыка слёз». Паэтычная зорка з Беларусі ўзышла на заморскім небасхіле, і яна працягвае пісаць на роднай беларускай мове нават цяпер, калі жыве ў Амерыцы, дзе выкладае ва ўніверсітэце. Можа, у гэтым вялікая сіла, бо душу ж не пераробіш, а словы — яе адлюстраванне (Л. Цімошык). (174 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту.

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Якую інфармацыю вы атрымалі з водгуку на падзею? Вызначце жанр тэксту. Абгрунтуйце сваю думку.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў даецца ацэнка творчасці Вальжыны Морт?

Выпішыце ўласныя назвы з тэксту, растлумачце іх правапіс.

Назавіце сказы з аднароднымі членамі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх. Якую функцыю выконваюць аднародныя члены сказа ў тэксце?

Выпішыце словазлучэнні, што адпавядаюць схеме *прыметнік* (*дзеепрыметнік*) + *назоўнік*. Ці ёсць у тэксце адасобленыя азначэнні? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

5. Перакажыце змест нататкі сваім аднакласнікам на класнай гадзіне (літаратурнай вечарыне), прысвечанай маладым беларускім паэтам.

## Пераказ навуковых і мастацкіх тэкстаў з апісаннямі

а) Венерыны чаравічкі — дзікая архідэя, што ўсё яшчэ сустракаецца ў нашай прыродзе. Калі зазірнуць у «Энцыклапедыю прыроды Беларусі», можна вычытаць, што венерыны чаравічкі — расліна з роду Cypripedium з рэдкай прыгажосці кветкай. У Швейцарыі, да прыкладу, венерыны чаравічкі ахоўваюць яшчэ з дзевятнаццатага стагоддзя. Архідэя гэтая цвіце некалькі месяцаў, не тое што, скажам, цюльпаны, макі ці якія гладыёлусы. Праўда, зацвітаюць венерыны чаравічкі толькі на пятнаццатым — сямнаццатым годзе жыцця. Ці не таму найпрыгажэйшая з нашых архідэй рэдка сустракаецца і яе ўвогуле мала хто бачыў? А чаравічкамі расліну называюць, бо кветка яе напраўду напамінае чаравічак. Азначэнне «венерыны» паходзіць ад імя багіні кахання Венеры, яна ж Кіпрыда, адсюль і лацінская назва (В. Гардзей. «Суквецце ў форме згубы»). (107 слоў)

б) **Венерын чаравічак сапраўдны (жоўты)** (Cypripedium calceolus L., 1753). Сямейства Ятрышнікавыя (Orchidaceae).

**Статус**. I катэгорыя. Рэдкі від, які знаходзіцца пад пагрозай знікнення. **Значэнне ў захаванні генафонду**. Высокадэкаратыўная расліна. **Кароткае апісанне**. Шматгадовая травяністая расліна з моцным прамым, аблісцелым, апушаным сцяблом вышынёй 25—50 сантыметраў і тоўстым паўзучым карэнішчам, якое мае моцны спецыфічны пах. Лісце (тры-чатыры) эліптычнае, чаргаванае, даўжынёй да 18 сантыметраў і шырынёй 12 сантыметраў, з выразнымі дугападобнымі жылкамі. Кветкі дыяметрам да васьмі сантыметраў, адзіночныя або па два-тры, з мешкападобна ўздутай накшталт чаравічка (адсюль назва) жоўтай губой з чырванаватымі плямкамі і пахам ванілі. Бакавыя лісцікі калякветніка завостраныя, чырванавата-бурыя, унутраныя – лінейна-ланцэтныя, завостраныя, гарызантальна адхіленыя, крыху закручаныя. Плод – сухая каробачка, якая раскрываецца трыма — шасцю падоўжанымі шчылінамі. **Асаблівасці біялогіі**. Цвіце ў траўні — чэрвені. Зацвітае на 15—18 годзе жыцця, працягласць цвіцення 10—15 дзён. Размнажаецца бакавымі пупышкамі карэнішча, рэдка насеннем. **Пашырэнне**. Еўропа, Азія (Урал, паўднёвыя раёны Сібіры і Далёкага Усходу). У Беларусі спарадычна трапляецца пераважна ў заходніх і паўднёвых раёнах: у Браслаўскім, Бярозаўскім, Ваўкавыскім, Віцебскім, Камянецкім, Лепельскім, Мазырскім, Мядзельскім, Навагрудскім, Пінскім, Пружанскім, Свіслацкім, Столінскім і іншых раёнах. **Месцы росту**. Разрэджаныя шыракалістыя, драбналістыя і мяшаныя лясы, лясныя паляны, узлескі, ускрайкі балот, сырыя мшыстыя яловыя лясы. **Характар росту**. Расце адзіночнымі экзэмплярамі і невялікімі групамі. **Прынятыя меры аховы**. Уключаны ў Чырвоную кнігу СССР з 1978 г. Занесены ў спіс ахоўных раслін Беларусі з 1964 г. і Чырвоную кнігу Беларусі з 1981 г. (Паводле Энцыклапедыі электроннай) (223 словы).

1. Разгледзьце тэкст *б*. У чым яго структурная адметнасць?

2. Ці аднолькавыя тэмы тэкстаў *а* і *б*? Параўнайце іх адрасантаў і адрасатаў. Вызначыўшы стыль кожнага тэксту, запішыце ў два слупкі

(у адпаведнасці са стылем) асаблівасці кожнага стылю, ілюструючы прыкладамі.

3. Абазначце лічбамі ў другім тэксце аднародныя члены сказа. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх. Якую ролю выконваюць яны ў тэксце?

4. Запішыце лічэбнікі словамі.

5. Перакажыце (вусна) тэкст *а*.

## «СУКВЕЦЦЕ Ў ФОРМЕ ЗГУБЫ»

Пра гэтую дзівосную расліну ў народзе складзена шмат паданняў і легенд. Вось адна з іх. На вячэрнім і ранішнім небе ў добрае надвор'е можна бачыць яркую бліскучую зорку. Яна ўвасабляе сабой багіню прыгажосці Венеру, якая, паводле ўяўленняў нашых продкаў, яшчэ да ўзыходу сонца спускаецца на зямлю, абуджае людзей ад сну і кліча да працы. Аднойчы Венера хадзіла ад хаты да хаты і, захапіўшыся сваім міласэрным заняткам, не заўважыла, як насунулася навальніца з грымотамі. Уцякаючы ад дажджу, багіня бегла па касагорах, ускрай балот, каля ручаёў і крынічак ды не заўважыла, як згубіла прыгожы чаравічак. Усюды па слядах, дзе яна ступала босай нагой, праз нейкі час расцвілі залаціста-жоўтыя архідэі, якія назвалі венерыным чаравічкам.

У сямействе архідных, як сведчаць batанікі, гэты род самы старажытны. Венерын чаравічак сапраўдны — шматгадовая травяністая дэкаратыўная расліна з пругкім, прамым сцяблом вышынёй 25—50 сантыметраў. Кветкі дыяметрам да 8 сантыметраў, адзіночныя або па два-тры, з мешкападобна ўздутай накшталт чаравічка (адсюль назва) жоўтай губой з чырванаватымі плямкамі і пахам ваніліі. Характэрная для ўсяго сямейства губа адыгрывае ролю своеасаблівай пасткі для насякомых. Залазячы на салодкі пах, яны закранаюць тычынкі і тым самым апыляюць расліну.

На Беларусі расліна трапляецца ў Белавежскай пушчы, у Бярэзінскім біясферным запаведніку. Размнажаецца насеннем і вегетатыўна, цыкл развіцця незвычайна доўгі: першы ліст паяўляецца праз чатыры гады, а цвіценне пачынаецца праз

15—17 гадоў. Распаўсюджванню расліны перашкаджаюць розныя адмоўныя фактары: меліярацыя, высяканне лясоў, пасьба жывёлы, вытоптванне і збор прыгожай дэкаратыўнай кветкі. Венерын чаравічак сапраўдны ў Чырвоную кнігу Беларусі занесены з 1981 года (В. Гардзей). (247 слоў)

Знайдзіце ў тэксце элементы апісання і апавядання. Пераказваючы змест, захавайце змешаны тып маўлення.

## ВЕНЕРЫНЫ ЧАРАВІЧКІ

Валерка заўважыў раптам нешта чырвонае. Глянуў, прыгледзеўся і знерухомеў ад уражання! Стуленая падкурчанымі лістамі папараці, расла дзіўная, ніколі не бачаная расліна з надта ж дзіўнай кветкай. Каму, як не пераможцу абласной алімпіяды вызначыць від расліны?

Што ж гэта за расліна, якая мае кветку з чатырма пялёсткамі ружовага, амаль чырвонага колеру, а пяты пялёстак у выглядзе ўздзьмутай губы? На выгляд уся кветка выглядае як бахілы якія.

«Бахілы? Хм...»

Дык гэта ж — венерыны чаравічкі! Тая самая надзвычай рэдкая, дзівосная расліна, што занесена ў Чырвоныя кнігі ўсёй Еўропы... Бачыў жа на малюнках, а вось зараз і жыўцом. Харошая якая, свежая, бессаромная!

Над кветкай таўкліся камары, віліся дробныя мушкі. Ад кветкі выразна пахла цукеркамі. Вось дзелавітая пчала ўлезла ў кветку. Валерка ведаў з кніг, што нектару ў венерыных чаравічкаў няма — так распарадзілася прырода. Пчала аблазіла сярэдзіну кветкі, нічога там не знайшла, замітусілася — па слізкіх пялёстках праз верх ёй не выбрацца. Паспрабавала ўзляцець, ударылася крыламі аб краі, скацілася на дно, раззлавана забзыкала, папаўзла па дне. Інстынкт самазахавання штурхае яе да пошукаў выйсця, а яно там, дзе пялёстак-губа прымацавана да кветаложа. Выйсце цеснае, але пчала прашчамілася, вырвалася на волю. Ашалелая ад радасці, што ўсё так хутка скончылася, імкліва ўзляцела. Валерка ведаў

(а юннат ён яшчэ той!), што калі пчала praціскалася праз цеснае выйсце, то ўмазалася ў пылок. Панясе ў вулей ці ў калоду, пчолы патруцца з ёю і перанясуць пылок на іншыя венерыны чаравічкі. Так разумная, мудрая прырода прыдумала спосаб апыляць саму сябе (Паводле А. Наварыча). (237 слоў)

1. Вызначце тэму тэксту. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? У якім сказе яна сфармулявана? Ці праводзіцца асноўная думка праз увесь тэкст? Дакажыце гэта. Падбярыце да тэксту загаловак, які перадае асноўную думку.

2. Вызначце стыль маўлення, ахарактарызаваўшы яго па плане:

1) Сфера ўжывання.

2) Мэта тэксту.

3) Формы маўлення, у якіх рэалізуецца тэкст.

4) Найбольш агульныя якасці мастацкага тэксту .

5) Аналіз асаблівасцей моўных адзінак на фанетычным, словаўтваральным, марфалагічным, лексічным, сінтаксічным узроўнях.

6) Сродкі сувязі.

3. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Назавіце часткі тэксту, якія ўяўляюць сабой апавяданне, апісанне, разважанне.

4. Колькі абзацаў (частак) у тэксце? Якая сувязь паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках? Падбярыце да кожнага абзаца назву або выпішыце апорныя словы ці словазлучэнні.

5. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі. Растлумачце значэнне наступных слоў: *бахілы, прашчамілася, падкурчанымі* (лістамі).

## АМЕРЫКАНЦЫ Ў БЕЛАРУСІ

Сёння мы можам пабачыць далёка не ўсе расліны, якія цвілі ў нашых продкаў літаральна пад нагамі. Рэдкімі сталі беларускія архідэі — пальчатакарэннікі, яшчэ радзейшымі любкі і венерыны чаравічкі. Няпроста стала знайсці расяніцу і мандрагору.

Аднак ёсць зараз на нашай зямлі і тыя расліны, якіх нашы продкі і ў вочы не бачылі. Большасць з гэтых раслін — садовыя і сельскагаспадарчыя. Хаця б наша ўлюбёная бульба — выхадзец з Цэнтральнай Амерыкі.

Але не толькі садовыя расліны з амерыканскага кантынента сталі нашымі звыклымі суседзямі. У цяністых лясах, пад засенню дрэў можна лёгка сустрэць амерыканскую эмігрантку-незачэпу. Гэтая раслінка з вялікімі лістамі і дробнымі жоўтымі кветачкамі лёгка заняла пустыя нясонечныя землі пад полагам лясных пасадак. Яшчэ больш кідаецца ў вочы паспяховы амерыканец лубін. З'явіўся ён у нас не больш за сотню год таму і ўжо заваяваў сабе прызнанне ва ўсіх кутках Беларусі. Еўрапейцы не засталіся даўжнікамі — занеслі ў Амерыку трыпутнік і стрэлкі (Паводле Энцыклапедыі электроннай). (147 слоў)

Пра якіх амерыканцаў ідзе гаворка ў тэксце? Падбярыце да тэксту свой загаловак, які б перадаваў тэму тэксту.

## Пераказ тэкстаў на гістарычную тэму

### І ЗАСНАВАЎ КНЯЗЬ РАГАЧ ГОРАД…

Герб горада Рагачова, на якім у залатым полі адлюстраваны чорны баранаў рог, сімвалізаваў, па задуме яго стваральнікаў, назву горада. У геаграфічным найменні Рагачоў сапраўды маецца каранёвая частка рог, але з выявай баранава рога яе звязваюць толькі ўскосныя асацыяцыі[1]. Традыцыйна дадзеную назву тлумачаць пры супастаўленні са старажытнарускім словам *рогъ* у значэнні *мыс*. Пры такім тлумачэнні спасылаюцца на тое, што Рагачоў, які ўпершыню згадваецца ў старажытнарускі час у Іпацьеўскім летапісе пад 1142 годам, узнік на месцы ўпадзення рэчкі Друць у Днепр, гэта значыць ля рога. Рог тут разумеецца менавіта як мыс, выступ.

Зрэшты, слова рог у дадзеным выпадку можна разумець і ў «беларускім сэнсе» — як вугал. Пры зліцці Друці і Дняпра ўтвараецца нібыта рог — вугал, дзе і размешчаны горад Рагачоў, раённы цэнтр Гомельскай вобласці. Такія тлумачэнні

[1] Асацыя́цыя, -і, *ж.* Тут: сувязь паміж асобнымі ўяўленнямі, пры якой адно ўяўленне выклікае другое.

былі б, магчыма, і прымальнымі, калі б не дзве акалічнасці. Па-першае, многія старажытныя гарады Беларусі ўзнікалі якраз пры злучэнні малой і большай рэк, гэта значыць «на рагу», таму само месца сутокаў[1] не магло лічыцца вызначальнай прыкметай для нараджэння геаграфічнага імя. Па-другое, у назве Рагачоў вычляняецца ўтваральная аснова Рагач-, а не Рог-, як, напрыклад, у найменні вёскі Рог Акцябрскага раёна ці ў назве горада Рогаў. На нашу думку, аснова Рагач- можа звязвацца з асабістым іменем Рагач ці з такой жа мянушкай, якія насіў верагодны князь або правадыр той групоўкі, што асвойвала зручную з розных пунктаў гледжання пляцоўку пры ўпадзенні Друці ў Днепр. Такім чынам, назва Рагачоў спрадвечна мела значэнне «горад Рагача» (Паводле А. Рогалева). (239 слоў)

1. Вызначце тэму тэксту. Назавіце словы (сказ) з тэксту, дзе яна сфармулявана.

2. Перачытайце першыя тры абзацы тэксту. Ці выражана ў іх аўтарская задума? Якое словазлучэнне з другога абзаца, на вашу думку, магло б быць выкарыстана ў якасці загалоўка, які б адлюстроўваў асноўную думку тэксту?

3. Якія тыпы маўлення сустракаюцца ў тэксце? Абазначце лічбамі часткі тэксту: 1 — апавяданне, 2 — апісанне, 3 — разважанне.

4. Колькі падтэм (мікратэм) выкарыстана аўтарам для раскрыцця тэмы? Паназірайце, як мяняюцца мікратэмы. Ці ўдалося аўтару «ўтрымаць» тэму і асноўную думку і захаваць цэласнасць тэксту?

Якая частка тэксту з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць у тэксце заключная частка? Складзіце план той часткі тэксту, у якой разглядаецца паходжанне назвы горада Рагачова. У адпаведнасці з ім вусна перакажыце змест.

5. Вызначце стыль тэксту, адказаўшы на наступныя пытанні:

• Ці адпавядае тэкст задачы «па магчымасці дакладна і поўна растлумачыць факты рэчаіснасці, паказаць прычынна-выніковыя сувязі паміж з'явамі, высветліць заканамернасці гістарычнага развіцця, абагульніць інфармацыю і інш.»?

• Ці з'яўляюцца асноўнымі наступныя рысы стылю тэксту: падкрэсленая лагічнасць (паслядоўнасць, звязнасць) выкладу; адназ-

[1] Суто́кі, -аў; адз. няма. Тут: месца, дзе зліваюцца два водныя патокі.

начнасць, дакладнасць, сціслацсць пры інфармацыйнай насычанасці зместу; канкрэтнасць, бясстраснасць, аб'ектыўнасць выказвання?

• Ці характэрныя наступныя асаблівасці стылю: насычанасць тэксту тэрмінамі; навуковай фразеалогіяй; абстрактнай лексікай; у пачатку сказа звычайна стаіць не дзейнік (з дзейнікаў могуць пачынацца першыя сказы абзацаў), а даданыя члены сказа (акалічнасці, дапаўненні); пабочныя канструкцыі і інш.?

6. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з пабочнымі канструкцыямі.

Растлумачце правапіс уласных назваў у тэксце.

7. Пісьмова перакажыце тэкст так, каб атрымалася апавяданне з элементамі апісання і разважання.

## ПЯЦЬ ГІСТАРЫЧНЫХ ПАДЗЕЙ, ПРА ЯКІЯ ПАВІНЕН ВЕДАЦЬ КОЖНЫ БЕЛАРУС

**Частка 1**. Гісторыя, напэўна, самая спрэчная і суб'ектыўная з усіх навук. Усе мы ведаем, што калі валодаць майстэрствам красамоўства і дарам інтэрпрэтацыі[1], то адну і тую ж гістарычную падзею можна трактаваць абсалютна па-рознаму. Каму як выгадней. Вядомы англійскі кінарэжысёр Пітэр Грынуэй у адным са сваіх фільмаў выказаўся на гэты конт: такой з'явы, як гісторыя, не існуе — існуюць толькі гісторыкі. Цяжка не пагадзіцца. Тым не менш нейкія «базавыя» падзеі для сусветнай гісторыі або для гісторыі асобнай краіны ці нацыі ўсё-такі ёсць. Праўда, кожны ўсё адно мае свой «хіт-парад» значных гістарычных падзей, якія складаецца ў залежнасці ад роду дзейнасці, складу характару, асабістага лёсу і схільнасцей школьных настаўнікаў гісторыі. Бясспрэчна адно: калі чалавек не ведае сваіх каранёў, свайго мінулага, то будучыня яго не мае сэнсу, не мае перспектыў. А значыць, будучыні яго не існуе. Якія ж гістарычныя падзеі павінен ведаць кожны беларус, каб мець права і гонар звацца беларусам, каб быць годным прадстаўніком нацыі? «Звязда» папрасіла прадстаўнікоў розных творчых прафесій (бо творчых людзей можна справядліва

[1] Інтэрпрэта́цыя, -і, *ж*. Кніжн. Тлумачэнне, раскрыццё сэнсу чаго-небудзь.

лічыць самымі чуйнымі да важных дат для гісторыі краіны) вызначыць сваю пяцёрку гістарычных падзей, якія асабіста яны лічаць важнымі. І якія, на іх думку, павінен абавязкова ведаць кожны беларус. Пісьменнік, спявачка, музы́ка, мастак і кінарэжысёр таксама перакананы, што без ведання сваёй гісторыі немагчымае развіццё і існаванне нацыі. Але ў кожнага з іх свой падыход у вызначэнні ключавых гістарычных дат. Зрэшты, некаторыя падзеі ў апытаных супадаюць. Але гэта толькі пацвярджае іх важнасць (В. Чайкоўская). (233 словы)

1. Вызначце тэму тэксту. У якім месцы тэксту яна сфармулявана? Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Якая думка праводзіцца праз увесь тэкст? Ці згодны вы з ёю?

2. Вызначце тып і стыль маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Назавіце асноўны тэзіс і пералічыце аргументы, ужытыя аўтарам нататкі. Калі маеце свае аргументы, выкарыстайце іх у сваім пераказе. Знайдзіце сказ, які з'яўляецца асноўным вывадам тэксту.

4. Вызначце сродкі сувязі паміж першымі трыма сказамі тэксту.

5. Якія моўныя сродкі выкарыстоўваюцца ў тэксце для таго, каб зрабіць доказы і прыклады пераканальнымі?

Якую ролю выконваюць у тэксце пабочныя канструкцыі? Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

6. Растлумачце значэнне і правапіс наступных слоў: *красамоўства, інтэрпрэтацыя, хіт-парад, дасведчаны, грамадства, прадстаўнік нацыі.*

**Частка 2**. Прачытайце адказы на пастаўленае ў папярэднім тэксце пытанне Анатоля Бутэвіча, пісьменніка, грамадскага дзеяча, і спявачкі Паліны Смолавай.

***Анатоль Бутэвіч*, пісьменнік, грамадскі дзеяч:**

**1. Утварэнне Вялікага Княства Літоўскага.** Трэба ведаць не толькі таму, што гэта была першая беларуская дзяржава. Зрэшты, сапраўдным яе ядром была Чорная Русь — гэта Верхняе і Сярэдняе Панямонне (або Сярэдняя гістарычная Літва, як яе называлі). Разам з утварэннем ВКЛ трэба ведаць дату аб'яўлення Навагародка сталіцай княства, дзе была першая рэзідэнцыя першага вялікага князя і адзінага караля ВКЛ Мін-

доўга. Гэта 1240-я гады. Гэта нам трэба ведаць дзеля таго, каб ніколі больш не саромецца сваёй уласнай гісторыі.

**2. Крэўская унія. 1385 год.** У выніку гэтага пагаднення вялікі князь Літоўскі Ягайла стаў каралём польскім, пераехаў у Кракаў і адначасова заставаўся найвышэйшым князем літоўскім. У выніку Крэўскай уніі ВКЛ, на мой погляд, яшчэ больш выйшла на еўрапейскі прастор.

**3. 1410 год. Грунвальдская бітва народаў.** Так я яе называю, менавіта народаў. Бо там сапраўды з абодвух бакоў удзельнічалі прадстаўнікі многіх еўрапейскіх народаў. Гэтую падзею трэба ведаць дзеля таго, каб вучыцца, як абараняць свой дом, сваю зямлю.

**4. Распрацоўка і выданне Статутаў Вялікага Княства Літоўскага.** І першага — 1529 года, і наступных 1566 і 1588 гадоў, якія некалькі стагоддзяў былі на ўсю Еўропу адзіным заканадаўчым дакументам і ВКЛ, і як узор для іншых краін. Гэта неабходна ведаць для таго, каб разумець, як трэба ствараць прававую дзяржаву і законы, якія гэта забяспечваюць.

**5. 1941—1945 гады. Вялікая Айчынная вайна.** У вялікай расшыфроўцы гэта падзея не мае патрэбы. Яе трэба ведаць для таго, каб ушанаваць сапраўдную мужнасць народа і навучыцца, чаго і як не трэба рабіць. (237 слоў)

***Паліна Смолава*, спявачка:**

**1. Утварэнне новай федэратыўнай дзяржавы — Рэчы Паспалітай.** У 1569 годзе пачалася новая эпоха ў беларускай гісторыі. Вялікае Княства Літоўскае і Каралеўства Польскае падпісалі Люблінскую унію і аб’ядналіся ў адну дзяржаву. Гэтую дату я запомніла яшчэ са школы. Думаю, што кожны беларус павінен ведаць асноўныя гістарычныя падзеі сваёй роднай дзяржавы.

**2. Вялікая Айчынная вайна.** Думаю, усе ведаюць, колькі беларусаў склалі свае галовы на алтар Перамогі ў гэтай маштабнай і кровапралітнай вайне. І калі 22 чэрвеня 1941 года лічыцца трагічнай датай, то 9 мая 1945 года — радасны і вясёлы дзень. Акрамя таго, трэба ведаць і дату 3 ліпеня 1944 года. Менавіта ў гэты дзень быў вызвалены горад-герой Мінск.

**3. Аварыя на Чарнобыльскай АЭС.** Яшчэ адна трагічная дата ў гісторыі беларускага народа — 26 красавіка 1986 года. Наступствы аварыі адчувальныя і сёння. У выніку гэтай катастрофы пацярпела значная частка тэрыторыі Беларусі. Такое больш не павінна паўтарыцца.

**4. Канец савецкай эпохі.** У 1991 годзе Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік спыніў сваё існаванне. Я рада, што мне давялося пажыць і ў савецкі час са сваімі законамі і парадкамі. А вось сённяшняе маладое пакаленне толькі з кніг можа даведацца пра тое, што хавалася за абрэвіятурай СССР. Гэтую дату трэба ведаць, бо менавіта тады Беларусь стала незалежнай дзяржавай.

**5. Выбары першага беларускага прэзідэнта.** У 1994 годзе адбыліся выбары першага ў гісторыі незалежнай дзяржавы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Ім стаў Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, які і сёння працуе дзеля дабрабыту беларускага народа. (232 словы)

Адкажыце самастойна на пастаўленае пытанне. Свае адказы абавязкова падмацоўвайце невялікім апісаннем падзеі і абгрунтаваннем, чаму іменна гэтая падзея называецца.

## ЦІ ЛІЧЫЦЬ 1409 ГОД ДАТАЙ ЗАСНАВАННЯ БЕЛАВЕЖСКАЙ ПУШЧЫ?

Тут наконт 1409 года даволі загадкавая гісторыя. Раней казалі пра тысячагоддзе, пра тое, што Іпацьеўскі летапіс згадвае Белавежскую пушчу, у якой палявалі галіцка-валынскія князі. На самай справе ў Іпацьеўскім летапісе — гэта часы Кіеўскай Русі — канкрэтнай згадкі Белавежы ці Белавежскай пушчы няма. Там ёсць населены пункт Белавеж. Але толькі на Украіне месцаў з такімі назвамі каля дзясятка. Дакладна называецца Белавеж як менавіта Белавежская пушча толькі пад 1409 годам (1). Гэтыя звесткі захаваліся ў Хроніцы Яна Длугаша. У той час у Польшчы кіраваў Ягайла, а ў Вялікім Княстве Літоўскім — Вітаўт як яго намеснік (2). Ішла падрыхтоўка да ваенных дзеянняў з крыжакамі. У 1409 годзе Ягайла і Вітаўт

сустрэліся ў Берасці, каб абмеркаваць на тайнай нарадзе ваенныя планы. Ніякіх пісьмовых дакументаў тады падпісана не было. Пасля таго, як яны ўзгаднілі свае планы, Вітаўт паехаў назад у Літву, у бок Коўна і Трокаў, рыхтавацца да ваенных паходаў, а Ягайла, пакінуўшы Берасце, накіраваўся ў бок Камянца, а адтуль да Белавежскай пушчы і, як піша храніст, паляваў восем дзён на Белавежы за ракой Лясной. Гэта якраз трапляе ў межы сучаснай Белавежскай пушчы. Каля Камянца знаходзяцца рака Лясная і непасрэдна сама Белавеж. Карацей, гэта першая дакладная згадка геаграфічнага пункта Белавеж і самой Белавежскай пушчы (А. Доўнар). (203 словы)

1. Дакажыце, што прачытаны вамі тэкст — разважанне. Назавіце яго структурныя часткі, ахарактарызуйце сродкі сувязі паміж сказамі.

2. Вызначце стыль тэксту, адказаўшы на наступныя пытанні: хто? дзе? калі? навошта? піша (або гаворыць).

3. Растлумачце правапіс вялікай літары ва ўласных назвах. Ці ведаеце вы пералічаныя населеныя пункты?

Ці ёсць у тэксце пабочныя і ўстаўныя канструкцыі? Калі ёсць, вызначце іх ролю ў тэксце, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

Ці ёсць у сказах, абазначаных у тэксце лічбамі 1 і 2, аднолькавыя канструкцыі? Растлумачце пастаноўку або адсутнасць знакаў прыпынку пры іх.

Назавіце сказы з удакладняльнымі акалічнасцямі, растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры іх.

4. Уявіце сябе ў якасці прамоўцы на пасяджэнні гуртка «Гісторыя маёй Радзімы». Адкажыце на пытанне, якое сфармулявана ў загалоўку тэксту.

## ПАКРЫЖАВАЛІСЯ МЯЧЫ...

Адвеку самай мірнай лічыцца праца хлебароба. Але як часта прыпынялі гэтую пачэсную працу войны! Калі вораг ідзе на Беларусь, адрываецца селянін ад сахі[1], бярэ ў рукі зброю — бараніць Бацькаўшчыну.

---

[1] Саха́, -і, *ж.* Прымітыўная сельскагаспадарчая прылада для ворыва глебы.

Сярэдзіна лета прыносіць вялікую спёку. Пыл курыцца да неба. Ляціць па дарозе, як вецер, вершнік. Спяшаецца, б'е каня па баках. Хрыпіць конь, іржэ, пенаю пырскае. Падлятае да Берасця, хаваецца ў расчыненай браме.

Што ў ягоных руках? Вянок з лазы! Ведаюць гараджане, што гэты знак азначае: «Вайна! Зноў вайна ідзе!»

— З кім біцца? Хто да нас цяпер завітаў?

— Крыжакі! Крыжакі! — крычыць княжацкі пасланец і гоніць далей свайго каня.

Моцныя сілы трэба, каб спыніць крыжацкую навалу. На чале нашага войска сам вялікі князь Вітаўт. Яму на дапамогу спяшаюцца ваяры з усёй Беларусі.

15 ліпеня 1410 года сустрэліся два вялікія войскі пад Грунвальдам (на поўначы Польшчы). Пачалася бітва крывавая ды ўпартая. Гул яе чуваць за некалькі кіламетраў. Воін ідзе на воіна. Звіняць мячы. Трашчаць і ламаюцца шчыты. Ідзе бітва не на жыццё, а на смерць...

Палову дня б'юцца праціўнікі. Дрыжыць зямля. Хіліцца гарачае сонца долу. Вось не вытрымалі крыжакі ўдару. Бягуць! Кідаюць зброю. Зламаўся крыжацкі меч аб нашы шчыты! Перамога!

Здабылі нашы продкі на полі Грунвальда сабе славу і незалежнасць. Вяртаецца хлебароб дамоў, бо спелае збожжа чакае гаспадара. Ён для сваёй зямлі выратавальнік. Ён на ёй працаўнік, сейбіт, хлебароб.

Зразумелі крыжакі навуку, атрыманую пад Грунвальдам. Пяць стагоддзяў не ступала нага ўзброенага германскага воіна на беларускую зямлю (А. Бензярук). (234 словы)

1. Як вы разумееце загаловак тэксту? Што ён перадае: тэму ці асноўную думку?

Як вы разумееце выраз: «Зламаўся крыжацкі меч аб нашы шчыты!»? Замяніце яго сінанімічным.

2. Вызначце стыль маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Які тып маўлення пераважае? Чаму?

4. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы?

Якая частка з'яўляецца ўводнай? Ці пераклікаецца канцоўка з пачаткам тэксту?

Складзіце план тэксту, выкарыстаўшы цытаты з тэксту.

5. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання і апісання гістарычнай падзеі?

Выпішыце паасобку з кожнага абзаца тэксту дзеясловы. Вызначце іх тэкстаўтваральную ролю.

Назавіце параўнанні і параўнальныя звароты з тэксту. Ці ёсць гіпербала ў тэксце? Якую ролю выконваюць гэтыя прыёмы ў апісанні падзеі?

Якую ролю выконваюць у тэксце клічныя і пытальныя сказы?

## СУСТРЭЧА Ў БЕРАСЦІ

Ішоў 1409 год. Завітаў Ягайла ў Берасце на спатканне з Вітаўтам. Іх воіны адклалі ўбок зброю, распалілі вогнішча. Пусцілі па крузе вялікую чашу браціну з салодкім і гаркаватым мёдам. Нездарма чаша так завецца: усе, хто з яе вып'е, становяцца братамі і не могуць больш узняць адзін на аднаго руку!

Польскі рыцар Завіша прыгубіў мёд, шырокай далонню вусны абцёр. Усміхнуўся Завіша, перадаў браціну берасцейцу Ціту:

— Мір твайму дому, русін!

— Мір твайму дому, лях! — адказвае Ціт.

Паплыла браціна па коле. Кожны пра мір згадвае, але пра вайну трывожна думае.

Моцным хорам выгукнулі ваяры:

— Каралю Ягайлу — слава! Вітаўту-князю — слава! Хай яны заміраюцца і пабратаюцца. Хай ворагі дрыжаць, як лісце на асіне!

А за шырокім сталом у Берасцейскім замку сядзяць Вітаўт і Ягайла. Доўга гавораць. Ужо і месяц на неба ўзышоў. Няпростая бяседа.

— Неспакойна ў нашым краі, браце, — пачынае кароль. — Крыжакі толькі і чакаюць, калі мы загінем паасобку, каб захапіць Польшчу з Літвою.

— Згуба ўсіх чакае, калі паміж сабою не спынім барацьбы, — згаджаецца вялікі князь. — Досыць помніць благое!

Паглядзелі Вітаўт і Ягайла адзін аднаму ў вочы. Працягнулі браты рукі, крыж пацалавалі і паабяцалі ніколі больш не быць ворагамі. Дамовіліся разам пачаць вялікую вайну супраць крыжакоў (А. Бензярук). (194 словы)

1. Што вам вядома пра гістарычную дату 1409 год?

2. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? Падбярыце да тэксту свой загаловак, які б перадаваў яго асноўную думку.

3. Прывядзіце прыклады моўных асаблівасцей стылю тэксту (словы з пераносным значэннем, эмацыянальна-ацэначныя словы і інш.).

4. Назавіце звароткі, выкарыстаныя ў тэксце. Растлумачце, чаму іменна так звяртаюцца героі адзін да другога.

Вызначце ролю пабуджальных і клічных сказаў у тэксце.

## Падрабязны пераказ апавядальнага тэксту з элементамі разважання

### КАЗКА ПРА ПАЛКУ

Была ў маім дзяцінстве чароўная кніжка «Індыйскія казкі». Перачытвала яе бясконца, таму да гэтай пары час ад часу пры нагодзе яны, тыя дзіцячыя казкі, мне згадваюцца.

...Жыў-быў у адной вёсцы разумны міравы суддзя. Пра яго казалі, што ён можа вырашыць абсалютна любую справу лёгка і проста. Аднойчы ў селяніна ўкралі грошы, якія ён збіраў на карову. Селянін прыйшоў да суддзі і папрасіў разабраць гэтую справу хутка, але далікатна, каб не пакрыўдзіць аднавяскоўцаў падазрэннямі. Суддзя сказаў: «No problems» і папрасіў прынесці палкі аднолькавай даўжыні ў колькасці, роўнай колькасці аднасяльчан. Калі палкі былі прынесены, суддзя сабраў усіх жыхароў і абвясціў:

– Кожны з вас павінен узяць па палцы і аднесці сабе дадому. Той, у каго палка вырасце за ноч на дзесяць інчаў, — злодзей!

На другую раніцу ўсе жыхары сабраліся перад домам суддзі. Ён выйшаў і стаў параўноваць палкі. Ва ўсіх яны былі роўныя, і толькі ў аднаго палка была... карацейшая на дзесяць інчаў! Праблема выкрывання злодзея была вырашана проста і далікатна...

Чаму мне казка ўспамінаецца. Ды варта мне толькі згадаць слова «графаман», адразу ж процьма людзей пачынае пісаць лісты і абурацца: «Гэта ж яна пра мяне напісала!»

Кожны падкарочвае палку пад сябе... (Г. Кісліцына). (192 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст? У якім сказе яна сфармулявана?

2. Што можа дапамагчы вам у вызначэнні стылю тэксту «Казка пра палку»?

3. Які тып маўлення пераважае ў тэксце? Назавіце яго часткі адпаведна тыпам тэксту. З якой мэтай журналіст Г. Кісліцына ўводзіць у тэкст разважанне?

4. Якія падтэмы выкарыстала аўтар для раскрыцця тэмы?

Якая частка з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце? Які яна мае сэнс?

Колькі абзацаў у тэксце? Вызначце сувязь паміж часткамі тэксту і сказамі ў частках. Ці супадаюць абзацы і часткі? Падбярыце да частак загалоўкі, выкарыстаўшы апорныя словазлучэнні з тэксту.

Складзіце план тэксту і яго схему. Ці супадаюць яны? Чаму?

5. Якія вобразна-выяўленчыя моўныя сродкі выкарыстаны ў казцы? Назавіце мастацкія азначэнні. З якой мэтай выкарыстаны выраз «No problems»?

6. Вызначце з кантэксту значэнне слова *інч*. Выпішыце яго значэнне і значэнне слова *графаман* з тлумачальнага слоўніка ці Вікіпедыі.

Пракаменціруйце правапіс наступных слоў: *бясконца, жыў-быў, суддзя, селянін, прынесеныя* (палкі), *аднавяськовец, аднасяльчанін.*

Запішыце дыялог суддзі і сялян з выкарыстаннем зваротkaў.

## НЕ ПРАХОДЗЬЦЕ МІМА!

Мы прывыклі да абыякавасці, навучыліся з ёю жыць, не заўважаць яе, як прыліплівую жавальную гумку ці фанцік на дарозе. Часта, пакуль чалавек сам не сутыкнецца з абыякавасцю іншых, — калі яму было балюча і страшна, а на падмогу ніхто не прыйшоў, — ён не заўважае і няшчасці іншых. Ёсць такі фільм «Плачу́ наперад». Галоўны герой, маленькі хлопчык, прыдумвае простую схему абсалютнага шчасця: кожны чалавек дапамагае тром іншым людзям, кожны з іх — яшчэ траім і гэтак далей. Так, паступова, зробленае дабро вернецца да вас, і кожны дапаможа іншаму. У фільме прынамсі гэта схема працавала. У жыцці ж, пэўна, знойдуцца і такія, хто скажа: «А як доўга мне чакаць, што мне дапамогуць?», «Ці можна дапамагаць толькі знаёмым людзям?» і да т. п. Асабіста мне проста страшна ад думкі, што, калі, крый божа, давядзецца трапіць у бяду, усе проста пройдуць міма, сарамліва схаваўшы вочы (К. Бядуліна). (142 словы)

1. Дакажыце, што перад вамі тэкст, які мае:
пачатак;
канец;
яго будова адпавядае пэўным мэтам;
выражае канкрэтную ідэю;
нясе ў сабе пэўную інфармацыю;
адпавядае патрабаванням звязнасці, лагічнасці, паслядоўнасці і г. д.

2. Ахарактарызуйце спецыяльныя сродкі выразнасці, выкарыстаныя аўтарам у асноўнай частцы (нечаканасць у сюжэце, прыклады і інш.).

3. Адкажыце на пытанні:

- Для якой мэты створаны тэкст?
- Якую сферу дзейнасці чалавека ён абслугоўвае?
- У якой сітуацыі ён будзе ўспрымацца?

4. У якім стылі напісаны? Абгрунтуйце сваю думку, прывёўшы прыклады, якія ілюструюць яе.

5. Растлумачце правапіс *не* (*ня*), *ні* ў першых двух сказах.

6. Перакажыце змест тэксту, дапоўніўшы яго сваімі разважаннямі пра адносіны да абыякавасці.

## Выбарачны пераказ

Уважліва прачытайце нататку з газеты «Звязда».

### СУМУЮ ПА ПРЫНАЛЕЖНЫХ ПРЫМЕТНІКАХ...

Наш пастаянны чытач Сцяпан Станюк у сваім лісце ў рэдакцыю піша, што апошнім часам у нашым беларускім друку амаль забыліся на прыналежныя прыметнікі. У газетах найчасцей абыходзяцца родным склонам назоўніка.

«А звярніцеся да нашай класікі, — зазначае аўтар ліста, — “**Рыбакова** хата”, “**Міхасёвы** прыгоды” Якуба Коласа, “**Тарасова** доля” Янкі Купалы, “**Вавёрчына** гора” Васіля Віткі».

Вельмі слушная і надзённая ваша заўвага, шаноўны Сцяпан Іосіфавіч. І выдатныя прыклады.

Вядома, у нашай мове ёсць два сродкі выказвання прыналежнасці. Гэта прыналежныя прыметнікі і родны склон прыналежнасці (**братава** кніга і кніга **брата**). Але правільна падкрэсліваецца ў лісце: асноўнай формай былі і застаюцца прыналежныя прыметнікі.

Вельмі цікавыя падлікі гэтых абедзвюх формаў у фальклорных запісах і ў мове мастацкай літаратуры зрабіў некалі даследчык М. Стэльмах. Думаю, яны будуць цікавыя і для нашага чытача. Так, напрыклад, у аб’ёмістым «Белорусском сборнике», які выйшаў у Кіеве ў 1886 годзе і ў якім пададзены багаты фальклорны матэрыял — песні, прыказкі, прымаўкі, — родны склон прыналежнасці **зусім не сустракаецца**. У «Хрэстаматыі па беларускай дыялекталогіі» (Мінск, 1962), дзе змешчаны матэрыялы, сабраныя ў 1948—1959 гадах у розных

мясцовасцях Беларусі, ужыты 81 прыналежны прыметнік, у той час як з родным склонам прыналежнасці без паясняльнага слова толькі 3 прыклады.

А цяпер — з мастацкай літаратуры. У аповесці «Дрыгва» Якуба Коласа са 148 прыналежных канструкцый 127 прыпадае на прыналежныя прыметнікі і 21 — на родны склон назоўнікаў. У рамане «Людзі на балоце» Івана Мележа з прыналежнымі прыметнікамі налічваецца 157 прыкладаў, а з родным склонам — толькі 10.

У сучаснай рускай мове прыналежныя прыметнікі ўтвараюцца ад назваў асоб (галоўным чынам сваякоў), уласных імёнаў і назваў прафесій.

І калі ў рускай мове трэба зважаць не толькі на род, але і на тып скланення, да якога адносіцца той ці іншы назоўнік (*отцов*, *братцев*, *дедушкин*, *Зоин*, *Ванин*), то ў беларускай усё вельмі проста. Ад назоўнікаў мужчынскага роду (незалежна ад тыпу скланення) прыналежныя прыметнікі ўтвараюцца з дапамогаю суфіксаў *-оў*(*-ёў*), *-аў*, *-еў* (**дзядзькаў**, **Міхасёў**, **Толеў**), а ад назоўнікаў жаночага роду толькі з суфіксам *-ін*(*-ын*) (**Зоін**, **матчын**, **бабчын**). Так што адразу відаць і род уладальніка: **Алесева кніга** (кніга Алеся), **Алесіна кніга** (кніга Алесі).

Вядома, трэба мець на ўвазе: перад суфіксам *-ін* у нашай мове заднеязычныя памякчыліся ў шыпячыя (а *-ін* пасля шыпячых дае *-ын*): бабка — баб**ч**ын, мача**х**а — мача**ш**ын (параўн. руск. *бабкин*, *мачехин*).

Родны ж склон назоўнікаў для выказвання прыналежнасці ў нашай мове непазбежны, па сутнасці, толькі ў двух выпадках:

1) пры назоўніку стаіць яшчэ хоць бы адно слова: штодзённік *Міхася* Кунцэвіча, часопіс *майго* сябра;

2) прыналежнага прыметніка нельга ўтварыць ад прыметніка, які зрабіўся назоўнікам (ложак *хворага*).

Вось збольшага ўсё. Таму калі ў газетах бачыш: *ноўтбук выкладчыка*, *машына дырэктара*, *капялюш брыгадзіра*, думаеш: няўжо аўтару цяжка напісаць гэта больш натуральна: **выклад-**

**чыкаў ноўтбук**, **дырэктарава машына**, **брыгадзіраў капялюш**. І сумуеш па беларускіх прыналежных прыметніках (444 словы).

*Рубрыку вядзе Анатоль КЛЫШКА*

1. З якіх частак складаецца нататка?

2. Што вы ведаеце пра чалавека, які дае адказ на пастаўленае чытачом пытанне? Якія аргументы (факты) выкарыстоўвае мовазнаўца, каб пераканаць чытачоў старэйшай беларускамоўнай газеты «Звязда» ў тым, што прыналежныя прыметнікі – больш уласцівы беларускай мове сродак выказвання прыналежнасці?

3. Уявіце сабе, што вам патрэбна:

1) растлумачыць суседу-шасцікласніку тэму «Правапіс суфіксаў прыналежных прыметнікаў» або

2) выступіць з паведамленнем «Прыналежныя прыметнікі ў беларускай мове» на пасяджэнні гуртка «Юны мовазнавец».

4. Адбярыце неабходны для выбранай тэмы матэрыял і падрыхтуйце выбарачны пераказ тэксту.

## АЛІСА Ў КРАІНЕ ЦУДАЎ

З часу, калі амаль 150 гадоў таму матэматык Чарлз Доджсан (Льюіс Кэрал) выдаў сваю кніжку пра прыгоды маленькай брытанкі Алісы, было зроблена безліч спроб перакласці тую кніжку на іншыя мовы, а таксама на мову мультфільмаў, кінастужак, мюзіклаў і камп'ютарных гульняў. Прыгадаем хаця б крыху саладжавую (што паробіш — час быў такі!) дыснэеўскую пастаноўку ў 1951 годзе або складаны паводле мультыплікацыйнай тэхнікі савецкі мюзікл Яфрэма Пружанскага з дасціпнымі песнямі Уладзіміра Высоцкага (1981). Або эксперыментальную, сюррэалістычную дазваня[1] «Аленку ў краіне Дзіву» (1988) чэшскага рэжысёра Яна Шванкмаера, дзе скрушная на галаву Аліса трапляе ў галюцынацыйны сон.

У кнігацэнтрычнай беларускай культуры «Алісу» перакладалі ажно тры перакладчыкі. Паэт Макс Шчур абеларушваў

[1] Дазва́ння, прысл. Зусім, начыста, поўнасцю.

нават імя галоўнай гераіні: Аліса зрабілася Алесяй (а Краіна Цудаў — Дзівоснай краінай). Вера Бурлак дадала да гэтага шэрагу Гутата і Гуляля (анг. Tweedledum і Tweedledee, рус. Труляля і Траляля) і Мармазяўра (ён жа англійскі Jabberwocky (Джабервокі) і расійскі Бармаглот). А яшчэ ёсць карпатлівы пераклад віцьбіча Дзяніса Мускага.

«Аліса ў Краіне Цудаў» ЗША, 108 хвілін, казка, прыгоды. Рэжысёр — Цім Бёртан. У ролях: Джоні Дэп, Хэлена Бонэм-Картэр. Ці не самы паспяховы дзівак Галівуда Цім Бёртан зняў казку для дзяцей. «Эдвард — рукі-нажніцы», «Вялікая рыбіна», «Шакаладная фабрыка Чарлі» — усё гэта былі дзівосныя прытчы для дарослых, чароўныя няказкі. Кранальныя гісторыі пра неўладкаваных, але абаяльных фрыкаў, якія робяць свет прыгажэйшым. Але рэжысёрскае сэрца, відаць, не жалезнае (колькі можна быць інакшым?), і таму сустракайце: фільм са спецэфектамі і хэпі-эндам паводле дыснэеўскага канону. Амаль. Як там усё будзе? (Уладальнікі квіткоў! Не чытайце гэты абзац!) Замест Уондэрлэнда (Дзівоснай краіны) у Бёртана — Андэрлэнд (Ніжні свет). Замест малой і — чаго граху хаваць — крыху нуднаватай кэралаўскай Алісы — дваццацігадовая бунтаўніца хутчэй з дваццатага стагоддзя, чым з дзевятнаццатага, якая дае рады жудаснай пачвары з мячом у руках, а ў дадатак падумвае пра кар’еру дырэктаркі гандлёвай кампаніі. Пасярод заручынаў з гідкім хлопцам Аліса ўцякае ў Краіну Цудаў, краіну сваіх, здавалася, мараў. Каб вырашыць свае ўнутраныя праблемы ў гэтым свеце, у дзівоснай ягонай паралелі, дзяўчо змагаецца за вызваленне сяброў і нават абезгалоўлівае жахлівага Мармазяўра (а ў стужцы ён не такі смешны, як яго імя) (З газеты «Наша ніва»). (335 слоў)

1. Ці можна прачытаную вамі групу сказаў назваць тэкстам? Ці валодае яна асноўнымі прыметамі тэксту — цэласнасцю і закончанасцю, звязнасцю па сэнсе і граматычна (па будове)? Ці аб’яднаны сказы агульнай тэмай і асноўнай думкай? Высветліўшы гэта, надайце свайму пераказу рысы звязнага і цэласнага тэксту пра змест кінафільма «Аліса ў Краіне Цудаў».

2. Які гэта будзе пераказ — падрабязны, сціслы ці выбарачны? Чаму?

3. Растлумачце значэнне наступных слоў і словазлучэнняў: *савецкі мюзікл, дыснэеўская пастаноўка, сюррэалістычны, галюцынацыйны сон, абаяльныя фрыкі, фільм са спецэфектамі і хэпі-эндам, паводле дыснэеўскага канону, дзівак Галівуда.*

4. Выпішыце ўласныя імёны з тэксту. Хто напісаў кніжку пра прыгоды маленькай брытанкі Алісы і хто перакладаў тую кніжку на іншыя мовы свету? Ці ўвайшла гэтая інфармацыя ў ваш пераказ? Чаму?

5. Напішыце выбарачны пераказ тэксту.

## Сціслы пераказ

### САМАЕ ЗНАЧНАЕ ВЫНАХОДСТВА

Кніга — гэта сасуд, які нас
напаўняе, але сам не пусцее.
*Адрыян Дэкурсель*[1].

Якое вынаходства стала самым значным за ўсю гісторыю чалавецтва? Вучоныя з розных краін аднадушна вырашылі, што гэта — кніга. Не тэлефон, не самалёт, не атамны рэактар, не касмічны карабель, а іменна кніга. Таму што з'яўленне самалёта і касмічнага карабля, авалоданне электрычнай і атамнай энергіяй і яшчэ многае іншае стала магчымым іменна дзякуючы вынаходству кнігі.

І сёння, нягледзячы на з'яўленне і развіццё электронных сродкаў камунікацыі, кніга не страціла свайго першаступеннага значэння. Яна па-ранейшаму застаецца самым надзейным і стабільным носьбітам і захавальнікам інфармацыі, якому непатрэбна ніякая знешняя энергія. А таму кніга пакуль і самы даўгавечны акумулятар ведаў. Яна, як і ў старажытныя часы, служыць галоўнаму: з пакалення ў пакаленне прасвятляе людзей, гэта значыць робіць іх святлейшымі, вядзе да дабра.

[1] Адрыян Дэкурсель (1821—1892) — французскі драматург.

Многія думаюць, што навучаць можна і вусна. Канечне, можна. Толькі вымаўляць словы, не запісваючы іх, усё роўна што пісаць віламі па вадзе. Так сказаў адзін са стваральнікаў славянскай азбукі, асветнік Кірыла. Пачутае слова, не замацаванае на паперы, вельмі хутка сціраецца, зыходзіць з памяці, выціснутае іншымі словамі і ўражаннямі. Ды і ці можна спадзявацца на яго дакладнасць? Слова ж пачутае, а затым яшчэ і прачытанае надоўга захоўваецца ў памяці чалавека.

Людзі заўсёды імкнуліся не проста захаваць свае назіранні і веды, але і абагульніць іх. Нездарма нашы продкі казалі: «Розум без кніг — як птушка без крылаў». І азначае гэта адно: як птушка без крылаў узляцець не можа, так і розум абмежаваны і скаваны без чытання кніг (Па матэрыялах Энцыклапедыі электроннай). (245 слоў)

1. Вызначце тэму тэксту.

2. Як суадносяцца ў тэксце тэма і мікратэмы? Ці падпарадкоўваюцца яны агульнай тэме? Ці супадаюць мікратэмы з абзацамі?

3. Перакажыце тэкст сваімі словамі, выкарыстоўваючы наступную табліцу.

| Абзац | Мікратэма |
|---|---|
| 1 | Самым значным вынаходствам за ўсю гісторыю чалавецтва вучоныя з розных краін прызналі кнігу, таму што дзякуючы гэтаму вынаходству сталі магчымымі і многія іншыя. |
| 2 | Сёння кніга па-ранейшаму застаецца самым надзейным акумулятарам інфармацыі, які вядзе да дабра. |
| 3 | Даставерным з'яўляецца толькі слова, замацаванае на паперы, слова пачутае і затым прачытанае надоўга застаецца ў памяці. |
| 4 | Розум абмежаваны і скаваны без чытання кніг, таму што ў іх абагульнены вопыт дзясяткаў пакаленняў. |

4. Пры сціслай перадачы зместу вы можаце выкарыстоўваць наступныя прыёмы:

— выключэнне неістотнай інфармацыі, падрабязнасцей, дэталей;

— абагульненне адзінкавых з'яў і фактаў;

— пераканструяванне сінтаксічных канструкцый на больш простыя і інш.

## ДВА ПОЗІРКІ НА ПУСЮ

Ці вядома вам, сябры, што навукай даказана: кошкі прыбаўляюць сваім гаспадарам аж дванаццаць гадоў жыцця? А тое, што таленты кошак — цыркавых артыстак — напрамую залежаць ад пароды і характару (таму дрэсіроўшчыкі, рыхтуючы цыркавыя нумары, не муштруюць жорстка сваіх гадаванцаў, а толькі ўмела выкарыстоўваюць іх прыродныя схільнасці)? Асабіста я гэтыя і іншыя цікавыя звесткі пра нашых пушыстых сяброў знайшла ў кніжцы Маі Гарэцкай «Разумніца Пуся», якую нядаўна выпусціла ў свет РВУ «Літаратура і мастацтва».

Пуся — гэта рэальная кошка. Яе гаспадыня, журналістка Мая Гарэцкая, з любоўю і гумарам расказала аб прыгодах, звычках і талентах сваёй пястухі. А зрокава ўявіць сабе вобраз гэтай ласкавай гарэзніцы чытачам дапамагла маладая мастачка, студэнтка архітэктурнага факультэта БНТУ Данута Рунова. І зрабіла гэта таксама з любоўю і гумарам. Прычым настолькі шчыра, што нам нават захацелася распытаць яе аб рабоце над ілюстрацыямі да «Разумніцы Пусі» больш падрабязна.

— Данута, лічыцца, што спасцігнуць заканамернасці абаяння яшчэ цяжэй, чым заканамернасці прыгажосці. На вашых малюнках — вельмі абаяльная кошка. Можа, раскрыеце нам сакрэт абаяння «вашай» Пусі?

— Я ўсведамляла, што малюю для сучасных дзяцей і што рабіць гэта варта ў сучасным стылі. Але разам з тым адразу вырашыла адмовіцца ад камп’ютарнай графікі, якой, на мой погляд, не стае душы. З дзяцінства люблю ілюстрацыі савецкіх дзіцячых кніжак. Я іх перамалёўвала, рабіла ў іншым колеры, відазмяняла вобразы казачных герояў. Адным словам, тыя ілюстрацыі істотна сілкавалі маю фантазію. Таму і Пусю палічыла правільным маляваць «жывой» рукой.

— Ці ёсць у вас самой кошка?

— Толькі не кошка, а кот Барсік.

— І назіранні за ім дапамаглі лепш адчуць гераіню кніжкі Маі Гарэцкай?

— Хутчэй было некалькі інакш. Справа ў тым, што колькі сябе памятаю, заўсёды любіла коней, сабак, катоў, клапацілася пра іх. Думаю, менавіта гэтая любоў, гэтыя клопаты і дапамаглі мне ў рабоце над кніжкай пра Пусю. Я даўно заўважыла, што людзі, у якіх жывуць жывёлы, маюць больш шырокі і больш светлы позірк на свет.

Кніга, створаная журналісткай Маяй Гарэцкай і мастачкай Данутай Руновай, яшчэ раз пераканала мяне ў гэтым (Паводле Г. Пшонік). (321 слова)

*Заўвага.* Пераказ можна правесці з мэтай падрыхтоўкі да напісання водгуку на мастацкі твор.

1. Дакажыце, што перад вамі тэкст, які мае:
пачатак;
канец;
яго будова адпавядае пэўным мэтам;
выражае канкрэтную ідэю;
нясе ў сабе пэўную інфармацыю;
адпавядае патрабаванням звязнасці, лагічнасці, паслядоўнасці і г. д.

2. Ахарактарызуйце спецыяльныя сродкі выразнасці, выкарыстаныя аўтарам у асноўнай частцы (нечаканасць у сюжэце, прыклады і інш.).

3. Адкажыце на пытанні:
- Для якой мэты створаны тэкст?
- Якую сферу дзейнасці чалавека ён абслугоўвае?
- У якой сітуацыі ён будзе ўспрымацца?

4. У якім стылі напісаны тэкст? Вызначце яго жанр.

5. Як бы вы назвалі частку тэксту, пададзеную ў 3—9 абзацах? Як па-іншаму можна яе перадаць пісьмова?

6. Выявіце, якую інфармацыю ў тэксце можна перадаць абагульнена, а якую можна апусціць. Сцісла перакажыце тэкст, замяняючы простую мову ўскоснай.

## Пераказ
## з дадатковым заданнем

21 лютага адзначаецца Міжнародны дзень роднай мовы. Гэты дзень быў заснаваны ў лістападзе 1999 года рашэннем Трыццатай сесіі Генеральнай канферэнцыі ЮНЕСКА з мэтай абароны моўнай і культурнай разнастайнасці.

Дзень роднай мовы асаблівы для кожнай нацыі, кожнага народа, бо няма народа без мовы, няма мовы без яго носьбіта. І беларусы не выключэнне. Нам у спадчыну засталася ўнікальная мова — жывая і мілагучная, песенная і паэтычная, старажытная і сучасная.

Міністэрства культуры звяртаецца да ўсіх, каму неабыякавы лёс роднай мовы, пашыраць яе выкарыстанне ў паўсядзённым жыцці і не толькі ў гэты дзень.

Выказванні славутых беларусаў пра родную мову:

Янка Купала: «Магутнае слова, ты, роднае слова! Са мной ты на яве і ў сне, душу мне затрэсла пагудкаю новай, ты песень наўчыла мяне».

Францішак Багушэвіч: «Шмат было такіх народаў, што страцілі найперш сваю мову, так як той чалавек перад скананнем, катораму мову займае, пасля і зусім замерлі. Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі!»

Уладзімір Караткевіч: «Ты мой ясны хлеб і каханы май, песня продкаў, нашчадкаў палі, без цябе, не з табой – не патрэбен мне рай на душы. Ў небясі. На зямлі».

Якуб Колас: «Любіце, ведайце і шануйце мову свайго народа і ўмейце дасканала валодаць ёю».

Алесь Гарун: «Дык шануй, беларус, сваю мову, – гэты скарб наш на вечныя годы, за пашану радзімаму слову ўшануюць нас брацця-народы!»

Максім Танк: «З усяго таго, што лягло назаўсёды ў аснову святыні народа, бяссмерця яго, – ты выткана, дзіўная родная мова» (Паводле інтэрнэт-рэсурсаў). (237 слоў)

1. Вызначце тэму тэксту. Выпішыце (прачытайце) сказ, у якім заключаецца асноўная думка. Падбярыце да тэксту загаловак.

2. Вызначце стыль маўлення. Свой адказ падмацуйце прыкладамі, выпісанымі з першых трох абзацаў. З якой мэтай у тэксце выкарыстаны выказванні вядомых беларускіх пісьменнікаў пра мову?

3. Знайдзіце параўнальны зварот у выказванні Францішка Багушэвіча. Як ён дапамагае вам зразумець сэнс выказвання?

Якая дзеяслоўная форма аб'ядноўвае выказванні Францішка Багушэвіча, Якуба Коласа, Алеся Гаруна? З якой мэтай яна выкарыстана? Вызначце тыпы сказаў па мэце выказвання і будове.

У якіх выказваннях выкарыстаны звароткі? Ахарактарызуйце іх, назавіце іх функцыю.

Пералічыце, з дапамогай якіх вобразна-выяўленчых сродкаў, выкарыстаных пісьменнікамі ў прыведзеных выказваннях, пацвярджаецца асноўная думка тэксту.

Растлумачце правапіс вялікай літары ў словах тэксту.

Пракаменціруйце пастаноўку знакаў прыпынку ў выказваннях пісьменнікаў.

4. Высветліўшы асноўную думку тэксту, перакажыце яго змест, дапоўніўшы некалькімі, вядомымі вам выказваннямі грамадскіх дзеячаў пра родную мову.

## А ДЗЕД БЫЎ ПРЫГОЖЫ

Без шапкі, у шэрай, як ралля, расхрыстанай на сухіх, загарэлых грудзях кашулі. Упёршыся худымі і пругкімі, як смаляныя галіны, нагамі ў рабрыну вялікай лодкі, «кароль вугроў» паволі і няспынна разгойдваўся ўперад-назад, рытмічна ўзмахваючы цяжкімі вёсламі. З вельмі дакладнай і неабходнай для справы скупасцю заграбаў ён ціхую празрыстую ваду. Так лёгка і хораша, спраўна і спорна ідуць у пракосе сапраўдныя касцы. Белы маршчыністы лоб над загарэлымі скуламі шчодра акраплены потам. Сівыя валасы, хоць і прычасаныя перад ад'ездам у людзі, як толькі ён зняў кепку, зноў растрэсліся, прынялі свой звычайны, сціпла кучаравы беспарадак.

Прыгожая была гэтая шэрая, вельмі жыццёвая, натуральная прастата, гэтая яшчэ ўсё не растрачаная сіла, якую і не высушылі, і не прыглушылі дзевяць дзясяткаў больш катаржных, чым радасных гадоў. Прыгожы быў позірк светла-бла-

кітных вачэй пад густымі сівымі брывамі, вачэй адкрытых і чыстых, як само бясхмарнае неба, паўторанае ў крынічным люстры бяскрайняга возера. Прыгожы быў, урэшце, увесь гэты звычайны, будзённы малюнак: вялікая чорная лодка на вадзяной пустыні, у лодцы — шэры дзед і светленькая ўнучка, а за кармой, на буксіры, — доўгае сасновае бервяно і яшчэ даўжэйшы трохкутнік растрывожанай вады (Я. Брыль). (181 слова)

1. Падрыхтуйцеся да пераказу тэксту-апісання, вызначыўшы, якія дэталі партрэта дзеда і чаму іменна яны выбраны аўтарам для апісання (паказу). Якія прыкметы гэтых дэталей адлюстраваны ў тэксце? Выпішыце апорныя словы і словазлучэнні, якімі характарызуюцца дэталі партрэта (апісання дзеда). Як гэтыя прыкметы згрупаваны? Якія моўныя сродкі выкарыстаны? Назавіце параўнанні, словы з пераносным значэннем, мастацкія азначэнні і інш.

2. Якую тэкстаўтваральную ролю выконваюць азначэнні, пабочнае слова *нарэшце*?

3. Растлумачце пастаноўку працяжніка ў сказах.
Растлумачце правапіс дэфіса (злучка).

4. Перакажыце змест тэксту, дапоўніўшы яго заключнай часткай, выказаўшы ў ёй сваё разуменне прыгожага.

Прачытайце дома апавяданне Наталлі Пахомчык.

## АБМЯРКУЕМ

**Частка I**. Глеб і Алег пазнаёміліся ў гуртку «Польская мова». Сярод пераважна ціхмяных вучняў яны, бясспрэчна, вылучаліся: за іх партай заўсёды штосьці актыўна абмяркоўвалася. Часта гэтае абмеркаванне пераходзіла ў спрэчку...

Гулялі мы тады ў «Адгадайку», ці, як вучні хутка перайначылі, у «Мозгаламайку» (каб новыя польскія словы запаміналіся лепш, іх пераклад я давала не адразу: спачатку называла часціну мовы, да якой адносіцца гэтае слова, рабіла падказкі наконт яго агульнага значэння, падбірала аднакаранёвыя словы, сінонімы з іншых моў — карацей, намагалася скіраваць думку гурткоўцаў у правільным рэчышчы. Сэнс слова,

здабыты такім шляхам, надоўга запамінаўся). Дык вось... Ламаем мы так галаву над словам styczé («стЫчэнь»)...

— Гэта ча́савы адрэзак на **сты**ку, на памежжы, — раблю я падказку.

— «Агонія», ці што? — пачынаюць «ламаць мазгі» гурткоўцы.

— «Канец свету»!

— «Апакаліпсіс»!

— «Канікулы», мабыць.

— Цяплей. Яшчэ раз: гэта абазначэнне менавіта часавага прамежку — і ён з года ў год паўтараецца. Дарэчы, у беларускім адпаведніку першыя два гукі супадаюць, — ізноў спрабую скараціць шлях да ісціны.

— Месяц! Гэта нейкі месяц! — здагадваюцца некаторыя.

Гурткоўцы пачынаюць нерватацца: адгадка блізка, і кожны хоча быць першым. Узнімаецца гармідар, усе імкнуцца выкрыкнуць — пакуль што пальцам у неба — сваю версію, абы-што — толькі б ніхто не апярэдзіў. Чуюцца назвы месяцаў па-руску.

— Стоп. Беларускі месяц, які пачынаецца на «**ст**» — адзін. Атрымліваецца — без варыянтаў. Ну? — прыспешваю працэс.

Нечаканая цішыня, толькі чуецца дробат Алегавых пальцаў па парце, ён круціцца то ўлева, то ўправа — наставіў вушы.

Нарэшце Глеб не вытрымлівае і пакутліва расцягвае:

— «Сту-у-удзень»... Па-руску — «январь». Па-польску «**сты**-чэнь» — першы, на **сты**ку года, месяц (239 слоў).

**Частка II**. Расчараваны, незадаволены гул хваляй пракаціўся па класе, і спужаныя вераб'і хмаркай разляцеліся з падаконняў.

— Ну нашто такія выкрунтасы?! Ці не прасцей было б усе месяцы ва ўсіх мовах назваць аднолькава. Якая розніца? Вось рускія назвы — падобныя да англійскіх: ноябрь — November, сентябрь — September. А тут панавыдумлялі «студзеняў» розных. Гэта ж трэба, месяц стравай назваць — «заліўным». (Алег яўна не мог дараваць сваёй паразы.) І ўвогуле, — гарачыўся юнак, — даўно ўжо разумныя людзі прыдумалі эсперанта —

штучную мову. Чаму б яго не зрабіць абавязковым школьным прадметам? Замест англійскіх, нямецкі-шмецкіх... І правілы там прасцейшыя, і карысць ад вывучэння такой мовы большая: можна было б смела ехаць у любую краіну — і там цябе абавязкова зразумеюць... — Алегавы разважанні набіралі ўсё больш глабальны маштаб.

— І карміць усіх аднолькава, і апранаць пажадана — таксама, — іранічна працягнуў «лагічны ланцужок» Алегавых разважанняў яго сябар.

— Чытаць аднолькавыя кніжкі, глядзець адны і тыя ж фільмы. І ўсім іх аднолькава любіць і хваліць... Каб прасцей, без спрэчак жылося. Так?

Алег маўчаў. Глеб палічыў гэта за згоду.

— Калі так, тады каб заўтра, Алег, ты прыйшоў апрануты так, як і я, каб валасы твае пасвятлелі і былі такія ж ускудлачаныя, як і ў мяне цяпер. Ага, і вочы хай будуць, як і мае, блакітныя.

— Ну і прыйду! — злосна пагадзіўся Алег на штучнае капіраванне. (205 слоў)

**Частка III**. На наступных занятках усе толькі і рабілі, што цікавалі за дзвярыма, чакаючы Алега і яго абяцанага пераўвасаблення.

Алег пазніўся. Пачалі без яго. На дошцы напісаны ўжо новы «незнаёмец» — oczywiście (очывIсьце).

— Шаноўныя, звяртаю вашу ўвагу: па-першае, гэта прыслоўе, па-другое, яно складаецца з двух слоў. Паспрабуйце знайсці іх і вылучыць — пасля прасцей будзе здагадацца пра сэнс цэлага слова, — стаўлю задачу гурткоўцам.

— Очы-очы-очы... — пачынаецца «мазгавы штурм».

— «Очы»! «Вочы»!

— Правільна! А далей? — пытаюся.

Тут ціхенька рыпнулі дзверы. Алег — такі ж, як і ўчора. Пашыбаваў за сваю апошнюю парту — далей ад цікаўных вачэй.

— Дык а другая частка — пра што?

— Што за «вісьце» такое?

— Падказваю: другая частка — ад дзеяслова. І паўтару: усё слова цалкам — прыслоўе.

— «Вісець»? «Вочы вісяць»? Не?..

— «Вішчэць»? «Вочы вішчаць»? «Страшна»?

— Паспрабуйце знайсці больш арганічны для «вачэй» адпаведнік, — раю я.

— Ну, вочы бачаць...

— А!!! «Від»! Рускае «видеть»!

— Што за лухта. Няма такога прыслоўя, — бурчыць Алег.

— «Очы-вісьце»... як рускае «оче-видно». Тое, што я добра **бачу** на ўласныя **вочы**!

Усе азіраюцца на Глеба з зайздрасцю — ізноў першы здагадаўся.

— А чаму ж ты, сябрук, не прыйшоў сёння, як учора абяцаў, у маім вобразе, га? — спытаўся раптам Глеб.

— Чаму-чаму... Не хачу я быць, як ты! Я — асоба! У мяне свае звычкі, свае прынцыпы. Я сам па сабе, такі, як ёсць, непадобны да цябе — ну і што?! Можа, у гэтай непадобнасці і ёсць мая каштоўнасць?!

Глеб спагадліва ўсміхнуўся.

— Алежка, дружа, дык тое ж самае — і з мовамі...

Гурткоўцы ажываюць, у іх узрушаным перашэпце разбіраю:

«Oczywiście» — «Очевидно?» — «Відавочна!» (Н. Пахомчык). (237 слоў)

1. Падрыхтуйцеся да вуснага пераказу тэксту па варыянтах: частка І — першы варыянт, частка ІІ – другі варыянт, частка ІІІ – трэці варыянт, адказаўшы на наступныя пытанні:

- Ад імя каго вядзецца аповед?
- Якое заданне атрымалі гурткоўцы?
- Паміж кім узнікла спрэчка?
- Аб чым спрачаліся вучні?
- Якія аргументы выкарыстоўвалі хлопцы?

2. Да якога стылю адносяцца іх выказванні? Прывядзіце прыклады, якія падмацоўваюць ваш адказ.

3. Пры падрыхтоўцы пераказаў падумайце, як можна перадаць дыялогі без выкарыстання простай мовы, каб скараціць колькасць слоў у сваім пераказе.

4. Уважліва слухайце пераказы сваіх аднакласнікаў. Пасля праслухоўвання іх паведамленняў творча перакажыце змест апавядання так, каб атрымаўся тэкст-апавяданне з элементамі разважання на тэму «Відавочна: беларуская мова не такая, як усе! Гэта добра ці не?» Памятайце, што тэкст-разважанне мае наступную схему:

| |
|---|
| ...Асноўная думка (тэзіс) |

*Таму што, бо*

↓..................................↓..................................↓

| | | |
|---|---|---|
| Першы<br>....довад.... | Другі<br>....довад.... | Трэці<br>....довад.... |

*Прыклады*

↓..................................↓..................................↓

| | | |
|---|---|---|
| Ілюстрацыя<br>(прыклады) | Ілюстрацыя<br>(прыклады) | Ілюстрацыя<br>(прыклады) |

| |
|---|
| Вывад |

Запішыце свой тэкст.

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

## РАСЦЕ ДРЭЎЦА

Ехалі мы да дзеда ў госці. Падвозіў нас бацькаў сябар на сваёй аўтамашыне. Дзядзька Алесь быў маўклівы, але вельмі ўважлівы да нас.

На пярэднім сядзенні, побач з дзядзькам Алесем, сядзела Лідачка. Яна ледзь носам не ўпіралася ў лабавое шкло і, здзіўленая, радуючыся, што едзе да дзеда, глядзела толькі наперад, на дарогу.

Раптам Лідачка закрычала:

— Стой, не трэба...

Дзядзька Алесь, хоць нічога не зразумеў, але па тым, як Лідачка раптам выставіла наперад руку, здагадаўся, што яна нешта заўважыла, і затармазіў машыну.

Лідачка хуценька скокнула на зямлю, забегла наперад машыне і нахілілася да зямлі.

— Во! — падняла яна дрэўца. Гэта была некім выкінутая на дарогу, а мо згубленая, як перавозілі саджанцы, маладзенькая вішанька. Маленькая, не зусім роўная, з аголенымі галінкамі, на якіх трымалася некалькі засохлых лісточкаў з калматымі[1], але ўжо таксама амаль засохлымі карэньчыкамі.

Дзядзька Алесь стаяў ужо тут, каля пярэдніх колаў, адкуль Лідачка выхапіла малое дрэўца. Зразумеўшы дзіцячы клопат пра яшчэ жывое, але пакінутае на дарозе дрэўца, ён упэўнена сказаў:

— Трэба яго хутчэй пасадзіць, можа, жыць будзе...

— Будзе, будзе! — удзячная дзядзьку Алесю за тое, што ён у час спыніўся і падтрымлівае яе, радасна зашчабятала Лідачка.

Вішаньку ўзялі ў машыну і павезлі да дзеда.

А там, на яго прысядзібным участку, у самым сонечным куточку пасадзілі дрэўца.

---

[1] Калма́ты, -ая, -ае. Непрычэсаны; касматы.

З таго часу мінула шмат гадоў. Мы па-ранейшаму наведваем свайго дзеда, які жыве ў калгасе за Смалявічамі. Лідачка ўжо студэнтка, а вішанька яе кожную вясну цешыць усіх сваёй квеценню, а летам частуе сакавітымі салодкімі ягадамі (Паводле П. Кавалёва). (241 слова)

## СМАРГОНСКАЯ МЯДЗВЕДЖАЯ АКАДЭМІЯ

Якіх толькі навучальных устаноў не сустрэнеш на свеце. Але сярод іх была адна — ці не адзіная і самая знакамітая на ўсю Еўропу. Месцілася яна ў беларускім горадзе Смаргонь і называлася мядзведжай акадэміяй. «Акадэмікамі» ў ёй былі, вядома ж, касалапыя мішкі з навакольных лясоў.

Заснавалі акадэмію ў сямнаццатым стагоддзі князі Радзівілы. Адбор вучняў быў строгі. Іх адлучалі ад бацькоў яшчэ малымі. Часта рабілі гэта ўвішныя цыганы, якія пасля станавіліся гаспадарамі вучаных мядзведзяў. Вучылі артыстаў шэсць гадоў — не менш, чым у іншых вучэльнях.

Пасля таго, як іх на самым пачатку вясны адшуквалі ў вялізных сасновых лясах Смаргоні, не марудзячы прыступалі да справы. Дзеля гэтага будавалі спецыяльныя класы. Часта гэта была прасторная хата, падлогай якой служыла чарэнь вялікай печы. Мядзведзяў навязвалі да слупа ў цэнтры, а ў печы распальвалі агонь. Заднія лапы вучняў абувалі ў лапці, абгарнуўшы папярэдне анучамі. Печ награвалі да той пары, пакуль малады звер не станавіўся на заднія лапы. А калі не ўратоўвалі і лапці, ён пачынаў падтанцоўваць — пераступаць з адной лапы на другую. Настаўнік у гэты час біў у бубен або граў на дудцы. Рытм музыкі супадаў з рытмам таптання мядзведзя. Заняткі праводзіліся штодзённа. Так доўжылася ад аднаго да двух месяцаў — у залежнасці ад здольнасці вучняў і настойлівасці дрэсіроўшчыка.

Пасля гэтага мядзведзяў выводзілі з хаты на волю. Тут іх зноў пацяшалі бубнам або дудкай. Але, навучаныя клеткай-хатай, звяры не чакалі, пакуль гарачая чарэнь падсмаліць пяты,

і пачыналі адразу танцаваць. За такую стараннасць іх частавалі пернікам (А. Бутэвіч). (239 слоў)

## КАПА[1] ПЕРНІКАЎ ЗА ТРЫ КАПЕЙКІ

Каля нашае царквы быў фэст. Наз'язджаліся людзі з усяго свету, як у нас казалі. А свет гэты ўвесь меў у радыусе дзесяць – дванаццаць вёрст. Дзяўчаты і хлопцы хадзілі праз плошчу прыбраныя ў святочныя строі. З бліжніх мястэчак папрыязджалі бойкія мяшчанкі з пернікамі і мучнымі цукеркамі. Моладзі хапала і ля гэтых вазоў, бо тут ішла латарэя, цягнулі нумаркі. Аддаўшы тры капейкі, можна было выцягнуць шчаслівы нумарок на капу пернікаў адразу, а іншым разам і нічога не выцягнуць. Я пра такую механіку яшчэ ніколі не чуў. Мама дала мне тры капейкі, каб я сходзіў і купіў тры пернікі: сабе, сястры і брату. Калі я падышоў да воза і паказаў менавіта тры капейкі, шастак, як у нас тады казалі, дарослыя хлопцы надумаліся пажартаваць з мяне, малога.

— Што табе тры пернікі! Кідай свой шастак і цягні нумарок! Адразу ўвесь воз будзе твой.

Я так і зрабіў: укінуў грошы, пацягнуў нумарок.

І што б вы думалі: выцягнуў шчаслівы нумар.

Хлопцы аж пазайздросцілі.

— Ты падумай, колькі шастакоў пракідаў – нічога няма. А гэты малы – з аднаго разу ўвесь кон і забраў...

Але што рабіць далей? Я ж не данясу дамоў такі выйгрыш. Тыя ж хлопцы знялі з мяне кашульку, спакавалі ў яе пернікі і памаглі дадому паднесці.

Маці мая напужалася. Падумала, што я абрабаваў тую гандлярку.

Павінен прызнацца, што гэта быў мой адзіны выйгрыш за ўсё жыццё. У далейшым я выйграваў толькі тое, што зарабляў сваёй уласнай працай (У. Дубоўка). (238 слоў)

---

[1] Капа́, -ы, *ж.* Тут: даўнейшая мера чаго-небудзь (снапоў, яек і інш.) колькасцю ў 60 адзінак.

## АРТЫСТКА

Кінастудыя здымала фільм пра вайну. Рыхтаваўся эпізод — бежанцы на дарозе.

У назначаны дзень людзей сабралася вельмі многа. Рэжысёр, нізенькі, каржакаваты, з чорнаю барадою, у палінялым камбінезоне, з тоўстым кіем у руцэ — у яго балела нага — выйшаў перад людзьмі і растлумачыў, як яны павінны апрануцца, што ўзяць з сабою.

— Адным словам, каб было так, як у сорак першым, — заключыў рэжысёр.

Пра тое, як хадзілі ў бежанцы, помніла яшчэ амаль палова вёскі. Бабка Мар'я, старая ўжо, зусім сівая, бяззубая. Але і ёй хацелася трапіць у кіно, і яе ўсхваляваў успамін – як гэта было тады, у тыя часы, каб яны век не вярнуліся.

З бабкаю збіраўся ісці «здымацца ў кіне» і яе ўнук трактарыст Косця. Яму цяпер было столькі гадоў, як у вайну яго бацьку, сыну бабкі Мар'і, якога забілі немцы. І падобны ж быў Косця да бацькі – ну выліты Віця, бабчын сын.

Калі амаль усе жыхары вёскі выйшлі на тракт[1] – з клункамі, з чамаданамі, з дзецьмі на вазах, – карціна сапраўды атрымалася такой жа, як тады, у сорак першым. У бабкі Мар'і аж забалела сэрца. Успомнілася ўсё да драбніц, як было ў вайну. А ў гэты час артысты, апранутыя ў нямецкую форму, схапілі яе ўнука Косцю і пацягнулі з дарогі ў лес.

І бабка Мар'я нема загаласіла, падалася за ўнукам. З вачэй яе паліліся непадробныя слёзы.

Пасля спецыялісты, якія глядзелі гатовы фільм, казалі, што артыстка вельмі добра сыграла эпізод. Вельмі праўдзіва (Паводле Л. Арабей). (238 слоў)

## ТРУБАЧ

З гары ішоў трубач. Яго труба здалёк працінала ранішнюю цішыню. Сонца цалавала пікі ялінаў. Туман спадаў, і з яго на-

[1] Тракт, -у, *м*. Шырокая дарога.

сустрач ранішнім промням выплывалі палі́ і дамы. А гук трубы пранікаў усё глыбей у лес. Ён гучаў, як заклік, як салодкі смутак, як водгук шматлікіх спадзяванняў.

Гук трубы разлягаўся ўшыркі, вецер нёс яго з галіны на галіну, даносіў да самых глухіх пушчанскіх нетраў.

Звяры пакінулі свае норы. Страсаючы расу на лясных сцяжынах, яны пабеглі за трубой, гук якой трымцеў поклічна і зманліва.

Але за трубачом ішоў паляўнічы і забіваў прыгожых звяроў.

А трубач ужо быў дзесьці за гарамі. Ён апынуўся ў даліне каля возера. Яго труба скалыхнула санлівую ваду. Рыба пакінула цёмныя глыбокія ямы і пачала танцаваць па мігатлівых хвалях. Аднак за трубачом ішоў рыбак, які лавіў вясёлую рыбу сеткай. Трубач так захапіўся, што нічога не заўважаў. Ён выйшаў на прасторны гасцінец. Залатыя пылінкі танцавалі перад ім, а следам з гулам ляцелі пчолы, забыўшы пра кветкі.

Ён падышоў да каралеўскага замка ў гарах і пачаў спяваць на трубе мурам, вежам, сцягам, дзідам і шчытам жаўнераў. Кароль адклаў убок скіпетр. Прынцэса спыніла свой залаты калаўрот. Падманутыя салодкай сілай, ахоўнікі апусцілі зброю і расчынілі браму замка. Але за трубачом ішоў вораг-ліхадзей, які захапіў замак, забіў караля, а ягоную прыгажуню дачку пагнаў у палон. І стары летапісец напісаў на руінах спустошанага замка: «Голас у трубы салодкі, шлях падману такі кароткі».

Гэты надпіс я нядаўна там прачытаў, калі гладзіў далонню замшэлы камень (К. Скальбэ. Пераклад з латышскай мовы В. Буйвал). (238 слоў)

## СТОСІК СШЫТКАЎ

Аднойчы я правініўся перад мамай. Меўся грэх. Наш агарод упіраўся ў школьны парканчык, і, калі неяк узімку яна папрасіла мяне паднесці стосік сшыткаў, я рушыў напрамкі. А разгулялася завіруха, шалеў вецер, ён шпурляў у мой твар, здавалася, жменямі пякучую крупку. І тут здарылася непапраўнае: калі

я быў ужо каля хлява, вецер усё ж выхапіў з маіх рук стосік сшыткаў і пачаў апантана гартаць іх, я кінуўся падбіраць сшыткі, але дзе там!.. Каляровыя прамаканкі разляталіся асобна, нібы феерверк у гонар маёй бездапаможнасці.

З апушчанай галавой я сядзеў на табурэце перад мамай, шмыгаў носам, а яна плакала: нёс я сшыткі з сачыненнем па роднай мове ў шостым — чамусьці запомнілася мне надоўга гэта — класе. Перапісвалі сачыненне вучні ці не, не магу сказаць, не ведаю, але я тады цвёрда вырашыў стаць настаўнікам і насіць стосікі сшыткаў так, каб іх болей ніколі не вырваў вецер з маіх рук.

Я скажу пра гэтую мару маці, але значна пазней...

Калі я ўспамінаю сваю хату, то бачу швейную машынку «Зінгер», на якой мама шыла сукенкі і спадніцы вясковым кабетам. Ухітралася ж неяк паміж урокамі, складаннем планаў і праверкай сшыткаў і хатняй гаспадаркай рабіць і гэта.

Бачу я і прыгожую вышыванку, што вісела на сцяне ў мамінай спальні. Да вышыванкі былі прымацаваны інстытуцкі «ромбік» і значок «Выдатнік народнай асветы». Яна была добрай настаўніцай, для многіх вучняў любімай (В. Ткачоў). (220 слоў)

## ДАРЫЦЕ КВЕТКІ

Пэўна, гэта будзе хлусня, калі хто з жанчын скажа, што ёй не падабаюцца кветкі. Бо калі жанчыне дораць кветкі, яна робіцца іншай, змяняецца на вачах. І не мае вырашальнага значэння, якія гэта будуць кветкі: з луга, з поля ці сапраўднай аранжарэі — вытанчаныя і экзатычныя. І не мае вырашальнага значэння, хто і каму дорыць кветкі: сын — матулі, муж — жонцы, хлопец — любай дзяўчыне. Галоўнае ў тым, што кветкі дорыць мужчына жанчыне. Гэта аснова. Мабыць, не галоўнае, і з якой нагоды гэта адбываецца. Ёсць кветкі, і іх патрэбна некаму дарыць.

...Буяла і цвіло лета. Я няспешна крочыў па вуліцы. Насустрач ішла жанчына. Звычайная, якіх тысячы па вёсках

і гарадах Беларусі. Нічым не адметная. Знешнасць, вопратка, хада — ва ўсім адчувалася нейкая стомленасць і абыякавасць да жыцця. У руцэ я трымаў шыкоўны гладыёлус, адзін з першых, што расцвілі тым летам у нашым садзе. На імгненне прыпыніўся, а калі незнаёмка параўнялася са мною, прамовіў: «Калі ласка, гэта Вам!» У той момант з жанчынай пачало нешта адбывацца. У вачах з'явіўся прывабны бляск, выпрасталіся плечы. У імгненне яна зрабілася стройнай і прыгожай. Жанчына зніякавела і нейкім дрыготкім голасам спытала: «Мне? А чаму?» — «Таму, што вы жанчына, прычым прыгожая», — адказаў я. І не адважыўся ўдакладняць, што прыгажосць яе стала відавочнай пасля таго, як ёй далі кветку. Яна пайшла, а я яшчэ нейкі час пазіраў ёй услед. Гэта была ўжо зусім іншая жанчына. Вось яна, дзівосная сіла ўсяго толькі адной кветкі і мужчынскай увагі. Дарыце кветкі... (М. Ільючык). (238 слоў)

# 9 КЛАС

## НАВУЧАЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

### Падрабязны пераказ

ЖНІВО

Спакон вякоў у славян уборка хлеба прыраўноўвалася да ратнай справы па велічыні затрачаных сіл і псіхалагічнай напружанасці.

Пачыналі жніво з «пакрывання поля», калі малодшая з нявестак у сям'і, святочна апранутая, зажынала першы сноп, падкідвала яго ўверх і прыгаворвала: «Пакрыла ніўку на добрую спажыўку. Парадзі, Божа, наша збожжа!»

Кульмінацыяй жніва станавіліся дажынкі. Яны праводзіліся па правілах, заведзеных продкамі. Жнеі зацягвалі і падхаплівалі песні, праводзілі «завіванне барады». Песні звінелі над полем, іх словы, мелодыі былі ёмістыя і значныя. У песнях закладзена таямнічая сіла гукавога фону, які павінен быў адпужваць злых духаў ад поля, ад хлеба. Песні былі абярэгам і абаронай.

Пакінутую на прыбраным полі жменю каласоў жнеі завівалі, упрыгожвалі кветкамі, а пад каласамі ўсю траву яны выполвалі. У сярэдзіну «барады» клаўся на чыстым белым палатне хлеб з соллю, жнеі тройчы кланяліся ў пояс полю і зямлі. З каласоў яны звівалі вянок, упрыгожвалі яго кветкамі і ўрачыста неслі ў чырвоны кут хаты, пад абразы́.

Скончыўшы працу, стомленыя жнеі ішлі з сярпамі дадому, але іх сярпы не павінны былі быць голымі і блішчаць халодным жалезам. Сярпы абвівалі травой і саломай.

Па заканчэнні работы жнеі таксама кланяліся ў пояс зямлі, лажыліся на яе і прасілі: «Ніўка, ніўка, аддай маю сілку». Была

скончана вялікая справа, і столькі ж сіл было аддадзена ёй (Паводле Г. Уланскай). (207 слоў)

1. Вызначце тэму тэксту. Ці перадае загаловак тэму тэксту? Чаму ў славян спакон вякоў уборка хлеба прыраўноўвалася да ратнай справы? Якія абрады праводзілі ў час жніва? З чым звязана іх правядзенне? Што сімвалізаваў кожны з іх? Чаму, на вашу думку, сярпы абвівалі травой і саломай?

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Колькі падтэм выкарыстана для раскрыцця тэмы? Колькі частак у тэксце? Якая сувязь паміж часткамі ў тэксце? Складзіце план тэксту.

4. Якую ролю ў тэксце выконваюць дзеясловы?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: (па правілах) *заведзеных*, (*на*) *прыбраным* (полі), *стомленыя* (жнеі). Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыметнікавымі і дзеепрыслоўным зваротамі, паміж часткамі складаных сказаў.

## СЛЯДЫ КАМЕННАЙ ГІСТОРЫІ

На тэрыторыі Беларусі вялікая колькасць камянёў. Гэта характэрны і непаўторны элемент нашага ландшафту, сведкі ледавіковых працэсаў, а таксама помнікі гісторыі і культуры. Камяні заўсёды фарміравалі духоўны свет беларусаў, з імі звязаны легенды і паданні. Больш за тры сотні валуноў абвешчана помнікамі прыроды, і толькі нязначная іх колькасць абвешчана помнікамі гісторыі і культуры.

Сакральных[1] камянёў налічана больш за паўтысячы. Адна з найцікавейшых разнавіднасцей культавых валуноў — камяні-следавікі, а асаблівасцю такіх камянёў з’яўляюцца адбіткі слядоў на іх паверхні ў выглядзе чалавечага або звярынага следу. Выемкі на камянях падзяляюцца на штучныя і прыродныя, якія па сваёй форме сапраўды нагадваюць след пэўнай істоты.

Уласцівасць камянёў-следавікоў збіраць і доўга захоўваць дажджавую ваду заўважана даўно. У сухое і спякотнае надвор’е выбіты след заўсёды вільготны. Вада са слядкоў паўсюдна лічыцца гаючай і святой, з ёй звязана мноства легенд.

[1] Сакра́льны, -ая, ае. Той, які мае адносіны да рэлігійнага культу.

На тэрыторыі Беларусі камянёў са слядкамі налічылі ўжо больш за сотню, у асноўным яны маюць невялікія памеры. Найчасцей на камені месціцца адзін слядок, але зрэдку сустракаюцца і два, і тры.

У старажытнай традыцыі нашага народа існаваў звычай рабіць памінальныя кладкі з выразанымі на іх слядкамі нябожчыка і класці іх у балоцістыя мясціны. Душа пасля смерці, паводле дахрысціянскіх вераванняў, доўга блукае па свеце ў пошуках дарогі ў іншасвет, кладкі ж павінны дапамагчы ёй у такой сітуацыі. Загадкавыя валуны са слядкамі звычайна знаходзяцца ў нізінных і балоцістых мясцінах Беларусі, побач з крыніцай ці ручаём. Магчыма, яны былі сведкамі далёкіх і таямнічых памінальных абрадаў нашых продкаў.

З пашырэннем хрысціянства многія следавікі сталі аб'ектамі пакланення, а слядкі на камянях атаясамліваліся са слядамі Хрыста і хрысціянскіх святых (Паводле Л. Дучыц, І. Клімковіч). (255 слоў)

1. Якая тэма тэксту? Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

2. Вызначце стыль маўлення. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце?

3. Колькі падтэм выкарыстоўваецца для раскрыцця тэмы? Складзіце план тэксту.

4. Растлумачце правапіс наступных слоў: *камяні-следавікі, адбіткі, надвор'е, кладкі, з* (выразанымі) *слядкамі, загадкавыя*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з пабочнымі словамі, паміж часткамі складаных сказаў.

## ВЁСКА УЮН

Праяўленне цікавасці да гістарычных звестак пра свой горад, мястэчка, вёску ўласціва кожнаму чалавеку амаль з нараджэння і да самага скону. Мы імкнёмся адшукваць шляхі да сваіх каранёў, святынь.

Мая вёска Уюн, што знаходзіцца на Быхаўшчыне, здаецца, нічым не адрозніваецца ад іншых вёсак, якіх тысячы на

Беларусі. Не нарадзіла яна найвядомейшых літаратараў, мастакоў, слынных вучоных. Але Уюн мае сваю адметнасць, непаўторнасць, бо кожная вёска — гэта своеасаблівая краіна, з усім сваім: моваю, звычаямі, норавамі і побытам. І заўсёды яна ў маіх вачах паўстае ў найпрыгажэйшых колерах.

Куды б ні закінуў мяне творчы лёс, я заўсёды згадваю мой дарагі куточак Уюн, дзе нарадзіўся, дзе прайшлі гады майго маленства і юнацтва.

Па сведчанні старажылаў, некалі на месцы вёскі Уюн быў непралазны лес і бурліла невялікая рачулка, у якой вялося шмат рыбы, асабліва ўюноў. Калі гэтую мясціну пачалі засяляць людзі, яны выкарчоўвалі лес і будавалі свае хаты ўздоўж рэчкі. Таму і вёска выцягнулася, як той уюн, у адну доўгую вуліцу на добрую сотню двароў. Адсюль дзве версіі паходжання назвы вёскі. Першая — ад рачулкі, якую назвалі ласкава Уюнком. Другая — ад характару забудовы.

Рачулка Уюнок, нібы пужлівы лясны звярок, абыходзіць агароды і крадзецца па альховым зарасніку ўзбоч вёскі, нібы баіцца, каб часам людзі яе не пакрыўдзілі. І толькі можа ўволю пацешыцца, калі злучае сваю плынь з ракой Грэзай, якая працякае праз суседнюю вёску (Паводле М. Макарцова). (218 слоў)

1. Якая тэма тэксту? Вызначце асноўную думку тэксту. Чаму людзі праяўляюць цікавасць да гістарычных звестак пра свой горад, мястэчка, вёску? Пра што можна даведацца з назваў гарадоў, мястэчак, вёсак?

2. Вызначце стыль маўлення.

3. Колькі абзацаў у тэксце? Складзіце план тэксту.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў аўтар апісвае рачулку Уюнок?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў і словазлучэнняў: *(на) Быхаўшчыне, (на) Беларусі, уздоўж* (рэчкі), *узбоч* (вёскі), *вёска Уюн, рачулка Уюнок, рака Грэза.* Растлумачце пастаноўку двукроп'я і працяжнікаў у сказах тэксту, коскі паміж часткамі складаназалежных сказаў.

## ЗЯЛЁНАЯ ДУБРОВА

Калісьці малым я прачытаў у адной кніжцы пра дзівосны лясны край — Палессе. У ёй з такой замілаванасцю расказвалася пра яго таямнічыя пушчы і салаўіныя гаі, пра шырокія квяцістыя лугі і абласканыя сонцам жураўліныя балоты, пра чыстыя крынічныя рэкі і сінія люстэркі азёр, што мне захацелася пабываць там, каб на свае вочы пабачыць тую красу. Толькі значна пазней я даведаўся, што мая Зялёная Дуброва з усімі яе ваколіцамі і ёсць тое самае Палессе.

Кожная вёска, як і чалавек, мае сваё ўласнае аблічча. Зялёная Дуброва — вёска невялікая, якая ўзнікла на самым пачатку мінулага стагоддзя. У часы самага росквіту тут было крыху больш за семдзесят двароў.

Лясы абступаюць нашу вёску з усіх бакоў і цягнуцца ў некаторых кірунках без канца і краю.

Помню, як у школьныя гады я надумаў дайсці да краю лесу, што цягнецца на паўночны ўсход. Строга трымаючыся гэтага кірунку, прадзіраючыся праз лясныя гушчары, блытаючыся нагамі ў верасах ды папаратніках, залез тады ў такія глухія нетры, што ледзьве адтуль выбавіўся. Так і не дайшоў я тады да таго звабліваага канца-краю...

Сярод нашых лясоў можна напаткаць папраўдзе цудоўныя мясцінкі, з жураўлямі і журавінамі балоты і балотцы, чыстыя, як слязіна, крыніцы і блакітныя, як само неба, азёры гаючай вады. Цудоўная Палеская зямля! (Паводле К. Цвіркі). (201 слова)

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Чаму вабіла аўтара Палессе ў дзяцінстве? Што яго ўразіла пазней? Як вы думаеце, чаму вёска Зялёная Дуброва мае такую назву?

2. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце?

3. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? Складзіце план тэксту.

4. Якую ролю ў тэксце выконваюць прыметнікі? Прыметнікі якіх разрадаў выкарыстоўваюцца ў тэксце для апісання прыроды? Знайдзіце ў тэксце параўнанні. Якую ролю яны выконваюць?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў і словазлучэння: *калісьці, ледзьве, Палессе, стагоддзе, Зялёная Дуброва*. Растлумачце пастаноўку працяжнікаў і шматкроп'я ў сказах тэксту, косак паміж часткамі складаназалежных сказаў.

## ЛЁНЬКА І ВОЎК

Асенні дзень быў сухі і цёплы.

Ідучы дадому праз лес, Лёнька не трымаўся дарогі, наўпрост пешкаваў. Любіў ён так хадзіць, нацянькі, прывык за час леснікоўства. Раптам нешта мільганула наперадзе. Лёнька прыгледзеўся і ўбачыў, што гэта воўк убіўся ў чародку дзікіх коз і спрабуе якую-небудзь з іх злавіць сабе на спажыву. Няйначай, воўк доўга высочваў коз, пакуль тыя не апынуліся на гэтым дрыгвяністым узбалоцці.

Лёнька ажно аслупянеў, бо здзівіўся спрыту драпежніка. Козы кругом бегаюць, таму што няма куды ім кінуцца, каб набраць хуткасць. Воўк, як відаць, вопытны, бо знарок загнаў іх у твань, на куп'ё. А гэта амаль што смяротная пастка.

Драпежнік не надта марудзіў, умомант схапіў ахвяру, якая была бліжэй да яго, і, не адпускаючы, кульнуў казу сабе на спіну. Воўк пашыбаваў якраз на Лёньку, відаць, браўся на сухое, у яловы гушчар.

Хто не ведае воўчы нораў? Схавае ў балотную твань здабычу і тут жа вернецца, каб зноў прадоўжыць паляванне.

Лёньку як ветрам сарвала з месца, ён гайсануў з-за куста насустрач шэраму ненасыту з крыкам:

— Аддай казу!

Усё так нечакана атрымалася, што звер напраўду спалохаўся, у роспачы кінуў сваю здабычу і сiгануў у гушчар (Паводле А. Масарэнкі). (187 слоў)

1. Якая тэма тэксту? Якім вам уяўляецца герой з тэксту? Чаму ён так зрабіў?

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Назавіце характэрныя для гэтага стылю моўныя сродкі.

3. Колькі частак у тэксце? Якая сувязь паміж імі? Складзіце план тэксту.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання? Якія словы, выразы выкарыстоўвае аўтар, каб пазбегнуць паўтарэння слоў пры апавяданні пра Лёньку і воўка?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *нацянькі, напраўду, якую-небудзь, не адпускаючы.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складаназалежных сказаў, знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі, пабочнымі словамі.

## ГІСТАРЫЧНАЯ ПАМЯЦЬ

Веліч Налібоцкай пушчы можна адчуць хіба што з вышыні Замкавай гары ў самім Навагрудку. Напэўна, гэта адзінае месца ў Беларусі, дзе адчуванне вышыні і адчуванне самой гісторыі, нібыта тыя два крылы, зліваюцца ў адно цэлае, дзе рэзка абвастраецца зрок і на ўсё ты глядзіш нібы праз разрэз вачэй самога Міндоўга. Відаць, падсцерагаюць чалавека тыя моманты, калі ён нечакана пачынае глядзець іншымі вачамі на даўно знаёмыя абсягі, рушачы рамкі часу, абдымаючы прасторы, быццам прыўзняўшыся на крылах. Штосьці падобнае адчуваў і я, стоячы ля халаднаватай цэглы былой вежы магутнага сярэдневяковага замка тым летнім днём, углядаючыся ўніз на размахі зялёных пушчанскіх крылаў. Было выразна чуваць, як нязвычна тахкае ў грудзях сэрца. З вышыні пушча і на самай справе выглядала непрыступна і велічна. То грозна, то далікатна, але размашыста і рашуча хвалістымі ўзгоркамі і лагчынамі паўставалі перад вачыма яе векавечныя абшары. І згадвалася наша гісторыя, далёкая і блізкая.

Гэта і сапраўды найвышэйшае месца ў Беларусі, дзе чалавеку вельмі проста адчуць і веліч самой гісторыі, і веліч сваёй уласнай годнасці. Там, ніжэй, у зялёнай нетравай бязмежнасці, разрэзанай яркай блакітнай маланкай Нёмана, крыжаваліся мячы, свісталі дзі́ды[1] ды звінелі косы.

А пачынаецца наш славуты Нёман на Уздзеншчыне. І да самай Балтыкі нёманскія берагі авеяны славай вялікіх бітваў, памятных паходаў ды пераправаў. Вада цячэ, як і час, мяняецца.

---

[1] Дзі́да, -ы, *ДМ* -дзе, *мн.* -ы, дзід, *ж.* (уст.). Старадаўняя калючая зброя ў выглядзе доўгага дрэўка з вострым металічным наканечнікам; піка.

І справядліва кажуць, што нельга двойчы ступіць у адну і тую ж ваду. А вось берагі застаюцца нязменнымі. У іх свая памяць, хоць сляды з часам і знікаюць, хоць вырастаюць новыя дрэвы і мяняецца рэчышча...

Шуміць, гайдае свае кроны векавечная пушча (Паводле К. Камейшы). (253 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Чаму аўтар лічыць, што Замкавая гара ў Навагрудку — месца, дзе адчуванне вышыні і адчуванне гісторыі зліваюцца ў адно цэлае? Якія гістарычныя падзеі адбываліся на гэтай зямлі? Ад чаго ў аўтара нязвычна білася сэрца? Якую памяць захоўваюць берагі Нёмана?

2. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце?

3. Якая сувязь паміж часткамі ў тэксце і сказамі ў частках? Складзіце план тэксту.

4. Якія моўныя сродкі дапамагаюць уявіць веліч Налібоцкай пушчы?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў і словазлучэнняў: *Навагрудак, Беларусь, Нёман, Балтыка, Міндоўг, Налібоцкая пушча, Замкавая гара.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку паміж часткамі складаназалежных сказаў, знакаў прыпынку ў сказах з аднароднымі членамі, звязанымі паўторнымі злучальнымі злучнікамі.

## АДВАГА

Стаяла чыстая летняя ноч, цёмнае неба абняло ўсю зямлю, бледныя бляскі месяца паўзлі па лісці.

І вось спакойны, глыбокі сон раптам парушыўся жудасным начным звонам. У вёсцы ўзняўся пажар, перапужаныя людзі беглі да яго.

Страха Пракопавай хаты ўжо ўся была ахоплена полымем. Сам гаспадар, разгублены, мітусіўся каля хаты; відаць было па ім: ад раптоўнага страху анямела сэрца, абамлелі рукі і ногі. З грамады хтось крыкнуў: «Ратуйце дзетак, у хаце засталіся». Ачуняў адразу Пракоп, успомніў пра дзетак і кінуўся, абуджаны нейкай нястрымнай адвагай, у ахопленую агнём хату.

Застылі ад страху людзі, здавалася ўжо ўсім: Пракоп і яго дзеткі навекі зніклі ў моры агню, адтуль ім няма звароту. Сэр-

цы ў людзей замерлі. А вочы ўсё глядзелі ў тыя дзверы, куды ўскочыў бедны Пракоп.

Прайшла цяжкая бязмоўная хвіліна, паказаўся ў акне Пракоп, несучы ў абсмаленай посцілцы сонных дзетак. Гоман падняўся між людзьмі, чуваць быў адусюль плач... Дзетак выратавалі.

Яшчэ раз выкінуў Пракоп праз акно нешта, не зважаючы на крык людзей, каб ён ратаваўся. Не далятала да вушэй Пракопа ні адно слоўца: страціўшы ўжо прытомнасць, ён нічога не бачыў і не разумеў.

Сцішэла ўсё, толькі трэск ад гарэлага дрэва разыходзіўся ў начной цішы.

Вось апошні раз паказаўся ў акне Пракоп. У абгарэлым твары яго ўжо не відаць было той іскры, якая была ў хвіліны змагання за жыццё дзетак. Засланіўшы рукамі твар свой, ён нібы збіраўся выскачыць праз акно. Але застагнала столь, самкнуліся бэлькі, хваляй ірвануўся агонь...

Пракопа пахавалі.

Сцюдзёная зямля прытуліла бедака, а вецер усю ноч, быццам злуючы на людское сумленне, растрасаў сухое апалае лісце (Паводле У. Галубка). (252 словы)

1. Якая тэма і асноўная думка тэксту?

2. Вызначце стыль і тып маўлення.

3. Колькі частак у тэксце? Дайце часткам загалоўкі.

4. Назавіце сказ, у якім аўтар выказвае свае адносіны да раўнадушша людзей. Якія моўныя сродкі ён выкарыстоўвае?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: (*у*) *ахопленую* (хату), (*у*) *абсмаленай* (посцілцы), *навекі*, (*на*) *людскае* (сумленне). Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў бяззлучнікавых складаных сказах.

## ВАВЁРКІ

Вавёрка ўжо на працы. Здалёк заўважыў, як яна бегае па зямлі, паміж рэдкімі стваламі ліп, і не спяшаецца ўцякаць.

Зноў успамінаю адну з вавёрак, што была маёй госцяй некалькі дзён. На акне перад пісьмовым сталом для яе была

заўсёды насыпана гурбачка сланечнікавых семечак, ляжаў драбок цукру і цвёрды, знарок засушаны пернік. Ужо на трэці дзень нашага знаёмства яна садзілася на акне, брала ў лапкі чорную семечку, лушчыла яе, брала другую, трэцюю, спынялася, аціхала, мы глядзелі адно на аднаго, і мне здавалася, што вось яна, са складзенымі лапкамі, спытаецца: «А што вы, дзядзька, пішаце?» Цукру яна не чапала, а пернікі знікалі з акна, калі я гэтага не бачыў. Часам яна грымела імі за кніжнай шафай. Потым адзін з гэтых пернікаў я знайшоў паміж кніг. Ён быў пагрызены ўпрыкуску з польска-беларускім слоўнікам, відаць, яна іх толькі пакаштавала, бо і пернік, і слоўнік былі недаедзены. Аднак сяброўства нашага гэта не разладзіла. Калі яна аднойчы шуснула з гардзіны ў фортачку і адтуль па карнізе на дах, я бедаваў па ёй не менш за свайго хлапчука...

Тут іх, вавёрак, многа. Яны падпускаюць людзей так блізка, што здаецца: будзь мы яшчэ трохі лепшымі, яны прыйшлі б на нашы працягнутыя далоні, пацерліся б рыжаю мордачкаю аб нашы шчокі.

Іду па асфальце вузкай алеі. А вакол па серабрыстай траве, па насціле нядаўна пагаслага золата гулліва шархаціць ужо цэлае мноства вавёрак (Паводле Я. Брыля). (223 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Які выпадак успомніў аўтар? Чаму ён бедаваў пра тое, што вавёрка знікла? Якую думку аб вавёрках выказаў аўтар?

2. Вызначце стыль і тып маўлення.

3. Колькі абзацаў у тэксце? Ці супадаюць абзацы і часткі? Якая сувязь паміж часткамі тэксту? Складзіце план тэксту.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў перадаюцца пачатак дзеяння, яго развіццё і заканчэнне?

5. Растлумачце напісанне наступных слоў: *здалёк*, *упрыкуску*, (з) *польска-беларускім* (слоўнікам), *адтуль*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

## ПАХ ГРЫБОЎ

Юзік з бацькам прыехалі адведаць у бальніцу настаўніцу Ларысу Іванаўну, якой ледзь паспелі выклікаць машыну «хуткай дапамогі» да школы, дзе яна вучыла маленькіх пачаткоўцаў.

Убачыўшы наведвальнікаў, настаўніца радасна ўсміхнулася.

Яна прыкметна схуднела. Бальнічны халат быў прасторны, і настаўніца ў ім выглядала як падлетак. Бачачы, як Юзікаў бацька сарамліва топчацца ля дзвярэй, Ларыса Іванаўна прыўзнялася на ложку і паказала на табурэт:

— Садзіцеся туды: будзе зручней. А ты, Юзічак, можаш прысесці на мой ложак.

Бацька паставіў на тумбачку слоік мёду і паклаў нізку сушаных грыбоў. Па палаце разнёсся непаўторны грыбны пах. Паўнаватая жанчына, якая ляжала ў палаце з настаўніцай, захоплена войкнула і прысела на табурэт каля свайго ложка.

— Грыбы? — падзівілася яна. — Ах, як даўно не чула іх паху. Можна патрымаць?

— А чаму ж не? — ажывіўся Юзікаў бацька. — Гэта мы з Юзікам збіралі і сушылі іх.

Ён расказаў, як з сынам хадзілі ў грыбы...

Калі выдавалася вольная хвіліна, бацька браў з сабой Юзіка, і яны ішлі па баравінах. Там, пад высокімі соснамі, грыбы раслі сямейкамі, моцныя, на тоўстых ножках, з цёмна-карычневымі, як берэты ў казачных прынцаў, капелюшамі. Юзік асцярожна падразаў карані, клаў у кошык чарговы грыб і прыгаворваў:

— Ляжы тут, маленькі. Хопіць па лесе разгульваць...

Вочы настаўніцы свяціліся радасцю, калі тая глядзела на наведвальнікаў, на грыбы, што яны прывезлі з далёкага лесу.

— Папросім ку́хара, каб згатаваў іх хворым. Праўда, Пятроўна? — звярнулася настаўніца да паўнаватай жанчыны.

— А што? Праўда. Але ж шкада: не нанюхаемся ляснога водару (Паводле М. Даніленкі). (234 словы)

1. Якая тэма і асноўная думка тэксту? Чаму абрадавалася настаўніца?

2. Вызначце стыль маўлення. Які тып маўлення пераважае ў тэксце?

3. Колькі частак у тэксце? Дайце частакам загалоўкі.

4. Якую ролю выконваюць канструкцыі з простай мовай у тэксце?

5. Растлумачце напісанне наступных слоў і словазлучэнняў: (*на*) *ножках, берэты,* (*з*) *цёмна-карычневымі* (капелюшамі), *машына «хуткай дапамогі», Юзікаў бацька.* Растлумачце афармленне канструкцый з чужой мовай, пастаноўку шматкроп'я ў сказах тэксту.

## АДКРЫЦЦЁ

Зусім нядаўна, год назад, мне давялося начаваць на вёсцы ў цёткі Тоні.

Раніцай жанчына прыйшла знадворку амаль з пустым вядром і паскардзілася, што карова не дала малака.

— І гэта не першы раз, — тлумачыла жанчына. — А ведаеце чаму? Ласка адабрала.

— Якая ласка? — здзівіўся я. — Звярок?

— Звярок! Ужо некалькі дзён раніцай гляджу на карову, а карова мокрая, успацелая ад страху. І малака не дае. Пэўна ж, ласка па карове ўсю ноч скакала.

— Не можа быць, — кажу. — Пацук лазіць па каровіных спінах, сам бачыў. Але каб ласка? Першы раз чую. Ці не пацук гэта?

— Ласка! — пераканаўча прыклала руку да грудзей цётка Тоня. — Хіба я ласку не ведаю? Карова ад страху аж трасецца.

У мяне ад жудасці мурашы па спіне забегалі. Я і запытаўся:

— Выбачайце, а што ласка робіць на спіне ў каровы?

— Не ведаю, — паціснула плячамі старая жанчына. — Хто іх ведае, гэтых ласак. Можа, грэецца.

Да абеду ў мяне перад вачамі стаяла бедная, успацелая ад страху карова і не давала спакою ўсё тое ж пытанне. Што могуць ласкі рабіць на каровіных ці конскіх спінах?

Відаць, турбавала гэтае пытанне і цётку Тоню, бо пад самы абед яна прамовіла без ніякіх асаблівых уступаў і тлумачэнняў:

— Аблізвае! Некаторыя бачылі, што аблізвае.

І тут да мяне дайшло! Соль! Мінеральная дабаўка! Каровы, коні часта пацеюць. Пот высыхае, а соль, якая змяшчаецца ў поце, і ёсць прычына таго, што ласкі залазяць на конскія ці каровіны спіны і аблізваюць іх. Вось дзе магчымая разгадка дзівосных паводзін маленькага звярка. Згадзіцеся, цікава было б праверыць падобнае дапушчэнне (Паводле А. Наварыча). (246 слоў)

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Якое адкрыццё зрабіў аўтар?

2. Вызначце стыль маўлення. Які тып маўлення пераважае ў тэксце?

3. Колькі частак у тэксце? Складзіце план тэксту.

4. Якую ролю адыгрываюць словы аўтара ў канструкцыях з простай мовай?

5. Растлумачце напісанне наступных слоў: *знадворку, не дала, без ніякіх, аблізвае*. Растлумачце афармленне канструкцый з простай мовай, у якіх словы простай мовы разрываюцца словамі аўтара.

## Сціслы пераказ

### СНЯЖОК І ВОЛЕЧКА

Вельмі выразна ўспамінаю драўлянае вядро, даверху поўнае празрыстай, халоднай вадой. Мама нясе яго па двары, а са страхі злятае мой голуб Сняжок і садзіцца на край вядра. Вада ў вядры калышацца, і піць яе нязручна. Ды голуб п'е, а мама смяецца і ставіць вядро на зямлю.

Вада ў вядры памалу перастае калыхацца, і голуб п'е, не адымаючы дзюбы.

— Перадыхнуў бы хоць! — гаворыць мама.

Яна смяецца. Я сяджу ля вядра на зямлі, і гэтак мне добра глядзець на вясёлую маму. Таксама добра глядзець, што мой Сняжок сядзіць на краёчку вядра, учапіўшыся за гэты край чырвонымі маршчыністымі ножкамі.

І вось ён нарэшце напіўся. Паглядзеў на нас і скочыў у ваду.

— О, гэта дык гэта! — замахнулася мама.

— Ты не гані́ яго, — крычу я. — Няхай пакупаецца.

Кажу таксама, што я сам прынясу вады. Ды мама зноў смяецца.

— Здаравяка знайшоўся. І сама прынясу. Ды ён вады не замуціць, ён чысценькі.

Сняжок вады не замуціў. Ён скончыў купацца, і мама паднесла вядро на парог хлява. Карова Падласка зусім спакойна пачала піць.

А мой Сняжок тым часам ужо на страсе. Ён ужо дакарае за нешта сваю галубку, сварыцца на галубянят. Яны сядзяць на тым баку страхі. Сняжок надзімаецца, кружыцца ваўчком і ўсё вурчыць. Я разумею, што ён кажа. Ён сварыцца на сваю белую сяброўку Волечку, якая залішне песціць малых.

Нарэшце, нібы выказаўшы ўсё, Сняжок узняўся, залопаўшы крыламі. За ім узляцела яго паслухмяная Волечка, а ўслед за імі — маладыя. Маладых двое. Яны яшчэ пішчаць і часта лезуць да дзюбы бацькоў. Сняжок дарэмна бурчыць на маладых, што яны гультаі. Яны лятаюць вельмі ахвотна.

Ды Сняжок ужо не злуе. Ён уздымаецца ўсё вышэй, спыняецца і пачынае заўзята куляцца, а побач з ім куляецца і кружыць белай пушынкай па ветры спрытная Волечка. Толькі маладыя «гультаі», як называе іх Сняжок, не могуць яшчэ куляцца. Яны нясмела прысядаюць на распушчаныя хвасты, патрымцяць крыламі, як жаўрукі, і зноў пачынаюць лятаць.

А я гляджу, не магу наглядзецца (Паводле Я. Брыля). (309 слоў)

1. Якая тэма тэксту? Раскрыццю якой думкі падпарадкаваны тэкст?

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? Складзіце план тэксту.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *даверху* (*поўнае вядро*), *не адымаючы, услед* (*за імі*). Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай, паміж часткамі складаных сказаў.

6. Напішыце сціслы пераказ.

## ЗУБРЫ

Зуброў часта называюць белавежскімі. Думаеце, зубрам там надта прывольна? Не зусім. Зубр — прыхільнік светлых лісцвяных гаёў, але белавежскія мясціны сталі для яго апошнім прытулкам.

Тэрыторыі ўсіх краін Еўропы раней уяўлялі сабой суцэльны лясны масіў, але з-за гаспадарчай дзейнасці гэты лес паступова і паўсюдна высякаўся. Дубовыя гаі выпальваліся і раскарчоўваліся пад жыта і пшаніцу, а бары ішлі пад карабельнае будаўніцтва. Многа лесу трэба было на новыя гарады, крэпасці, масты, калодзежы. Стагоддзямі не змаўкаў грукат сякеры ў еўрапейскіх лясах. Белавежская пушча — усё, што засталося больш-менш цэлым, некранутым ад гэтага магутнага лесу. А дзе ж зубру хавацца, як не ў самым большым лесе!

Але нідзе не схавацца ад двухногага драпежніка. Апошні белавежскі зубр у дзікай прыродзе быў забіты ў тысяча дзевяцьсот дзевятнаццатым годзе. Засталіся толькі асобіны ў некаторых еўрапейскіх заапарках. Вучоныя спахапіліся, забілі трывогу — і ў Белавежскай пушчы быў створаны зубрагадавальнік. Былі закуплены два дзясяткі зуброў. У Вялікую Айчынную вайну, на шчасце, зубры ацалелі, а пасля вайны пачалася работа па ўзнаўленні папуляцыі гэтых жывёл. Поспех пакуль спадарожнічае добраму пачынанню.

Чым зубр цікавы? Зразумела, сваімі памерамі. Вага зубра дасягае тысячы кілаграмаў, а даўжыня яго тулава — трох метраў. У яго пагрозлівыя серпападобныя рогі і калматая грыва.

Калі зубра нішто не трывожыць, ён спакойны і міралюбівы. Але ў гневе зубр страшны. Ён з чмыханнем валіць сваім тоўстым ілбом дрэвы, рые капытамі зямлю.

Зубры харчуюцца маладымі галінкамі дрэў і хмызнякоў, пасуцца на лясных палянах, ахвотна ядуць кару грабаў, асін, елак. Яны любяць рабінавыя галінкі, падбіраюць дзі́чкі, жалуды, а апенькі і лісічкі — гэта лепшы ласунак для іх.

Зімой зубры харчуюцца мохам, рознымі лішайнікамі і сухой травой. Іх поўсць, летам кароткая і рыжаватая, на зіму робіцца густой і цёмна-бурай, і ў такім футры жывёле не холадна гадзінамі ляжаць на снезе ў непагадзь.

На сённяшні дзень абаронцы прыроды давялі лік зуброў на Беларусі да трох сотняў, але лясныя быкі ёсць і ў іншых краінах. Усяго зуброў на Зямлі больш за дзве тысячы. Пагроза знішчэння гэтых жывёл не знікла. Але ёсць вялікая надзея, што зубр, сучаснік мамантаў, стане такім жа звычайным зверам нашых лясоў, як лось ці казуля (Паводле А. Наварыча). (338 слоў)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Чаму зубрам даводзіцца жыць у Белавежскай пушчы, хоць яны любяць светлыя лісцвяныя гаі?

2. Вызначце стыль маўлення. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце?

3. Колькі падтэм у тэксце? Складзіце план тэксту.

4. Назавіце моўныя сродкі, якія выкарыстоўвае аўтар для апісання зуброў.

5. Растлумачце напісанне наступных слоў і словазлучэнняў: *больш-менш, цёмна-бурай, раскарчоўваліся,* (у) *Вялікую Айчынную вайну, Белавежская пушча, белавежскія мясціны, белавежскі зубр.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназлучаных сказах.

6. Напішыце сціслы пераказ.

## УСПАМІНЫ МАЛЕНСТВА

Выган сёння не пазнаць, бо ён ужо не паша для гусей ды свіней, а проста адна з ваколіц.

Раней гэта было вялікае роўнае гала[1], зялёнае ад гусценькай мураўкі, якую кожны дзень з ранку да вечара дружна пад-

[1] Га́ла, -ы, *ж.* Голае месца, чыстая прастора.

грызалі свінні. Цяпер, калі даўно ўжо ніхто не ганяе сюды свіней, мураву ўзяліся выцясняць густыя купінкі сіўцу ды мяцёлачкі метлюкоў.

Даўно зараслі, згубіліся на Выгане і сляды майго маленства. Спярша я ганяў сюды чараду гусей, падросшы, зрабіўся і бяззменным свінапасам.

З кожнага двара нашай вёскі былі тут свіныя пастушкі́ і пасту́шкі. Тут мы і гулялі, забаўляліся, ды не вельмі разгульваліся, бо трэба было глядзець свіней.

Больш за ўсё стараліся адганяць іх ад недалёкага лесу, адкуль не раз падкрадваліся ваўкі. Не менш пільна глядзелі мы, каб свінні не залезлі ў шкоду[1].

Аднак маё пастушкоўства прывяло раз да шкоды. Віноўнікам яго быў... Янка Маўр. Я так зачытаўся яго «Палескімі рабінзонамі», што забыўся, на якім знаходжуся свеце, і не заўважыў, як мае свінні ўлезлі ў Салімонішыну бульбу. З бязлюднага вострава сярод балот, на якім разам з двума такімі ж, як і сам, вясковымі хлопцамі прабіраўся таемнымі звярынымі сцежкамі і я, мяне вярнуў на Выган прарэзлівы жаночы лямант. Гэта Салімоніха ўгледзела ў сваёй бульбе маіх свіней. Калі я ўбачыў, што нарабілі свінні, хацелася праваліцца скрозь зямлю. На маё шчасце, маці тады ўсё ж разагнала грымотныя навальнічныя хмары, якія навіслі нада мной, аднёсшы Салімонісе добры кош бульбы за патраву.

Значна пазней, ужо як мінчанін, я стаяў на ганку Тэатра юнага гледача ў невялічкай пісьменніцкай кампаніі, дзе самы старэйшы з нас Іван Міхайлавіч Фёдараў вельмі цікава расказваў, чаму ён для свайго псеўданіма ўзяў гэтае нетутэйшае слова — Маўр. Мяне ў сваю чаргу падмывала тады расказаць вельмі паважанаму пісьменніку Янку Маўру, як праз яго я калісьці нарабіў шкоды. Але я ўстрымаўся, падумаўшы, што пра такое ён, пэўна, наслухаўся нямала (Паводле К. Цвіркі). (301 слова)

[1] Шко́да, -ы, *ж.* Страта, прычыненая жывёлай, патрава і месца на зямлі, дзе жывёла можа зрабіць патраву.

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Якія ўспаміны выклікаў у аўтара Выган? Чаму аўтар не расказаў Янку Маўру пра цікавы выпадак са свайго дзяцінства?

2. Вызначце стыль маўлення. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце?

3. Колькі частак у тэксце? Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Ці ёсць канцоўка ў тэксце? Дайце часткам загалоўкі.

4. Назавіце моўныя сродкі, характэрныя для апавядання.

5. Растлумачце правапіс наступных слоў і словазлучэнняў: *Салімоніха, бяззменны, Янка Маўр, «Палескія рабінзоны», Салімонішына бульба*. Растлумачце пастаноўку шматкроп'я, знакаў прыпынку ў складаназалежных сказах з некалькімі даданымі часткамі.

6. Напішыце сціслы пераказ.

## ЯК МЛЫНАР СПІЛАВАЎ СВЯТУЮ ЯДВІГУ

Далёка-далёка на абшарах Беларусі цягнуліся лясы магната Свяцкага. Векавечныя елкі, сосны і дубы раслі на добрай глебе. Там не чулася сякеры селяніна, там не валяўся валежнік: парадак у лясах даўні.

У самай глушы лесу на высокім кургане расла моцная сасна. Расла яна праз цэлыя вякі і называлася Святой Ядвігай. Гэта сасна, як старэнькая бабка, за свой век шмат чула, шмат бачыла. Як кажуць, памятала яна караля Баторыя, Вітаўта. Памятала яна татар, шведаў, французаў і шмат другіх народаў, якія ішлі праз Беларусь. Памятала той дзень, калі пасадзілі яе на кургане ў гонар нейкага пахаванага ваяводы. Праходзілі вякі, курган сушыўся сонцам і вятрамі. А бор, які вырас над курганом, хаваў у сваім гушчары сасонку-бабульку.

Будаваліся гарады, нараджаліся і паміралі людзі, расла і харашэла на кургане сасна. З павагай да сасны ставіліся магнаты, у гонар яе складалі вершы, цэлыя паэмы. Сяляне таксама ведалі вартасць кургана і шанавалі памяць пра тую далёкую мінуўшчыну.

Так плыў час... Над зямелькай той, дзе расла Святая Ядвіга, гаспадарыў пан Свяцкі. І гэты патомак шанаваў старадаўняе

дрэва і курган. Са згоды пана і яго ляснічых сяляне секлі дрэвы ў лесе і будавалі дамы.

Была вялікая патрэба ў млынара[1] на моцнае шула[2] для млына[3]. Ён, атрымаўшы згоду на адну сасонку, выправіўся ў бор.

Шмат было добрых дрэў, якія бачыў млынар. Але лепшага за сасонку, што расла на кургане, не было. Кінулася сасонка ў вочы млынара. І думкі, каб спілаваць яе, не давалі млынару спакою, хоць ён добра ведаў старадаўнюю вартасць кургана і сасонкі. Абышоў млынар бор і лепшага дрэва не знайшоў. Трэба было ці адыходзіць дадому, ці пілаваць якое другое дрэва...

Не стрымаў сваю натуру млынар: быў ён асаблівага характару чалавек. Абгледзеўшы сасонку з усіх бакоў, млынар узяўся за пілу. Нехаця скрыгатала піла, сумна расцягвала па лесе рэха — урэшце са страшным трэскам дрэва пахілілася набок і звалілася на зямлю.

Застагнала зямля.

Млынар задаволена ўхмыльнуўся, сеў на векавечную сасонку: ён сваё зрабіў (Паводле У. Галубка). (318 слоў)

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку? Чаму шанавалі сасонку? Якая асноўная думка тэксту?

2. Вызначце стыль маўлення.

3. Колькі частак у тэксце? Якая сувязь паміж імі? Складзіце план тэксту.

4. Назавіце словы, выразы, якія выкарыстоўваюцца ў тэксце для апісання Святой Ядвігі. Якую функцыю яны выконваюць?

5. Растлумачце напісанне наступных слоў: *далёка-далёка, сасонку-бабульку, (у) вочы, Баторый, Вітаўт, не чулася, не валяўся,*

---

[1] Млына́р, -а, *м.* Уладарнік млына або работнік у млыне.

[2] Шу́ла, -а, *н.* 1) Бервяно ці тоўсты брус з высечанымі пазамі, замацаваны ў чым-небудзь вертыкальна. 2) Слуп ці брус, на які падвешваецца створка варот.

[3] Млын, -а, *м.* Прадпрыемства, будынак з устаноўленымі ў ім прыстасаваннямі для размолу зерня.

*не стрымаў, не знайшоў, абышоў.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаназалежных і бяззлучнікавых складаных сказах, пастаноўку шматкроп'я.

6. Напішыце сціслы пераказ.

## МАШЭКА

На тым месцы, дзе цяпер Магілёў, стаяў цёмны, непраходны лес, які не прапускаў нават сонечныя прамені; ад яго і Дняпру было цесна, а Днепр у той час быў шырокі і сярдзіты. У тым лесе жыў страшны разбойнік, якога звалі Машэкам. У яго была такая вялікая сіла, што адною рукою спыняў экіпаж з васьмерыком коней на ўсім скаку, ухапіўшыся за калясо, і адным разам вырываў з карэннем высокія сосны, а хадзіў ён у мядзведжай шкуры поўсцю ўверх. Не такі тады быў народ, як цяпер, многа было асілкаў, але ўсе дрыжалі перад Машэкам, і пяць дзясяткаў нічога не маглі зрабіць супраць аднаго. Машэка наводзіў жах на ўсе навакольныя селішчы. Нягледзячы на тое, што людзі жылі тады вялікімі сёламі, ён, не баючыся, прыходзіў у кожнае сяло і браў, што яму было трэба. Усюды людзі самі адчынялі яму вароты, каб толькі пакінуў душу ў целе. Не раз выходзілі супраць Машэкі цэлымі палкамі, але ён жыў у такой непраходнай пушчы, што ніхто не знаходзіў не толькі яго бярлогі, але і дарогі назад. Але і на Машэку прыйшла пагібель. Чаго не маглі зрабіць сотні людзей, тое зрабіла адна жанчына.

Раз па дарозе праз лес ехала плеценая брычка, запрэжаная васьмерыком коней. У ёй сядзеў малады мужчына з прыгожай жанчынай. Тут з'явіўся Машэка з-за агромністай елкі, спыніў брычку і ўраз забіў кучара, а мужчына, што сядзеў у брычцы, прырос да свайго месца ад аднаго ўдару разбойніка. Глянуўшы на жанчыну, Машэка стаў як укопаны: ён пазнаў у ёй старую знаёмую. Гэта яна, адхіліўшы яго каханне, прымусіла падружыцца з буйным ветрам.

Ачуняўшы пасля здзіўлення, Машэка паўмёртвую ад перапуду прыгажуню аднёс у сваю бярлогу. Тут яна апрытом-

нела, зразумела сваё становішча і склала план, як загубіць разбойніка. Прыгажуня прыкінулася лагоднаю, паслухмянаю, і разбойнік зусім ёй даверыўся. І вось раз Машэка бяспечна заснуў моцным сном. Прыгажуня забіла яго і, неяк знайшоўшы дарогу, прыйшла да сваіх і паказала ім праклятае месца, дзе і закапалі Машэку, а месца тое людзі назвалі Магілаю льва (З кнігі «Легенды і паданні»). (319 слоў)

1. Якая тэма і асноўная думка тэксту? Чым вызначаўся Машэка? Чаму ён стаў разбойнікам?

2. Вызначце стыль і тып маўлення.

3. Колькі частак у тэксце? Складзіце план тэксту.

4. Назавіце словы, выразы, якія выкарыстоўваюцца ў тэксце, каб пазбегнуць паўтарэння слоў пры апавяданні пра галоўнага героя.

5. Растлумачце напісанне наступных слоў: *дзясяткаў, мядзведжая* (шкура), *плеценая, запрэжаная* (брычка), *адхіліўшы*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах з рознымі відамі сувязі частак.

6. Напішыце сціслы пераказ.

## БУКЕТ ЛЯСНЫХ КРАСАК

Заміраючы ад хвалявання, я заглядваю праз адчыненае акно ў пакой і асцярожна стаўлю букет на падаконнік. Ніколі яшчэ мой букет не быў такім прыгожым і такім удалым.

Пануе цішыня, ніхто нічога, здаецца, не заўважыў. Які казачны водар ідзе ад суніц! Стаўлю кошык на падаконнік і азіраюся. Застаецца толькі дастаць з вядзерца баравічкі.

Амаль кожнае лета пасля вайны я адпачывала разам з бацькамі і двума братамі ў Каралішчавічах, дзе знаходзіўся Дом творчасці беларускіх пісьменнікаў.

Праз колькі гадзін пасля таго, як краскі і баравічкі былі ўладкаваны на падаконніку, я паснедала і выпырхнула на дворык.

Першы, каго я ўбачыла перад сабою, быў Якуб Колас. Ён усміхнуўся і ветліва, добразычліва працягнуў мне руку.

— Дзень добры, — неяк асабліва мякка сказаў ён.

— Дзень добры, — не ўзнімаючы вачэй, ціха адказала я.

Цёпла ўсміхаючыся вачамі, ён сказаў:

— Дзякуй табе за краскі і за суніцы. А я ўсё не мог зразумець, хто ў шэсць гадзін раніцы краскі мне на акно ставіць і знікае, як той прывід. Дзякуй табе, Рымачка, — сур'ёзна прамовіў ён і дадаў: — У даўгу перад табой я не застануся, і, калі выйдзе з друку мой першы том, я падару яго табе з надпісам.

— Праўда?! — аж затрапятала я ад радасці і захаплення. — Самы сапраўдны том? Вамі напісаны?

— Самы сапраўдны, мой, — весела адказаў Колас і жартаўліва пакланіўся.

— Дзякуй, вялікі Вам дзякуй... — голас мой квола задрыжаў. — А Вы не забудзеце? — нечакана для самой сябе спыталася я.

Колас ніколечкі не пакрыўдзіўся.

— Калі чалавек дае абяцанне, Рымачка, дык памятае пра яго. Навошта ж тады і даваць? Не хвалюйся, усё будзе, як сказана, — пацвердзіў ён.

Аднойчы я ўвайшла ў сталовую і ўбачыла там Канстанціна Міхайлавіча за сваім столікам з невялікім стосікам кніг вішнёвага колеру.

Колас весела памахаў мне рукою, каб я падышла да яго. І калі асцярожна наблізілася да Канстанціна Міхайлавіча, ён урачыста ўручыў сваю кнігу.

Так, пісьменнік не забыў пра мяне. Я глянула на яго мудрую ўсмешку і кінулася да выхаду, шчаслівая.

Кніга ляжала на маіх далонях. Бясцэнны падарунак...

Я і зараз бачу той самы цудоўны букет, і маё сэрца сціскаецца пяшчотаю (Паводле Р. Стаховіч-Ларчанка). (333 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Узгадайце прозвішча мастака слова, які падпісваў свае творы псеўданімам Якуб Колас.

2. Вызначце стыль і тып маўлення.

3. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? Складзіце план тэксту.

4. Якую функцыю выконваюць канструкцыі з простай мовай у тэксце? Назавіце словы, якія выкарыстоўваюцца для характарыстыкі Якуба Коласа.

5. Растлумачце напісанне наступных слоў і словазлучэння: *адчыненае* (акно), *адказаў, пацвердзіў, добразычліва, ніколі, ніхто, нічога, ніколечкі, Дом творчасці беларускіх пісьменнікаў*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў складаных сказах, у канструкцыях з простай мовай.

6. Напішыце сціслы пераказ.

## БЕЛАЯ АКАЦЫЯ

Светлай вясновай раніцай у невялікі дворык, што знаходзіўся ля старога саду, зайшла жанчына. Яна падышла да вялізнай акацыі, абняла яе, павіталася і села на лаўку, што стаяла ля пад'езда дома. Жанчына глядзела на сад, любавалася дрэвамі. Яе цягнула сюды, бо тут ёй спакойна сядзелася, добра думалася, тут расло яе любімае дрэва — акацыя.

Аднойчы ў канцы лета жанчына сядзела на лавачцы. Раптам у двор заехаў невялікі экскаватар. За рулём сядзеў малады хлопец. Ён спыніў машыну і прайшоўся па садзе. Жанчына адчула трывогу. Потым не вытрымала, падышла.

— Што ты збіраешся тут рабіць?

— Траншэю капаць, электрычны ка́бель класці, — радасна патлумачыў хлопец.

— У садзе?

— Не будзем жа капаць на вуліцы: там машыны ходзяць.

— А тут дрэвы растуць. Яны жывыя.

— Я іх не пашкоджу.

— Як гэта не пашкодзіш? Тут уся зямля прашыта карэннем. Гэта ж стары сад, яму больш за пяцьдзясят гадоў. Яго берагчы трэба, шанаваць. А ты з машынай сюды.

— Я акуратненька.

Хлопец ускочыў у кабіну, апусціў жалезны коўш з вострымі зубцамі і ўрэзаўся імі ў зямлю. Жанчына заплакала.

Праз нейкі час задрыжала і пахіснулася акацыя.

— Ты ж абяцаў быць акуратным! — закрычала жанчына.

— Не магу я траншэю крывую рабіць.

І хлопец капаў далей.

Жанчына падышла да дрэва, дакранулася рукой да шурпатай кары, пагладзіла, нібы просячы ў яго прабачэння за чужую абыякавасць.

— Глядзі, што ты нарабіў! Яно ж загіне.

Хлопец павярнуў машыну, каб трошкі пасунуць дрэва ўбок, і яно яшчэ больш нахілілася.

Скончыўшы работу, хлопец хуценька выехаў з двара.

Жанчына стаяла каля параненага дрэва, апусціўшы галаву. «У маладосці, — думала яна, — чалавек усё набывае: прафесію, сям'ю, сяброў, а ў старасці толькі губляе. І вось цяпер прыгожае, моцнае дрэва, якое столькі радасці дарыла людзям, можа загінуць».

Хутка сабраліся мужчыны з усіх трох пад'ездаў, але падняць акацыю не змаглі.

Ноччу дрэва ўпала. Яно ляжала на траве, магутнае, з буйнымі белымі гронкамі, прыгожае і бездапаможнае.

Прыехалі рабочыя з бензапілой, распілавалі акацыю на кавалкі, пакідалі ў грузавік і вывезлі...

Мінула зіма. Растаў снег. Свяціла яркае сонца. Весела імчаліся ручайкі. І прыляцелі шпакі.

Толькі жанчына ў дворык ля старога саду больш не прыйшла (Паводле Г. Васілеўскай). (334 словы)

1. Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

2. Вызначце стыль маўлення. Які тып маўлення пераважае ў тэксце?

3. Колькі частак у тэксце? Складзіце план тэксту.

4. Чаму ў тэксце выкарыстана вялікая колькасць дзеясловаў?

5. Растлумачце напісанне наступных слоў: (*на*) *лавачцы*, *падышла*, *пяцьдзясят*, *вострыя* (*зубцы*). Растлумачце афармленне канструкцыі з простай мовай, у якой словы простай мовы разрываюцца словамі аўтара.

6. Напішыце сціслы пераказ, замяняючы канструкцыі з простай мовай канструкцыямі з ускоснай.

## Выбарачны пераказ

### ГАСПАДЫНЯ

Жанчына даглядзела навіны, выключыла тэлевізар, па звычцы абышла ўсе пакоі па-зімняму сцішанай хаты і ўпэўнілася, што на ноч святло ўсюды выключана.

У настуджанай верандзе яна пстрыкнула выключальнікам, запаліла вулічны ліхтар, прыпала да акна і пахукала ў размаляванае марозам шкло. Жанчына доўга цёрла шкло цёплай далонню, каб разгледзець падворак. На вуліцы шчыравала завіруха, і цяпер паўсюль былі відаць бялюткія снегавыя сумёты.

Позняя зіма, нарэшце, паказала характар і за адзін тыдзень замяла дарогі і сцяжынкі, засыпала дзверы і студню. Зараз пявучы свавольны вецер то галасіў недзе ў паднябессі, то бясшумна, па-гаспадарску далікатна прыцярушваў снегам самыя дальнія і непрыступныя закуткі падворка.

Нечакана цяўкнуў сабака. Жанчына, спахапіўшыся, прачыніла на вуліцу дзверы, гукнула:

— Тузічак, забылася на цябе, бяжы сюды.

Невялікі кудлаты сабачка паўторнага запрашэння не чакаў. Ён радасна завіскатаў, выкуліўся з перакошанай будкі, і праз некалькі хвілін мокры снежны камяк закаціўся ў веранду.

— У гэткую непагадзь які з цябе ахоўнік? — далоняй змахваючы з поўсці снег, ласкава прыгаворвала гаспадыня. — Сцерагчы няма чаго, начуй у хаце.

Тузік весела забрахаў і высока заскакаў, цэлячыся халодным носам і чырвоным шурпатым языком у руку гаспадыні.

— Малайчынка, усё разумееш, — засмяялася жанчына і адчыніла дзверы ў калідор, — бяжы на кухню, кашай накармлю.

Акрамя кашы, Тузіку перапала і костачка з супу. Яна збіла сабаку з панталыку, і той доўга не мог вызначыцца з выбарам. Ён то костачку ўгрызне, то кашы лізне. Урэшце Тузік, ухапіўшы апетытны пачастунак, куляй вылецеў у калідор. Вярнуўся ён без смакаты. Сабака апустошваў чыгунок з ка-

шай, а яго чуйныя вострыя вушы прыслухоўваліся, лавілі кожны падазроны шолах у хаце. Жанчына наліла вады, але Тузік піць не стаў. Ён, быццам нешта ўспомніўшы, зноў крутнуўся ў калідор. Праз якую секунду сабака вярнуўся горды і вясёлы, а ў зубах — смачная костачка.

— Жук-хітрун табе мянушка, а не Тузік, — ціха засмяялася гаспадыня, — няўжо ад мяне хаваў?

Каб Тузік мог гаварыць, пэўна, нешта і адказаў бы. Але ў яго была справа больш важная. Трэба было ўтульней уладкавацца каля печы на квадратным саматканым дыванку, каб усю ноч з асалодай грызці заслужаную костку (Паводле В. Праўдзіна). (325 слоў)

1. Якая тэма тэксту?

2. Вызначце стыль і тып маўлення. Абгрунтуйце сваю думку.

3. Колькі падтэм выкарыстана ў тэксце? Складзіце план тэксту.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў дасягаецца выразнасць апавядання?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *абышла, па-зімняму, па-гаспадарску, сцішанай* (хаты), *настуджанай* (верандзе), *размаляванае* (шкло), *бясшумна, адчыніла*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з простай мовай, паміж часткамі складаназлучаных і складаназалежных сказаў.

6. Напішыце паводле тэксту выбарачны пераказ «Хітрун».

## КУПАЛАВА ДРЭВА

У кожнага чалавека, як і ў кожнага дрэва, ёсць свае карані, ствол, галіны, верхавіна.

Карані — гэта людзі, з якіх некалі пачаўся сямейны радавод. Ствол — гэта своеасаблівая лесвіца, па якой уздымаюцца ў гісторыю ўсё новыя нашчадкі ад аднаго і таго ж спадчынніка. Галіны — гэта блізкая радня таго, хто трымаецца на стрыжні радаводнага дрэва. А верхавіна — гэта месца самага маладога з усёй радні.

Радаводнае дрэва звычайна складаецца па мужчынскай лініі. Ім, хлопцам ды мужчынам, прызначана з годнасцю несці

па жыцці прозвішчы пачынальнікаў свайго роду, а дзяўчаты, як вядома, у замужжы страчваюць бацькава прозвішча.

Якое ж радаводнае дрэва ў нашага геніяльнага паэта Янкі Купалы? Хто, якія людзі перадалі яму сваю ўзнёслую душу, дабрыню, мудрасць?

Продкі нашага славутага песняра насілі прозвішча Луцэвіч.

Архівісты і даследчыкі змаглі зазірнуць толькі ў сямнаццатае стагоддзе. Яны ўстанавілі, што трыста гадоў назад на Беларусі жыў Станіслаў Луцэвіч. Ён валодаў невялікім маёнткам Кукялёўшчына, быў панам не вельмі важным, але меў званне двараніна і свой сямейны герб. Зямля і хата Станіслава Луцэвіча знаходзіліся на Міншчыне, на тэрыторыі цяперашняга Стаўбцоўскага раёна.

На другой галіне радаводнага дрэва — трое сыноў Станіслава, адзін з якіх быў у Радзівілаў дазорцам у маёнтку Святы Двор. Гэта Купалаў прапрадзед Іван. Дазорцам быў і адзін з Іванавых сыноў. Архіўны дакумент сведчыць, што Луцэвічы выконвалі службу акуратна і бездакорна, разбіралі і судзілі спрэчныя справы паміж арандатарамі, сачылі за тым, каб правільна і своечасова яны плацілі чынш.

Амаль два стагоддзі Луцэвічы жылі ў засценку Лазараўшчына. Там жылі і потым здабывалі сабе хлеб прадзед Купалы Дамінік, дзед Ануфрый. Там нарадзіўся і яго бацька Дамінік. У сям'і Ануфрыя, акрамя Дамініка, гадаваліся яшчэ чатыры сыны і тры дачкі. Усе яны — родныя дзядзькі і цёткі паэта. А ў кожнага з іх — свае сем'і. Дык вунь колькі радні толькі па бацькавай лініі было ў малога Яся Луцэвіча, калі ён з'явіўся на свет (Паводле У. Ліпскага). (298 слоў)

1. Якая тэма і асноўная думка тэксту? Чым вызначалася радаводнае дрэва Купалы?

2. Вызначце стыль маўлення. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце?

3. Колькі падтэм выкарыстаў аўтар для раскрыцця тэмы? Якая частка з'яўляецца ў тэксце ўводнай? Дайце часткам загалоўкі.

4. Растлумачце правапіс наступных слоў і словазлучэнняў: (*на*) *Міншчыне, Радзівілы, маёнтак Кукялёўшчына, маёнтак Святы Двор, засценак Лазараўшчына, Стаўбцоўскі раён, Купалаў прапрадзед.*

5. Напішыце паводле тэксту выбарачны пераказ «Купалаў радавод».

## СЯМЕЙНЫ ГЕРБ

Даўней людзі мелі сямейныя гербы. Гэты спадчынны сімвал беражліва перадавалі з пакалення ў пакаленне, ганарыліся ім. Па гербе, як па кнізе, чыталі гісторыю радаводу.

А пачыналі гербавую традыцыю старажытныя воіны-рыцары: на турнірах і ў баявых паходах яны насілі на адзенні ці зброі апазнавальныя знакі-гербы. Пазней такія сімвалы займелі дваране, шляхта — людзі, якія мелі чыны, узнагароды, зямлю.

І Луцэвічы, продкі Янкі Купалы, мелі сямейны герб. У цэнтры яго — блакітны шчыт, на ім — срэбная падкова і срэбны меч з залатой рукаяткай; над шчытом — шляхецкая карона і сагнутая ў калене залатая нага ў латах і са шпораю.

Але чаму Луцэвічы выбралі сабе такі герб? Што азначаюць гербавыя сімвалы? Блакітны колер у шчыце азначае паветра, вольнасць, срэбра — белізну, золата — багацце, сілу, вернасць, чысціню, пастаянства.

У старажытных кнігах маецца адна легенда. У ёй сцвярджаецца: кароль польскі Баляслаў III Крывавусты ўпершыню падараваў гэты герб у тысяча сто дваццаць сёмым годзе аднаму свайму ротмістру. Прозвішча камандзіра коннай роты не захавалася, але яго подзвіг жыве ў вяках.

Нібыта той ротмістр-смяльчак два разы ратаваў караля. Аднойчы, рызыкуючы жыццём, ён замяніў параненага пад каралём каня сваім баявым канём. А другі раз, калі кароль і ротмістр трапілі ў палон і былі закаваны ў адну калодку-кайданы, воін не пашкадаваў сваёй нагі і вызваліў караля. Магчыма, па гэтай прычыне яна, залатая, і ўвенчвае карону ў гербе, а шчыт герба ўпрыгожваюць меч смелага воіна і падкова баявога каня.

Вось якія гераічныя сімвалы выбралі Луцэвічы для свайго сямейнага герба.

Але ў гербе Луцэвічаў ёсць яшчэ адзін сімвал: карона, шлем і шчыт, абрамлены прыгожымі стужкамі. Чым больш узіраешся ў іх, тым больш здаецца, што яны падобны да лісця папараці. Можа, далёкія прашчуры Купалы верылі ў дзівосную казку пра чароўныя кветкі папараці, якія з'яўляюцца зорнай ноччу на Івана Купалу. Можа, яны маліліся, каб у іхнім родзе калі-небудзь з'явіўся той шчаслівец, які ўрэшце адшукае таемную кветку папараці і ўславіць увесь іх род. І хаця старажытны род Луцэвічаў з часам драбнеў, бяднеў, але духоўна ён заставаўся багатым, быў верным свайму гербу (Паводле У. Ліпскага). (324 словы)

1. Вызначце тэму і асноўную думку тэксту. Для чаго выкарыстоўваліся сямейныя гербы? Якая сімволіка герба продкаў Янкі Купалы?

2. Вызначце стыль маўлення. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце?

3. Колькі падтэм выкарыстоўвае аўтар для раскрыцця тэмы? Складзіце план тэксту.

4. Якія моўныя сродкі выкарыстоўвае аўтар, выказваючы свае меркаванні?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *воіны-рыцары, знакі-гербы, ротмістр-смяльчак, (у) калодку-кайданы, калі-небудзь*. Растлумачце пастаноўку двукроп'я і працяжніка ў сказах тэксту.

6. Напішыце паводле тэксту выбарачны пераказ «Сімволіка герба продкаў Янкі Купалы».

## АД КРОМАНІ ДА СВІЦЯЗІ

Налібокі! Прамоўлю тое слова — і самымі рознымі ўзорамі ткуцца думкі, далёкія і блізкія ўспаміны, і душа просіцца туды, на шырокія і дрымотныя лясістыя прасторы.

А дарог, каб трапіць у Налібоцкую пушчу, даволі многа. У кожнага свае вароты і свая дарога, каб трапіць у самае сэрца пушчы. Але дзе ж знаходзіцца тое сэрца? Думалася некалі, што яно там, дзе найбольш нетравай гушчыні, непралазных балот, камароў ды багны, аднак мінула некалькі дзясяткаў гадоў,

і я задумаўся яшчэ раз аб сэрцы пушчы. Будзем лічыць, што гэта стаўбцоўскія Налібокі, адкуль, напэўна, і ўзяла наша лясная матуля сабе назву.

Я добра ведаю, дзе знаходзяцца вочы пушчы; тут ужо сумнення няма: яе вочы — гэта два залатадонныя азёры Кромань ды Свіцязь.

Калі я першы раз пабачыў Кромань, дык ахнуў ад нечаканай прыгажосці: уразіў не зіхоткі блакіт яго люстэрка, а зялёны хваёвы ды альховы вяночак, якім быў акаймаваны яго бераг.

Непаўторная прыгажосць гэтага возера, у якой я знаходжу вельмі шмат ад задуменнасці і таямнічасці, найдаражэйшая за ўсё.

Другое вока пушчы, возера Свіцязь, зусім не ўступае па сваёй прыгажосці Кромані, а ў нечым і падобнае да яго. Можа, сваім светла-залатым дном, дзе можна кожны каменьчык убачыць.

Я шукаў агульнае ў двух славутых азёрах нашага краю і знаходзіў, што яны ўсё ж вельмі розныя і сваёй прыгажосцю, і сваёй вадою: вада ў Свіцязі значна мякчэйшая і, можа, больш жывая, чым у Кромані, у яе лагода з іншай падфарбоўкай, бо і бераг зусім іншы (з елкі, дуба, ясеня, граба). Не магу параўноўваць азёры і па смаку рыбы. На Свіцязі не давялося ёй пачаставацца, і я застаюся з перакананнем, што кроманскі шчупак самы смачны ў свеце (Паводле К. Камейшы). (268 слоў)

1. Якая тэма і асноўная думка тэксту? Чаму, на ваш погляд, вачамі пушчы аўтар называе азёры Свіцязь і Кромань? Чым яны адрозніваюцца?

2. Вызначце стыль тэксту. Які тып маўлення пераважае ў ім?

3. Вызначце часткі тэксту. Дайце ім загалоўкі.

4. Якія моўныя сродкі выкарыстоўвае аўтар для апісання Свіцязі і Кромані?

5. Растлумачце напісанне наступных слоў і словазлучэнняў: *дрымотныя* (прасторы), *залатадонныя* (азёры), *светла-залатое* (дно), *кроманскі* (шчупак), *Налібоцкая пушча, некалькі дзясяткаў.* Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў першым сказе апошняга абзаца.

6. Паводле тэксту напішыце выбарачны пераказ «Вочы Налібоцкай пушчы».

## Пераказ з дадатковым заданнем

### ГАЛУБКА

Растаў апошні, брудны снег. Сонца, іграючы ў небе, яшчэ нясмела кідала на зямлю свае гарачыя прамені, і тады ад зямлі падымалася лёгкая па́ра. Весела булькаючы, беглі, спяшаліся некуды маленькія ручайкі. Займаць драўляныя домікі, зробленыя для іх чалавекам, прыляцелі шпакі.

Такой вясновай раніцай жанчына, невысокага росту, у гадах, зайшла ў невялікі дворык, што знаходзіўся ля старога саду. Яна села на лаўку, што стаяла ля пад'езда дома, паклала побач хатулёк з ежай і праседзела тут цэлы дзень.

Рэшткі хлеба, што засталіся ад абеду, яна пакрышыла і пасыпала птушкам. Наляцелі галубы, пачалі кляваць, а яшчэ яны клявалі ўсе дружна адну галубку, адганяючы яе ад ежы. Жанчына прыгледзелася і ўбачыла, што тая кульгае. «Відаць, мароз пашкодзіў лапку, можа, села птушка на падаконнік ля акна, і лапка прымерзла», — падумала жанчына. Яна паднялася, пайшла ў суседні дом, дзе быў магазін. Жанчына купіла кавалак хлеба і, адганяючы нахабных галубоў, карміла кульгавенькую.

Калі прыцемкі пагусцелі, жанчына паднялася і пайшла дадому.

Наступнай раніцай яна зноў прыйшла сюды. І так прыходзіла кожны дзень, пакуль было цёпла. Кульгавенькая галубка ўжо прывыкла да жанчыны, яна не толькі не баялася, а нават чакала, седзячы на траве насупраць лаўкі.

Аднойчы... (Паводле Г. Васілеўскай). (187 слоў)

1. Вызначце тэму тэксту. Чаму жанчына кожны дзень стала прыходзіць у сад?

2. Вызначце стыль і тып маўлення.

3. Колькі падтэм выкарыстана ў тэксце? Ці ёсць канцоўка ў тэксце? Якой, на вашу думку, яна можа быць? Складзіце план тэксту.

4. Выпішыце з тэксту словы з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі. Якую ролю ў тэксце яны выконваюць?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *зробленыя* (домікі), *невысокага* (росту), *зайшла, пайшла, пад'езд, адганяючы*. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку ў сказах з дзеепрыслоўнымі зваротамі, паміж часткамі складаназлучаных і складаназалежных сказаў.

6. Напішыце пераказ з працягам.

## ЦЁЦЯ БРОНЯ

Ёй далёка ўжо за шэсцьдзясят, хада ў яе цяжкаватая. І гэта не дзіўна, бо цёця Броня ў целе. Ідучы, яна злёгку перавальваецца то ў адзін бок, то ў другі. Праз тоўстыя шкельцы акуляраў з тоўстай рагавой аправай яе вачэй амаль не відно. Але мне здаецца, што вочы ў яе добрыя, шчырыя, як і яе словы да хворых.

— Ну, сёння цябе не пазнаць, — цёця Броня спыняецца каля майго ложка, — а ўчора глядзеў у столь, слова не вымавіў. Ты не думай пра дрэннае.

У цёці Броні мова спакойная, павольная, пявучая, як музыка Эдварда Грыга, якая кладзецца на сэрца, заварожвае. Слухаючы яе, забываешся пра ўсе нягоды, пра ўсё змрочнае, нядобрае, і ў душы раптам затрапечацца агеньчык надзеі. Напачатку гэта надзея кволая, але яна разрастаецца, набывае крылы, дае веру. І ты ўвачавідкі мяняешся, думаеш, што вось за гэтым змрокам абавязкова будзе светлая паласа.

Цёця Броня гаворыць пра тое, што я трохі яшчэ паляжу і стану на ногі, змагу зноў хадзіць скрозь і ўсюды. Слухаючы яе словы, я веру ёй больш, чым дактарам. Дактары не ўтойваюць, што пасля такой траўмы, як у мяне, падняцца не так проста.

Я гатовы ўскочыць з ложка, абняць цёцю Броню, расцалаваць яе і спытаць:

— Няўжо гэта праўда? Няўжо я зноў змагу хадзіць?

Але я гэтага не раблю. Ляжу нерухома каторы ўжо месяц, не чую сваіх ног з таго часу, як трапіў у аўтакатастрофу. У мяне пералом пазванкоў, адняліся ногі. І з таго часу мяне акружаюць дактары, сёстры і цёця Броня.

Я маўчу. На вачах у мяне круцяцца слёзы, але я ім волі не даю, стрымліваюся з апошніх намаганняў. Заўважаю, што і цёця Броня, гледзячы на мяне, таксама ледзь стрымліваецца ад слёз. Яна, думаю я, мужная жанчына. Хіба ж не? Каб кожны дзень даглядаць гэтакіх цяжкахворых, прыкутых да ложка, як я, суцяшаць іх, казаць добрыя словы, трэба быць мужным (Паводле І. Капыловіча). (300 слоў)

1. Якая тэма тэксту? Што перадае загаловак: тэму ці асноўную думку?

2. Якія тыпы маўлення спалучаюцца ў тэксце? Знайдзіце ў тэксце апісанне. З якой мэтай яно ўключана ў тэкст?

3. Колькі падтэм выкарыстана для раскрыцця тэмы? Колькі частак у тэксце? Якая частка ў тэксце з'яўляецца ўводнай? Які сэнс мае канцоўка? Складзіце план тэксту.

4. З дапамогай якіх моўных сродкаў перадаецца характарыстыка цёці Броні? Выпішыце прыметнікі, якія выконваюць асноўную сэнсавую нагрузку ў тэксце. Якую ролю выконваюць у тэксце дзеясловы?

5. Растлумачце правапіс наступных слоў: *шэсцьдзясят, цяжкахворыя*.

6. Напішыце пераказ ад трэцяй асобы.

# КАНТРОЛЬНЫЯ ПЕРАКАЗЫ

## ЗАЛАТАЯ ГОРКА

Калісьці і гара, на якой тады не было лесу, і вёска называліся Лісінай Гарой. Па кустах і балотах палявалі лісіцы, але норы свае рабілі яны на гары. Там было сушэй і цяплей, чым у нізіне.

Неўзабаве каля падножжа гары пачалі сяліцца людзі, і лісіцы перайшлі на вяршыню, а затым і зусім сышлі, пакінулі аблюбаваны пагорак.

Вёску сталі называць Гарой. Толькі было незразумела, што гэта за гара. Шмат іх было вакол. Як адрозніць?

Так і не прыдумалі людзі для сваёй вёскі адметнага імя. Дапамог выпадак. Прыехалі аднойчы з горада хлопцы. Абодва маладыя, дужыя і занадта ўжо цікаўныя. Пачалі яны распытваць жыхароў, ці не стаяў некалі на гары панскі замак-палац, ці не засталіся ад яго якія скляпенні. Людзі адказвалі, што нічога пра гэта не ведаюць, нават ад дзядоў сваіх не чулі. Але хлопцы не паверылі, павысякалі на адхоне гары кусты і пачалі капаць я́му. Кожны каменьчык, што трапляўся пад руку, яны ўважліва разглядалі, правяралі, а пясок нават праз рэшата прасейвалі.

Тры дні і тры ночы капалі тыя хлопцы я́му і ўсё каменьчыкі і пясок правяралі. Прыйшоў да іх стары дзядок, паглядзеў, як яны ў той яміне змучыліся, схуднелі. І кажа:

— Што ж гэта вы, сынкі, пакутуеце тут? Ці ж можна так мардаваць сябе? Паглядзіце, які дзянёк добры, як вакол золата зіхаціць.

Кінулі збянтэжаныя хлопцы свае рыдлёўкі, утаропіліся на старога:

— Дзе, дзядок, золата?

— Вылазьце, пакажу, падзялюся з вамі, — з хітрай усмешкай адказвае дзядок.

Павыскаквалі хлопцы з ямы, азіраюцца, а дзядок ім і кажа:

— Ды хіба ж вы не бачыце, колькі яго на нашых бярозах?

А было тады бабіна лета, цёпла, суха. Пераглянуліся хлопцы ды раптам як зарагочуць. Падышлі яны да дзядка, руку пацiскаюць, дзякуюць:

— Нам сказалі, а мы паверылі. Дзякуй Вам, дзядуля, што навучылі, ад марнай працы пазбавілі.

Закінулі тыя няўдалыя шукальнікі золата свае торбы за плечы і пайшлі.

Вось з таго выпадку, з тых лёгкіх слоў мудрага дзядка быццам бы і знайшлося нарэшце для вёскі яе поўнае імя — Залатая Горка (З кнігі «Легенды і паданні»). (320 слоў)

## МАСЛЕНІЦА

Масленіца — старажытнае свята, яно ўзнікла ў нашых продкаў задоўга да хрысціянства і сімвалізавала сабою культ прыроды, адраджэнне плодных сіл зямлі. Першапачаткова свята звязвалася з днём вясновага сонцазвароту, але з прыняццем веры ў Хрыста цяпер яно папярэднічае Вялікаму посту. Сёння яно не мае ў народным календары канкрэтнай даты, а пачынаецца за восем тыдняў да Вялікадня. Свята працягваецца роўна тыдзень і яшчэ завецца Сырным тыднем, Сырніцай, таму што асноўнай ежай у гэтыя дні, апроч рыбы, масла, малака і яек, з'яўляецца сыр.

З прыняццем хрысціянства адным з цэнтральных момантаў Масленіцы стаў чацвер. У гэты дзень жанчыны з самага ранку завіхаліся каля печы, гатавалі багатыя стравы, пяклі бліны. Першы блін прызначаўся продкам, яго клалі на дахавае акенца.

На свята распальвалася вогнішча, вакол яго моладзь вадзіла карагоды, спявала масленічныя песні. У многіх мясцовасцях вешалі арэлі, прывязаўшы доўгую вяроўку да сука дрэва, і гушкаліся на іх.

У масленічныя дні, асабліва ад пятніцы да нядзелі, аб'язджалі вакол вёскі маладых коней, быкоў і валоў, якія дасягнулі трохгадовага ўзросту. Пры гэтым уся вупраж упрыгожвалася рознакаляровымі стужкамі, на дугу прыбіваліся званочкі.

Дбайныя гаспадары на Масленіцу абнаўлялі сані. Новыя сані яны зацягвалі на горку, на сані садзілася чалавек дваццаць. І сані ляцелі з гары. Верылі, што толькі такія сані і будуць потым лёгкія на ходу. У такіх гуляннях захаваліся рэшткі старажытнай магіі. Па павер'ях, чым з вышэйшай горкі з'едуць сані, тым вышэйшым вырасце лён. Аб'ездамі на маладых конях і валах вакол вёскі выганялі, згодна з вераваннямі, нячыстую сілу. Гэтаму садзейнічалі гукі званочкаў. Гушканне на арэлях, як верылі, спрыяла росту раслін, а паветра ў час гушкання павінна было надзяліць чалавека моцным здароўем.

Шмат дзе на Беларусі ў суботу перад Сырным тыднем людзі хадзілі на могілкі і прыводзілі да ладу магілы сваякоў.

Сырны тыдзень заканчваўся тым, што члены сям'і прасілі адзін у аднаго прабачэння за ўсе магчымыя крыўды і грахі (Паводле І. Клімковіч). (298 слоў)

## ДУБ І САСНА

Увагу ўсіх, хто едзе ў горад па старой дарозе Гарадзея — Нясвіж, прыцягвае незвычайны помнік прыроды. Дуб і сасна стаяць абняўшыся, як закаханыя, а вакол помніка — агароджа і надпіс «Аберагаецца дзяржавай».

Шмат легенд звязана з гэтымі дрэвамі. Адна з легенд апавядае пра тыя часы, калі ў Нясвіжы быў створаны вялікі прыгонны тэатр. У Слуцку таксама існаваў прыгонны тэатр, і родныя браты Міхал і Геранім Радзівілы часта пазычалі адзін аднаму артыстаў. Калі ў Нясвіжы задумалі паставіць некалькі балетных спектакляў, са Слуцка прывезлі артыстаў-танцораў у абмен на таленавітых нясвіжскіх музыкантаў.

Паданне расказвае, што сярод балерын вызначалася талентам і прыгажосцю сямнаццацігадовая Ганузя. Стройная, блакітнавокая, яна пакарала сэрцы гледачоў. Не маглі застацца раўнадушнымі да таленту простай дзяўчыны князі і іх госці. Некаторыя з гасцей спадзяваліся знайсці спагадлівы адказ на свае заляцанні, але артыстка адмаўляла ўсім і вы-

мушана была пасля спектакляў хавацца ў старых дэкарацыях за сцэнай.

Малады прыгажун Язэп, нясвіжскі мастак, рыхтаваў дэкарацыі да спектакляў і ведаў, дзе хавалася дзяўчына. Ён закахаўся ў Ганусю. Дзяўчына таксама звярнула ўвагу на мастака і чакала прызнання толькі ад яго, Язэп жа не лічыў сябе дастойным увагі таленавітай балерыны.

Такое становішча цягнулася амаль два гады. Хутка заканчваўся тэрмін дагавора, і Ганузя павінна была вярнуцца ў Слуцк. Адчай дапамог юнаку перамагчы нерашучасць і прызнацца любай у каханні. Доўгачаканыя словы хлопца знайшлі водгук у сэрцы дзяўчыны, і шчаслівыя закаханыя вырашылі звярнуцца да князя Міхала па дазвол на шлюб. Нясвіжскі князь даў згоду на вяселле, але патрэбны быў дазвол і слуцкага Радзівіла. Жорсткі князь у гневе загадаў закаваць дзяўчыну ў кайданы і даставіць назад у Слуцк. Пачуўшы гэта, закаханыя вырашылі ўцякаць, але салдаты злавілі ўцекачоў недалёка ад Нясвіжа. Закаваную ў кайданы Ганусю павезлі ў Слуцк, а праз некалькі дзён дзяўчына загінула.

З той пары Язэп у любое надвор'е хадзіў на месца іх апошняга расстання і праводзіў там цэлыя гадзіны. Магчыма, гэта ён пасадзіў у памяць пра сваё адзінае каханне незвычайныя дрэвы. Язэп адрокся ад свету і ўсё жыццё аддаў манаству...

Дуб і сасна дажылі да нашых дзён (Паводле К. Шышыгінай). (328 слоў)

## ГАСПАДАРЫ ЗЯМЛІ

Бульбу ў тую восень пачалі капаць позна. Звычайна ў гэтую пару яна ўжо ляжала ў сховішчах, у надзейных паграбах.

Амаль увесь верасень ліў дождж, шэрае, беспрасветнае неба вісела нізка-нізка над зямлёю і бесперастанку палівала яе халоднай вадой.

На палях стаяла непралазная балаціна, загоны паразмывала так, што соткі з бульбай ператварыліся ў суцэльнае рыжае месіва. Ні тэхніка, ні гужавы транспарт нават падступіцца сюды не маглі.

Такой восені ніхто ў Воплаве не чакаў. Дождж не спыняўся ні на хвіліну, і на пачатку чацвёртага тыдня слоты[1] людзі разгубіліся, перасталі спадзявацца на лепшае. Адчуўшы рэальную небяспеку, пагрозу свайму дабрабыту, яны кінуліся ратаваць спаконвечны «другі хлеб».

Зямля любіць руплівых, тых, хто дбае пра яе ад вясны да восені. А хто лайдачыць, надоўга забывае сцежку да поля, лянуецца лішні раз прапалоць свой загон, на добры ўраджай разлічваць не можа. Але на гэты раз справядлівай аплаты за працу чакаць не выпадала. Вясковыя руплiўцы зноў паказалі свой працавіты характар. Яны першымі выйшлі ў поле, каб адстаяць сваё права называцца гаспадарамі зямлі.

На полі, якое ўвачавідкі ажыло, зазвінелі, загрукацелі вёдры.

Ды што было выбіраць у тыя вёдры з балота, з чорнай палявой кашы? Капальнікі шукалі клубні навобмацак, рассоўваючы мокрую зямлю рукамі, каб не пашкодзіць бульбы, якая і без таго пацярпела ад затаплення барознаў. Калі ў мяшку набіралася вядры чатыры клубняў, адваяваны ў непагадзі скарб ускідвалі на плечы і неслі ў вёску. Там высыпалі бульбу на гліняны ток у адрынах[2], каб яна пад страхой абсыхала да лепшых часоў. А перад тым абмывалі бульбу вадой са студні, бо калі пакінеш яе ў такім брудзе, то згніе ў пограбе хутка. І раз за разам вярталіся на поле.

Вечарам, стомленыя, людзі ледзь упаўзалі ў хату. Карова, свінні, куры, сабака, кот — усё, што чакала звычайнага гаспадарскага дагляду, належнай увагі чалавека ў тыя дні не мела. На першым плане была бульба — царыца вясковага жыцця. На яе, як на Бога, маліліся ад ранку да вечара. З клопатам пра яе прачыналіся і клаліся спаць. Усяго астатняга ў свядомасці людзей быццам не існавала (Паводле І. Карэнды). (328 слоў)

---

[1] Сло́та, -ы, *ж.* Вадкая гразь на зямлі, на дарогах.

[2] Адры́на, -ы, *ж.* Халодная будыніна для захоўвання кармоў, інвентару і пад.

## УЧЫНАК

Хлопчык ведаў, што зайца злавіць цяжка. Тут ужо трэба небывалае здарэнне, каб ён, такі імклівы, няўлоўны, апынуўся ў тваіх руках. Але аднойчы такі цуд адбыўся. Толькі не з зайцам, а з маленькім зайчыкам, але цуд ад гэтага быў не меншы. Тады цэлы вывадак зайчанят не проста знайшлі ў канюшыне, а выкасілі. Добра, што не падрэзалі касою. Дарослыя, хто касіў, кінулі косы і пачалі лавіць зайчанят, што сыпанулі ва ўсе бакі. Сыпанулі смешна так, як завадныя, і не вельмі хутка. Цяжка сказаць, як ён сам, той хлопчык, не дагнаў ніводнага. Можа, таму, што хацеў палавіць усіх адразу. А аднаго яму далі. Рука дарослага трымала зайчаня за вушкі. Шарачок па-немаўлячы пацешна дрыгаў заднімі лапкамі, нібы ад радасці. Хлопчыку сказалі, што зайца нельга браць за спіну, а можна браць толькі за вушы. І малады чалавек з вялікай асцярожнасцю і трывогай узяў зайчыка так, як трэба браць, адчуў у пальцах цёплыя лапінкі вушэй, а потым ужо без парады дарослых палажыў яго ў шапку і панёс подбегам дахаты.

Так была знойдзена ў зялёным полі казка.

Аднак яна не захацела далей раскрывацца. Зайчык не толькі не захацеў гаварыць, усміхацца, падміргваць, а нават і малака не хлябтаў, не еў свежай травіцы. Сядзеў на дне пустой бочкі...

Хлопчыка выхоўвала маці. Часцей за ўсё без лішняга далікацтва, бо сама яна была заваленая клопатам удава́. Гадавала хлопца тым розумам, што ўзяла ад бацькоў, ад людзей, ад народнай мудрасці ды ад добрага сэрца. А яшчэ былі кнігі ў хаце і ў школе. Нямнога ды няхітрыя, бо чытачу таму толькі што споўнілася восем гадоў. Якраз неўзабаве пасля таго, калі ў бочцы з’явілася зайчаня. У сялянскіх сем’ях таго часу дзень нараджэння не быў ні святам, ні падзеяй. Добра яшчэ, калі хто ўспомніць. Маці не забывалася. Колькі б работы ні было, яна знаходзіла час, каб спячы малому піражок. Сын зрабіў тады сваё свята яшчэ весялейшым. Ён вызваліў зайчаня. Занёс за гумно і пусціў у авёс (Паводле Я. Брыля). (312 слоў)

# ХУТКАЦЕЧНЫ ЧАС

— Прывітанне, пляменніца! — пачула з вірлівага натоўпу Таццяна.

Ад нечаканасці яна скаланулася: такім знаёмым і пяшчотным падаўся жаночы голас. Таццяна хуценька азірнулася і ўбачыла невысокую кабету, якая ішла насустрач. Таццяна адразу пазнала жанчыну, усміхнулася, сэрца ад радасці ёкнула ў грудзях. Гэта ж родная цётачка! Жанчыны павіталіся, абняліся.

Таццяне яшчэ з маленства запомніўся такі эпізод: разам з мужам цётачка Ганна прыязджае ў госці. Рухавая матуля завіхаецца каля печы, рыхтуе пачастункі. А вось бацька вядзе разважлівую гамонку пра сялянскія навіны. Дзятва, як звычайна, побач. Аднойчы, убачыўшы на дзядзькавым пальцы бліскучы пярсцёнак, Таня асмелілася, папрасіла:

— Дзядзечка Мікола, калі ласка, дайце прымераць!

Зірнуўшы са смехам на цікаўную, дапытлівую малую, дзядзька Мікола зняў з рукі залаты пярсцёнак і на поўным сур'ёзе паабяцаў:

— Калі станеш дарослай, выйдзеш замуж, я падару табе яшчэ лепшы пярсцёнак.

Пальчыкі ў дзяўчынкі былі тоненькія, быццам ніткі. Патрымаўшы ў руцэ каштоўную рэч, дзяўчынка, расчараваная, аддала яе назад, потым доўга цешыла сябе дзіцячай марай, чакала запаветны падарунак. Таня добра ведала: дзядзька не кідае слоў на вецер.

Вялікая Айчынная вайна жорстка перакрэсліла ўсё добрае і светлае на белым свеце. Дзядзьку Міколу адразу накіравалі на фронт, з якога ён не вярнуўся.

Калі дзядзька загінуў на вайне, Ганна Максімаўна засталася адна ў чужой вёсцы. Ні радні, ні надзейных сяброў не аказалася побач — нялёгка было прызвычаіцца да адзіноты, да цяжкай мужчынскай працы. Шмат чаго навучылася рабіць сама. Надумалася ўзяць да сябе жыць сірацінку Любачку — малодшую дачушку сваёй рана памерлай роднай сястры. Любаччын бацька загінуў на вайне. Дзяўчынка расла старанная,

працавітая, вучылася добра; Любачка была вельмі падобная да сваёй цёткі. Сёння ніхто і не падумае, што Ганна Максімаўна ёй няродная маці.

Зірнуўшы на цётку Ганну, Таццяна сама сабе адзначыла: нягледзячы на ста́лы ўзрост, яна па-ранейшаму заставалася прыгожай жанчынай. Адкрытае аблічча беспамылкова вызначала шчырую, разважлівую натуру; карыя вочы, вялікія, бліскучыя, выпраменьвалі цэлы сноп асаблівага цяпла.

— Які хуткацечны час! — чамусьці ўздыхнула Ганна Максімаўна.

Нечакана яна замаркоцілася і, правёўшы па вейках маленькай працавітай далонькай, змахнула няпрошаную слязіну.

Пагаманіўшы пра жыццё, жанчыны развіталіся ў добрым настроі (Паводле Г. Атрошчанка). (325 слоў)

## ВЫПАДАК НА ГРАНІЦЫ

Група малодшага сяржанта Мікалая Салаўёва ўжо некалькі гадзін кружыла вакол балацявіны, дакладваючы ў належны час на заставу аб выніках пошукаў. Нічога падазронага пагранічнікі так і не заўважылі. Дайшоўшы чарговы раз да неглыбокага высахлага рова, вырашылі перадыхнуць. І тут позірк Салаўёва выхапіў на суседняй елцы свежы злом лапкі, Мікалай знакамі паклікаў радавых Ракіту і Лапаціна. Паказаўшы на злом, ён загадаў шэптам:

— Лавіць кожны рух паветра!

Затым далажыў на заставу.

— Працягвайце кантраляваць мясцовасць! — быў загад. – Падмацаванне будзе хвілін праз дваццаць.

Пагранічнікі накіраваліся ўздоўж балотца, пад нагамі зачвякала вада. У гэты час падышлі яшчэ два нарады пагранічнікаў з сабакамі, але сабакі ўзяць след не змаглі. Прайшоўшы вакол балотца, нарады з сабакамі накіраваліся далей, група Салаўёва вярнулася ў роў. Атрымаўшы загад працягваць кружыць вакол балацявіны, Салаўёў вырашыў паглыбіцца метраў на трыццаць і прайсці па крузе. Было горача, душыла балот-

ная гніль, даймала машкара, назалялі, лезлі нахабна за каўнер камары. Прайшоўшы метраў трыста, Мікалай раптам улавіў незразумелы шум: пачуўся нейкі шолах. Падаўшы знак таварышам, малодшы сяржант замёр і ўскінуў да вачэй бінокль — нічога не відаць. Пагранічнік паволі пасунуўся далей. Праз некалькі хвілін шум паўтарыўся. Мікалай прыпаў да бінокля: нехта адганяе машкару. Малодшы сяржант падаў байцам умоўны знак падрыхтавацца і, узняўшы аўтамат напагатоў, гучна скамандаваў:

— Загадваю здацца! Вы акружаны!

Зморany, галодны, пакусаны машкарой, змучаны смагай, бандыт сціснуў у руках пісталет. На нейкае імгненне перад ім усплыў матчын твар, у яе заплаканых вачах было маленне... І ён апусціў пісталет, шпурнуў яго ў балота і, павольна падымаючыся, узняў рукі.

Каля рова затрыманага ўжо чакалі работнікі крымінальнага вышуку і начальнік заставы. На руках бандыта пстрыкнулі наручнікі (Паводле М. Пазнякова). (259 слоў)

## ЦУКЕРКІ

Зося Іванаўна заварыла чай, дастала з халадзільніка тварог, паставіла на стол цукарніцу і раптам угледзела, што яна пустая. Паглядзела ў адной шуфлядзе, у другой — цукру не было.

— Хоць бы цукерачку якую, адну маленечкую, — сказала Зося Іванаўна, перабіраючы ў кухонным століку мяшэчкі, слоікі, каробкі і шукаючы ў іх што-небудзь салодкае.

Нечакана яна знерухомела, быццам наткнулася на нейкую нябачную перашкоду.

Набеглі шчымлівыя і ўсё яшчэ нявыплаканыя слёзы, даўкі камяк сціскаў яе. Гэтыя даўно забытыя словы нечакана ўскалыхнулі і параненую душу, пакутлівае пачуццё трывогі вяртала ў маленства, у цяжкія ваенныя гады...

Сямігадовай Зосі спускацца з цёплай печы, выходзіць на вуліцу забаронена: у іх хаце жыве чужы чалавек — Фрыц.

Тыдзень таму Фрыц атрымаў пасылку з дому і чытаў пісьмы, разглядваў дасланыя фотакарткі. Калі ён выцягнуў круглую зялёную бляшаначку і скруціў накрыўку, у Зосі аж дыханне перахапіла, яна і на печы пачула духмяна-спакуслівы пах мядовых цукерак-ледзянцоў.

Той ноччу Зося доўга не магла заснуць. «Мне б хоць адну, самую маленечкую», — шаптала яна.

А раніцай здарыўся цуд: Фрыц піў чай, у нейкі момант ён узяў цукерку, устаў, падышоў да дзяўчынкі, моўчкі паклаў цукерку ёй у далонь.

Зося не верыла ў сваё шчасце. Наступнай раніцай дзяўчынка таксама чакала, што здарыцца цуд, але ён не паўтарыўся.

Праз некалькі дзён яна ўбачыла на падаконніку забытыя Фрыцам цукеркі. У хаце нікога не было, і праз хвіліну Зося ўжо трымала ў руках чароўную бляшаначку. Што здарылася потым і як некалькі мядовачак аказалася ў роце, дзяўчынка нават не зразумела.

Нечакана пацягнула скразняком. Перад ёй стаяў Фрыц.

Ухапіўшы перапужаную Зосю за ногі, Фрыц вынес яе на вуліцу і з усёй моцы кінуў у вялікі снежны сумёт...

Зося Іванаўна піла духмяны несалодкі чай. Яна думала пра тое, якое жыццё няроўнае. Калі памірала ў снежным сумёце, ёй пашанцавала, што міма сумёта на машыне праязджаў Курт і дастаў са снегу дзяўчынку.

Адзін немец хацеў забіць яе і амаль зрабіў гэта, а другі — ўратаваў: ён аднёс Зосю да суседзяў, кожны дзень наведваўся, прыносіў розныя лекі.

Зося Іванаўна дапіла чай і ўголас сказала:

— Мне наканавана ўсё жыццё ўспамінаць і нядобрага Фрыца, і харошага немца Курта (Паводле В. Праўдзіна). (337 слоў)

## СВАЯ ХАТКА ЯК РОДНАЯ МАТКА

Хата была і ёсць для чалавека тым месцам, дзе ён праводзіць усё сваё жыццё, калыскай, у якой нараджаецца і расце не адно пакаленне сям'і. З даўніх часоў чалавек надаваў

будаўніцтву новай хаты вельмі важнае значэнне: пад увагу бралася і месца, дзе будзе стаяць хата, і час пачатку яе будаўніцтва.

Перш трэба было нарыхтаваць лес для будаўніцтва хаты. Калі пачыналі секчы першае дрэва, то глядзелі, як упадзе кара на зямлю. Добрым знакам лічылася, калі кара ўпадзе белым бокам уверх, а верхняй шурпатай часткай уніз.

Па каляндарным часе будаўніцтва пачыналі толькі пасля Дабравешчання.

Са старажытных часоў месца для новай хаты выбіралася наступным чынам: за некалькі дзён да будаўніцтва на зямлю кідалася дубовая кара з лесу, нарыхтаванага на хату, а прыкладна на чацвёрты дзень яе падымалі і глядзелі, што пакажацца пад карой. Калі там былі чарвякі ці чорныя мурашкі, лічылі, што такое месца найбольш спрыяльнае для будаўніцтва, а калі пад карой заводзіліся павукі ці звычайныя мурашкі, хату ў такім месцы не будавалі.

Будаўнікі пачыналі звязваць першы вянец зруба з таго месца, дзе ў хаце павінен быць кут — пачэсны і святы вугал, на якім вісяць абразы́.

Пры закладцы першага вянца ў зарубку паміж бярвеннямі клаліся зёлкі, якія збіралі і асвячалі ў царкве напярэдадні Івана Купалы; вядомы ў беларусаў і звычай класці ў зарубкі вуглоў першага або трэцяга вянца медныя і сярэбраныя манеты, воўну, зерне — усё, з чым асацыіравалася багацце ў будучай хаце.

У нашых продкаў быў звычай па заканчэнні будаўніцтва не спяшацца з перасяленнем. На першыя суткі ўпускаліся ў хату певень і курыца, на другія — гусь ці кот, на трэція — парася, затым — авечка, карова, конь, і толькі на сёмыя суткі, калі з жывёламі і птушкамі нічога не здаралася, перабіраліся ў хату жыць людзі. Рэшткі гэтага звычаю вядомы і сёння: пры ўваходзе ў новую хату спачатку ўпускаюць пеўня або ката.

У дзень перасялення ў хату запрашалі святара, які асвячаў яе і чытаў малебен на ўсяленне. Уваходзілі ў новую хату

з радавым абразом. Такі абраз уносіла жанчына. У хату яна ўваходзіла першай і вешала яго на куце (Паводле У. Сысова). (336 слоў)

## СПАДЧЫНА

Я сядзеў у зале чыгуначнай станцыі, чакаючы поезда. Раптам пачуўся малады голас:

— Пакіну каля Вас свае рэчы ды пайду па білет.

— Калі ласка.

Перада мной, усміхаючыся, стаяў невысокі хлопец у вайсковай форме. Яго твар свяціўся лагоднасцю, а вочы выпраменьвалі добразычлівасць.

Ён паставіў каля маіх ног чамаданчык, зняў з пляча рэчавы мяшок, апусціў на сядзенне.

Вярнуўшыся ад білетнай касы, мой спадарожнік сеў побач і пачаў расказваць займальна-жартаўлівыя гісторыі са свайго салдацкага жыцця.

— Ты або закахаўся, або атрымаў спадчыну! — пажартаваў я.

— Як вы здагадаліся? Я на самай справе атрымаў спадчыну!

— Спадчына вялікая? — спытаў я.

— Дом! Дзед мой памёр і на мяне пакінуў завяшчанне. Ведаеце, які ў мяне дзед Андрэй быў? Чалавек! Дзевяноста гадоў пражыў. Усю вайну на трыццацьчацвёрцы!

Хлопец дастаў з чамаданчыка канверт з фатаграфіямі. Адзін здымак, пажаўцелы ад часу, ён урачыста падаў мне:

— Глядзіце! Вось мой дзед у сорак пятым.

Я беражліва ўзяў працягнуты мне стары здымак і не мог адарваць позірку ад постаці бравага танкіста.

— Пашанцавала табе, хлопча, — прамовіў я ў захапленні. — Такі гераічны продак! А як ты абышоўся са спадчынай?

Хлопец здзіўлена пацікнуў плячыма:

— Адмовіўся ад спадчыны на карысць сястры.

З чамаданчыка хлопец дастаў скураны мяшочак і асцярожна павыкладваў з яго сабе на калені ордэны і медалі.

— Баявыя! Дзед іх толькі ў святочныя дні насіў. Мне пакінуў.

Налюбаваўшыся ўзнагародамі, хлопец сабраў іх.

— А ў рэчавым мяшку таксама спадчына — акардэон. Яго ніколі і нікому не аддам: гэта памяць. Як вяселле ці свята якое, усё сяло да дзеда ішло. Нікому не адмаўляў, іграў. Мяне вось навучыў.

Бліснуўшы вачыма, хлопец раптам прапанаваў:

— Хочаце, я Вам сыграю любімую песню дзеда Андрэя?

Не чакаючы маёй згоды, ён асцярожна вывернуў з рэчавага мяшка акардэон. Загучала знаёмая мелодыя песні. Яна ўскалыхнула памяць, вяртаючы ў той далёкі час, калі выпраўлялі на фронт бацькоў і каханых.

Хлопец пеў задушэўна.

— Дзякуй, сынок! — ціха сказала пажылая жанчына хлопцу, калі змоўк яго акардэон.

Што нагадала жанчыне старая франтавая песня, лёгка было здагадацца. Хацеў і я расказаць майму спадарожніку пра трагічнае і слаўнае мінулае, падзякаваць яму, але на станцыю вось-вось павінен быў прыбыць наш поезд (Паводле Я. Каршукова). (334 словы)

# ЗМЕСТ


Прадмова ... 3

Пераказ як сродак фарміравання ў вучняў навыкаў звязнага маўлення ... 3

Методыка правядзення розных відаў пераказаў ... 14

Цытаваная літаратура ... 28

**5 клас**

Навучальныя пераказы ... 30

Вусны і пісьмовы падрабязны пераказ тэкстаў па плане ... 30

Падрабязны пераказ тэкстаў з простай мовай (з выкарыстаннем апорных слоў і словазлучэнняў) ... 39

Падрабязны пераказ мастацкага тэксту ... 44

Падрабязны пераказ апавядальнага тэксту ... 48

Кантрольныя пераказы ... 54

**6 клас**

Навучальныя пераказы ... 58

Падрабязны пераказ ... 58

Пераказ тэкстаў з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання ... 63

Падрабязны пераказ тэксту па складаным плане ... 71

Сціслы пераказ ... 76

Пераказ з дадатковым заданнем ... 81

Кантрольныя пераказы ... 89

Пераказ тэксту з элементамі апісання рэчаў, жывёл або памяшкання ... 89

Падрабязны пераказ апавядальнага тэксту ... 91

**7 клас**

Навучальныя пераказы ... 95

Падрабязны пераказ ... 95

Сціслы пераказ ... 104

Выбарачны пераказ ... 108

Пераказ з дадатковым заданнем ... 115

Кантрольныя пераказы ... 121

## 8 клас

Навучальныя пераказы ........ 130
Пераказ зместу кінафільмаў, урыўкаў з мастацкіх твораў, радыё- і тэлеперадач з выкарыстаннем двухсастаўных сказаў ........ 130
Пераказ навуковых і мастацкіх тэкстаў з апісаннямі ........ 133
Пераказ тэкстаў на гістарычную тэму ........ 138
Падрабязны пераказ апавядальнага тэксту з элементамі разважання ........ 147
Выбарачны пераказ ........ 150
Сціслы пераказ ........ 154
Пераказ з дадатковым заданнем ........ 158
Кантрольныя пераказы ........ 165

## 9 клас

Навучальныя пераказы ........ 172
Падрабязны пераказ ........ 172
Сціслы пераказ ........ 184
Выбарачны пераказ ........ 196
Пераказ з дадатковым заданнем ........ 202
Кантрольныя пераказы ........ 205

*Вучэбнае выданне*

КАНТРОЛЬНА-ВЫМЯРАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

**Валочка** Ганна Міхайлаўна
**Васюковіч** Людміла Сяргееўна
**Зелянко** Вольга Уладзіміраўна і інш.

**БЕЛАРУСКАЯ МОВА**

**Навучальныя і кантрольныя пераказы**

**5—9 класы**

Дапаможнік для настаўнікаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай і рускай мовамі навучання

*2-е выданне*

Адказны за выпуск *Д. Л. Дзямбоўскі*

Падпісана ў друк 09.02.2016. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 13,02. Ул.-выд. арк. 9,97. Тыраж 1100 экз. Заказ

Таварыства з дадатковай адказнасцю «Аверсэв».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/15 ад 02.08.2013. Вул. М. Олешава, 1, офіс 309, 220090, Мінск.
**E-mail: info@aversev.by; www.aversev.by**
Кантактныя тэлефоны: (017) 268-09-79, 268-08-78.
Для пісьмаў: а/с 3, 220090, Мінск.

УПП «Віцебская абласная друкарня».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/19 ад 26.11.2013.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, 210015, Віцебск.